# БЕЛАРУСЬ:
## ні Эўропа, ні Расея

Меркаваньні беларускіх эліт

**Беларусь: ні Эўропа, ні Расея**

Меркаваньні беларускіх эліт

# **Беларусь: ні Эўропа, ни Расея**
## Меркаваньні беларускіх эліт

Пад рэдакцыяй Валера Булгакава

Выдавецтва „ARCHE”
Варшава 2006

Выдавецтва „ARCHE”

Рэдактар
**Валер Булгакаў**
Карэктар
**Настасься Мацяш**
Мастацкі рэдактар
**Марта Куштра**
Дызайнэр па вокладцы
**Тэрэса Алешчук**
Вёрстка
**TYRSA Sp. z o.o.**

© Copyright by ARCHE

ISBN 83-89406-77-2

Распаўсюджваецца бясплатна

Варшава 2006

# Зьмест

Ад укладальніка **7**

Віталь Сіліцкі, Дылемы выбару **9**

1. Што для вас значыць Эўропа? **25**
2. Ці зьяўляецца Беларусь (такая, якой яна ёсьць сёньня) часткай Эўропы? Быць можа, ёй толькі належыць ёю стаць? Што варта зрабіць у гэтым кірунку ў Беларусі? **41**
3. Што Беларусь можа прыўнесьці ў Эўропу? **67**
4. Ці павінна Беларусь ажыцьцявіць які-небудзь стратэгічны выбар? Калі так, то які: Саюзная дзяржава Беларусі і Расеі, Эўразьвяз, СНД? Ці гэтыя выбары ўзаемавыключальныя? Што варта зрабіць, каб ажыцьцявіць іх? **89**
5. Ці існуе беларуская ідэнтычнасьць? Калі так, то што яе вызначае? Што такое беларускасьць? Што азначае быць беларусам? **123**
6. Ці існуе для вас такі панятак, як славянская супольнасьць / супольнасьць былых савецкіх народаў? **151**
7. Як вы ацэньваеце палітыку Расеі ў дачыненьні да Беларусі? **175**
8. Як вы ацэньваеце палітыку іншых суседніх дзяржаваў, за выняткам Расеі, у дачыненьні да Беларусі? **193**

9. Як вы ацэньваеце палітыку Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі? **213**

Андрэй Казакевіч, Чатыры карпарацыі беларускае эліты **239**

Аб аўтарах **249**

# Ад укладальніка

Інтэрвію, зьмешчаныя ў гэтай кнізе, запісваліся ў сакавіку – траўні 2006 году, г. зн. падчас і адразу пасьля трэціх прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Таму невыпадкова ў шэрагу іх прысутнічаюць алюзіі на гэтую палітычную кампанію.

Увесну 2006 году незалежныя сацыёлягі канстатавалі, што праводзіць сацыялягічныя апытаньні стала немагчыма, паколькі ў краіне ня створаны ўмовы для вытворчасьці сацыялягічных меркаваньняў. Гэтая канстатацыя прагучэла пасьля таго, як прыкладна 25% апытаных падчас *exit polls* адмовіліся паведаміць сацыёлягам, за каго яны прагаласавалі. З тым жа самым давялося сутыкнуцца і рэалізатарам гэтага праекту: больш як палова тых, да каго мы зьвярнуліся з просьбай аб інтэрвію, адмовіліся даць яго. У прыватнасьці, на інтэрвію не згадзіліся ўсе спартоўцы і бізнэсоўцы, якім мы адрасавалі такую прапанову, пераважная бальшыня дзеячаў культуры і мастацтва, журналістаў і прадстаўнікоў дзяржаўнага апарату. Між іншым, гэтая адмова паказвае, у якіх сфэрах беларускага грамадзтва прэсінг дзяржавы наймацнейшы.

Гэты матэрыял не прэтэндуе на вычапральнасьць і ўсебаковасьць, але будзе цікавы для тых, хто цікавіцца поглядамі беларускай эліты на тэмы станаўленьня беларускай ідэнтычнасьці, узаемаадносінаў Беларусі з эўрапейскімі краінамі і Расеяй. Ён выяўляе супярэчлівасьць і неаднароднасьць мысьленьня і мэнтальнасьці нават тых, каго прынята называць самай прадэмакратычнай і праэўрапейскай часткай беларускага грамадзтва. Усе інтэрвію былі аўтарызаваныя і друкуюцца без купюраў і рэдакцыйных правак.

# Дылемы выбару

## Віталь Сіліцкі

Адзін з аўтараў адказаў да геніяльнага проста і сьцісла сфармуляваў, дзеля чаго гэты праект задумваўся. На думку эканаміста і бізнэсоўцы Паўла Данейкі, «трэба кімсьці быць!». Фармулюючы пытаньні, аўтары праекту відавочна мелі на ўвазе і яшчэ адну, непасрэдна зьвязаную з папярэдняй, патрэбу: «Трэба дзесьці быць!».

Чаму пры вызначэньні, кім быць, мы ўвесь час зьвяртаемся і да іншага пытаньня: дзе мы? Магчыма, таму, што справа ня толькі ў празьмернай палітызацыі ідэнтыфікацыйных праектаў, якія цяпер існуюць альбо абмяркоўваюцца, але і ў тым, што на стадыі нацыятварэньня і ў палітычных, сацыяльных, геаграфічных і геапалітычных умовах, у якіх знаходзіцца Беларусь, гэткай палітызацыі пазьбегнуць немагчыма. У любым выпадку, тая ці іншая форма вызначэньня саміх сабе як дзяржавы і як нацыі (ці адмова ад такога вызначэньня) непазьбежна прыводзіць да пераразьмеркаваньня ўлады, статусу, уплыву паміж тымі ці іншымі палітычнымі, сацыяльнымі і інтэлектуальнымі актарамі. У вялікай ступені адказ на пытаньне «дзе мы?» мусіць таксама памагчы вызначыць зьмест нацыянальнай ідэнтыфікацыі: якія моманты ўва ўласнай гісторыі мы будзем лічыць гераічнымі, а якія ганебнымі? каго будзем ставіць у прыклад дзецям як герояў, а каго як здраднікаў? што вырашым шанаваць, а чаго цурацца? і г. д. Можна спрачацца, ці патрабуе беларускі нацыянальны праект гэтых складнікаў нацыянальнай міталёгіі. Аднак відавочна, што іх актыўна вызначае ў пэўным кірунку існы сёньня ў беларускай дзяржаве палітычны рэжым. Відавочна і тое,

што ён гэта робіць у выразна палітычных мэтах: гэта значыць дзеля як мага даўжэйшага самазахаваньня. Можна лічыць, што Лукашэнка кінуў выклік. Нам застаецца альбо адказаць на яго, альбо прыняць тое, што прапануецца (ці, нехта скажа, навязваецца).

Такім чынам, цалкам натуральна, што вызначаючы беларусаў як нацыю, мы імкнемся аднесьці яе да той ці іншай ідэі, што вызначае цывілізацыйны лад, такой як «Эўропа», «Расея», «славянская супольнасьць» альбо нешта іншае. Я наўмысна кажу менавіта як аб ідэях, хаця і Эўропу, і Расею, і славянскі сьвет можна азначыць, правёўшы цалкам рэальныя геаграфічныя ці палітычныя межы. (Хаця, скажам, з Эўропай, у адрозьненьне ад Эўрапейскага Саюзу, гэта таксама зрабіць цяжка: тое, як мы праводзім гэтую мяжу – ці пасьля Бугу, ці каля Воршы, ці за Ўралам, ці нават захопліваючы Аўстралію з Новай Зэляндыяй – перадусім вызначае наша ўяўленьне Эўропы.) Але вызначаючы, дзе мы, кожны з нас таксама апэлюе найперш да ўяўленай, а не рэальнай супольнасьці, цывілізацыі і г. д. Прывяду просты прыклад: уяўленьні і беларускай уладнай эліты, і грамадзтва аб Расеі часьцяком проста не суадносіліся з тым, якой Расея была і ёсьць на самай справе. У значнай ступені гэта і выклікала ўсе тыя недарэчнасьці, якія праяўляюцца падчас спэктаклю пад назвай «беларуска-расейская інтэграцыя». З гэтай жа прычыны ня зьдзейсьніліся і спадзяваньні прарасейскіх дэмакратаў на пэўныя зрухі ў палітычным разьвіцьці краіны дзякуючы ўплыву з Усходу. Тое ж самае, і нават у большай ступені, можна сказаць і пра Эўропу. Размовы аб месцы Беларусі ў Эўропе ці аб пэрспэктывах яе інтэграцыі ў Эўрасаюз будуць бессэнсоўнымі, калі мы ўяўляем яе па-іншаму, чым астатнія эўрапейцы (гэтаксама калі і ўяўленьні іншых аб нас не супадуць з тым, як мысьлім сябе мы самі). Пытаньне тут ня толькі ў нашым веданьні ці няведаньні іншага. (Хаця тут даводзіцца з горыччу згадваць аб незвычайна нізкай інтэнсіўнасьці нашых палітычных, інтэлектуальных і нават людзкіх кантактаў з навакольным сьветам: гэта больш тычыцца Эўропы, але ня толькі яе.) Іншы, гэтаксама як мы, гэта ня нейкая зацьвярдзелая канструкцыя, іншы таксама ў працэсе перарабленьня, перавызначэньня самога сябе, іншы таксама можа быць разгублены і дэзарыентаваны. Прычым калі нашыя ўласныя ўяўленьні аб саміх сабе могуць стаць зачэпкай і нават штуршком для пэўнай сацыяльнай інжынэрыі, перапрацоўкі рэчаіснасьці

пад ідэю (з гэтага збольшага і складаецца рэалізацыя нацыянальнага праекту), то перарабіць іншых значна цяжэй ці наагул немагчыма. Можна хіба зьмяніць успрыманьне саміх сябе ў большым сьвеце, там, дзе мы сябе ўяўляем ці часткай чаго імкнемся стаць.

Вызначэньне нацыянальнай ідэнтычнасьці і вырашэньне пытаньняў цывілізацыйнага выбару – гэта найперш задача нацыянальных і культурных элітаў. «Жывая творчасьць масаў» пры гэтым цалкам не адмаўляецца, але відавочна, што абазначыць і дасягнуць пэўных маральных і інтэлектуальных прарываў здольныя нямногія. Можна сказаць і так: хто ў стане іх ажыцьцявіць, той і становіцца насамрэч нацыянальнай элітай.

Эліта, такім чынам, гэта ня тыя, хто гаворыць больш за іншых. Эліта – гэта тыя, каго больш за іншых слухаюць. Па гэтым крытэры сучасную беларускую эліту можна было б абмежаваць Аляксандрам Лукашэнкам і дыктарамі дзяржаўнага тэлебачаньня ды яшчэ тымі, хто піша і рэдагуе іхнія тэксты. У гэтым выданьні, аднак, прадстаўленыя меркаваньні і бачаньні палітычнага, культурнага і інтэлектуальнага асяродзьдзя. Гэта асяродзьдзе людзей, якія ў нармальных варунках сваім статусам, сваімі дасягненьнямі *мусяць* быць элітай. У асноўным тут пададзеныя погляды «контрэліты» – таго асяродзьдзя, якое супрацьстаіць палітычнай дамінацыі і ідэалягічным дыскурсам, што прапаноўваецца сёньня існым палітычным рэжымам. Прадстаўнікі «афіцыёзу» – дзеячы па-свойму яскравыя і безумоўна вядомыя публіцы менавіта сваім стаўленьнем да пытаньняў, што ўздымаюцца аўтарамі кнігі. Прадстаўніцтва «іншай» Беларусі даволі шырокае – ад палітычных да культурных дзеячаў, ад журналістаў да эканамістаў, ад пісьменьнікаў да праваабаронцаў.

Карацей, мяркуючы паводле складу рэспандэнтаў, можна сказаць, што аўтарам праекту ўдалося сабраць асяродзьдзе, якое мусіць імкнуцца даць грамадзтву зьмястоўныя і зразумелыя адказы на пытаньні, аб якіх вялося вышэй; прапанаваць ня толькі бачаньне саміх сабе, але і бачаньне будучыні. Бачаньне, якое вызначае ў пэўнай ступені маральны код грамадзтва, легітымізуе ці адкідае тыя ці іншыя палітычныя ці культурныя практыкі. Сапраўдная эліта ня можа і ня мусіць гэтага бачаньня навязваць. Хутчэй, яна павінна прадумаць і сканструяваць спосабы, празь якія гэтае бачаньне было б прынятае. Гэта і ад-

розьнівае яе ад рэжыму, хунты ці вэртыкалі. Зь іншага боку, калі ў пагоні за прызнаньнем яна проста *recycle* стэрэатыпы масавай сьвядомасьці, то яе ўжо цяжка будзе адрозьніць ад масы. У гэтым і хаваецца хітрая мяжа паміж прагматызмам і інтэлектуальнай баязьлівасьцю.

Было б недарэчным чакаць фармуляваньня нацыянальнага праекту ў адной кнізе. Нават так, кніга ўяўляе вялікую каштоўнасьць як індыкатар гатоўнасьці ці негатоўнасьці беларускіх элітаў (тут мы перадусім, вядома ж, кажам аб контрэліце) даваць гэтыя адказы. Аналіз выказваньняў можа набыць форму палемікі, таму што ў аўтара гэтых радкоў таксама існуюць меркаваньні, якія могуць не супадаць з тымі, што выказалі рэспандэнты. Я ніяк не хачу, каб мае думкі ўспрымаліся як крытыка. Замест гэтага, завастрыўшы ўвагу на колькіх найбольш актуальных, з майго пункту гледжаньня, пытаньняў, вакол якіх, відавочна, не існуе кансэнсусу ані ўнутры грамадзтва, ані сярод элітаў, я паспрабую вызначыць, дзе мы знаходзімся на сёньняшні дзень у нашай рэфлексіі і ў нашых памкненьнях, і ці імкнемся мы наагул, як калісьці вызначыў Уладзімер Мацкевіч, «думаць Беларусь» – і, дадам, навакольны сьвет.

## Хто мы ёсьць?

Як мы думаем саміх сябе? Хто мы ёсьць, альбо, у іншай пастаноўцы пытаньня, кім нам быць? Адказы на гэтыя пытаньні мы атрымалі самыя розныя. Меркаваньні рэспандэнтаў хутчэй пацьвярджаюць, што станаўленьне беларускай самасьвядомасьці толькі адбываецца. Шмат хто ў сваіх адказах (Калінкіна, Літвіна, Бугрова, Вардамацкі) пра гэта і кажа. Пры гэтым хутчэй ідзе працэс усьведамленьня адрозьненьня ад іншых, чым вызначэньня таго, што яднае беларусаў унутры саміх сябе, свайго сьвету, свайго соцыюму. На думку Ірыны Бугровай, працэсу самаідэнтыфікацыі спрыяе найперш дыстанцыя ад іншых дзяржаваў і народаў. (Наконт падобнай нэгатыўнай самаідэнтыфікацыі таксама выказваецца, у іншым кантэксьце, Кася Камоцкая.) Аднак вонкавая дыстанцыя не здымае пытаньня аб унутраным стане, кансалідацыі, пачуцьці роднасьці і адзінства. Як зазначыла, троху разгублена, Кася Камоцкая, «можа быць, збоку іншыя народы сказалі б, што значыць для іх беларус, але для сябе беларус... Мне здаецца, што працэс яшчэ ідзе».

Дык у якой жа бок ідзе працэс? Толькі некалькі рэспандэнтаў (Дынько, Вячорка, Бураўкін, у пэўнай ступені Саньнікаў) вызначаюць істотнасьць нацыянальнай мовы і культуры. Цікава, што найбольш шчыльна і сьмела гэтую тэзу сфармуляваў прадстаўнік афіцыёзу Яўген Бабосаў (той самы, які беспасьпяхова імкнуўся ўціснуць «беларускасьць» у падмуркі лукашэнкаўскай ідэалёгіі): «Беларуская ідэнтычнасьць якраз і ёсьць *беларуская нацыянальная мова*». Вельмі мала хто (акрамя, як ні дзіўна, прадстаўнікоў уладнай эліты) спасылаецца на калектыўную памяць, гістарычны шлях беларусаў (праўда, у трактоўцы Ўсевалада Янчэўскага галоўная адметнасьць беларусаў – гэта іх «савецкасьць», з чым, дарэчы, многія могуць пагадзіцца). Іншыя абыходзяць пытаньне альбо імкнуцца давесьці, што клясычнага моўна-этнічнага нацыяналізму ў Беларусі не паўстане: «На мой погляд, у пачатку XXI стагодзьдзя беларуская ідэнтычнасьць, заснаваная на прынцыпе этнічнасьці (уключаючы яго базавыя элемэнты, такія як агульнасьць тэрыторыі, крыві, гісторыі і культуры), ня тое каб неадэкватная, але ня мае яснай пэрспэктывы» (Манаеў). Альбо яшчэ ў больш жорсткай форме: «Калі ня скочвацца на „ура-патрыятычныя" лёзунгі, дык быць беларусам – значыць адчуваць сваю прыналежнасьць да гэтага абшару» (Абрамава).

Спадар Манаеў гаворыць перш за ўсё аб немагчымасьці рэалізацыі гэтак званага «беларускамоўнага нацыянальнага праекту», альбо пабудовы дзяржавы і нацыі на моўна-этнічным і культурна-гістарычным падмурку ў вэрсіі беларускамоўных нацыяналістаў (хаця ёсьць вялікія сумненьні наконт таго, што гэткі адзіны праект насамрэч існуе). Аднак, адхіліўшы мову і культуру, мы мусім тады адказаць на пытаньне «што замест?» альбо «што яшчэ?». Насамрэч, адсутнасьць унікальнай нацыянальнай мовы ў «грамадзянскіх нацыяў» яшчэ не азначае таго, што яны не фундуюцца на супольным культурным кодзе (і прыклад Злучаных Штатаў Амэрыкі, на які ў нас любяць спасылацца, – найлепшае пацьверджаньне гэтага). Апэляцыя да грамадзянства таксама не вырашае цалкам праблемы. Бадай, кожны можа згадзіцца і падпісацца пад цудоўнымі словамі, што агучыў Васіль Лявонаў: «Быць беларусам – любіць перш за ўсё беларусаў, Беларусь, спрыяць працьвітаньню сваёй зямлі». Аднак любіць беларусаў і Беларусь можна было і ў складзе Расейскай імпэрыі, і ў Савецкім Саюзе.

У асноўным, у рэфлексіі наконт нацыянальнай адметнасьці беларусаў у патэнцыйнай эліты назіраецца адданьне перавагі пэўным вонкавым, псыхалягічным (дабрыня, талерантнасьць) альбо паводзінскім (схільнасьць да прыстасаваньня) чыньнікам. Вось характэрныя прыклады: «Гэта характэрны паказчык адной з рысаў беларускасьці. Гэта імкненьне захавацца, напляваўшы на ўсё. Можа, гэта і слушна, але калі ты чалавек – істота сацыяльная, то мусіш і Божымі прынцыпамі кіравацца» (Фралоў). Альбо: «Я ведаў вясковы тып беларуса альбо такі, на ўскрайку гораду, дзе, фактычна, жылі, як у вёсцы. Гэта сур'ёзны руплівы гаспадар» (Шушкевіч). Зноў жа, гэтыя прыклады, як станоўчыя, так і адмоўныя, бадай, адлюстроўваюць успрыманьне беларусаў, распаўсюджанае сярод нас саміх. Сама па сабе такая рэфлексія, аднак, стварае падставы для даволі хісткай міталягізацыі саміх сябе. Ці мы сапраўды такія ўжо талерантныя, як мы сябе малюем? Калі мы руплівыя, то ў параўнаньні з кім?

Такім чынам, праблема вызначэньня, што робіць беларусаў культурнай нацыяй, вызначэньня, не пабаюся гэтага сказаць, зьместу нацыянальнай культуры застаецца адкрытая. Значная частка патэнцыйнай беларускай эліты (і асабліва контрэліты) пакуль што акрэсьлівае беларускую самаідэнтыфікацыю пераважна ў нэгатыўных тэрмінах, у адносінах да «значэнных іншых», паводле прынцыпу «мы – не яны» (гл. вышэй характэрныя выказваньні Бугровай і Камоцкай). Гэта нармальная стадыя самаідэнтыфікацыі любой супольнасьці, можна сказаць, гэта тая стадыя, у якой цяпер пераважна знаходзіцца беларускае грамадзтва ў цэлым. Аднак дзеяньні, вызначэньне і дасягненьне пэўных калектыўных мэтаў магчымыя толькі пры ўмове пазытыўнай самаідэнтыфікацыі («мы гэта...»). Проста ідэнтыфікаваць сябе з «абшарам» (паводле словаў Вольгі Абрамавай) яўна недастаткова, таму што такая ідэнтыфікацыя не вырашае пытаньня легітымізацыі гэтай прасторы. Легітымізаваць яе можа толькі супольнасьць, што на ёй пражывае.

Пытаньне культурнага вызначэньня нацыі зноў, такім чынам, паўстае, і нам ад яго нікуды не падзецца. Гэта ня значыць, што я загадзя аддаю перавагу таму ці іншаму «праекту». Але калі мы, напрыклад, спыняемся на дзьвюхмоўі, то трэба вызначыць, што гэтае дзьвюхмоўе азначае (у практыцы сёньняшніх уладаў, відавочна, дзьвюхмоўе проста прыкрывае русіфікацыю) і як мы інтэрпрэтуем

і ўсталюем дзьвюхмоўе менавіта ў якасьці нацыянальна-культурнай адметнасьці. Рэч у тым, што ня вырашыць гэтыя ды іншыя пытаньні што да вызначэньня культурнага коду нацыі азначае пакінуць глебу для «ідэнтыфікацыі шырокіх групаў людзей з гэтым незвычайным палітычным рэжымам» (Дынько) – і для яго (рэжыму) канструяваньня гэтага культурнага коду, чым ён цяпер адносна пасьпяхова і займаецца.

## Дзе мы?

Наконт славянскай супольнасьці зьместоўна выказаліся толькі некаторыя рэспандэнты (што ў пэўнай ступені адлюстроўвае эфэмэрнасьць самой канцэпцыі), пра Расею пытаньне стаяла толькі ў пляне палітыкі, таму паразмаўляем пра нашае бачаньне Эўропы. Эўропу беларусам можна пакуль што толькі ўяўляць. Знаходзячыся ў ёй прынамсі геаграфічна, мы маем на гэта поўнае права. Гэтаксама як іншыя эўрапейцы маюць поўнае права лічыць нас часткай сваёй супольнасьці і культуры ці не. Агульных правілаў у вызначэньні культурных, цывілізацыйных межаў Эўропы бадай што няма. Ёсьць болей-меней агульнапрынятыя геаграфічныя межы (нават нягледзячы на гэта, Эўрапейскі Саюз у сваіх афіцыйных дакумэнтах, прысьвечаных праграме «новага суседзтва», заяўляе, што пытаньне аб далейшым пашырэньні ЭС можа быць вырашана толькі пасьля вызначэньня «канчатковых межаў Эўропы»). Ёсьць эўрапейскія інстытуты, сябрамі якіх мы альбо зьяўляемся (АБСЭ), альбо не (Рада Эўропы і ЭС). Прыналежнасьць да большасьці гэтых інстытутаў (відавочнае выключэньне – Эўрасаюз) толькі фармальна вызначае прыналежнасьць да эўрапейскай прасторы, аднак, фармальнасьці час ад часу адыгрываюць нечаканую ролю. Аўтар гэтых радкоў неяк заявіў брусэльскай публіцы, што беларусаў немагчыма пазбавіць эўрапейскай ідэнтычнасьці (ці мары), пакуль Беларусь зьяўляецца членам УЭФА. Брусэльская публіка рэагавала вельмі жвава!

Эўропа – гэта ня нацыя (што б там не казалі Габэрмас ці Дэрыда, канструюючы «эўрапейскую ідэнтычнасьць» на супрацьстаўленьні амэрыканізму), і вызначыць, што робіць нас эўрапейцамі (калі мы наагул хочам гэта вызначыць), немагчыма, не акрэсьліўшы, што робіць нас нацыяй. Ведама, можна паспрабаваць проста дамовіцца, што, скажам, зь першага кастрычніка такога

году ў аднабаковым парадку пачаць прымаць усе талмуды эўрапейскага права ў якасьці нацыянальнага заканадаўства. Аднак сутыкнуўшыся зь першай жа праявай ідыятызму эўрапейскай бюракратыі (скажам, каб трускалкі былі менавіта вось такой даўжыні, а для таго, каб замяніць лямпачку на высокай столі, трэба ставіць будаўнічыя рыштаваньні на некалькі тысячаў даляраў), мы непазьбежна задамося пытаньнем, чаму гэта патрэбна менавіта нам, і хто мы ёсьць, каб гэта нам было патрэбна. Таму агульнае можа быць зразумелае толькі ў асобным, і мае рацыю спадар Вячорка, калі кажа, што «эўрапейская тоеснасьць праяўляецца толькі ў тоеснасьцях нацыянальных». (Скажам, Фрэнсіс Фукуяма паказвае ў адным з сваіх апошніх артыкулаў, што менавіта размываньне нацыянальнай ідэнтычнасьці ў краінах «старога» ЭС прыводзіць да пэўнай эрозіі, здавалася б, вызначаных цывілізацыйных каштоўнасьцяў эўрапейцаў; у сваю чаргу, гэта прыводзіць да адмысловых сацыяльных праблемаў і крызісаў; найбольш відавочнай зьяўляецца праблема інтэграцыі этнічных і рэлігійных меншасьцяў: абарыгены «старой» Эўропы ўсё менш і менш у стане вызначыць і значыць прад'явіць іншым, што адрозьнівае гэтую супольнасьць, што ёсьць яе культурным кодам, «грамадзянскай рэлігіяй» і ўва што і як, урэшце, эміграну з Марока ці Сэнэгалу трэба інтэгравацца.)

Уяўленьне нашай патэнцыйнай эліты (перш за ўсё – контрэліты) пра Эўропу ў першую чаргу заснаванае на прызнаньні факту існаваньня эўрапейскай цывілізацыі і на ўспрыманьні так званых эўрапейскіх каштоўнасьцяў («Хрысьціянства, рацыяналізм, дыялёг», – Данейка; «Тып цывілізацыі, якая ў значнай ступені навязала гэтую цывілізацыю ўсяму сьвету», – Шушкевіч; «Паняцьце дэмакратыі і паняцьце цывілізацыі, якія, як я лічу, падыходзяць для Беларусі», – Бураўкін; «Эўропа – гэта сьвет мудрай узаемнай цярпімасьці», – Вардамацкі). Відавочныя таксама тэндэнцыі да ідэалізацыі Эўропы («Эўропа – гэта таксама і месца, дзе была сфармуляваная і дзе рэалізуецца новая сыстэма чалавечых каштоўнасьцяў. Гэта месца, дзе жывуць так, як мне б хацелася жыць», – Працька; «Гэта і ўзор у шмат якіх галінах грамадзкага, дзяржаўнага, эканамічнага жыцьця», – Калякін; «Гэта культурныя каштоўнасьці, гэта агульнацывілізацыйныя каштоўнасьці. Тое, што значнае для большасьці насельніцтва», – Абрамава), якія, праўда, не заўжды падзяляюцца прадстаўнікамі ўладнай эліты («Эўропа ўжо ня раз выклікала на

шматлікія народы бяду, войны і кроў. Паглядзіце, хто толькі за ўсю гісторыю ні ішоў на нашы землі!», – Касьцян). Ёсьць спробы вызначыць яе як «не-Амэрыку» («Калі параўноўваць ЗША і Эўропу, Эўропа болей дэмакратычная, бліжэйшая нам, і ўсе праявы дэмакратыі значна мякчэйшыя, чымся ў тых жа Злучаных Штатах, якія цяпер узмоцнена намагаюцца памагчы нават тым, хто ня хоча стаць дэмакратычнай краінай», – Фралоў) і нават «не-Беларусь» («Але асабіста для мяне ў першую чаргу гэта грамадзтва, у якім адсутнічае шалёнае, неразумнае, амаральнае прапагандысцкае абалваньваньне насельніцтва і грамадзкай сьвядомасьці», – Літвіна).

Разважаючы на тэму прыналежнасьці Беларусі да Эўропы, нашая патэнцыйная эліта, за выняткам некаторых прыхільнікаў геаграфічнай канцэпцыі Эўропы (Улаховіч, Кебіч), якія лічаць, што Беларусь Эўропай была, ёсьць і будзе, таксама мысьліць у катэгорыях каштоўнаснай ці цывілізацыйнай гармоніі. Сярод гэтай групы толькі невялікая частка гатовая разгледзець у беларускім грамадзтве прыхільнасьць да эўрапейскіх цывілізацыйных каштоўнасьцяў («Гэта хрысьціянская краіна, якая будуе свае паводзіны на грунце рацыяналізму і схільная да дыялёгу», – Данейка), астатнія вызначаюць, што да іх яшчэ трэба, што называецца, «дарасьці» («Ідэі пра тое, якой мае быць гэтая прастора, эўрапейскія ідэі, сфармуляваныя невялікай часткай інтэлігенцыі, але яны не адчутыя да канца народам», – Алексіевіч; «Я думаю, што гэта проста гістарычная недарэчнасьць, і зь цягам часу (празь дзесяць, пяць альбо пяцьдзясят гадоў) усё стане на свае месцы», – Калінкіна) альбо да іх «вярнуцца» («Сёньня мы – эўрапейская анамалія», але «Беларусь нікуды ня сыдзе з мапы Эўропы. Беларусь у Эўропе – гэта традыцыя, гэта гісторыя», – Мілінкевіч), ці прыходзяць да высновы, што Эўропа, кажучы словамі аднаго беларускага палітыка, гэта «ня наша» («На мой погляд, якраз на мяжы Беларусі, Расеі праходзіць такі цывілізацыйны разлом, які зьвязаны з мэнтальнасьцю ў Расеі, Беларусі і той, другой частцы Эўропы, у якой мэнтальнасьць зусім іншая», – Фралоў).

Вызначыць сваю прыналежнасьць да той ці іншай супольнасьці – гэта перш за ўсё пытаньне выбару («Вы калі-небудзь чулі, каб беларус сказаў: «Я эўрапеец»? Вельмі рэдка. А ад іншых народаў можна гэта пачуць, яны кажуць: «Мы эўрапейцы, і таму...», – Бугрова). Калектыўны выбар заўжды паўстае

з сукупнасьці выбараў індывідуальных. Магчыма, і беларусам пакуль што наканавана рухацца да эўрапейскай цывілізацыі ў індывідуальным парадку, што, дарэчы, не зьяўляецца нечым незвычайным. З трапнага вызначэньня вядомага сацыяльнага філёзафа Тымаці Гэртана Эша, дэмакратычныя дысыдэнты Польшчы, Вугоршчыны ці Чэхаславакіі савецкага часу мелі, з прычыны іх вострага адчуваньня і інтэрналізацыі дэкляраваных каштоўнасьцяў «заходняга сьвету», больш падставаў лічыцца індывідуальнымі сябрамі эўрапейскай супольнасьці, чым пэўныя краіны – калектыўнымі. Таму нараканьні спадарыні Абрамавай на тое, што кантакты Беларусі з ЭС «прыватызаваныя» часткай палітычнай апазыцыі, як мінімум недарэчныя. Гэта натуральна, што супольную мову знаходзяць перш за ўсё падобныя духам і вартасьцямі, і інакш быць наўрад ці можа.

Тое ж самае тычыцца і іншага боку, які мусіць нас прызнаць часткай сваёй супольнасьці. Іншыя эўрапейцы таксама мусяць вырашыць для сабе, ці ёсьць мы «сваімі», і, як кажа Вінцук Вячорка, «не-экзотыкай». Аднак тут праблема нават шырэйшая, чым тое, ці зможам мы пераканаць французаў, палякаў ці кіпрыётаў, што мы «не-экзотыка». Самі паняцьці эўрапейскіх каштоўнасьцяў, эўрапейскай ідэнтычнасьці і наагул Эўропы ня ёсьць чымсьці статычным. Бясконцыя і часта марныя пошукі ўласнай ідэнтычнасьці, дэмаграфічны крызіс і эканамічны застой, паталягічны страх «старой Эўропы» перад польскім вадаправодчыкам, зруйнаваныя прыгарады Парыжу, карыкатурныя скандалы, забойствы палітыкаў і журналістаў у Нідэрляндах, паліткарэктнасьць, якая прымушае не называць імя жанчыны, што зьбіралася ўжыць уласнае дзіця ў якасьці бомбы – гэта таксама Эўропа. Зь іншага боку, і нас могуць прызнаць ці не прызнаць «сваімі» толькі цалкам, з усімі нашымі праблемамі і недарэчнасьцямі, нашай «памяркоўнасьцю» і «талерантнасьцю» і Чарнобылем...

Трэба сказаць, што эўрапейская інтэграцыя – гэта працэс у сваёй ідэалёгіі вельмі кансэрватыўны. Далучэньне да ЭС новых краінаў непазьбежна ажыўляла пэўны дыскурс, што грунтуецца на такіх паняцьцях, як свабода, дэмакратыя, правы чалавека, рынкавая эканоміка, талерантнасьць, роўнасьць, нарэшце, ажыўляла само разуменьне эўрапейскай цывілізацыі як цывілізацыі вольнага сьвету. Гэта вяртала, прынамсі інтэлектуальна, усю астатнюю Эўропу да сваіх першапачатковых ідэяў, назад ад усялякіх «пост-» і «антыканцэпцыяў» (постма-

дэрнізму, постхрысьціянства, постнацыяналізму, антыамэрыканізму, антыглябалізму і г. д.), што імкліва апаноўваюць сьвядомасьць тых, хто «думае Эўропу» ў самой Эўропе. Таму, мабыць, галоўнае, што можа прынесьці Беларусь у Эўропу – гэта ня свой добразычлівы характар, працавітае насельніцтва, стабільнасьць ці нават чалавечы патэнцыял і культуру (што можа з такім жа посьпехам прапанаваць, скажам, і Расея), а менавіта той імпульс да пераасэнсаваньня і ўзнаўленьня гэтых каштоўнасьцяў – калі мы, вядома, здолеем надаць такі імпульс.

Але кожны віток гэтай інтэграцыі аслабляе актуальнасьць канцэптуалізацыі Эўропы як «цывілізацыі свабоды», і здань экзыстэнцыяльнага ворага, якім у свой час быў Усход ці савецкі камунізм, паступова слабее, а таму кожнаму, хто спазьняецца да адыходу цягніка, ажывіць зноўку гэты рамантызм айцоў-заснавальнікаў і героіку 1989 году робіцца ўсё цяжэй і цяжэй. Насамрэч тое, што Беларусь – гэта апошні кавалак адойшлага ў нябыт Усходу (Расея – гэта, усё ж такі, асобнае пытаньне), зусім не азначае, як бы таго ні хацеў Вячаслаў Кебіч, што астатняя «Эўропа» толькі і думае пра тое, каб дадаць да сваёй мазаікі гэты адсутны кавалачак.

Далучэньне да чагосьці, дасягненьне пэўнай культурнай і цывілізацыйнай еднасьці – гэта ня гандаль і не «перадпродажная падрыхтоўка». Натуральна, мы «прапануем» (калі прапануем) сябе такімі, якімі мы ёсьць – з усімі нашымі адметнасьцямі, недахопамі і прывабнасьцямі, рэальнымі альбо ўяўнымі.

## Што мы выбіраем?

Калі сапраўды можна вызначыць беларускі нацыянальны характар, то відаць, адна зь бясспрэчных яго рысаў – гэта імкненьне пазьбегнуць жорсткага выбару, боязь гістарычных ды палітычных Рубіконаў. Хтосьці з апытаных бачыць менавіта гэта паратункам для Беларусі («Наш інтарэс – гэта адмова ад канчатковага цывілізацыйнага выбару. І гэта – таксама выбар. Прынамсі, ня трэба зь ім сьпяшацца. Няхай сусьветная палітыка зробіцца больш пэўная», – Вольга Абрамава), хаця некаторыя нязгодныя, што гэтая боязь насамрэч існуе («Апрача яўнай, усьвядомленай намі веды, ёсьць няяўныя ўяўленьні аб рэальнасьці, якія актуалізуюцца ў моманты выбару. Паколькі ў беларусаў не было яшчэ выбяру, яны яшчэ не сталі перад гэтай праблемай, то гэтае ўяўленьне ўсё яшчэ не актуалізаванае. Але

маё адчуваньне такое, што выбар у Беларусі зроблены адназначна большасьцю насельніцтва, абсалютнай большасьцю. І татальна», – Данейка).

І ўсё ж такі стаўленьне да праблемы большасьці эліты зноў-такі нагадвае тое, што робіцца ў галовах і душах «не-элітаў». Ня ўсе прызнаюць саму актуальнасьць выбару («Думаю, цяпер няправільна ставіць пытаньне ў тэрмінах „альбо – альбо". Цяпер было б адэкватна ставіць пытаньне ў тэрмінах „і – і". Адэкватна з пункту гледжаньня нацыянальнага характару, мэнтальнасьці, эканамічнай сытуацыі, нашага геапалітычнага становішча», – Андрэй Вардамацкі). Некаторыя спадзяюцца на тое, што выбар, з прычыны зьмены вонкавых чыньнікаў, адпадзе сам сабою («... справа ў тым, што Эўрасаюз мае тэндэнцыю разьвівацца. І калі Расія ўступіць у Эўрасаюз, то і Беларусь рана ці позна туды ўступіць. Куды ж яна дзенецца? Калі Ўкраіна будзе, дапусьцім, і Расея, і Літва, і Латвія, і Эстонія, і Польшча, куды Беларусь падзенецца? Нікуды не падзенецца, яна будзе часткай Эўрасаюзу», – Бабосаў; «Зразумела, што калі мы будзем разглядаць ідэальныя схемы, то месца Беларусі – у Эўропе і Эўразьвязе. Але я думаю, што гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі і Расея ўступіць у Эўразьвяз», – Калінкіна). І толькі некаторыя гатовыя выразна вызначыцца ў адзін бок («Трэба штосьці выбіраць! Я, увогуле, прыхільнік таго, каб мы былі ў дастаткова цесным саюзе з Расеяй. Безумоўна, каб і Расея троху іншая была», – Фралоў) альбо ў іншы («Я ўпэўнены, што Беларусь павінна быць толькі ў аб'яднанай Эўропе, у Эўразьвязе», – Саньнікаў).

Пытаньне выбару рэспандэнты разумеюць па-рознаму. Адны – больш у сэнсе з кім інтэгравацца (наладжваць эканамічныя ды палітычныя стасункі), іншыя – як наблізіць Беларусь да той ці іншай супольнасьці ўнутры самой сябе. Паміж гэтымі двума аспэктамі існуе пэўная ўзаемасувязь, але ж яна ня поўная. Цывілізацыйны выбар – гэта ня выбар суседзяў (іх, прынамсі з 1945 г., не выбіраюць), альбо эканамічных партнэраў: геаграфію не падманеш, таму нафта- і газаправоды ды іншыя транзытныя камунікацыі бягуць з Расеі ў ЭС менавіта празь Беларусь. Эканамічная інтэграцыя і з Расеяй і з Эўропай таксама цалкам магчымая, да і мы яе цяпер маем (што з горыччу зазначыла Кася Камоцкая, якая акрэсьліла палітыку Расеі да Беларусі як адназначную падтрымку дыктатуры «пры дапамозе газу і нафты» і дадала, што палітыка Эўропы – гэта таксама «падтрымка дыктатуры. Яны купляюць у нас нафту і радасна павіскваюць!»).

Такім чынам, існаваньне і з Расеяй і з Эўропай у нейкім сэнсе магчымае (на жаль некаторых беларускіх палітыкаў і інтэлектуалаў, такое існаваньне можа несьці не рашэньне палітычных і цывілізацыйных пытаньняў, а таксама і праблемы, спрыяць мацаваньню аўтарытарнага прэзыдэнцкага абсалютызму). Аднак сумяшчэньне Эўропы і Расеі ў палітычных інстытутах, у грамадзянскай культуры, у стаўленьні да грамадзянскіх правоў і свабодаў, ува ўсім тым, што і вызначае цывілізацыйны выбар, меней верагодна. Такое сумяшчэньне магчымае толькі часова, яно прыводзіць да існаваньня нестабільнай гібрыднай формы, якая раней ці пазьней апынаецца ў стане ўнутранага крызісу і ўрэшце мусіць трансфармавацца ў штосьці больш вызначанае (прыклады нашых суседзяў, Расеі і Ўкраіны, гэта пацьвярджаюць). Фінляндызацыя, пра якую кажа Андрэй Дынько – гэта не зусім тое ж самае. Фінляндыя за савецкім часам была абмежаваная ў вызначэньні сваіх вайскова-палітычных і часткова эканамічных дачыненьняў, але ўнутрана яна цалкам належала да заходняга, эўрапейскага сьвету. Таксама выклікае пэўныя сумненьні выказваньне Алега Манаева аб тым, што найперш трэба вырашыць пытаньне аб уладзе (падыгрываючы, калі так можна сказаць, электарату) і толькі потым вырашаць пытаньне выбару. Падобны выбар насамрэч хутчэй ёсьць не наступствам, а чыньнікам палітычнай барацьбы, яго актуалізацыя акурат і мае той мабілізацыйны і легітымацыйны патэнцыял, што вырашае вынікі палітычных баталіяў і трансфармацыяў. Прапанова, якая не знаходзіць попыту, безумоўна, асуджаная на паразу. Але яе адсутнасьць яшчэ больш пэўна праграмуе на паразу тых, хто пазьбягае яе сфармуляваць і прасоўваць.

Магчыма, гэтае перабываньне паміж двума сьветамі ёсьць натуральнай прыступкаю ў палітычным разьвіцьці і ў працэсе нацыятварэньня, празь якую Беларусь асуджаная прайсьці. Аднак у мяне ёсьць сур'ёзная падстава сумнявацца, што гэта будзе менавіта так. Існаваньне на цывілізацыйным разломе было магчымае тады, калі па абодва бакі былой савецкай мяжы яшчэ захоўваліся пэўныя ўяўленьні (якія аказаліся ўрэшце ілюзорнымі) наконт магчымасьці нейкай больш шырокай супольнасьці, скажам так, Эўропа+Расея (а паводле азначэньня, і ўсё тое, што паміж імі), калі гэтыя два бакі самі яшчэ не да канца вызначыліся ў кірунках уласнага разьвіцьця. Гэты працэс вызначэньня і афармленьня – палі-

тычнага, інстытуцыянальнага, культурнага – ідзе цяпер імкліва. Сьвет мяняецца, і калі мы не мяняемся разам зь ім, то верагоднасьць таго, што мы застанемся з тым, што маем цяпер, павышаецца з кожным годам.

* * *

Відавочна, што беларуская эліта, і перш за ўсё контрэліта, збольшага толькі пачынае шукаць адказы на пытаньні, кім і дзе быць Беларусі і беларусам. Пакуль мы вельмі часта сутыкаемся хутчэй з рэпрадукаваньнем пэўных элемэнтаў масавай сьвядомасьці, чым, уласна кажучы, адказамі ці пошукамі адказаў. Бадай, гэта лепш за ўсё адлюстроўвае пэўную недарэчнасьць размоваў пра існаваньне «нацыянальных праектаў» (беларускамоўнага, расейскамоўнага ці іншых), пра што час ад часу кажуць аналітыкі і палітыкі. Мы толькі маем іх сфармуляваць. Як потым прыйсьці да адзінага – гэта пытаньне яшчэ больш нявызначанае. А як яго ці іх рэалізаваць – да гэтага яшчэ вельмі і вельмі далёка.

Гэта ў цэлым натуральнае адлюстраваньне стану, у якім знаходзяцца сёньня як беларускае грамадзтва ў цэлым, так і інтэлектуальная эліта ў прыватнасьці. Атамізаванасьць усяго грамадзтва вядзе і да разарванасьці элітнага поля, адсутнасьці ці амаль адсутнасьці пляцовак і мэдыяў для дыскусіяў і дыялёгу ўнутры інтэлектуальнай і палітычнай супольнасьці, ня кажучы ўжо пра зваротную сувязь паміж ёй і грамадзянамі. Дый здаецца, бягучых палітычных ды іншых праблемаў столькі, што ня час думаць аб высокім. Але ня вырвацца з гэтага замкнёнага кола, не распачаць гэты дыялёг, не пачаць пошук супольных адказаў на пытаньні – гэта значыць проста зьмірыцца з тым, што Беларусь урэшце паўстане як нацыя, сканструяваная паводле вобразу і падабенства яе сёньняшняга правадыра. Альтэрнатываў і часу, каб пазьбегнуць гэтага, у беларускіх элітаў і ўсіх нас застаецца вельмі і вельмі мала.

**Віталь Сіліцкі** (нар. у 1972 у Менску) – незалежны палітоляг. Магістар Цэнтральнаэўрапейскага ўнівэрсытэту ў Будапэшце (1994). Доктар Ph.D унівэрсытэту Ратгерса (Rutgers University New Brunswick NJ). У кастрычніку 1998 – верасьні 2003 – дацэнт Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў Менску. Быў звольне-

ны за публічную крытыку рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. У 2006 – запрошаны дасьледчык Цэнтру вывучэньня дэмакратыі, разьвіцьця і прававой дзяржавы, Стэнфардзкі ўнівэрсытэт, ЗША. Рэдактар „Historical Dictionary of Belarus" (Scarecrow Press), выданьне якога заплянавана на пачатак 2007.

# 1. Што для вас значыць Эўропа?

## Вольга Абрамава

Я не магу сёньня сказаць: Эўропа – гэта «наша ўсё». Але, мяркуючы па тым, дзе мы знаходзімся, так павінна быць. Гэта агульныя культурныя каштоўнасьці, гэта агульнацывілізацыйныя каштоўнасьці. То бок тое, што мае значэньне для большасьці насельніцтва Эўропы. Жыцьцё чалавечае кароткае – гэта хутчэй імкненьне нашых грамадзянаў дасягнуць хоць бы сярэднеэўрапейскага ўзроўню жыцьця і мець высокую ступень сацыяльнай абароненасьці, што таксама характэрна для вельмі многіх эўрапейскіх дзяржаваў. Пры гэтым важна захаваць самабытнасьць Беларусі і тое, што характэрна для беларускай культуры. Я не бяру палітычныя аспэкты супрацьстаяньня, таму што ў сёньняшнім жыцьці гэта вельмі моцна ўзаемазьвязана, той водападзел, па якім праходзяць прэтэнзіі бакоў адзін да аднаго. Апрача таго, я хацела б толькі, каб было большае разуменьне спэцыфікі Беларусі, асаблівасьцяў нацыянальнага характару з боку эўрапейцаў.

Як палітык, я мыслю па-за межамі свайго чалавечага жыцьця. З таго часу як я прыйшла ў палітыку, я пачала ўяўляць сабе стандарт, прыкідваць разьвіцьцё маёй краіны на пяцьдзясят гадоў наперад. То бок не такая, якая яна сёньня (абавязкова гэта ўлічваць), але такая, як было б пажадана, каб яна стала за 50 год. А праз пяцьдзясят гадоў, з майго пункту гледжаньня, Беларусь мае зрабіцца паўнацэннай сярэднеэўрапейскай краінай з высокімі жыцьцёвымі стандартамі, з высокай камфортнасьцю для пражываньня людзей. І адзінае, чаго

мне не хацелася б пазычаць у эўрапейцаў, – гэта эўрабюракратыя і некаторыя абывацельскія каштоўнасьці. Калі параўноўваць сёньняшняе жыцьцё ў Беларусі і эўрапейскіх краінах, я магу сказаць, што для большасьці (асабліва тых, хто бываў у Эўропе неаднаразова) эўрапейскія стандарты жыцьця разглядаюцца як тое, да чаго варта імкнуцца. Але што да самога эўрапейскага ладу жыцьця на бытавым узроўні, на ўзроўні ўспрыманьня гэтага жыцьця – мне б хацелася, каб людзі былі больш крытычныя ў дачыненьні да інфармацыі, каб людзі не ўспрымалі так сьлепа тое, што падае грамадзтву «чацьвертая ўлада», і каб людзі не супакойваліся на дасягнутым, а жылі цікавейшым жыцьцём. Гэта ня ёсьць тым, што палітык можа прапаноўваць грамадзтву, гэта – пажаданьне таго, каб захавалася вялікая цікавасьць да жыцьця. Каб ня толькі і ня столькі матэрыяльныя каштоўнасьці або тое, што з гэтым зьвязана, былі самыя значныя.

Вядома, у любой краіне кожны чалавек думае перш за ўсё пра сваю сям'ю: ці можа ён павысіць яе ўзровень спажываньня, ці можа ён яе абараніць, ці можа ён забясьпечыць для сваёй сям'і той лад жыцьця, які дазволіць падтрымаць яе здароўе, высокі ўзровень адукацыі для дзяцей, годную старасьць... Усё гэта так, але ў той жа час ён хоча (гэта пажаданьне халерыка і экстравэрта, якім я зьяўляюся), каб людзі захавалі непазбыўную цікавасьць да жыцьця. Каб яны знаходзілі для сябе ўсё новыя мэты, усё новыя вяршыні, якія трэба браць. І каб так было да глыбокай старасьці.

## Сьвятлана Алексіевіч

Чым больш у Эўропе жывеш, тым менш разумееш, што ж гэта такое. Я ў ёй жыву ўжо пяць гадоў у розных краінах: у Францыі, у Германіі, цяпер у Швэцыі...

Гэта кавалачак Зямлі, зямнога сьвету, які больш-менш дасканала ўладкаваны, дзе галоўнай каштоўнасьцю прызнаецца чалавечае жыцьцё. На Ўсходзе больш важнымі лічацца дзяржаўныя праблемы. У постсавецкіх краінах пераважае цяпер філязофія выжываньня. Амэрыка – гэта ўсё-такі імпэрыя... А Эўропа мае нармальныя чалавечыя памеры, яна ўладкаваная для чалавека.

### Яўген Бабосаў

Эўропа – самы дзіўны ў сьвеце кантынэнт. Чаму? Таму што хрысьціянская культура, на якой заснаваныя сучасныя веды, сучасная тэхніка, сучаснае разуменьне дзяржавы, сучаснае разуменьне чалавека, яго любові, зробленыя ў Эўропе. Таму Эўропа – гэта той асяродак, зь якога вырасла ўся сучасная цывілізацыя, заснаваная на хрысьціянстве. У гэтым сэнсе Эўропа зьяўляецца прамаці сучаснай цывілізацыі, сучаснай культуры. Цывілізацыя шырэйшая за культуру: яна ўключае ў сябе і культуру, і навуку, і тэхніку... Эўропа – гэта асяродак сучаснай цывілізацыі, пабудаванай на аснове хрысьціянства і яго разнастайных тлумачэньняў, у тым ліку і марксісцкіх, атэістычных.

### Анжаліка Борыс

Культурна-гістарычная прастора, у якой існуюць народы, што прытрымліваюцца супольнай сыстэмы каштоўнасьцяў, правілаў паводзінаў і прызнаюць унікальны ўклад кожнага з народаў у фармаваньне таго, што прынята называць эўрапейскай цывілізацыяй.

### Ірына Бугрова

Што да мяне, то я «сапсавана» навуковымі ведамі, «сапсавана» бясконцым патокам літаратуры, якую я чытала, калі вывучала гэтае пытаньне – пра станаўленьне паняцьця «Эўропа», пра мэнтальнасьць Эўропы, пра тое, што больш укладваецца ў гэтае паняцьце: геаграфія ці палітычныя функцыі? Калі Эўропа фармавалася, пэрыяд станаўленьня тэрыторыі, стварэньне і разбурэньне блёкавых сыстэмаў, натуральна – культуралягічны і рэлігійна-этнічны варыянты... Гэта значыць – усё! Сама Эўропа – гэта паняцьце досыць няпэўнае, якое не акрэсьлілася дагэтуль. Дыскусіяў шмат, і я не магу быць убаку ад іх: я надта ўжо ў іх заглыбленая...

Для мяне Эўропа зьвязаная, вядома, з пэўнай тэрыторыяй. Безумоўна, тэрытарыяльная ідэнтыфікацыя і вызначанасьць адыгрывае сваю ролю і мае сваё значэньне, але ўсё-такі мэнтальнасьць на першым месцы. Цяпер калі мы

гаворым пра Эўропу і кажам «эўрапейская сьвядомасьць», «эўрапейская культура», «эўрапейскія каштоўнасьці», дык мы, безумоўна, укараняемся ў культурны пласт, у глыб вякоў і высьвятляем, як станавілася Эўропа, на базе якіх культурных сэнсаў, значэньняў, кодаў ішло фармаваньне Эўропы. Для мяне, вядома, гэта ў першую чаргу сэнс, зьвязаны з эўрапейскімі культурнымі кодамі, у якіх ёсьць хрысьціянства, ёсьць нейкі невялікі маўрытанскі, мусульманскі элемэнт (без усялякага сумненьня, ён прысутнічае ў ёй) і балканскі элемэнт, субстрат. У ёй прысутнічае і славянскі, і балцкі, і скандынаўскі элемэнты, і ўсё, што зьвязана з культурамі іншых плямёнаў і народаў.

І вядома, гэта рэлігійны кантэкст. Мала таго што ў Эўропе сышліся дзьве вельмі магутныя хрысьціянскія галіны, яны і сфармавалі Эўропу. І, безумоўна, я не магу не гаварыць пра тое, што Эўропа прыняла, увабрала ў сябе (асабліва ў паўднёвай частцы – Балканы, Гішпанія, Партугалія) некаторыя элемэнты мусульманскай культуры. І мы ня можам не заўважаць гэтага.

Для мяне сёньня, як сказала баўгарка Марыя Тодарава, прафэсар Парыскага ўнівэрсытэту, Эўропа ёсьць паняцьцем варыятыўнай геамэтрыі. У залежнасьці ад таго, зь якога зыходнага пункту ты глядзіш, ты выкрэсьліваеш сваю фігуру, лепіш сваю скульптуру. Таму дагэтуль ёсьць жаданьне надаць Эўропе расшыранае значэньне, у тым ліку ўключыць туды Расею, асабліва эўрапейскую Расею. Цяпер Расея выштурхоўвае Эўропу: уключаючы Расею, мы трацім Эўропу. Але ёсьць жаданьне іншым разам у пашыральным сэнсе падумаць пра Эўропу...

З другога боку, эўрапейскае ядро сфармавалася ў заходняй і цэнтральнай частках Эўропы – на ўзроўні маленькіх дзяржаваў, якія ўваходзілі ў нейкія саюзы, складалі часткі імпэрыі, але сваю ролю адыгрывалі. Вельмі хочацца адысьці ад палітыкі. Але не выходзіць, таму што Эўропа – вельмі палітызаваная структура, у адрозьненьне ад Афрыкі, напрыклад.

Таму для мяне Эўропа – гэта ў першую чаргу самаадчуваньне, самасьвядомасьць і пачуцьцё прыналежнасьці да нейкай культуры, дзе я адчуваю сябе добра, дзе мне падабаюцца мовы, дзе мне падабаецца каштоўнасьць чалавека. Каштоўнасьць чалавека для мяне вельмі важная. Толькі каб гэта не было абсалютным антрапацэнтрызмам, а каштоўнасьць чалавека як павага да найвышэйшай праявы Боскага тварэньня.

Гэта значыць Эўропа для мяне – вельмі мнагаслаёвае паняцьце, але ў першую чаргу важныя культурны і мэнтальны аспэкты.

### Генадзь Бураўкін

Калі коратка гаварыць, для мяне Эўропа значыць паняцьце дэмакратыі і паняцьце цывілізацыі, якія, як я лічу, падыходзяць для Беларусі. Чаму? Таму што так склалася гістарычна. Мы былі ня толькі геаграфічна, але і духоўна, хоць нам ня надта шанцавала ў гісторыі, ня надта беларусы атрымлівалі магчымасьць выявіць сябе духоўна, поўна, але ўсё-ткі мы былі часткай Эўропы. Я, бясспрэчна, не магу ня ўспомніць, калі гаворка ідзе пра эўрапейскую цывілізацыю, такія постаці, як Скарына, як Гусоўскі. А калі гаворка ідзе пра дэмакратыю, я не магу ня ўспомніць такія постаці, як Каліноўскі і Ўрублеўскі, якія ня толькі былі сынамі свайго часу і той цывілізацыі ў сябе ў Беларусі, але якія засьведчылі нават і фізычна сваю прысутнасьць у эўрапейскіх працэсах. Скарына – тым, што ён быў прызнаны як выдатны дзеяч і ў Італіі, Чэхіі й іншым эўрапейскім сьвеце. А Ўрублеўскі – сваім удзелам у адпаведных рэвалюцыйных падзеях у Францыі, безь якіх традыцыі дэмакратыі, праверанныя і горкім, і слаўным вопытам, ня могуць быць. Гэта я ўзяў толькі дзьве фігуры. А калі азірнуцца на нашу гісторыю і ўспомніць тых сыноў беларускай зямлі, якіх мы падарылі іншым народам і іншым краінам, то для мяне прысутнасьць Беларусі ў Эўропе – бясспрэчная. І тое вельмі цікавае і непаўторнае, што выпрацавала для чалавецтва ў сьвеце Эўропа: і ў сэнсе цывілізацыйным, і ў сэнсе законаў дэмакратыі, – я перш за ўсё зьвязваю зь Беларусьсю.

### Алесь Бяляцкі

Вельмі шмат што значыць. Як бы гэта банальна ні гучала, 90% інфармацыі, якой валодаю на сёньняшні дзень я як асоба: я выхаваўся на пэўных панятках, чытаў шмат рознай літаратуры, маю гістарычныя веды і арыентацыю і г. д. – вось 90% гэтай інфармацыі зьвязана з Эўропай. Гэта датычыць эўрапейскай культуры, эўрапейскай літаратуры, эўрапейскай гісторыі і ўсяго таго, што можна было б

назваць «цывілізаваным сьветам». Усё ж такі больш маладыя «культуры перасяленцаў» (амэрыканская, канадзкая, аўстралійская), якія маюць эўрапейскі пачатак, яны для нас зразумелыя, але гэта больш простыя варыянты, схемы, «калькі» сапраўднага разьвіцьця. Чым адрозьніваецца той хлеб, які пякуць у печцы, і той, які пякуць на хлебакамбінатах? Вось прыкладна так можна параўнаць эўрапейскі культурны абсяг і амэрыканскі культурны абсяг.

### Аляксандар Вайтовіч

Эўропа для мяне – гэта калыска цывілізацыі, элінскай, а затым хрысьціянскай, да якой належаць і мае продкі і я. Гуманітарныя каштоўнасьці сучаснай Эўропы – працяг і разьвіцьцё каштоўнасьцяў гэтай нашай агульнай цывілізацыі.

### Андрэй Вардамацкі

Эўропа – гэта сьвет узаемнай мудрай цярпімасьці. Тая талерантнасьць, пра якую гаворыцца ў дачыненьні да беларускага нацыянальнага характару, – гэта на самай справе характарыстыка эўрапейскіх каштоўнасьцяў. Правыя і левыя, кансэрватары і лібэралы, прадстаўнікі самых разнастайных плыняў як на агульнафілязофскім узроўні, так і на ўзроўні чыста палітычным мірна суседзяць адзін з адным, ужываюцца і ламаюць коп'і толькі на ўзроўні аргумэнтацыі, на ўзроўні дыскусіяў і спрэчак. Нікому ў галаву не прыходзіць арыштоўваць чалавека за тое, што ў яго іншыя погляды, або характарызаваць яго ў тэрмінах «адмарозак» і да т. п.

Але гэты плюс цягне за сабой і мінус, які цяпер пачаў відавочна праяўляцца. І гэта адлюстроўваецца ў тым, што працэс прыняцьця рашэньняў у Эўропе неадэкватны тэмпу сучаснага жыцьця. Усе гэтыя ўзгадненьні, якія адбываюцца ў 25 эўрапейскіх краінах, – гэта нешта неадпаведнае рэальнаму мэнэджмэнту. Усякая станоўчая рыса мае і мінусы.

Я ня буду казаць трывіяльных рэчаў з нагоды таго, што гэта культура «старэйшая», за «маладую», «падлеткавую» паўночнаамэрыканскую. Хоць і гэтая падлеткавасьць мае плюсы.

## Вінцук Вячорка

Найперш скажу, чаго для мяне Эўропа ня значыць. Ня значыць «эўрапейскай ідэнтычнасьці» як самадастатковай. Эўрапейская тоеснасьць праяўляецца толькі ў тоеснасьцях нацыянальных. А што значыць? Эўропа ёсьць тым, што можа ўспрымацца мэнтальна й культурна як «сваё» (у сэнсе – не-экзотыка).

## Павал Данейка

Хрысьціянства, рацыяналізм, дыялёг. Мабыць, гэтыя тры характарыстыкі.

## Андрэй Дынько

Для мяне гэта бацькаўшчына. Мой бацька нарадзіўся на левым беразе Бугу, які цяпер знаходзіцца ў Эўразьвязе, у Польшчы. А маці нарадзілася на правым беразе Бугу. Абое яны нарадзіліся за 10 км ад Берасьця. Але сёньня, каб патрапіць на бацькаўшчыну, мне трэба браць польскую візу. Гэтая мяжа, праведзеная Сталіным па Бугу, амаль ніколі ў гісторыі не існавала. Гэтая сталінская мяжа выклікала масавыя перасяленьні. Мой дзед, бацька былі вымушаныя выехаць адтуль – праваслаўныя рэпатрыяваліся ў Беларусь, тады як каталікі – у Польшчу. І толькі ў 1990-х гадах мы змаглі туды трапіць, пабачыць тую мясьціну, дзе бацька вырас.

Я рос пад расказы бацькоў, маёй бабулі пра рэчку Буг. Буг для мяне – гэта нейкая містычная рака, якую я ніколі ня бачыў, бо яна была адгароджаная калючым дротам савецкай мяжы, і нам не было як да яе падысьці. Я веру, што настане дзень, калі калючыя драты, якія стаяць на гэтай сталінскай мяжы паміж Беларусьсю і Польшчай, будуць зьнятыя.

Я родам з культурнага пагранічча, ад таго Эўропа для мяне – паняцьце ня так геаграфічнае, як духоўнае.

Эўрапейская ідэя для мяне – гэта перадусім ідэя салідарнасьці. Ідэя салідарнасьці розных нацый, розных людзей, якія падзяляюць супольныя вартасьці.

Ня толькі супольныя эканамічныя ці палітычныя інтарэсы, але – вартасьці. Таму Эўропа для мяне – гэта вартасьць.

### Сьвятлана Калінкіна

Я лічу Беларусь эўрапейскай краінай – і геаграфічна, і гістарычна. Таму Эўропа для мяне – вялікая радзіма, а Беларусь – малая радзіма.

### Сяргей Калякін

Для мяне гэта вельмі шматграннае паняцьце. Эўропа – гэта і кантынэнт, Эўропа – гэта сёньня і адно з найбуйнейшых дзяржаўных аб'яднаньняў (калі мы гаворым пра Эўрасаюз), Эўропа – гэта і асноўны цэнтар праблемаў у гісторыі чалавецтва. З другога боку, гэта і ўзор шмат у якіх галінах грамадзкага, дзяржаўнага, эканамічнага жыцьця.

### Кася Камоцкая

У першую чаргу, гэта культурны панятак, культурна-сацыяльнага пляну. Я была ў Англіі – яна канкрэтна адрозьніваецца ад астатняй Эўропы. Вось што дзіўна! Эўропа – гэта нейкая культурная супольнасьць.

Цяпер, калі размытыя межы паміж усімі краінамі, адкрытыя межы, канечне, Эўропа не геаграфічны панятак. Я ня згодная, што Эўропа канчаецца Ўральскімі гарамі. Як па мне, яна канчаецца раней – на ўсходняй беларускай мяжы.

### Сяргей Касьцян

Для мяне Эўропа – паняцьце геаграфічнае, бо калі гаварыць аб культуры, гісторыі Эўропы цалкам, то трэба заўважыць: Эўропа не аднолькавая. Эўропа паўднёвая (з Балканамі), Эўропа заходняя, Эўропа паўночная і Эўропа ўсходняя – гэта розныя культуры, розныя гісторыі, розныя традыцыі і звычаі. Пагэтаму казаць аб нейкай адзінай эўрапейскай цывілізацыі – гэта значыць паказаць сваю

неадукаванасьць. Падкрэсьліваць такое аб'яднанае паняцьце, як эўрапейская цывілізацыя, – гэта значыць абразіць шматлікія эўрапейскія народы. Пагэтаму для мяне Эўропа – гэта канглямэрат розных культураў, розных гісторыяў, моваў, звычаяў і парадкаў.

### Вячаслаў Кебіч

Перш за ўсё для мяне Эўропа – гэта мая родная краіна, мая радзіма Беларусь. Яе ніяк не аддзяліць ад Эўропы, і таму для мяне Эўропа перш за ўсё там, дзе я жыву. Я памятаю, калі я быў у Швайцарыі на форуме ў Кран-Мантана, дзе зьбіраюцца розныя палітыкі, бізнэсмэны (хоць гэта сустрэча, якая ні да чога не абавязвае, дзе проста абменьваюцца думкамі), тады я, выступаючы з 15-хвілінным дакладам, сказаў: годзе дзяліць Эўропу на ўсходнюю і заходнюю. Ёсьць адна Эўропа, ніхто ж ня дзеліць Азію на ўсходнюю, заходнюю і г. д. Ёсьць адзіны мацярык, адзіная прастора, якую ня трэба дзяліць на паўднёвую, усходнюю, паўночную і г. д. Тады гэтыя мае прапановы ў цэлым знаходзілі разуменьне сярод многіх палітыкаў, у тым ліку і сярод палітыкаў (калі трактаваць па-іхнаму) чыста Заходняй Эўропы.

Гэта адзіная эканамічная прастора, я б нават так сказаў. Людзі, паміж якімі даўным-даўно склаліся дачыненьні, – няважна, француз ты, ці расеец, ці беларус, украінец. Гэта даўно ўтвораная супольнасьць людзей, я б так сказаў. Ня расавая, а супольнасьць людзей, заснаваная на іх сувязях адзін з адным.

### Жанна Літвіна

Адказваючы на гэтае пытаньне, можна было б гаварыць і пра абсалютна іншы ўзровень эўрапейскай палітыкі, можна гаварыць пра эўрапейскія каштоўнасьці й г. д. Але асабіста для мяне ў першую чаргу гэта грамадзтва, у якім адсутнічае шалёнае, неразумнае, амаральнае прапагандысцкае абалваньваньне насельніцтва і грамадзкай сьвядомасьці. Для мяне прыкмета цывілізаванасьці, эўрапейскасьці – у першую чаргу ў гэтым: чалавеку не навязваюць стэрэатыпаў, чалавека не заганяюць у нейкую безвыходную сытуацыю, не навязваюць яму ні ладу жыцьця, ні ладу думак.

У нашай краіне больш за ўсё раздражняе прысутнасьць вось гэтай беспрынцыповай прапагандысцкай машыны, якая навязвае чалавеку мысьленьне.

### Анатоль Лябедзька

Доўгі час на нашых прапарах быў лёзунг «Беларусь у Эўропу!». Я думаю, што прыйшоў час зрабіць невялікую карэкцыю: сутнасна больш правільна будзе сфармуляваць яго так: «Эўропу ў Беларусь!». Гэта азначае, што першым крокам для Беларусі як краіны мусіць быць прышчэпліваньне эўрапейскіх каштоўнасьцяў да беларускага дрэва, якое і так знаходзіцца на эўрапейскім кантынэнце. Мы не павінны нікуды ісьці, мы павінны заставацца тут, на гэтай зямлі, геаграфічна – у самым цэнтры Эўропы.

Для мяне Эўропа – гэта ў першую чаргу якраз эўрапейскія каштоўнасьці. І калі мы гаворым пра пэрспэктыву інтэграцыі, уступленьне Беларусі ў Эўрапейскі Зьвяз, то мой погляд, мая пазыцыя трошку адрозьніваюцца ад клясычнай. Калі мы сустракаемся з эўрапейскімі палітыкамі ў Брусэлі і Страсбуры, то мы просім іх: згадваем гісторыю, кажам, што мы эўрапейцы, што мы эўрапейская нацыя... Усё гэта правільна, але сёньняшнія рэаліі патрабуюць ад нас іншага падыходу і іншай пастаноўкі пытаньня пэрспэктывы інтэграцыі Беларусі ў Эўрапейскі Зьвяз. Прасіць – гэта пазыцыя слабога! Мы павінны самі зрабіць нешта рэальнае для таго, каб увайсьці ў Эўразьвяз. Эўрапейскія каштоўнасьці, якія прыйдуць у Беларусь, – гэта першы крок да інтэграцыі ў Эўрапейскі Зьвяз.

Другі крок (які таксама залежыць ад нас! Не ад эўрапейцаў, не ад чыноўнікаў у Брусэлі, Страсбуры ці ў якой іншай краіне!) – гэта эўрапейскія стандарты. Калі ў нас будуць эўрапейскія каштоўнасьці – гэта значыць, што ў нас будзе права выбару, што ў нас будзе прынцып падзелу ўладаў, што мы будзем выбіраць прэзыдэнта і дэпутатаў, а не прызначаць іх. Плюс стандарты ў эканамічнай сфэры, у паўсядзённым нашым жыцьці...

Калі мы зробім два гэтыя крокі, то мы прыедзем у Брусэль – і ня будзем прасіць! Мы ня будзем стаяць там у сенцах і навязваць сябе, нібы для нас трэба зрабіць нейкія паблажкі. Мы будзем гаварыць: «Мы эўрапейцы! У нас эўрапейская гісторыя. І першая пісаная Канстытуцыя, яна зьявілася тут, на гэтай зямлі».

У нас ёсьць шмат прыкладаў у розных сфэрах, якія даказваюць нашу прыналежнасьць да эўрапейскай цывілізацыі. Але гэта ўсё ў мінулым. Нешта павінны зрабіць мы самі, сёньняшняе пакаленьне. І калі мы гаворым, што ў нас ёсьць эўрапейскія каштоўнасьці, якія можна, прыехаўшы ў Беларусь, пабачыць, што мы падыходзім да эўрапейскіх стандартаў, тады ў нас будзе зусім іншы фармат для перамоваў. Мы проста скажам усім: «Прабачце, вось рашэньні, якія прымаліся Эўрапейскім Зьвязам, – капэнгагенскія крытэрыі. І мы адпавядаем гэтым капэнгагенскім крытэрыям! Мы ня просім – мы проста гаворым, што мы адпавядаем ім. Як эўрапейская нацыя, з эўрапейскімі каранямі, мы мусім быць у гэтай структуры».

Вось такое маё бачаньне і пэрспэктываў узаемадачыненьняў з Эўрапейскім Зьвязам, і таго, чым Эўропа ёсьць для мяне. Перш за ўсё, гэта каштоўнасьці, стандарты і супольнае вырашэньне ўсіх праблемаў, пачынаючы ад палітычных, бясьпекі, эканамічных і г. д.

### Васіль Лявонаў

Гэта мой край, зямля маіх дзядоў і бацькоў, «мой родны кут».

### Алег Манаеў

Я ўкладваю ў гэтае паняцьце і геаграфічны сэнс, і культурны. Геаграфічна – гэта кантынэнт, на якім мы жывем і ў цэнтры якога знаходзіцца Беларусь. Многія кантынэнтальныя асаблівасьці таксама важныя: ляндшафт, клімат і інш. Але перш за ўсё, вядома, Эўропа – паняцьце культурнае, г. зн. гэта сыстэма пэўных каштоўнасьцяў, якая ўзьнікла і пачала фармавацца ў антычны час. Гэта тая сыстэма каштоўнасьцяў, на якой сёньня грунтуецца ўвесь заходні сьвет.

### Аляксандар Мілінкевіч

Ёсьць малая радзіма, ёсьць проста радзіма, а Эўропа, пэўна, – мая вялікая Радзіма. Я сябе адчуваю эўрапейцам, гэта калыска культуры, у рэчышчы якой

разьвівалася Беларусь. Для мяне гэта кантынэнт, перш за ўсё, вялікай цывілізацыйнай спадчыны. Беларусь чакае час вялікага вяртаньня туды, адкуль мы родам.

### Анатоль Міхайлаў

Апроч таго, што Эўропа зьяўляецца геаграфічным кантынэнтам, існуе не заўсёды намі самімі ўсьвядомленае ўяўленьне пра спэцыфічнае гісторыка-культурнае і інтэлектуальнае разьвіцьцё Эўропы, пра яго адрозьненьне ад іншых цывілізацыяў. Зразумела, сама магчымасьць ідэнтыфікацыі сябе як эўрапейца зусім не заключаецца ў прыпісваньні сабе наяўнасьці нейкіх пэўных якасьцяў. На працягу многіх стагодзьдзяў на эўрапейскім кантынэнце існавалі пэўныя спосабы трансьляцыі ад пакаленьня да пакаленьня каштоўнасьцяў эўрапейскай культуры. Разам з тым, XX стагодзьдзе прадэманстравала беспрэцэдэнтны паводле свайго характару радыкалізм пераацэнкі ўсяго таго, што на працягу больш як дзьвюх тысячаў гадоў фармавала сэнсавае поле эўрапейскай прасторы. У выніку, у цяперашні час шмат што істотна ўскладнілася для тых, хто, як мы, імкнецца асэнсаваць зьмест таго, што яшчэ ня так даўно валодала для ўспрымаючай сьвядомасьці вітальнай сілай.

### Алесь Міхалевіч

Эўропа для мяне значыць пэўны агульнакультурніцкі падмурак, які абʼядноўвае розныя народы, што насяляюць абшар, больш-менш блізкі да геаграфічнай Эўропы. Для мяне гэта паняцьце ў большай ступені каштоўнаснае, культурнае і ў меншай ступені – геаграфічнае.

### Тацяна Процька

Для мяне асабіста Эўропа – музэй, у якім назапашана ўся тая выдатная спадчына чалавецтва, якую яно мае за ўвесь час свайго цывілізаванага разьвіцьця. Эўропа – выдатны паказчык таго, што можа дасягнуць чалавецтва,

калі яно разьвіваецца паводле пэўных прынцыпаў: законнасьці, дэмакратыі і правоў чалавека.

Эўропа – гэта таксама і месца, дзе была сфармуляваная і дзе рэалізуецца новая сыстэма чалавечых каштоўнасьцяў. Гэта месца, дзе жывуць так, як мне б хацелася жыць.

### Андрэй Саньнікаў

Перш за ўсё Эўропа для мяне – гэта культура, гісторыя, традыцыі, якія знайшлі і знаходзяць увасабленьне ў архітэктуры, музыцы, музэях. Там матэрыяльна можна адчуць, што гэта сапраўды нешта даволі выразнае, своеасаблівае, што адрозьніваецца ня толькі геаграфічна, але і перш за ўсё культурна, цывілізацыйна ад іншых: ад Азіі, Паўночнай Амэрыкі, Лацінскай Амэрыкі.

### Уладзімер Улаховіч

Частка супольнай жыцьцёвай прасторы. Ідэя агульнаэўрапейскага дому, хоць і гучыць сёньня зацёрта, а не рамантычна, як у 1989 годзе, – вельмі дакладная з пункту гледжаньня агульных намераў, жаданьняў і пэрспэктываў.

### Валеры Фралоў

Эўропа – гэта частка мацерыка, дзе разьмешчаны краіны Заходняй і (цяпер) Усходняй Эўропы, якія, аб’яднаўшыся цяпер у Эўрасаюз і расшырыўшы яго, кіруюцца пэўнымі падыходамі (нярэдка прынятымі сумесна), што дазваляюць гэтым краінам існаваць досыць бязьбедна, сур’ёзна разьвіваць эканоміку і дзякуючы ёй забясьпечваць вельмі высокія сацыяльныя стандарты. Гэта частка мацерыка (я гавару пра Заходнюю і Ўсходнюю Эўропу), дзе дзякуючы шматгадовай барацьбе людзей (у тым ліку і за свае правы) сапраўды зрабіліся нормай дэмакратыя, агульначалавечыя каштоўнасьці (у нас іх часам клянуць і называюць інакш).

Але, на жаль, на мой погляд, Эўропа страціла дынаміку ў сваім разьвіцьці. Некалі Маякоўскі гаварыў: «Капіталізм быў добрым хлапчынам, пакуль не баяўся

зашмальцаваць сваёй кашулі». Вось і цяпер пэўная частка Эўропы спачывае на ляўрах, а «чорную работу» выконваюць прышэльцы, неэўрапейцы. І гэта стварае пэўную напружанасьць у гэтых краінах. Хоць, на мой погляд, калі параўноўваць ЗША і Эўропу, то Эўропа больш дэмакратычная, больш блізкая нам, і ўсе праявы дэмакратыі там намнога мякчэйшыя, чым у тых жа Злучаных Штатах, якія цяпер заўзята намагаюцца дапамагчы нават тым, хто ня хоча рабіцца дэмакратычнай краінай. У нас таксама камуністы хацелі ўсіх за вушы прыцягнуць адразу ў камунізм. Калі чалавек не сасьпеў, навошта яго некуды цягнуць? І вось так адрывалі вушы, а часам і галаву разам з вушамі, і зьнікалі людзі. Мабыць, усё-такі ЗША прымаюць занадта жорсткія меры (Эўропа ў гэтых адносінах усё-такі мякчэйшая), каб усіх зацягнуць ва ўлоньне дэмакратыі і свабоды слова, стварыць грамадзянскую супольнасьць.

Хацелася б, вядома, каб і ў Азіі былі дэмакратычныя дзяржавы, але, напэўна, мэтады пры гэтым усё-такі павінны быць куды мякчэйшыя. Нельга, напрыклад, чалавека зь першай клясы перасадзіць адразу ў восьмую, і каб ён камфортна там сябе адчуваў. Якія мэтады для гэтага? Напэўна, патрэбны дыялёг. Напэўна, патрэбная нейкая дапамога. Напэўна, можна ў нейкай ступені праяўляць і сваю сілу, але гэта настолькі тонкае і далікатнае пытаньне... Мне здаецца, далікатнасьці Злучаным Штатам і не стае.

### Станіслаў Шушкевіч

Эўропа – гэта пэўны тып цывілізацыі. Яна, дарэчы, не аднолькавая ўсюды, таму што яна ўтварылася з шэрагу культураў. Але ўрэшце стала агульнай культурай. Да нядаўняга часу я думаў, што яна базуецца на хрысьціянскіх вартасьцях, але цяпер я бачу, што гэта больш шырокае паняцьце.

Тая Эўропа, якую я ведаў з кніжак, яна даволі моцна адрозьніваецца ад той Эўропы, якую я ўбачыў на ўласныя вочы. Так што гэта тып цывілізацыі, якая ў значнай ступені навязала сябе ўсяму сьвету.

## Усевалад Янчэўскі

Эўропа... Эўропа належыць да шматзначных паняцьцяў. Ёсьць такія словы ў нашай мове, у якія кожны ўкладвае сэнс паводле сваёй волі. Іншымі словамі, хто як хоча, так і разумее.

Шмат хто, калі кажа «Эўропа», мае на ўвазе перш за ўсё Заходнюю і Цэнтральную Эўропу, гэта значыць краіны, якія сфармаваліся ў каталіцкай і пратэстанцкай традыцыі.

Расейцаў, напрыклад, такое азначэньне бянтэжыць. Ім даспадобы называць сябе эўрапейцамі і ўсюды ўрачыста абвяшчаць: «Расея – гэта Эўропа». У Беларусі таксама нямала людзей, якія пакрыўдзяцца, калі сказаць ім, што яны не эўрапейцы (а калі такое заявіць украінцу, дык ён увогуле адмовіцца мець з вамі справу).

Скажу адразу, мне асабіста бліжэйшае вузкае азначэньне Эўропы.

Вядома, можна без канца даводзіць самім сабе, што «мы эўрапейцы», «у нас усё мусіць быць па-эўрапейску» і г. д.

Але нас выдае... наша ўласнае маўленьне. Зьвярніце ўвагу. Калі мы едзем у Аўстрыю (Галяндыю, Данію, Гішпанію), дык кажам: «Еду ў Эўропу». А вось, напрыклад, француз, выпраўляючыся ў Германію, ніколі ня скажа: «Я еду ў Эўропу». Такіх цікавых моўных агаворак можна прывесьці вельмі багата.

Гэта значыць, нават на ўзроўні мовы мы падсьвядома ПРОЦІПАСТАЎЛЯЕМ сябе Эўропе. А мова, лінгвістыка – вельмі дакладныя і вельмі чуйныя рэчы. Яны часта выдаюць тое, у чым мы самі сабе ня можам (ці ня хочам) прызнацца.

## 2. Ці зьяўляецца Беларусь (такая, якой яна ёсьць сёньня) часткай Эўропы? Быць можа, ёй толькі належыць ёю стаць? Што варта зрабіць у гэтым кірунку ў Беларусі?

**Вольга Абрамава**

Гледзячы ў якіх крытэрах ацэньваць. Калі ацэньваць паводле геаграфічнага – вядома, зьяўляецца. Калі вы будзеце ацэньваць паводле старадаўняй гісторыі і таго ўнёску, які зрабіла Беларусь, – дык, безумоўна, зьяўляецца. Калі разглядаць з пункту гледжаньня эўрабюракратыі, то не, не зьяўляецца. Калі з пункту гледжаньня даміноўнай грамадзкай думкі, якая сфармаваная ў эўрапейскіх краінах, то, безумоўна, не зьяўляецца. Я думаю, ня ўсё так трагічна, як бачыць адзін бок, і ня ўсё так цудоўна, як бачыць другі. Я заўсёды кажу так (асабліва калі кантактую з заходнімі партнэрамі): паспрабуйце ўявіць краіну, у якой ня ўсё так добра, як пішуць дзяржаўныя газэты, і ня ўсё так дрэнна, як пішуць недзяржаўныя, – і вы атрымаеце той вынік, які ёсьць. Гэты рух ня статыка, а дынаміка, наперакор таму, што гавораць пра застой!

Паспрабуйце ўжыць такую сыстэму каардынатаў. Я не скажу, што яна мая сыстэма каардынатаў, але яна мае права на існаваньне. Праўды не бывае адной. У мяне філязофская адукацыя, і гэта дазваляе мне ўспрымаць шмат якія рэчы больш стрымана, чым успрымаюць людзі, якія хацелі б атрымаць усё адразу і цяпер – і ў палітыцы, і ў эканоміцы. Калі перафразаваць вядомага клясычнага героя, дык я скажу так: я згодная ўзяць часткамі.

## Сьвятлана Алексіевіч

Гэта яшчэ не Эўропа, гэта дэфармаваная постсавецкая прастора з масай розных праблемаў. Ідэі пра тое, якой мае быць гэтая прастора, эўрапейскія ідэі, сфармуляваныя невялікай часткай інтэлігенцыі, але яны не адчутыя да канца народам.

Мы яшчэ вельмі разгрупаваная нацыя. Я напалавіну ўкраінка. І калі я бываю ва ўкраінскім сяле, то я адчуваю, што гэта ўсё ж вельмі цэльная нацыя, адзіная. А ў нас ва ўсходняй частцы ў вёсцы больш адчуваецца Расея, у заходняй – Польшча...

Мы яшчэ нават не пачалі ісьці ў бок Эўропы – мы ўсё яшчэ топчамся ў старым сацыялістычным часе. Магчыма, гэта ня так і дрэнна, таму што мы ня трапілі ў найдзічэйшы капіталізм, да якога прыйшла Расея.

## Яўген Бабосаў

Беларусь і геаграфічна, і геапалітычна, і ў цывілізацыйным сэнсе, і ў культурным зьяўляецца часткай Эўропы. Дарэчы, ня самая ўскраіна, як некаторыя лічаць. І ніякая ня «чорная дзірка», як некаторыя гавораць. Беларусь – гэта Беларусь! Гэта нармальная краіна, якая мае сталыя традыцыі, якая мае сваю нацыянальную культуру, якая мае свае базавыя беларускія каштоўнасьці: талерантнасьць, добрасумленнасьць, добразычлівасьць, памяркоўнасьць, працавітасьць. Гэта каштоўнасьці народу, які захоўваў сваю незалежнасьць ад усялякіх нашэсьцяў і далучэньняў да Польшчы, Літвы ці Расеі. Вось гэтыя беларускія каштоўнасьці, традыцыйныя, якія ідуць з часу Эўфрасіньні Полацкай і Кірылы Тураўскага, робяць Беларусь Беларусьсю, апрача таго, што яна геаграфічна належыць да Эўропы. Таму што і Эўфрасіньня Полацкая, і Кірыла Тураўскі – асобы эўрапейскага ўзроўню. Я ўжо не гавару пра Вялікае Княства Літоўскае, пра Статут, які быў напісаны на беларускай мове. Гэта тое, што цэмэнтавала ў духоўным сэнсе Эўропу. І ў варыянце Эўфрасіньні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Літоўскага статуту і Полацкага княства – гэта якраз узровень X–XI стагодзьдзяў, калі Беларусь была Беларусьсю, і была ў Эўропе, і адыгрывала зусім не апошнюю

ролю. Я ня думаю, што яна моцна саступала Германіі, якая была моцна раздробленая. Ня думаю, што яна саступала Францыі. Можа, у Францыі была трохі іншая культура, але ў той час усё было нармальна.

Іншая рэч, што Беларусь апынулася спачатку пад уладай Польшчы, потым Расеі, і тут была нейкая пагарда да беларускай мовы, беларускай нацыянальнай культуры, тут не было ўнівэрсытэтаў, апроч Віленскага. У гэтым сэнсе Беларусь пацярпела. Але не таму, што яна не хацела, – проста не было сацыяльна-эканамічных умоваў для таго, каб Беларусь стварала ўнівэрсытэт накшталт Сарбоны ці ангельскага Кембрыджу. А Францыск Скарына? А Сымон Будны? Гэта ж людзі эўрапейскага ўзроўню!

Значыць, Беларусь была, будзе і застаецца Эўропай! І нікуды ёй не падзецца з Эўропы. І нікуды яна не павінна дзявацца.

Наконт усходніх межаў Эўропы па граніцы Эўрасаюзу гавораць члены Эўрасаюзу. Але справа ў тым, што Эўрасаюз мае тэндэнцыю разьвівацца. І калі Расея ўступіць у Эўрасаюз, дык і Беларусь рана ці позна туды ўступіць. Куды ж яна дзенецца? Калі Ўкраіна будзе, дапусьцім, і Расея, і Літва, і Латвія, і Эстонія, і Польшча, куды Беларусь падзенецца? Нікуды не падзенецца, яна будзе часткай Эўрасаюзу.

Яна звычайная эўрапейская краіна, ня горшая за іншых. Я шмат у якіх краінах быў, у эўрапейскіх – амаль ва ўсіх. Беларусь нічым не саступае ні Славеніі, ні Славакіі, ні Чэхіі... Такім буйным, як Германія ці Францыя, – можа быць. А такім, дзе прыкладна дзесяць мільёнаў насельніцтва, – нічым. Абсалютна! У некаторых адносінах, можа, нават лепшая! Ёй ні ў якую Эўропу лезьці ня трэба. Яна – у Эўропе! Некаторым эўрапейскім краінам, накшталт Вугоршчыны, накшталт Баўгарыі, яшчэ вучыцца і вучыцца ў нас. Я ведаю гэтыя краіны ў сэнсе культурным, у сэнсе цывілізацыйным, у сэнсе навукі, у сэнсе звычайных штодзённых паводзінаў. Цяпер паказваюць паводку ў Румыніі – як яны жывуць?! У нас так жылі дваццаць гадоў таму ці пятнаццаць, калі быў развал...

Што трэба рабіць Беларусі? Ёй трэба заставацца сабой, разьвіваць свае нацыянальныя традыцыі, даць шырокую прастору беларускай мове (большую, чым у нас цяпер ёсьць!), большую – нацыянальнай культуры, такім велічыням, як Быкаў, да якога ў нас па-ўсякаму ставяцца, той самы Рыгор Барадулін, якога

я выдатна ведаю (мы зь ім на «ты» даўно, вучыліся разам, на цаліну езьдзілі). Вось такіх людзей трэба падтрымліваць і падтрымліваць усімі сіламі. І ствараць умовы, каб прыток маладых быў. Прытоку маладых вось такога ўзроўню я пакуль ня бачу, на жаль. Што трэба рабіць Беларусі? Рабіць так, каб таленавітыя маладыя людзі не зьяжджалі ў Эўропу – тую, Заходнюю, – а заставаліся тут і служылі свайму народу.

## Анжаліка Борыс

У нейкім сэнсе часткай Эўропы зьяўляюцца нават ЗША ці, напрыклад, Аўстралія. Гэта значыць тэрыторыі, што былі калянізаваныя эўрапейцамі і прынялі за аснову сваёй ідэнтычнасьці эўрапейскую сыстэму каштоўнасьцяў. Беларусь як супольнасьць людзей, што лічаць сябе нашчадкамі жыхароў, напрыклад, Вялікага Княства Літоўскага, безумоўна зьяўляецца часткай Эўропы. Калі ж лічыць, што сапраўдная гісторыя Беларусі пачалася толькі пасьля (і дзякуючы) бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 году, то прыналежнасьць да Эўропы выглядае ўжо больш сумнеўна. У гэтым выпадку Беларусь хутчэй можна вызначыць як ацалелы абломак экспэрымэнту ў стварэньні супольнасьці савецкіх людзей. Каб не зрабіцца, але застацца часткай Эўропы, беларускаму грамадзтву варта зноў усьвядоміць, што яно Эўропы не пакідала. Інакш кажучы – адмовіцца ад савецкай самаідэнтыфікацыі.

## Ірына Бугрова

Складанае пытаньне. Калі разумець Эўропу ў першую чаргу як самаідэнтыфікацыю, як разуменьне «я належу да гэтай тэрыторыі», то я не магу сказаць, што ў беларусаў існуе выразная эўрапейская ідэнтычнасьць, выразнае ўсьведамленьне: я эўрапеец. Вы калі-небудзь чулі, каб беларус сказаў: «Я эўрапеец»? Вельмі рэдка. А ад іншых народаў можна гэта чуць, яны гавораць: «Мы эўрапейцы, і таму...» Ёсьць вядомыя дасьледаваньні «Эўрабаромэтру», дзе жыхароў розных дзяржаваў параўноўваюць, у каго большы ўзровень ідэнтычнасьці: скажам, італьянцы – большыя эўрапейцы, чым французы. Існуе чатыры шкалы вымярэньня,

«Эўрабаромэтар» у гэтых адносінах вельмі добры спэцыфічны інструмэнт, які можа зьмерыць дынаміку руху людзей да большай эўрапейскай ідэнтычнасьці, ці да новай хвалі нацыяналізму, ці да кансалідацыі ўнутры дзяржавы, унутры нацыі.

Мне здаецца, у Беларусі цяпер вельмі складаны пэрыяд. Ён і пачаўся ж вельмі складана... Наагул, ідэнтычнасьць беларусаў – вельмі складаны працэс. З 1995 году яна нашмат больш супярэчлівая і зь вельмі значнымі нэгатыўнымі момантамі – нават на ўзроўні адсутнасьці ідэнтыфікацыі, на ўзроўні ідэнтыфікацыйнага вакууму. У нас быў час, калі людзі не маглі зразумець, дзе яны жывуць: гаворка ішла пра саюз Расеі і Беларусі, у мінулым у іх быў Саюз ССР, наперадзе ў іх – як бы няма Беларусі, але яна ўсё-такі ёсьць, таму што прымушаюць падпарадкоўвацца законам. Да таго ж, разьвіваецца эўрапейскі складнік. Нарэшце, быў праект грамадзянства БНР.

Я помню, быў поўны *irreal house*, маленькая шыза, таму што ідэнтычнасьць была нейкая «завернутая». Таму, вядома, была і палярызацыя, і групы розныя, якія спрабавалі кансалідавацца паводле прыналежнасьці менавіта да гэтых падзелаў.

Мне сёньня цяжка сказаць, наколькі Беларусь пераадолела гэтыя лініі, наколькі выраўнаваўся працэс, ці ідзе кансалідацыя ўнутры дзяржавы на ўзроўні нацыі (гэта значыць, спачатку дзяржаўная ідэнтычнасьць, потым нацыянальная). Але гэты працэс ёсьць, прычым ён выразны. Нейкія лініі нацыянальнай ідэнтычнасьці вызначаюцца.

І вось тут ужо, мы бачым, адбываецца ідэнтыфікацыя Беларусі дзяржавы, якая будзе вызначацца: ці яна больш эўрапейская, ці прарасейская. Куды больш цікавыя і выразныя пазыцыі!

У гэтым пляне я магу сказаць, што няма сёньня відавочнага адказу, які мы б адчулі адзіна праўдзівым. Беларусь, безумоўна, да Эўропы належыць. Але ў тым выглядзе, у якім яна цяпер ёсьць, яе прыналежнасьць падаецца, як казаў Эрыксан, супярэчлівай. Гэта як дуэль. Мы належым да Эўропы, але мы там не сядзім. Мы хочам быць эўрапейцамі, але нас не пускаюць. Нейкія нашыя правы ці гатоўнасьць узяць на сябе адказнасьць за тое, што ёсьць... Таму я, хутчэй за ўсё, падзяліла б насельніцтва Беларусі на нейкія групы, якія больш гатовыя

ўспрымаць сябе эўрапейцамі, і групы, якія ня тое каб цягнуліся да саюзу Расеі зь Беларусьсю, а проста – не гатовыя. Для іх ня важная гэтая ідэнтычнасьць, для іх важная іншая. Для іх не прыярытэтная нацыянальная ідэнтычнасьць ці эўрапейская. Гэтыя людзі здавольваюцца тым, што яны, скажам, магілёўскія, віцебскія ці нават полацкія. Гэта зямляцкія варыянты лякальнай ідэнтычнасьці. Я дасьледавала вялікі масіў матэрыялаў на гэтую тэму: у людзей лякальная ідэнтычнасьць была і застаецца важкім элемэнтам.

У сучаснай лякальнай ідэнтычнасьці мы вельмі часта бачым эканамічны элемэнт: рэгіянальны, прасунуты, глябалісцкі. У беларусаў глябалісцкі элемэнт пакуль толькі-толькі зьяўляецца. Яны застаюцца патрыярхальнымі, з патрыярхальнымі вытокамі, каранямі, ранейшай прыналежнасьцю. Дрэнна гэта ці добра? Я ніколі ня стаўлю ні плюсоў, ні мінусаў. Я проста кажу, што гэта натуральны працэс. Для мяне Беларусь як краіна сёньня не гатова нармальна і гарманічна ўвайсьці ў глябальны сьвет. У ёй існуе лякальная ідэнтычнасьць, якую можна характарызаваць як рэгіянальную.

Належым мы Эўропе ці не? Думаю, так. Але ўсё гэта беларускі чалавек адчувае не праз дзяржаўную палітыку, а праз штодзённае жыцьцё. Вось такая сытуацыя!

### Генадзь Бураўкін

Безумоўна, Беларусь ёсьць эўрапейскай. Іншая гаворка, калі мы вылучаем нейкія глыбінныя, глыбокія працэсы – і калі мы маем на ўвазе палітычную, эканамічную і культурную рэальнасьць тут. На жаль, супадзеньня няма. Але тое, што Беларусь – частка Эўропы ці, скажам так, жаданьне быць часткаю Эўропы ў найбольш адукаваным і найбольш дэмакратычным асяродку, адчуваньне сябе часткаю Эўропы, – для мяне бясспрэчна. Калі на тое пайшло, якое ў Беларусі найбольшае веданьне культуры і палітычнай гісторыі? Амэрыканскай? Не. Азіяцкай? Не. Эўрапейскае веданьне! Мы найбольш ведаем тое, што зьвязана з Францыяй, Італіяй, я ўжо не кажу пра блізкіх да нас – Расею, Польшчу. І нас, хоць і недастаткова (гэта вялікая наша бяда. Можа быць, адна з самых сур'ёзных) нас ведаюць у сьвеце, але перш за ўсё ў Эўропе. Паверце мне, нават з майго

невялікага дыпляматычнага досьведу ведаю, што гэта так. Эўропа найбольш мае ўяўленьне. І, калі браць па-глыбіннаму, тое, што адбываецца з намі сёньня, усё-ткі ў Эўропе мы часьцей за ўсё знаходзім разуменьне тых працэсаў, якія ў нас адбываюцца. Хаця палітычна часам Амэрыка здаецца больш гатовая падтрымаць памкненьні нашых дэмакратычных колаў, чым некаторыя эўрапейскія краіны, эўрапейскія дзяржавы. Але я лічу, што і сёньня адчуваньне еднасьці з Эўропай (можа быць, пакуль што схаванае ў глыбінях недзе, не падтрыманае яшчэ афіцыйнымі структурамі, чынавенствам нашым) ёсьць. Ад таго, відаць, і нашы дэмакратычныя колы, дэмакратычныя арганізацыі і дэмакратычныя палітычныя партыі адкрыта зарыентаваныя на Эўропу.

Я б не казаў, што Эўропа канчаецца на мяжы Эўразьвязу. Эўразьвяз – гэта структура. Палітычная, міждзяржаўная структура. А калі я гавару пра Эўропу, для мяне Эўропа – перш за ўсё цывілізацыйная еднасьць. І ў гэтай еднасьці, даволі шырокай (і гэта шчасьце, што яна шырокая, ня вузенькая, бо гэта азначае і большы патэнцыял, большыя магчымасьці), унутры могуць быць розныя працэсы. Успомнім эўрапейскую гісторыю. То Рым выходзіў на першае месца, то Францыя, то вельмі сур'ёзна пра сябе заявіла руская культура. Таму ўнутры гэтай прасторы могуць быць нейкія зьмены. Наша Беларусь, на жаль, можа быць, ня самая прыкметная на гэтай прасторы – яна можа ці то аддаляцца, ці то набліжацца, ці то (ня дай Бог!) зусім на пэрыфэрыі аказвацца.

### Алесь Бяляцкі

Безумоўна! Я абсалютна ў гэтым перакананы: з усімі вывертамі і постсавецкім сьцёбам (інакш гэтую беларускую ўладу цяжка назваць. У нас адбываецца пэўны постсавецкі палітычны сьцёб), я лічу, мы на сёньняшні дзень ёсьць абсалютна арганічнай часткай эўрапейскай культурна-гістарычнай прасторы. У нас ёсьць нейкія адставаньні, нейкія выхады наперад. Як гэта ні дзіўна гучыць, але яны былі: і ў юрыдычнай думцы, і ў думцы культурніцкай (перакладніцкай – Біблія Скарыны)... Я ўжо ня буду казаць пра ролю ў геапалітычных працэсах, якую адыгрывала Вялікае Княства Літоўскае, – гэта ўсё было. Але я ўпэўнены, што гэта ўсё яшчэ наперадзе. На самай справе, яно ёсьць і сёньня, проста з ходу цяжка вызначыць...

Я ня думаў над гэтым: не мая гэта задача – сядзець і шукаць, што ёсьць у Беларусі самага лепшага. Можа быць, у нас самая лепшая гарэлка на сёньняшні дзень, якой больш нідзе няма ў Эўропе, я ня ведаю. Гэта ня ёсьць задачай культуролягаў – сядзець і думаць, чым мы можам пахваліцца на сёньняшні дзень.

Нягледзячы на пэўныя адхіленьні ў гістарычным працэсе, як бы там ні было, гэты кавалак тэрыторыі заўсёды быў у эўрапейскім кантэксьце. І гэта самае дзіўнае! Нават у час камунізму, брэжнявізму і г. д. усё адно асноўная база, асноўная «матрыца», у якой разьвіваўся народ і разьвівалася сытуацыя на гэтых землях, ня моцна адстала ад агульнаэўрапейскай супольнасьці. На сёньняшні дзень дастаткова зьмяніць грамадзка-палітычную сытуацыю ў Беларусі, і я ўпэўнены, што паводле эканамічных фармальных парамэтраў празь пятнаццаць гадоў мы будзем адпавядаць усім эўрапейскім стандартам. У мэнтальных рэчах, у звычках, ува ўзроўні масавай культуры мы, можа быць, трошкі пазьней дагонім: трэба, каб прамінулі два пакаленьні. Але для гісторыі народу, для гісторыі нацыі, для таго, адкуль мы бярэм свой пачатак, гэта – нішто, кропля ў моры.

Таму гэтыя адрозьненьні настолькі малыя, і транспарэнтнасьць, якая існуе на сёньняшні дзень, настолькі сама празь сябе магутная, настолькі шмат «капіляраў», якія «прабіваюць» мяжу паміж Берасьцем і Эўрапейскім Зьвязам, Горадняй і Эўрапейскім Зьвязам, што няма ніякіх шанцаў пабудаваць тут штосьці такое, што пайшло б нейкім іншым шляхам у параўнаньні з тым, якім цяпер ідзе Эўропа.

Наконт геаграфічнага панятку Эўропы, ад якога варта было б адштурхоўвацца. У нас няма такой праблемы, як у краінаў, якія фармальна адносяцца да Эўропы – маю на ўвазе Азэрбайджан, Грузію, Армэнію, – але ў якіх мэнтальных праблемаў значна болей. У першую чаргу гэта тычыцца Азэрбайджану, які ёсьць мусульманскай краінай на 90%. Фактычна, яны адносяцца геаграфічна да эўрапейскай часткі цывілізацыі, але рэальна настолькі моцны ўплыў іхнага турэцка-іранскага «падчарэўя» (і далейшых краінаў: Іраку, Сырыі), што гэты працэс на сёньняшні дзень у іх нявырашаны. У іх яшчэ бліжэйшым аднаму-двум-тром пакаленьням яшчэ трэба будзе вызначацца, якім шляхам яны пойдуць. Для нас такога пытаньня няма. Што мы можам? Нават нягледзячы на самыя неверагодныя ўяўленьні і гіпотэзы пра зьнішчэньне беларускай незалежнасьці, пра інкарпарацыю Беларусі ў Расею і г. д. – у гэтых праектаў гістарычна, паводле лёгікі разьвіцьця

падзеяў, проста няма ніякіх шанцаў, каб яны зьдзейсьніліся і далі нейкі плён. Таму ў нас сытуацыя ў гэтым пляне, я б сказаў, вельмі «льготная» і камфортная ў параўнаньні з тымі краінамі, якія будзе яшчэ дастаткова доўгі час трэсьці.

І ў параўнаньні з Расеяй, урэшце. Прыкладна пару тыдняў таму ў нас была гаворка зь вядомым расейскім праваабаронцам Сяргеем Кавалёвым, які напалову беларус – па бацьку. Бацька яго родам з Рагачоўшчыны, але сам Кавалёў ужо выхаваўся ў расейскай культуры. Аднак ёсьць у яго пэўныя рысы беларускай мэнтальнасьці. Ён казаў так: «Я абсалютна выразна разумею сытуацыю, якая складаецца на сёньняшні дзень у Расеі (Ён меў на ўвазе сытуацыю культурную і сытуацыю эўрапейскай арыентацыі – як яны любяць дзяліць на заходнікаў і славянафілаў. – А. Б.). І тое, чым я займаюся, яно збудзецца – праз сто гадоў. Я ў гэтым абсалютна перакананы». Так сказаў Сяргей Адамавіч Кавалёў.

Калі перафразаваць ягоныя словы, дык тое, дзеля чаго мы працуем, збудзецца не праз сто, а праз дваццаць гадоў. Ну, каб ужо канчаткова гэты працэс «вяртаньня блуднага сына» ў эўрапейскую супольнасьць скончыўся – хай сорак гадоў. Гэта і ёсьць тым тэрмінам, празь які мы здолеем, думаю, усё паставіць на свае месцы.

## Аляксандар Вайтовіч

Эўропа, з аднаго боку, – гэта геаграфічнае паняцьце. З другога ж, несумненна, сёньня яна ўспрымаецца як супольнасьць, заснаваная на агульных каштоўнасьцях. І ў вялікай ступені гэта абумоўлена тым, што цяпер большасьць краінаў Эўропы аб’яднаныя ў Эўрапейскі Саюз. Гэта палітычны і эканамічны саюз, у яго падмурку ляжаць агульныя цывілізацыйныя каштоўнасьці.

На жаль, у цяперашні пэрыяд сваёй гісторыі Беларусь толькі геаграфічна зьяўляецца часткай Эўропы. Існая ўлада ізалюе яе ад агульнага цывілізацыйнага разьвіцьця. І робіцца гэта з той мэтай, каб задаволіць непераадольную прагу дыктатара да пажыцьцёвага кіраваньня краінай. Такая палітыка ўладаў вельмі небясьпечная і шкодная для Беларусі. Яна адмоўна ўплывае на наша эканамічнае разьвіцьцё, тоіць у сабе пагрозу нестабільнасьці, катастрофы і абвалу. Гістарычных прыкладаў-аналёгіяў шмат: Савецкі Саюз, Кітай у пэрыяд «культурнай рэвалюцыі» і інш.

## Андрэй Вардамацкі

Пакуль што пра Беларусь як частку Эўропы можна гаварыць толькі ў чыста геаграфічным сэнсе. Але разам з тым можна ўпэўнена казаць, што эўрапейскі патэнцыял Рэспублікі Беларусь большы, чым у каго-небудзь з нашых суседзяў – былых рэспублік СССР. Ён большы, чым ва Ўкраіны, у пэўным сэнсе, можа, большы, чым у балтыйскіх краінаў. Я маю на ўвазе інфраструктуру, кампактнасьць краіны і, як вынік адсюль, кіраванасьць краіны, я маю на ўвазе ўзровень адукаванасьці, кваліфікаванасьці і таго, што называецца *skills* насельніцтва. Насельніцтва Рэспублікі Беларусь – адно з самых адукаваных, я б сказаў – самае адукаванае на тэрыторыі колішняга Савецкага Саюзу пасьля Масквы і Ленінграду (калі разумець іх як тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі). І гэтаму ёсьць свае аб'ектыўныя прычыны, якія заключаюцца ў тым, што Беларусь была завяршальным зьвяном, зборачным цэхам усесаюзнага канвэеру. А менавіта гэтыя вытворчасьці маюць на ўвазе найбольшы ўзровень кваліфікаванасьці прадукцыйных сілаў, чалавечага рэсурсу.

Магчымыя рэформы ў Рэспубліцы Беларусь адбудуцца вельмі хутка, таму што краіна, як я гаварыў, кампактная, кіраваная. Параўноўваючы з Украінай, можна сказаць: у Беларусі існуе адна, а ня дзьве мэнтальныя краіны, як там. У гэтым сэнсе можна гаварыць пра вельмі вялікі эўрапейскі патэнцыял Беларусі.

Талерантнасьць, якую я назваў як адну з базавых эўрапейскіх каштоўнасьцяў, зьяўляецца і адной з базавых каштоўнасьцяў нацыянальнага беларускага характару. Іншая рэч, што цяпер гэтая талерантнасьць нацыянальнага характару беларусаў знаходзіцца ў стане нейкага свайго іншабыцьця, якое можна ахарактарызаваць словам «канфармізм». Вось такое праяўленьне: талерантнасьць не як цярпімасьць, адкрытасьць да іншых сьветапоглядаў, іншых каштоўнасных структураў, арыентацыяў па палітычных кірунках, арыентацыяў, а талерантнасьць як канфармізм.

## Вінцук Вячорка

Бясспрэчна, Беларусь была, ёсьць і будзе Эўропаю ў абодвух згаданых сэнсах. Гэтаксама як Эўропаю ёсьць Грузія, Мальта, Партугалія, Чарнагорыя

й нават Альбанія (сумысьля называю тых, хто на геаграфічнай мяжы). Таму «ў гэтым кірунку» трэба рашуча спыніць дзяржаўную дээўрапеізацыю Беларусі, якою сыстэмна займаецца цяперашняя ўлада.

### Павал Данейка

Вядома, тут я разглядаю з цывілізацыйных пазыцыяў. У Беларусі ёсьць усе названыя мной характарыстыкі. Гэта хрысьціянская краіна, якая будуе свае паводзіны на грунце рацыяналізму і схільная да дыялёгу.

Некалі «Эўропа» канчалася на граніцы Германіі і Польшчы. Польшча таксама не была «Эўропай» – не ўваходзіла ў Эўрасаюз. Я думаю, гэтае пытаньне было народжана межамі, паводле якіх сябе вызначала Расейская дзяржава. Мне здаецца досыць відавочным, што эўрапейская сьвядомасьць моцна пашырылася: зьмена сытуацыі з расейскімі межамі прымушае па-іншаму глядзець на межы Эўропы. Я б так сказаў, мабыць: для эўрапейцаў мяжа Расеі – гэта і ёсьць заканчэньне Эўропы. Наколькі я разумею, цяпер гэты пункт гледжаньня прымаецца Эўропай. Ідэя супольнай Эўропы ўсё ж дастаткова моцная. І ідзе пошук, дзе ж гэтая агульная Эўропа канчаецца.

### Андрэй Дынько

Сучасная Беларусь адназначна ёсьць часткай Эўропы, хаця і вельмі-вельмі беднай. Беднай, а з другога боку – моцна ўражанай саветызмам, які падставіў пад сумнеў асноватворныя вартасьці Эўропы. Але мэнтальна беларусы застаюцца эўрапейцамі.

### Сьвятлана Калінкіна

Сучасная Беларусь геаграфічна, зразумела, – частка Эўропы. Цяпер мы можам гаварыць адно пра геаграфію, калі мы сьцьверджаем, што Беларусь – эўрапейская краіна.

Калі аналізаваць у цывілізацыйным ракурсе, то зразумела, што мы ў сябе назіраем цяпер нейкае такое азіяцкае кіраваньне і існаваньне грамадзтва. І ў гэтым сэнсе казаць пра эўрапейскую Беларусь вельмі цяжка. Але я думаю, што гэта проста гістарычная недарэчнасьць, і зь цягам часу (празь дзесяць, пяць альбо пяцьдзясят гадоў) усё стане на свае месцы. Мне здаецца, што і нашы людзі (нават тыя, хто сёньня крычыць, што патрэбен саюз і аднаўленьне нават былога Савецкага Саюзу) усё ж такі мысьляць сябе як прадстаўнікі Эўропы.

Каб стаць нармальнай эўрапейскай краінай, Беларусі на самай справе, бракуе шмат чаго. І ў першую чаргу – у кіраваньні. Таму што, як у любой краіне, у Беларусі эліта – гэта максымум 10% усіх жыхароў, а ўсе астатнія – гэта насельніцтва. Таму цяпер мы можам казаць пра тое, што эліта беларуская, кіраўніцтва Беларусі – яно зусім не эўрапейскае. І наагул, гэтая праслойка, эліта грамадзтва, у адрозьненьне ад разьвітых эўрапейскіх краінаў, у нас вельмі-вельмі малая.

## Сяргей Калякін

І так, і не. Мы і зьяўляемся часткай Эўропы, і не зьяўляемся, выпадаем з агульнага кантэксту – на мой погляд, ня толькі эўрапейскага, але і сусьветнага.

Геаграфічна мы, безумоўна, знаходзімся ў самым цэнтры Эўропы – гэта нікім не аспрэчваецца. А вось з пункту гледжаньня цывілізацыйнага разьвіцьця, з пункту гледжаньня таго, што сёньня робіцца ў нашай краіне, – мы па-за Эўропай, безумоўна. Больш за тое, мы ўсё хутчэйшымі тэмпамі ізалюемся ад знадворнага сьвету, і ў тым ліку – ад Эўропы.

Для таго каб наблізіцца да Эўропы, як гэта трывіяльна ні гучала б, мы павінны правесьці палітычныя рэформы ва ўласнай краіне. Мы павінны зрабіць нашу краіну адпаведнай тым стандартам, якія сёньня існуюць у арганізацыі грамадзкага і палітычнага жыцьця, тым абавязаньням, якія ўзяла на сябе Рэспубліка Беларусь у эўрапейскай супольнасьці (у праватнасьці, абавязаньням, якія мы ўзялі, уступаючы ў АБСЭ). Мы павінны былі б прыняць на сябе абавязаньні і выконваць іх у рамках Рады Эўропы. Бо парадокс: Беларусь – адзіная краіна Эўропы, што не ўваходзіць на сёньняшні дзень у Раду Эўропы! Усе астатнія эўрапейскія краіны, уключаючы і Расею, якая зьяўляецца краінай эўразійскай, знаходзяцца ў Радзе

Эўропы. Мы адзіная краіна, якая не ўваходзіць туды, таму што мы не адпавядаем стандартам, якія сёньня прынятыя ў аб'яднанай Эўропе.

### Кася Камоцкая

Безумоўна, сёньняшняя Беларусь – частка Эўропы. Я не кажу пра Эўразьвяз, але культурна – безумоўна зьяўляецца. І за гады савецкай улады і лукашэнкаўскага рэжыму ня можа зьмяніцца мэнтальнасьць людзей, якая была ў гэтага народу на працягу ўсёй яго гісторыі. Заўжды Беларусь была часткай Эўропы, нават у змрочны час царызму альбо Савецкага Саюзу – гэта адчувалася заўжды.

Дастаткова паглядзець на быт, на вёскі – беларускія, расейскія і польскія. Параўнаць, да чаго бліжэйшая беларуская вёска. Канечне, да польскай бліжэйшая, чым да расейскай! Ува ўсім: у побыце, у архітэктуры, у плянаваньні самога ўчастку... Напрыклад, у Расеі саджаць кветкі перад домам лічыцца дэбілізмам. Там людзі дзівяцца: «Навошта гэта?»

### Сяргей Касьцян

Беларусі не трэба нікуды ўваходзіць, бо яна заўсёды была эўрапейскай дзяржавай, ёсьць і будзе. І калі казаць аб Заходняй Эўропе, то трэба памятаць, што ў XVI стагодзьдзі Беларусь, якая знаходзілася ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, мела свой Статут. А Брытанія (або, як яе цяпер называюць, Злучанае каралеўства) і да гэтага моманту ня мае сваёй Канстытуцыі. А ўсе астатнія краіны Заходняй Эўропы атрымалі свае Канстытуцыі ў канцы XIX – пачатку XX стагодзьдзя. Таму нам няма чаму вучыцца ў Заходняй Эўропы ў гэтым сэнсе. Асабліва ў пляне дэмакратыі і ў пляне палітыкі. Калі нам і ёсьць чаму павучыцца, дык гэта здабыткам найноўшых тэхналёгіяў.

Таму Беларусь ня мусіць нікуды ўваходзіць, а жыць так, як яна жыве. Адзінае, што трэба рабіць: яшчэ раз паказаць – і эканамічна, і палітычна, – што мы краіна, якая можа размаўляць на роўных зь любой эўрапейскай краінай. Бо і нашая гісторыя, і сучасная адукаванасьць нашых грамадзянаў даюць нам поўнае

права сказаць, што мы ў шматлікіх пазыцыях на цэлую галаву вышэйшые за ўсякіх эўрапейцаў.

### Вячаслаў Кебіч

Я даўно гаварыў і яшчэ раз паўтараю, што Беларусь даўно зьяўляецца адзінай і непадзельнай часткай Эўропы. Вядома, з пункту гледжаньня палітычнага – гэта яшчэ не Эўропа, і ў яе яшчэ трэба сапраўды ўвайсьці.

Тое, што Эўропа канчаецца на мяжы Эўрасаюзу, – гэта іх разуменьне. Уявім сабе, што мы ўжо ў Эўрасаюзе. Тады што ж: мы дагэтуль не былі Эўропай, а як толькі ўступілі ў арганізацыю, адразу зрабіліся Эўропай? Лухта гэта! Гэта зусім няправільнае тлумачэньне паняцьця Эўропы. Калі мы гаворым «Паўночная Амэрыка», мы аўтаматычна разумеем, што гэта Злучаныя Штаты Амэрыкі і Канада, хоць гэта дзьве розныя, зусім самастойныя дзяржавы. Калі мы гаворым «Паўднёвая Амэрыка» ці «Лацінская Амэрыка», дык там жа розныя палітычныя погляды і іншае, але мы гэта разумеем як мацярык.

Сёньня зьявілася настолькі шмат дзяржаваў, што гаварыць пра тое, што гэта нейкая цывілізацыйная супольнасьць, я б не наважыўся. Давайце прыгадаем гісторыю. Калі мы ў Беларусі яшчэ жылі плямёнамі, і ў нас не было рэлігіі як такой, ужо тады былі іншыя цывілізаваныя краіны. У тым ліку да гэтых цывілізаваных краінаў тады адносіўся і Кітай. Мяняецца час, мяняюцца гады – мяняецца і разуменьне цывілізацыі. Цывілізацыя – гэта вельмі шырокі гістарычны пэрыяд. Таму я б сказаў, што Эўропа – перш за ўсё тэрытарыяльнае аб’яднаньне.

### Жанна Літвіна

Беларусь на сёньняшні дзень, мне падаецца, апынулася ў нейкім прамежкавым часе абсурду, у сытуацыі раздвоенасьці грамадзкай сьвядомасьці. З аднаго боку, беларусу сёньня вельмі б хацелася быць спажыўцом тых дабротаў, якія назапасіла эўрапейскае грамадзтва. А з другога боку, відаць, наяўнасьць эфэкту прымусовай саветызацыі робіць нас прыхільнікамі расейскага ладу жыцьця. Нас яшчэ настальгічна цягне ў той, савецкі час – гэта абсалютна для мяне незразуме-

ла. Можа быць, прычыны і карані гэтага імкненьня параўноўваць сваё жыцьцё і захапленьне савецкім часам палягаюць у першую чаргу ў тым, што людзі ня ведаюць, як можна жыць інакш. Сёньняшняя ўлада, сёньняшні рэжым не далі чалавеку гэтай духоўнай разьняволенасьці і магчымасьці марыць і імкнуцца не назад, не да савецкай сыстэмы, а шукаць разьняволенасьці свайго духу і шукаць духоўныя каштоўнасьці, духоўнае апірышча.

Беларусы цяпер езьдзяць за мяжу, але вяртаюцца – і апынаюцца надалей у кіпцюрах прапаганды. Нашы людзі (і гэта наступствы прымусовага ўкараненьня дзяржаўнай ідэалёгіі) папросту няшчырыя. Ёсьць шэраг фактаў, якія сьведчаць: людзі могуць гаварыць адно (чытаць лекцыі па дзяржаўнай ідэалёгіі), а паралельна ў іх існуе свой сьветапогляд. Гэта недзе глыбока закапана і можа выходзіць на сьвет, праяўляецца, напрыклад, у тым факце, што толькі за мінулы год Беларусь пакінулі 64 тысячы беларусаў. Дарэчы, гэта афіцыйная статыстыка, якую выдаў тэлеканал АНТ напрыканцы сакавіка. 64 тысячы людзей, нягледзячы на фармаваньне стэрэатыпаў, што мы на Захадзе нікому не патрэбныя і нас там ніхто не чакае, усё роўна сваё жыцьцё і заўтрашні дзень зьвязваюць з Захадам і шукаюць свой лёс па-за межамі Беларусі.

### Анатоль Лябедзька

Геаграфічна – так! І, канечне, ёсьць частка людзей – носьбітаў эўрапейскіх каштоўнасьцяў. Калі б гэтага не было, у нас бы не было пэрспэктывы. Калі мы сёньня возьмем, напрыклад, Расею – там бессэнсоўна ставіць пытаньне пра эўрапейскія каштоўнасьці: ёсьць спробы прышчапіць, але яны там не прышчапляюцца. Расейскае «дрэва» адрынае гэтыя прышчэпкі.

А ў Беларусі ёсьць такая пэрспэктыва! І ёсьць значная частка грамадзтва, якая зьяўляецца носьбітам эўрапейскіх каштоўнасьцяў. Калі паглядзець на сацыялягічныя зьвесткі, у нас ёсьць схільнасьць да Эўропы. Пазытыўныя адносіны – колькі б ні гаварыла прапаганда пра прыватызацыю, ці рынкавыя адносіны, ці дэмакратыю – у нас усё ж такі трывалыя (я думаю, што нават на генным узроўні) і таму, што мы блізка да Эўропы, і таму, што ў нас ёсьць пэўная гісторыя.

## Васіль Лявонаў

Беларусь – гэта толькі геаграфічная частка Эўропы. Яна павінна быць і будзе часткай адзінай эўрапейскай супольнасьці (палітычнай, культурнай і эканамічнай). Для гэтага нам, беларусам, трэба рабіць Беларусь эўрапейскай краінай. Усім палітычным партыям, грамадзкім аб'яднаньням, усім грамадзянам Беларусі трэба вызначыцца, дамовіцца, якой павінна быць Беларусь сёньня, заўтра. Гэта вельмі складанае пытаньне. Мы, беларусы, наша Беларусь разьмешчаныя на мяжы дзьвюх геапалітычных сілаў, дзьвюх цывілізацыяў. Вельмі многія разважаюць у нас катэгорыямі «ў Расею», «у Эўропу». Перш за ўсё Беларусь павінна стаць самой сабой. Пры гэтым мы абавязаныя ўлічваць інтарэсы як Усходу, так і Захаду. Мінулы выбарчы фарс (выбару ў Беларусі не было) наглядна пацьвердзіў наяўнасьць невырашальных супярэчнасьцяў у поглядах на будучыню нашай краіны ў Захаду і ў Расеі. Лукашэнка ўмела гуляе на гэтых супярэчнасьцях.

Эўропа – гэта супольнасьць, заснаваная на супольных каштоўнасьцях, якія выпрацаваныя і ажыцьцяўляюцца на практыцы, да якіх прыйшла Эўропа пасьля шматлікіх, шматвекавых крывавых канфліктаў, разьні і звадаў. Яны навучыліся дамаўляцца.

## Алег Манаеў

У культурным сэнсе Беларусь зьяўляецца часткай Эўропы пакуль толькі часткова. Пачынаючы з XII стагодзьдзя (ня будзем паглыбляцца ў больш старажытны час), г. зн. з Полацкага княства, а потым і ВКЛ, гэтая тэрыторыя ў пэўных адносінах: рэлігійных, прававых, палітычных, эканамічных і да т. п. – ужо ўваходзіла ў эўрапейскую культурную прастору. Але ў той жа час яна належала і да іншага, эўразійскага сьвету. Гэтая геапалітычная і культурная «раздвоенасьць» доўжылася стагодзьдзямі, але асабліва ўзмацнілася за апошнія тры, калі Беларусь фактычна была часткай Рэчы Паспалітай, а затым Расейскай імпэрыі і Савецкага Саюзу. Сёньня мы маем тое самае: на самай справе Беларусь зьяўляецца двухскладовым культурным утварэньнем. У ёй ёсьць нямала людзей, якія падзяляюць эўрапейскія каштоўнасьці. І з гэтага пункту гледжаньня наша краіна

належыць да эўрапейскай культурнай прасторы. Але ёсьць і іншая Беларусь. І розьніца паміж імі, з пункту гледжаньня каштоўнасьцяў, велізарная.

НІСЭПД ужо дзесяць гадоў таму публікаваў даныя, якія даказваюць, што, умоўна кажучы, беларускае грамадзтва складаецца з трох частак. Адна частка – праэўрапейская, ня ў поўным, вядома, сэнсе, але прыхільная да многіх каштоўнасьцяў, пра якія гаварылася. Гэта прыкладна трэць насельніцтва (нагадаю, што ў Беларусі жыве пад дзесяць мільёнаў чалавек, і калі я кажу «трэць» – гэта значыць каля трох мільёнаў). Калі б гэтых беларусаў сёньня нейкім чарадзейным чынам перанесьці на захад ад нашай краіны, думаю, яны ўпісаліся б у эўрапейскую палітыку, эканоміку, мэнэджмэнт, лад жыцьця...

Другая частка – таксама прыкладна трэць грамадзтва – не разумее і не прымае гэтай сыстэмы каштоўнасьцяў. Гэта так званая «савецкая Беларусь». І ёсьць яшчэ адна трэць. Яна ў нейкіх адносінах, напрыклад эканамічных, арыентаваная на эўрапейскую сыстэму каштоўнасьцяў, а ў іншых, напрыклад прававых, – на эўразійскую. Так што ў гэтым сэнсе можна сказаць, што Беларусь як была двухскладовым культурным утварэньнем, што ўтрымлівала розныя сыстэмы каштоўнасьцяў, так і засталася.

Што варта рабіць у гэтым напрамку? Я не паліттэхноляг і тым больш не палітык, таму даваць рэкамэндацыі, як арганізаваць грамадзка-палітычны працэс адпаведным чынам, не зьбіраюся. Кожны павінен займацца сваёй справай. Для нашай каманды, г. зн. былога НІСЭПД, і мяне асабіста задача заключаецца ў тым, каб узмацняць пазыцыі эўрабеларусаў, спрыяць таму, каб на гэтыя пазыцыі пераходзілі і тыя, хто вагаецца, каб «савецкія беларусы» спакойна жылі, не адчувалі сябе ўшчэмленымі, але і не тармазілі разьвіцьця краіны. З уласнага досьведу магу сказаць, што зрабіць зь іх эўрабеларусаў – задача практычна невыканальная. Але гэта ня так і важна: калі эўрабеларусаў будзе большасьць, то рэальнае ўваходжаньне нашай краіны ў Эўропу зробіцца пытаньнем тэхнікі – палітычнай, эканамічнай, прававой, інфармацыйнай і да т. п.

### Аляксандар Мілінкевіч

Безумоўна, Беларусь у сёньняшнім выглядзе выпадае з кантэксту Эўропы. Сёньня мы – эўрапейская анамалія. Тое, з чым цяжка мець справу. Сапраўдная дыктатура ў Эўропе. Але я не надаваў бы вялікай увагі такому стану Беларусі, не лічыў бы, што гэта вялікая праблема. Бо калі браць з гледзішча часу, то праблемы Беларусі – гэта проста невялічкая хвароба, як тэмпэратура паднялася. Беларусь нікуды ня сыдзе з мапы Эўропы. Беларусь у Эўропе – гэта традыцыя, гэта гісторыя. Замежнікі часта пытаюць: а ваша Беларусь мае азіяцкі ўхіл ці схільная хутчэй да эўрапейскіх тэндэнцыяў? Я тады распавядаю пра магдэбурскае права, якога ў Беларусі больш было, чым у Германіі, праз нас усе стылі мастацтва прайшлі, а, прыкладам, у Расею толькі барока трапіла. Нагадваю, што гэта беларусы на беларускай зямлі і па-беларуску стварылі ўзор першай у Эўропе Канстытуцыі. Як бы ні было, але беларусы – эўрапейская нацыя, гэта вынікае найперш з мэнтальных і культурных асаблівасьцяў. Мы мост паміж Усходам і Захадам, але ўсё ж з эўрапейскай традыцыяй.

### Анатоль Міхайлаў

У геаграфічным сэнсе, зразумела, – так. Але я ня думаю, што ў гэтым заключаецца зьмест пытаньня. Даводзіцца з сумам канстатаваць, што на сёньняшні дзень мы хутчэй маем посьпехі ў нашай няздольнасьці інтэгравацца ў Эўропу, чым ідэнтыфікаваць сябе зь ёй. Краіна, якая, здавалася б, у сілу свайго геапалітычнага становішча, знаходзячыся на скрыжаваньні шляхоў і сустрэчаў паміж разнастайнымі культурнымі традыцыямі, магла б быць месцам дыялёгу і прадуктыўным мостам узаемадзеяньня, апынулася ў стане канфрантацыі з Эўропай і астатнім цывілізаваным сьветам. Абсурднасьць гэтага стану рэчаў відавочная і зьяўляецца вынікам нашай папярэдняй працяглай ізаляцыі і дамінаваньня ідэалёгіі процістаяньня і процідзеяньня таму, пра што мы па-ранейшаму ведаем вельмі мала. Аднак расплачвацца за гэтыя нашы пралікі давядзецца і нам, і нашым нашчадкам, прычым крайне дарагой цаной.

### Алесь Міхалевіч

Я думаю, што сёньня Беларусь адной нагой у Эўропе, а другой – дзесьці па-за Эўропай. Таму што для мяне эўрапейскай краінай можа лічыцца толькі тая, дзе грамадзяне самі бяруць на сябе адказнасьць за свой лёс. То бок гэта цывілізацыя, якая паўстала праз актыўны ўдзел грамадзянаў у прыняцьці рашэньняў. Пакуль што можам сказаць, што ў Беларусі такіх грамадзянаў, можа, працэнтаў трыццаць. На мой погляд, вось на гэты працэнт мы ў Эўропе. І гэта вельмі добры працэнт: ад гэтых трыццаці недалёка да большасьці. Як толькі нас будзе большасьць, мы зможам упэўнена сказаць, што зьяўляемся паўнапраўнай часткай Эўропы.

Нам трэба сёньня гадаваць такіх людзей, якія ня будуць баяцца браць на сябе адказнасьць за сваю будучыню.

### Тацяна Процька

Геаграфічна мы цэнтар Эўропы. Беларусь – гэта ня толькі тэрыторыя, але і людзі, і дзяржава. Кожная з названых частак павінна мець лепшы выгляд, каб стаць часткай Эўропы. Грамадзянская супольнасьць мае адны магчымасьці ўзьдзеяньня на людзей, у дзяржавы – іншыя. І калі грамадзянская супольнасьць (такія людзі, як я, напрыклад) адчувае сябе часткай менавіта эўрапейскай цывілізацыі, нам зразумела, што мы павінны ў грамадзтве распаўсюджваць перш за ўсё сыстэму каштоўнасьцяў, якая тычыцца гэтай цывілізацыі.

Але шмат хто зь беларускіх людзей, на жаль, не прыняў тых каштоўнасьцяў, якія выпрацаваны і якія далі такі высокі эўрапейскі культурны і тэхналягічны ўзровень. Мы не прынялі каштоўнасьці «дэмакратыя», мы не прынялі каштоўнасьці «законнасьць», мы не прынялі каштоўнасьці «правы чалавека». Апошняе паняцьце ў нас наагул вельмі абмежаванае: далей за «чарку і скварку», на жаль, не ідзе – і нават у кіраўніцтва краіны. Сацыяльна-эканамічныя правы зьяўляюцца галоўнымі, а «чалавекам звацца», мець свабоду – другараднае.

У дзяржавы магчымасьцяў значна болей, чым у грамадзянскай супольнасьці. Нашая дзяржава публічна прыняла эўрапейскую сыстэму каштоўнасьцяў, а на

справе цяпер лявіруе паміж усходняй, так званай «славянскай», супольнасьцю (з крыху іншай сыстэмай каштоўнасьцяў) і заходнеэўрапейскай. Падаецца, што тая эліта, якая сёньня пры ўладзе, заходнеэўрапейскага выбару яшчэ не зрабіла. Таму мы маем сёньня сядзеньне на двух крэслах. З аднаго боку, мы кажам: мы ў цэнтры Эўропы, і мы прыхільнікі эўрапейскіх каштоўнасьцяў. З другога боку, мы ад іх у сапраўдным жыцьці адхіляемся.

І ўжо ўзьнікае новае паняцьце – «Эўразія». Быццам бы там новая супольнасьць, дзе знаходзяць месца і заходнеэўрапейскія каштоўнасьці, і нейкія іншыя, усходнія, «славянскія» каштоўнасьці. Мы можам прыняць і такую сыстэму. Але тады мы павінны ведаць, што Беларусь ніколі ня будзе з гарадамі-музэямі, ніколі ў нас ня будзе эўрапейскага ладу. Гэта будзе іншае грамадзтва зь іншымі магчымасьцямі.

### Андрэй Саньнікаў

Геаграфічна – бясспрэчна, Беларусь ёсьць часткай Эўропы. Там захавалася пераемнасьць нават ладу жыцьця. Безумоўна, сёньня мы можам казаць пра аб'яднаную Эўропу, дзе кожная краіна і нават рэгіён знайшлі сваё месца. І каб мы вярнуліся ў Эўропу (я хацеў бы казаць менавіта пра вяртаньне ў Эўропу), мы павінны прайсьці перш за ўсё шлях дэмакратызацыі, як ні банальна гэта гучыць. Толькі гэта, я ўпэўнены, дасьць нам шанец пабудаваць краіну, якая будзе лічыцца ў Эўропе. Без дэмакратычных палітычных інстытутаў (і наша сёньняшняя сытуацыя – яскравы прыклад гэтага) немагчыма разьвіцьцё амаль нічога: ані эканомікі, ні культуры, ні гістарычнай навукі...

Эўропа – панятак найперш цывілізацыйны. Я кажу «аб'яднаная Эўропа», бо гэта – ужо факт жыцьця. Гэта не мэханічнае аб'яднаньне дзяржаваў, краінаў. Гэта форма, якая замацоўвае прыналежнасьць да цывілізацыі ў гэты гістарычны пэрыяд.

### Уладзімер Улаховіч

У любым разе, Беларусь – гэта частка Эўропы. Эўропы вельмі markdown рознай, шматаблічнай, супярэчлівай, абцяжаранай гістарычнымі асьцярогамі і крыўдамі, сучаснымі фобіямі. Эўропы, што нялёгка фармуецца ў новай якасьці толькі ў апошнія дзесяцігодзьдзі.

Беларусь нязьменна зьяўляецца часткай Эўропы. На жаль, існуе шмат эўрапейскіх палітыкаў і экспэртаў, якім гэта трэба даказваць. Абсалютна непатрэбны занятак. Калі нехта лічыць, што Эўропа заканчваецца на Лянд-штрасэ ў Вене, Одэры ці Бугу альбо што Эўропа – паняцьце выключна мэнтальнае, то да гэтага варта ставіцца як да вузасьці і абмежаванасьці асабістых інтэрпрэтацыяў.

### Валеры Фралоў

На мой погляд, якраз на мяжы Беларусі, Расеі праходзіць такі цывілізацыйны разлом, які зьвязаны з мэнтальнасьцю ў Расеі, Беларусі і той, другой частцы Эўропы, у якой мэнтальнасьць зусім іншая. А геаграфічна мы нібыта ў цэнтры Эўропы. Але да тых прынцыпаў, якімі кіруюцца эўрапейскія краіны, мне здаецца, нам яшчэ вельмі далёка.

Іншая рэч, што нас нельга, вядома, параўнаць з азіяцкімі краінамі, дзе мусульманства і іншае. У Азіі – свае традыцыі, погляды, нават рэлігія, якія рэзка адрозьніваюцца ад эўрапейскіх падыходаў. Мы ўсё-такі эўрапейскія людзі, элемэнт эўрапеізацыі ў нас прысутнічае. Я думаю, мы здольныя прайсьці гэты этап і «дастаць» ува ўсіх пазыцыях Эўропу. Пакуль што мы недзе пасярэдзіне, паміж Эўропай і Азіяй.

### Станіслаў Шушкевіч

Няма жорсткіх патрабаваньняў наконт таго, што такое «эўрапейскасьць» і што такое «не зусім эўрапейскасьць». У асноўным Беларусь належыць да Эўропы, зьяўляецца эўрапейскай структурай. А тое, што часова ў нас пару стагодзьдзяў тут лад нялюдзкі (увесь час не ўладкоўваецца, хоць спробы ўлад-

каваць былі), – гэта не азначае, што Беларусь адлучылася ад Эўропы. Я лічу, што Беларусь і людзі Беларусі зьяўляюцца эўрапейцамі.

Я вам скажу, нават там, дзе не аспрэчваецца, што гэта Эўропа: у Партугаліі, Грэцыі, пэўных мясьцінах у Італіі, – там таксама моцныя адрозьненьні ад таго, што мы прывыклі бачыць у клясычнай літаратуры – францускай, нямецкай. Так што Беларусь належыць Эўропе, і беларусы зьяўляюцца эўрапейцамі. Гэта для мяне адназначна.

### Усевалад Янчэўскі

Мы зноў блытаемся ў тэрмінах. Фармальны адказ на першае пытаньне просты.

Калі мы гаворым пра Эўропу як пра краіны, што вырасьлі з каталіцка-пратэстанцкай цывілізацыі, дык безумоўна не. Калі ж мы разумеем Эўропу шырэй і ўключаем у яе бізантыйска-праваслаўную традыцыю, дык безумоўна так.

Вядома, Беларусь – гэта частка сьвету, які вырас зь вялікай хрысьціянскай цывілізацыі.

З другога боку, мы яшчэ і частка вялікай эўразійскай прасторы – таго, што было ў свой час Расейскай імпэрыяй. І, галоўнае, мы частка вялікага постсавецкага сьвету. Мы – адзін з абломкаў гіганцкай савецкай імпэрыі, якая сама па сабе была цэлай цывілізацыяй (дарэчы, даволі ўнікальнай для чалавечай гісторыі).

Савецкі ўплыў аказаўся для нас найбольш істотны. Савецкі лад пераараў усё чыста – і ў нас, і ва Ўкраіне (ня лічачы заходніх абласьцей), і ў Расеі. Больш таго, савецкі ўплыў быў настолькі магутны і кардынальны, што ён беспаваротна разарваў сувязь зь любымі папярэднімі традыцыямі.

Аб гэтым можна бедаваць ці гэтаму можна цешыцца, але факт застаецца фактам. Беларуская гісторыя – гэта перш за ўсё і больш за ўсё савецкая гісторыя.

У нейкай ступені маюць рацыю тыя палітыкі на Захадзе, хто лічыць, што Эўропа канчаецца на ўсходняй мяжы Эўрасаюзу. Гэта, магчыма, крыўдна некаму ў Маскве і Кіеве, але празь меру шырокая трактоўка паняцьця Эўропы няслушная. А калі такая трактоўка набывае канкрэтныя палітычныя контуры, дык яна яшчэ і згубная.

Беларусь, Украіна, Расея – гэта іншы сьвет.

Усё гэта зноў-такі праяўляецца ў маўленьні. Мы, напрыклад, з той ці іншай нагоды часта гаворым: «У Эўропе робіцца так, а ў нас гэтак». Гэта значыць, яшчэ раз паўтару, мы падсьвядома проціпастаўляем «наша» і «эўрапейскае».

Нічога дрэннага ў гэтым няма. Наадварот, менавіта спробы паказаць зь сябе тое, чым ты не зьяўляесься, заўсёды камічныя. Той, хто спрабуе, што б там ні было, давесьці сваю «эўрапейскасьць», на самай справе дэманструе правінцыяльнасьць і комплексы.

Спробы ж самой Эўропы «зацягнуць» да сябе яўна неэўрапейскія элемэнты дабром ня скончацца.

Напрыклад, усе размовы пра ўключэньне Турцыі ў Эўрасаюз мне падаюцца вельмі дзіўнымі. Для Эўропы яны згубныя. Калі гэта будзе мець практычныя вынікі, дык будзе вельмі кепска. Сама ідэя «эўрапейскасьці» абясцэніцца.

Ёсьць і іншае вымярэньне гэтага пытаньня. Тыя, хто занадта імпэтна імкнуцца «ў Эўропу», чамусьці зусім ігнаруюць адну сумную акалічнасьць. На жаль, Эўропа паступова перастае быць Эўропай. І чым далей, тым выразьней гэта праяўляецца. Эўропа губляе сябе. Эўропа робіцца ўсё больш сэкулярнай, атэістычнай, спажывецкай. Яна ўжо амаль дашчэнту разбурыла свой культурна-гістарычны падмурак – хрысьціянства.

Магчыма, гэты працэс натуральны. Але Эўропе ад гэтага не лягчэй. Ён ідзе – і Эўропа губляе культурна-гістарычныя карані. Эўрапейская традыцыя (у самым шырокім сэнсе) магутна прасуецца сучасным тэхнагенным сьветам. Усё гістарычнае, усё ўстойлівае, усё традыцыйнае, што робіць Эўропу Эўропай, – усё гэта зносіцца віхурай глябалізацыі.

Але пасьля гібелі эўрапейскай культуры надыдзе чарга і саміх эўрапейцаў. Новае «вялікае перасяленьне народаў» прыносіць наймацнейшы элемэнт мусульманскай культуры. Але калі большасьць у Эўропе акажацца мусульманскай, дык ці ўспрыме гэтая новая большасьць эўрапейскія каштоўнасьці? Ці зразумеюць яны іх так, як разумеюць эўрапейцы? Ці захаваюць яны эўрапейскі лад жыцьця, эўрапейскае сьветаразуменьне і г. д.?

Гэта ўсё вялікія пытаньні, і катэгарычнага адказу на іх няма.

Пры ўсім тым Эўропа не мабілізуецца – яна адступае. І наступ новай культуры, новага агрэсіўнага мэнталітэту (умоўна назавем яго ісламскім) – усё гэта не падганяе эўрапейцаў да мабілізацыі, а наадварот – прыводзіць да пастаяннага згодніцтва, да ўступак, да абсурдысцкага разуменьня правоў чалавека.

Выдатнае дасягненьне эўрапейскай цывілізацыі – канцэпцыя правоў чалавека – пачынае ператварацца ў пасьмешышча і выклікаць недавер да самога сябе. Наркотыкі? Калі ласка! Сэксуальныя ненармальнасьці? Калі ласка! Разбурэньне сям'і? Калі ласка! Зьдзекаваньне з хрысьціянскіх каштоўнасьцяў дзеля фальшыва зразуметай свабоды слова ці камэрцыйнага посьпеху? Калі ласка!..

Любую рэч можна давесьці да абсурду і, у прыватнасьці, такую выдатную рэч, як цярпімасьць. У Эўропе менавіта гэта і адбываецца.

Эўропа вельмі слабая. Эўропа бязвольная. Эўрапейцы нагадваюць паміраючыя, старэючыя нацыі. Яны ня здольныя супраціўляцца знадворнаму ўплыву.

Давайце прыгадаем. Ужо пасьля Другой сусьветнай Эўропа аддала сябе на літасьць пераможцаў. Адна частка пайшла «пад СССР», другая – «пад ЗША».

Дарэчы, без амэрыканскай магутнасьці Італія і Францыя сталіся б камуністычнымі. У гісторыі няма ўмоўнага ладу, але тым ня менш!.. Уяўляеце – кантынэнтальная Эўропа была б савецкая!

У Эўропы пасьля заканчэньня Другой сусьветнай вайны ўжо не было ўласных эўрапейскіх сілаў. Была сіла амэрыканская. І, адгарадзіўшыся амэрыканскай сілай, пад амэрыканскім «парасонам» эўрапейцы жылі і разьвіваліся. Так, быў дэ Голь, самастойная палітыка Францыі і іншае. Але ўсё адно яны ішлі, у асноўным, у рэчышчы амэрыканскай палітыкі.

У Эўропы вельмі слабая палітычная воля. Эўропа багатая, яна можа складаць годную канкурэнцыю ЗША... Але ня хоча! Таму што мэнталітэт эўрапейцаў – гэта мэнталітэт нацыяў, што адыходзяць, старэюць.

Яшчэ адзін момант выпускаюць з-пад увагі прыхільнікі эўрапеізму. Абсалютна некарэктна ставіць знак роўнасьці паміж эўрапейскасьцю і ідэямі лібэральнай дэмакратыі.

На самай справе ў Эўропы гістарычна вельмі няпростыя стасункі з дэмакратыяй.

Эўропа нарадзіла самую жудасную дэспатыю – нацысцкую. Эўрапейскія дыктатуры – германская і італьянская – былі разбураны ТОЛЬКІ сілай зброі. Дэмакратыя ў Германіі была ўстаноўлена сілай, г. зн. супраць волі народу. А паміж тым, немцы – гэта цэнтральная эўрапейская нацыя.

Францыя два стагодзьдзі мітусілася паміж дэспатыяй і дэмакратыяй, праходзячы праз шэраг крывавых і ПА-АЗІЯЦКУ жорсткіх рэвалюцыяў... І яе шчодра паліты крывёю «шлях да дэмакратыі» сяк-так завяршыўся толькі ў другой палове XX стагодзьдзя.

Гішпанія, Грэцыя вызваліліся ад дыктатураў літаральна трыццаць гадоў назад.

Лібэральная дэмакратыя – гэта ў асноўным англасаксонская вынаходка. Можа, тлумачэньне гэтаму заключаецца ў марскім характары народаў. Гістарычна першыя дэмакратыі заўсёды ствараліся марскімі народамі. Грэкі – мараплаўцы, першы эўрапейскі парлямэнт утварыўся ў Ісьляндыі – краіне, асвоенай вікінгамі... Першыя эўрапейскія дэмакратыі (Галяндыя, Англія) стварылі нацыі, магутнасьць якіх грунтавалася на флёце... І, нарэшце, ЗША – дзяржава, створаная выгнаньнікамі і эмігрантамі, што выправіліся за акіян у пошуках лепшага жыцьця.

Мараплавец, падарожнік, каляніст, выгнаньнік – гэта перш за ўсё індывідуаліст. Гэта дужы чалавек. Чалавек, зьвязаны з морам, разьлічвае толькі на сябе. Мора – чужая для чалавека стыхія. Тут усё супраць яго – і свавольны вецер, і салёная, непрыдатная для піцьця вада, і хісткая палюба, і пякучае сонца. У моры няма на каго разьлічваць.

Мэнталітэт маракоў, падарожнікаў, першапраходцаў – гэта мэнталітэт індывідуалістаў. Мэнталітэт марскіх нацыяў – гэта мэнталітэт дэмакратыяў. Таму што дэмакратыя пачынаецца з індывідуаліста, з чалавека, які спадзяецца толькі на сябе. У ЗША стварылі дэмакратыю індывідуалісты. Туды прыяжджалі адчайныя і дужыя людзі – найбольш актыўная частка, якая адсякалася ад кожнай эўрапейскай нацыі: найбольш актыўныя англічане, найбольш актыўныя галяндцы, найбольш актыўныя немцы, найбольш актыўныя ірляндцы... Тыя, хто не спатрэбіўся ў сябе на радзіме. Тыя, хто ўступіў у канфлікт з уладай. Тыя, хто не жадаў мірыцца зь лёсам. Гэтыя людзі верылі толькі ў сябе, спадзяваліся

толькі на сябе і працавалі толькі на сябе. Такія людзі, дужыя, жорсткія, – толькі яны ствараюць дэмакратыю.

Дэмакратыя – гэта стыль кіраваньня індывідуалістаў, якія здольныя выжыць самастойна (без чыёй-небудзь апекі) і не жадаюць прызнаваць над сабой моцнай улады.

Гістарычна мэнталітэт аселага земляроба (селяніна) процілеглы мэнталітэту марака і каляніста. У адных пад нагамі – хісткая палюба, у другіх – цьвёрды грунт.

Марак (каляніст) імкнецца да зьмены месцаў, селянін прывязаны да зямлі; марак адчайна сьмелы, селянін нясьпешны і асьцярожны; марак (як правіла, чалавек бяз роду і племені) разьлічвае на сябе, селянін – на сваю сям'ю, грамаду; марак шукае новага, селянін трымаецца за старое.

Таму кантынэнтальная, земляробчая Эўропа вельмі цяжка ўспрымала дэмакратыю – праз кроў, праз рэвалюцыі, праз войны і зьнішчэньне мільёнаў (як у Германіі).

На завяршэньне скажу галоўнае.

Асноўнае праблема нашага стаўленьня да Эўропы ў тым, што многія не разумеюць усёй складанасьці гэтага арганізму. Мы не зусім разумеем, што Эўропа – гэта не ідэальны і нават ня блізкі да ідэальнага праект. Больш таго, шмат у каго ствараецца ўяўленьне, што Эўропа калі не на пачатку свайго шляху, дык недзе ў зэніце... На самай справе Эўропа – на схіле.

Чым далей, тым вастрэйшымі робяцца беды Эўропы. Сыстэмныя, фундамэнтальныя праблемы будуць нарастаць. Гэтым, мне здаецца, павінна вызначацца стаўленьне Беларусі, беларусаў да Эўропы.

Бабулька-Эўропа ператвараецца ў музэй. Музэй трэба шанаваць. У музэі, відаць, ёсьць нейкія карысныя рэчы, якія можна браць на ўзбраеньне ў будучыні. Але ў музэі нельга жыць!

# 3. Што Беларусь можа прыўнесьці ў Эўропу?

## Вольга Абрамава

У матэрыяльным пляне яна можа даць (калі захаваецца адносна высокі ўзровень адукацыі) прыбаўку да чалавечага патэнцыялу Эўропы. Любая новая нотка прымушае па-іншаму гучаць увесь аркестар. Беларуская культура, думаю, таксама ня будзе забытая, ня будзе нівэляваная: яна занадта самабытная, яна проста ня можа растварыцца, нават калі б працэсы інтэграцыі прынялі нівэлёўны для культуры характар, калі б глябалізацыя дайшла да абсурду і калі б яна ахапіла сфэру культуры. Я думаю, што ў Беларусі заўсёды застанецца інтэлігенцыя як сумленьне нацыі, якая будзе адстойваць менавіта гэтую вэрсію разьвіцьця: самабытнасьць Беларусі павінна прасоўвацца, павінна адстойвацца і ў той жа час – узбагачаць агульнаэўрапейскае разьвіцьцё.

У пляне чалавечага патэнцыялу, я ўпэўненая, Беларусь магла б даць у межах гэтых пяцідзесяці гадоў прарывы, у тым ліку і ў сфэры навукі. Думаю, нашае разьвіцьцё ў навукова-тэхнічнай сфэры ў найбліжэйшы час набудзе іменна такі напрамак: стаўка будзе зробленая на разьвіцьцё навукі і адукацыі, на павышэньне якасьці чалавечага патэнцыялу, на прыкладную аддачу (хоць мне вельмі шкада фундамэнтальных навук!). Будзе разьвівацца хай-тэк: у Беларусі ўсё прызначанае для гэтага, увесь патэнцыял ужо ёсьць. Тут патрэбна палітычная воля: ня проста ўкладаць сродкі ў разьвіцьцё менавіта гэтых напрамкаў, але прыцягваць гэтыя сродкі адусюль, адкуль магчыма. На сёньняшні дзень

для гэтага ёсьць усе мажлівасьці, але пакуль няма разуменьня. Параўнаем: ёсьць разуменьне на дзяржаўным узроўні, што нам для чагосьці патрэбная лёгкая прамысловасьць, хоць цяпер я не разумею, для чаго яна патрэбная, за выключэньнем народных промыслаў і нейкіх дапаможных рэчаў, да якіх прывыклі і безь якіх цяжка абысьціся. А ў цэлым зразумела, што беларуская лёгкая прамысловасьць, як і паўсюдна, ня будзе вытрымліваць канкурэнцыі з кітайскай лёгкай прамысловасьцю. Паводле цэлага шэрагу парамэтраў яна асуджаная. Асобныя напрамкі могуць утрымацца на плаву: там, дзе добры маркетынг, дзе першаклясныя мэнэджары, дзе яны адчуваюць асабісты інтэрас, а не працуюць на дзяржаву.

Але ўвогуле зразумела, што трэба разьвіваць: Беларусь – краіна з добрым чалавечым патэнцыялам, яго трэба выкарыстоўваць.

Я б не хацела прызямляць пытаньне пра тое, што Беларусь магла б даць Эўропе. Я назвала наўскідку два напрамкі. А ў цэлым, інтэграцыйныя дзеяньні заўсёды лепш, чым дзеяньні паасобку. Лепш эўраінтэграцыя, чым (утрыруем сытуацыю) гаспадарчая аўтаркія.

### Сьвятлана Алексіевіч

Гэта вельмі складаная пастаноўка пытаньня...

Я вырасла ў вёсцы, у беларускай вёсцы. Я пісала пра вясковых бабуль – я вельмі люблю гэтую тэму. А пазьней я жыла ў Парыжы, дзе сустракалася з арабскімі, афрыканскімі старымі жанчынамі. Як гэта прыгожа! У Швэцыі я размаўляла з іранскімі старымі жанчынамі. Мне перакладалі тое, пра што яны гаварылі, – якая гэта філязофія!

Пастаўленае вамі пытаньне – усё-такі ўнутрысямейнае. А сьвет цяпер разьдзелены іначай. Мусульманскі Ўсход можа жывіць Эўропу. Ці, напрыклад, быў усплёск цікавасьці сярод заходніх інтэлектуалаў да Індыі, індыйскай культуры. Гэтая цікавасьць і цяпер яшчэ ня згасла. Або – узьнікае цікавасьць да Кітаю. Культурная энэргетыка захоўваецца на вялікіх тэрыторыях і ў старых цывілізацыях! Беларуская ж культура на сёньня ня можа канкураваць нават з польскай.

Адзінае, што мы можам даць Эўропе, – гэта нашу патрыярхальнасьць. Ды яшчэ чарнобыльскую філязофію. Гэта тое, што можа зацікавіць сьвет, таму што чарнобыльскі погляд – гэта сьвет, поўны будучых страхаў. Таму сёньня гэта наш адзіны тэкст, які мы можам даць сьвету. Сьвет цяпер вельмі жорстка ўладкаваны, і трэба гэта ўсьведамляць. Мы, вядома, можам сябе суцяшаць і шкадаваць, гаварыць пра сябе вельмі добра, але трэба рэальна ацэньваць сябе.

### Яўген Бабосаў

Беларусь можа прыўнесьці свае традыцыйныя каштоўнасьці: талерантнасьць, памяркоўнасьць, павагу да любой рэлігіі, павагу да любой культуры – у нас гэта ёсьць. У нас жа няма такіх канфліктаў, як у Армэніі (Нагорны Карабах) і г. д. Вось гэтая самая памяркоўнасьць беларуская, вось гэтая талака, калі хочаце, вось гэтая самая добразычлівасьць – гэта ўсё адно і тое ж, вось гэта мы можам прыўнесьці ў Эўропу. І ў гэтым сэнсе Беларусь можа ўзбагаціць духоўны патэнцыял эўрапейцаў. Яна не апошняя краіна, яна недзе ў сярэднім радзе. Ня самая галоўная, хоць некаторыя ў нас кажуць, што Беларусь – цэнтар славянскага сьвету. Я ў гэта ня надта веру, але ведаю – кажуць. Таму што быць цэнтрам славянскага сьвету складана. Расея прэтэндуе на цэнтар, а чаму тады Польшча ня цэнтар, дапусьцім? Гэта трэба даказаць, а гэта недаказальна!

Я думаю, што Беларусь – звычайная стандартная эўрапейская краіна, якая адпавядае эўрапейскім стандартам – у культуры, адукацыі, навуцы, рэлігіі, у чым хочаце. У гэтым сэнсе яна можа тое, што ёсьць у яе каштоўнага – асабліва, паўтараю, традыцыйныя каштоўнасьці, – прынесьці туды. І гэта будзе нармальны ўклад! І за гэта яе будуць цаніць яшчэ больш, чым цэняць цяпер.

Іншая рэч, што ёсьць неляяльнае стаўленьне да нас зь некаторых палітычных матываў. І гэта перашкаджае больш шчыльнаму ўваходжаньню Беларусі ў эўрапейскую цывілізацыю. Але гэта не культура, не цывілізацыя, гэта – палітыка.

## Анжаліка Борыс

Гледзячы якая Беларусь... Мне здаецца, што багацьце і прывабнасьць Эўропы заключаюцца ў адзінстве разнастайнасьці нацыянальных культураў, традыцыяў і ідэяў. Беларусь, як і любая іншая краіна, можа ўзбагаціць гэтую палітру. Дастаткова разьвіваць нацыянальную культуру, адрадзіць традыцыі і сфармаваць неагрэсіўную ў дачыненьні да навакольнага сьвету нацыянальную ідэю.

## Ірына Бугрова

Я не прыхільніца такой пастаноўкі пытаньня. Беларусь жа не нявеста на выданьне! Калі я разумею, што хачу спадабацца некаму, дык я думаю: што б мне такога надзець? Трэба вывучыць спачатку ўсіх і быць добрай таму, каму хачу спадабацца...

Таму для мяне ў першую чаргу тут важна ўзаемная цікавасьць. Узаемная цікавасьць зьяўляецца тады, калі краіна жыве паўнакроўным, паўнацэнным жыцьцём, калі яна кантактуе зь іншымі. Таму што ідэнтычнасьць, калі вы паглядзіце ва ўсіх нармальных слоўніках, фармуецца ва ўзаемадзеяньні. То бок ідэнтыфікацыя – гэта пастаяннае ўзаемадзеяньне. Я ўвесь час пераўноўваю сябе: я сёньня выйшла адэкватна гэтаму лесу, гэтаму лугу ці офісу? Я ў лесе магу хадзіць у куртцы невядома якой, а тут – не. Я ўвесь час сябе ідэнтыфікую з асяродзьдзем, з абставінамі, з часам сутак і г. д. Чалавек увесь час знаходзіцца ў нейкай ідэнтычнасьці. Існуюць пэрыяды, калі ў яго ідзе рэсацыялізацыя, пэрыяды вялікай ломкі ці крызісных зьяваў. І дакладна гэтак жа адбываецца з грамадзтвам. Чаму мы гаворым, што ў той жа самай Эўропе палітычны ківач хістаецца то ўправа, то ўлева? Гэта таксама своеасаблівая ідэнтыфікацыя і пераідэнтыфікацыя. Ці дэзыдэнтыфікацыя і потым рэідэнтыфікацыя людзей, народу. І мы бачым, якія цяпер працэсы адбываюцца ў Францыі, у Германіі на ўзроўні палітыкі ў дачыненьні да эмігрантаў, да міграцыі, да меншасьцяў (якія ўжо робяцца большасьцямі)...

Што можа даць Беларусь? Я б хацела сказаць: Беларусь будзе цікавая тады, калі яна пачне ўзаемадзейнічаць зь іншымі краінамі. Тады адкрыюцца яе абса-

лютна неймаверныя магчымасьці. Я лічу, што ў першую чаргу Беларусь можа паказаць свой гнуткі, вельмі ціхі нораў, які тоіць у сабе вельмі вялікія адкрыцьці. Беларусь можа быць цікавая абсалютна незвычайным уменьнем быць канфармісткай і быць першаадкрывальніцай. Калі вы пагледзіце на карту сьвету і пачняце вывучаць біяграфіі знакамітых людзей, дык выявіцца, што вытокі іх – у Беларусі, яны выхадцы зь Беларусі – будуць гэта габрэі, палякі, непасрэдна беларусы, расейцы...

## Генадзь Бураўкін

Па-першае, як кожны народ, Беларусь прыўносіць свой непаўторны мэнталітэт, свой нацыянальны характар. Адсюль – цікавая зьява. Вы заўважылі, што некаторыя паважаныя эўрапейскія краіны зь вялікімі культурнымі традыцыямі вельмі асьцярожна, а то і варожа адносяцца да працэсу глябалізацыі? У гэтым мне бачыцца своеасаблівасьць і шчасьце Эўропы. Яна зарыентаваная дастаткова сур'ёзна на разьвіцьцё нацыянальных культураў, нацыянальных асаблівасьцяў. І паколькі ў беларусаў, як і ў кожнай нацыі, непаўторныя свае рысы, свой мэнталітэт, то для Эўропы наша дабрыня, наша цярплівасьць беларуская – хаця не заўсёды, можа, гэтыя якасьці выгадныя для жорсткага нашага сёньняшняга сьвету, сёньняшняга часу – яны нешта ўносяць у гэты эўрапейскі букет. Таму перш за ўсё, я лічу, мы цікавыя для Эўропы вось гэтым непаўторным нацыянальным характарам.

Другое, мы цікавыя Эўропе тым, што мы ўжо даволі працяглы час знаходзімся ў інтэлектуальных працэсах, якія адбываюцца ў Эўропе. Возьмем тое ж Адраджэньне – шчасьлівы пэрыяд эўрапейскай гісторыі. Мы, беларусы, у ім прынялі, дзякуючы сваім выдатным сынам, вельмі чынны ўдзел. Можа, не такі вялікі, як іншыя, але – прынялі! Тое, што мы, беларусы, можам разам зь іншымі заяўляць права на першы прававы звод – літоўскі Статут. Гэта для Эўропы, думаю, вельмі важна. І калі мы ў сябе дома, на жаль, да гэтага часу не ацанілі так, як таго варта, гэты найвыдатнейшы гістарычны дакумэнт, то ў Эўропе ён ацэнены, ён прыняты, ён працуе. На падставе нашага Статуту прымаліся многія дэмакратычныя дакумэнты ў дэмакратычнай Эўропе. Мы карысныя гэтым.

І скажам так: такія нацыі, як беларуская, якая яшчэ абсалютна сябе ня вычарпала, нясуць інтэлектуальны запас, інтэлектуальны патэнцыял на будучае. Ёсьць нацыі, якія дастаткова поўна мелі і гістарычную і палітычную магчымасьць сябе праявіць, сябе выявіць, свае таленты, як кажуць, вычарпаць. Беларусь, у сілу тых гістарычных працэсаў, якія мы прайшлі, на мой погляд, яшчэ сябе не пасьпела праявіць так, як яна здольная. Для гэтага былі вельмі сур'ёзныя гістарычныя прычыны. Я лічу, што кожная нацыя найбольш поўна і найбольш глыбока можа сябе выявіць толькі ў рамках нацыянальнай дзяржавы. На жаль, у нас гэтай магчымасьці выявіць сябе ў рамках сваёй самастойнай нацыянальнай дзяржавы доўга не было. Калі Беларусь атрымлівала хаця б звужаныя магчымасьці сваёй дзяржаўнай гісторыі, яны праяўляліся ўсплёскам і выплескам беларускіх талентаў. Я лічу, што нашая нацыя яшчэ не аддала сьвету тое, што яна ў сабе нясе. І гэтым яна цікавая для Эўропы, якую часта называюць «старой Эўропай». Так, сапраўды, Эўропа старая, а мы ў гэтым сэнсе яшчэ маладыя. І маладая частка Эўропы, Беларусь, можа даць старой частцы Эўропы нейкую энэргію і нейкае сілкаваньне, вельмі важнае для ўсёй Эўропы, для ўсёй гісторыі.

І тут ёсьць даволі парадаксальная, але цікавая рэч. Мы быццам бы ў нечым адсталі, і таму мы быццам бы вінаватыя ці адчуваем нейкую сваю слабасьць, не разумеючы, што тое, што мы яшчэ можам даць, яно пасьля стане нашай выгадай. Калі там ужо, у нейкім сэнсе, вычарпалі магчымасьці, то мы толькі-толькі гэтыя магчымасьці праявім. Паколькі мы іх будзем праяўляць у гэты час, у гэты пэрыяд разьвіцьця чалавецтва, то ў нас будуць і іншыя пэрспэктывы. Мы будзем выдаваць тое нявыдадзенае на новым узроўні. Таму я лічу, што ў гэтым пляне Беларусь вельмі цікавая, важная і нават неабходная для Эўропы і для эўрапейскай цывілізацыі.

У пэрыяд Вялікага Княства Літоўскага, вельмі своеасаблівы пэрыяд, беларусы не пасьпелі сябе выявіць (хоць і мелі там вельмі шмат прывілеяў: практычнай дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага была беларуская, многія кіраўнікі гэтай вялікай эўрапейскай дзяржавы былі сынамі, прадстаўнікамі, пасланцамі нашай беларускай зямлі, беларускай нацыі), паколькі так атрымалася, што Вялікае Княства Літоўскае гістарычна ня так доўга праіснавала. І яны ня больш шырокую дарогу атрымалі пасьля тых гістарычных падзеяў, якія, на жаль, ад-

быліся, а наадварот: беларусаў загналі. Загнала імпэрыя Расейская, загнала Польская дзяржава ў многім. Гэта ж унікальная рэч, калі і польская дзяржава, і расейская дзяржава выдавалі спэцыяльныя ўказы аб забароне карыстаньня беларускай мовай. А калі мова, як мы ведаем – душа народу (гэта паэтычнае, але, на мой погляд, і дастаткова навуковае азначэньне), калі вымаюць з народу гэтую душу або прыгнятаюць яе, то гэты народ ня можа выявіць сябе так, як могуць выявіць іншыя народы. Таму, напрыклад, ведаючы добра расейскую гісторыю, мы часам арыентуемся на расейскі вопыт, але ў Расеі ніколі не было разуменьня, што такое нацыянальнае прыніжэньне. Нават, даруйце, забулдыга расейскі памірае ці дрэнна жыве, адчуваючы сябе прадстаўніком нацыі, у якой ёсьць мова і гісторыя. А ў нас нават выдатным людзям, выдатным талентам у нейкі пэрыяд не хапала ні годнасьці сваёй нацыянальнай, ні сваёй роднай мовы, ні веданьня сваёй гісторыі (для таго, каб гісторыю любіць і цаніць, яе трэба ведаць!). Гэта было забрана ад беларусаў. Таму я лічу, што пэрыяд ВКЛ, на мой погляд, да гэтага часу дастаткова поўна і сур'ёзна яшчэ ня вывучаны... Вялікае Княства Літоўскае не было чыста беларускім, яно было поліэтнічным. І тыя народы, тыя часткі, якія ўваходзілі ў Вялікае Княства Літоўскае, яны атрымалі свае дзяржавы, а значыць, і маюць сваю гісторыю, яны часта прэтэндуюць на ўсю гісторыю Вялікага Княства Літоўскага. Гэта зразумела – і чыста па-чалавечы, і па-дзяржаўнаму. Але пачынаюць расхопліваць, расьцягваць гісторыю Вялікага Княства Літоўскага па «нацыянальных кватэрах» (давайце тут прымем гэтае савецкае вызначэньне). А паколькі ў беларускім характары няма агрэсіўнасьці, няма залішняй рашучасьці, то гэтым карыстаюцца нашыя мілыя слаўныя суседзі. Пакуль беларус чэшацца, як кажуць, яны сабе тое-сёе па кавалачку забіраюць, як мы гэта бачым на прыкладзе Кастуся Каліноўскага, якога ў нас хочуць забраць нашы блізкія суседзі.

Так што наконт таго, што пэрыяд Вялікага Княства Літоўскага сьведчыць, што мы старая нацыя, старая дзяржава, гэта ў нейкім сэнсе так, а ў нейкім – ня так. І той шанец, які мы ня выкарысталі ў пэрыяд Вялікага Княства Літоўскага, я не лічу, што ўжо навек пахаваны, што прайшлі гады, што гэта, як пісаў клясык, сплыло і парасло травой. Я лічу, калі народ жыве і калі ў народу зьяўляецца магчымасьць гэта ўсё ў сабе ўскалыхнуць і разьвіць, то гэта нікуды не падзенецца.

Так, як гэтыя дзіва-выпадкі, калі людзі перад сьмерцю ці ў нейкія цяжкія пэрыяды раптам пачынаюць гаварыць на той мове, якую яны нават ня чулі. Я лічу, што і ў гісторыі нацыі могуць быць пэрыяды, калі тое, што было ў свой час нявыкарыстанае, прыходзіць і, калі ёсьць для гэтага спрыяльныя варункі, паяўляецца... Я вельмі спадзяюся, што ў беларускага народу і ў беларускай дзяржавы будзе такая магчымасьць, калі тое, што мы ня выкарысталі, калі былі ў Вялікім Княстве Літоўскім, і калі хоць трошачкі заяўлялі аб сваіх правах у Беларускай Народнай Рэспубліцы, і нават калі мы нейкія свае шанцы не пасьпелі выкарыстаць у складзе БССР, – павінен жа прыйсьці час. Бог жа ёсьць! Павінен надысьці пэрыяд, калі беларусам дадуць магчымасьць выкарыстаць тое. І тады, у мяне такая надзея, сьвет зьдзівіцца, як многа Беларусь можа даць Эўропе, чалавецтву і, перш за ўсё, самой сабе, сваім людзям, сваёй гісторыі. Я думаю, гэты пэрыяд будзе. Дай Бог, каб ён як мага хутчэй прыйшоў.

### Алесь Бяляцкі

Вельмі шмат! Пабываўшы ў многіх эўрапейскіх краінах (і неаднаразова, і дастаткова часта), я пазбавіўся калі ня комплексу, то нейкіх тэарэтычных уяўленьняў, што беларусы ў нечым не разьвітыя, што ім чагосьці не хапае ці што яны ў нечым горшыя. Абсалютна нармальны сярэднеэўрапейскі народ (як ёсьць «сярэднеэўрапейскі час»). Тут, як і ў любога іншага народу, у любой іншай дзяржаве, ёсьць горшае і лепшае. Але ёсьць і дастаткова шмат нармальных рысаў, якія дазволяць канкураваць на эўрапейскім полі і мець сваю нішу. Гэтак, як на сёньня, напрыклад, беларусы знайшлі некалькі сваіх нішаў у спорце: пара дысцыплінаў лёгкай атлетыкі, яшчэ недзе. Там-сям раптам нейкія выбухі адбываюцца: нашая дзяўчына раптам прабяжыць стомэтроўку на золата, што ўвогуле фантастычна – такога не бывае! Калі рабіць стаўкі, то гэта адзін да тысячы, можа быць...

Прабіваюцца! І самае галоўнае – ёсьць пэўны аптымізм. Беларусы ня ёсьць народам пэсымістычным. Гэты аптымізм закладзены ня сёньня і ня ўчора: гэта закладалася, можа, тысячы гадоў таму. Мы бадзёры народ, які ня хоча сядзець, плакаць, ня хоча нічога не рабіць (а ёсьць і такія народы!). Мы народ, які заўсёды знойдзе сваю дзялянку, будзе там капацца, цягаць туды цэглу, будзе там

штосьці будаваць, заліваць, штосьці вырошчваць – і штосьці будзе з гэтага мець. Я абсалютна ўпэўнены, што калі паглядзець усю мапу, пачынаючы з Партугаліі ці Ісьляндыі і канчаючы Беларусьсю, то ў гэтай прасторы мы выглядаем зь вельмі добрымі шанцамі выжыць, зрабіць свой унёсак туды, прапіхваць свае ідэі, мець свае нішы, зь якімі будуць лічыцца. Тут ня можа быць ніякіх сумненьняў, нібыта мы загінем ці нас будуць эксплюатаваць, за наш кошт будуць будаваць недзе нечае багацьце.

Я не кажу тут пра культурны ўнёсак – гэта больш складаная праблема. Таму што праблема з культурным унёскам – больш тонкая: гэта ня ёсьць эканомікай, ня ёсьць спортам, ня ёсьць тым, што можна выбудаваць за пяць-дзесяць гадоў. Яна патрабуе большых намаганьняў, большых духоўных укладаньняў. І ў гэтым пляне мы цяпер знаходзімся ззаду ўсёй Эўропы. Калі браць іншыя моманты (вяртаюся да эканомікі, спорту, да нейкіх сацыяльных схемаў), то мы нават на сёньняшні дзень канкурэнтаздольныя: мы штосьці ўкладаем, штосьці маем, штосьці паказваем і г. д. У культурным пляне – поўная пустка, поўная «дзіч». Маючы дастаткова клясныя рэчы, пачынаючы ад фальклёру, якога даўно ўжо нідзе няма, і канчаючы нармальнай прозай, нармальнай музыкай, нармальнай мастацкай школай, на сёньняшні дзень гэта ўсё абсалютна збаёдваецца, абсалютна ня цэніцца, не рэпрэзэнтуецца, ня ставіцца, не прапагандуецца такім чынам, якім гэта павінна быць. Цалкам адсутнічае іміджавы плян, безь якога на сёньняшні дзень ня скочыш вышэй і не пераскочыш. Бо для любой рэчы, пра якую ты хочаш, каб пра яе ведалі, трэба мець канкрэтны маркетынгавы плян: як яе «прадаць»? Апроч таго, яшчэ трэба падумаць, у якую «абгортку» яе загарнуць, каб яе купілі. У нас поўная адсутнасьць усяго гэтага на дзяржаўным узроўні. А на аматарскім, безумоўна, штосьці робіцца, але гэтых намаганьняў не стае. Тут трэба грошы, сур'ёзныя грошы! І каб дзяржава фінансавала ўсе гэтыя рэчы, толькі тады гэта можа даць нейкі сур'ёзны плён. Хаця пэрспэктывы вельмі неблагія. Але зрабіць трэба столькі – што проста няма словаў!

### Аляксандар Вайтовіч

Беларусь можа прыўнесьці ў Эўропу перш за ўсё сваю культурную і духоўную адметнасьць. І гэта важкі ўнёсак, бо багацьце цывілізацыйнай культуры – у яе разнастайнасьці.

### Андрэй Вардамацкі

У дадатак да таго, што ў нас эўрапейскі характар і эўрапейскія каштоўнасьці, прыўнесьці ў Эўропу Беларусь магла б вельмі шмат нават у чыста эканамічным сэнсе. Яе транзытнае, цэнтравое геапалітычнае становішча робіць адказ на гэтае пытаньне відавочным. Само месца вызначае, што Беларусь магла б прыўнесьці.

Але тут гаворка ідзе ня толькі пра транзыт у літаральным сэнсе слова: дарога, чыгунка, труба – але і ў сэнсе індустрыяльна-эканамічным. Тут можа быць сканцэнтраваная вялікая колькасьць вытворчасьцяў, якія сваім рынкам маглі б мець эўразійскую прастору. І паводле мэнтальнасьці, і паводле адукацыйнага ўзроўню беларусы больш адкрытыя і гатовыя да новых тэхналёгіяў.

### Вінцук Вячорка

Калі не чапаць гісторыі й гаварыць толькі пра сынхранічны зрэз, то ўжо «прыўнесла» – сябе як праблему, зьвязаную зь межамі Эўропы, з правам ня толькі на дэмакратыю, але на ідэнтычнасьць і незалежнасьць.

### Павал Данейка

Гэта добрае пытаньне, але, можа, спытаем па-іншаму: чым важныя чэхі для Эўропы? Ці баўгары? У якіх катэгорыях мы можам размаўляць? Што, баўгары кавалак Чорнага мора дадуць, чэхі – Высокія Татры? Ну, тады мы – лясы!

Калі мы будзем мерац у культурных каштоўнасьцях і спэцыфіках нацыянальных характараў, то нам таксама ёсьць што прапанаваць. Калі мы глядзім на

Эўропу як на нейкую сынэргію адрозьненьняў, якая дазваляе ствараць больш шматстайнасьці, мець большы патэнцыял разьвіцьця, то я ня думаю, што ўклад Беларусі меншы, чым уклад любой іншай цэнтральнаэўрапейскай краіны, якая ўжо зьяўляецца часткай аб'яднанай Эўропы.

### Андрэй Дынько

Беларусь – гэта 207 тыс. км$^2$ тэрыторыі, ня вельмі густа заселенай. Гэта таксама невычэрпныя крыніцы чыстай прэснай вады: многія рэкі Ўсходняй Эўропы ад нас бяруць пачатак. Беларусь – важны элемэнт у сыстэме бясьпекі Ўсходняй Эўропы: гэта тэрыторыя, празь якую праходзяць магістральныя камунікацыі і можна праводзіць новыя камунікацыі.

Няма такой сфэры, у якой Беларусь ня мела б сваіх важных каштоўнасьцяў. Вазьміце мастацтва: мастацкае жыцьцё ў нас пульсуе. Вазьміце эканоміку: беларускія тавары, ад нафтапрадуктаў і калійных соляў да харчовых, сельскагаспадарчых прадуктаў і праграмнай прадукцыі беларускай «Сыліконавай даліны» – гэта ўсё можа быць запатрабаванае ў Эўропе.

Хоць сама пастаноўка пытаньня «Што Беларусь можа даць Эўропе?» не зусім карэктная. А калі б нам не было чаго даць, то што? Нас тады трэба было б абгарадзіць калючым дротам?

### Сьвятлана Калінкіна

З гістарычнага і геаграфічнага пункту гледжаньня, Беларусь – транзытная тэрыторыя. І тут нічога іншага ня выдумаеш, як быць транзытнай, «буфэрнай» зонай паміж двума вялікімі «кантынэнтамі»: Расеяй, амаль азіяцкай, і Эўропай, старой Эўропай. Таму нічога іншага ў Беларусі ў геапалітычным і культурніцкім сэнсе, як мне здаецца, быць ня можа. І гэта галоўная мэта нашай краіны, нашай тэрыторыі – заставацца і захоўваць такое сваё прызначэньне.

## Сяргей Калякін

Для Эўропы наяўнасьць такога парадоксу, калі толькі адна краіна не зьяўляецца яе членам, сама па сабе ненармальная. Калі б нейкая колькасьць краінаў Эўропы не ўваходзіла зь нейкіх, напрыклад, палітычных меркаваньняў, гэта было б зразумела. А вось ёсьць адна краіна – Беларусь: ня самая буйная, ня самая дастатковая, – але яна не ўваходзіць... Для Эўропы гэта таксама праблема. І таму наша ўступленьне ва ўсе эўрапейскія структуры дало б Эўропе магчымасьць гаварыць аб кансалідацыі, аб прасунутасьці на шляху стварэньня аб'яднанай Эўропы і мэханізмаў вырашэньня разнастайных канфліктаў.

З другога боку, мы, безумоўна, цікавыя Эўропе, таму што мы зьяўляемся «мостам», сур'ёзным транзытным калідорам, з пункту гледжаньня разьвіцьця эканамічных узаемадзеяньняў з азіяцкім кантынэнтам. Праз нас практычна самы блізкі маршрут – праз Расею ў Азію і далей у Японію, у Паўднёва-Ўсходнюю Азію і г. д. Таму мы цікавыя з эканамічнага пункту гледжаньня, але для гэтага, зноў жа, мы павінны быць прадказальныя. Мы павінны выконваць існыя абавязаньні, каб праз нас пайшоў транзыт грузаў, транзыт камунікацыяў і г. д. Гэта быў бы сур'ёзны эканамічны інтэрас для Эўропы акрамя палітычнага.

Беларусы зьяўляюцца адной з самых адукаваных нацыяў і адной з нацыяў, у якіх існуе кваліфікаваная працоўная сіла. І мы ў эўрапейскім падзеле працы (як і ў сусьветным) маглі б заняць сваю вельмі цікавую нішу – выгадную як для Беларусі, так і для аб'яднанай Эўропы.

Аб'яднаная Эўропа ж не зьяўляецца нечым маналітным: яна складаецца з многіх нацыяў, народнасьцяў, культураў... Мы б прыўнесьлі ў эўрапейскую палітру сваю адметнасьць.

## Кася Камоцкая

Як і любая іншая краіна... Тыя краіны, якія цяпер уступілі, яны вельмі ажывілі Эўропу – і ў культурным пляне, і ў іншых. І тое ж самае – Беларусь: яна можа даць «сьвежую кроў». Эўропе вельмі сумна жыць. Эўропа была вельмі «старэнькая», нічым не цікавілася. Таму якраз-такі маладая кроў вельмі карысная.

## Сяргей Касьцян

Мы можам прынесьці ў Эўропу наш гуманізм, нашу чалавечнасьць, бо Эўропа ўжо ня раз выклікала на шматлікія народы бяду, войны і кроў. Паглядзіце, хто толькі за ўсю гісторыю ні ішоў на нашыя землі! Хто такія былі крыжаносцы? Гэта з Заходняй Эўропы ішлі на нашыя землі. Розныя ордэны з Заходняй Эўропы ішлі на нашыя землі. А дзе зарадзіўся фашызм? У Заходняй Эўропе! І хто падтрымаў Гітлера? Хто яму разьвязаў рукі, каб ён ішоў з вайной на Ўсход? Францыя, Італія і Вялікабрытанія. А хто сёньня нам крычыць на Беларусь, што мы недэмакратычныя? Хаўер Саляна, які нарадзіўся і вырас у фашысцкай дзяржаве Іспаніі. А хто такі Барозу, старшыня Эўракамісіі? Ён нарадзіўся і вырас, з малаком маткі ўспрыняў фашызм у Партугаліі. І хто сёньня крычыць аб дэмакратыі? Гэта нашчадкі былых фашыстаў у Заходняй Эўропе. Таму мы маем поўнае права сказаць: мы эўрапейская дзяржава, і мы будзем вам навязваць нашы славянскія каштоўнасьці: братэрства, інтэрнацыяналізм, гуманізм і г. д.

Я хацеў бы дадаць да сказанага вышэй. Заходняя Эўропа амаль уся каталіцкая. А хто благаславіў Гітлера на вайну супраць славянаў? Папа Рымскі Пій XII. Ён даў Гітлеру Божае благаслаўленьне. І мы сёньня гаворым, што і нашая праваслаўная вера – гэта самая гуманная вера. І нашыя звычаі, і нашыя традыцыі, і нашая культура заўсёды несьлі, і нясуць, і будуць несьці прагрэс, гуманізм і высокі ўзровень славянскай цывілізацыі.

## Вячаслаў Кебіч

Зноў-такі, трэба падзяліць гэтае пытаньне на палітычную і эканамічную часткі. З палітычнага пункту гледжаньня нас толькі і чакаюць там, каб мы сталі часткай гэтай структуры. Гэта зразумела ўсім: кім бы Расея ні лічыла сябе ў «васьмёрцы», як бы яна ні сябравала зь іншымі дзяржавамі, але сёньня ўся палітыка Эўрасаюзу, НАТО так ці інакш накіравана супраць Расеі. Няхай не ў адкрытую гэта робіцца, але ж мы ведаем, што так ці інакш Расея як была краінай, якая процістаіць, у гэтым выпадку Эўрасаюзу і Амэрыцы, так і засталася. Таму ўключэньне Беларусі

ў склад Эўрасаюзу ці эўрапейскага аб'яднаньня, з пункту гледжаньня палітычнага, – гэта набліжэньне межаў Эўрасаюзу, у тым ліку і НАТО, да Расеі.

Гэта з пункту гледжаньня палітычнага. А з пункту гледжаньня эканамічнага, вельмі цяжка нам цяпер увайсьці ў Эўропу (у тым сэнсе, як яе разумеюць члены Эўрасаюзу). Таму што рынкі збыту ўжо падзеленыя. Вядома, у нас ёсьць тавары, якімі мы можам добра гандляваць, але хутчэй за ўсё выгады эканамічнай у найбліжэйшы час (калі б мы ўвайшлі ў Эўрасаюз) мы б не атрымалі. Нам трэба імкнуцца да таго, каб там, дзе можна, паступова заваёўваць рынкі збыту шляхам двухбаковых стасункаў – паміж Беларусьсю і кожнай з краінаў Эўрасаюзу. А проста аўтаматычнага ўваходжаньня ў Эўрасаюз у нас ніяк не атрымаецца.

### Жанна Літвіна

Можа быць, ня столькі прыўнесьці, колькі ўрэшце зноў заняць гістарычнае сваё месца, якое яна страціла два стагодзьдзі таму. Проста аднавіць гістарычную справядлівасьць. Для мяне гэта так, у першую чаргу.

І не ўспрымаю гэтую неабходнасьць вяртаньня ў Эўропу як імкненьне ўцячы ад нейкай пагрозы, якая ідзе з Усходу. Відаць, уся нашая будучыня завязаная на гэтых працэсах ідэнтыфікацыі – і моўнай, і культурнай, і нацыянальнай. Пакуль мы праз гэта ня пройдзем, пакуль не ўсьвядомім «хто мы, што мы, дзеля чаго мы», пакуль у нас ня зьявіцца сваё сьветаўспрыманьне інтарэсаў – нашых інтарэсаў, беларускіх, – цяжка будзе сфармуляваць, што мы можам прыўнесьці ў эўрапейскую супольнасьць.

Калі браць палітычны аспэкт, тут праблема, як мне падаецца, намнога больш складаная. Так, унутраная палітыка сёньняшняй улады скіраваная на інтэграцыю з Расеяй. За гэтыя 12 гадоў былі моманты, калі можна было гаварыць пра пагрозу інкарпарацыі, а не інтэграцыйныя працэсы. У тым ліку знутры краіны навязваньне інтэграцыі, зьліцьця народаў. Гэта падхоплівае і першая асоба Расейскай Фэдэрацыі, Пуцін. Я лічу, гэта самыя абразьлівыя словы, што «мы адзін народ, беларусы і расеяне». Узгадаем, колькі ў самой Расеі нацыянальнасьцяў!

А побач – няўменьне намі самімі сфармуляваць стратэгію заўтрашняга дня. Мы становімся закладнікамі міжнароднай палітыкі эўрапейскіх структураў, якія

сьпярша абвяшчаюць пакрокавую стратэгію (якой так і не было, дарэчы, пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году). А паралельна зь ёй зьявіліся яшчэ больш небясьпечныя ўяўленьні, што дэмакратычныя перамены прыйдуць у Беларусь выключна праз Расею, праз Крэмль. І дагэтуль, я лічу, сапраўднай стратэгіі, што трэба рабіць зь Беларусьсю, у Эўропы няма. Мы самі ня ў стане прапанаваць асноўныя моманты гэтай стратэгіі, каб далей ажыцьцяўляць яе разам з эўрапейскімі інстытутамі. Эўрапейскім інстытутам нейкі час здавалася, што мы павінны выхоўваць беларускую ўладу. Пасьля гэтых прэзыдэнцкіх выбараў у дзяржаўнай прэсе паціху ўжо навязваецца думка, што стасункі Эўропа павінна мець усё ж з тымі, у каго ў руках улада ў Беларусі. Гэта вельмі небясьпечная штука, бо я лічу: на сёньняшні дзень самае асноўнае, што павінны зрабіць краіны Эўразьвязу, – гэта дэманстраваць, што Беларусь патрэбная Эўропе як незалежная, сувэрэнная дзяржава. Думаю, для нас сёньня гэта асноўнае пытаньне – па-за пытаньнямі легітымнасьці ўлады, легітымнасьці прэзыдэнцкіх выбараў. Эўропа павінна ўвесь час падкрэсьліваць тое, якой яна бачыць Беларусь.

## Анатоль Лябедзька

Найперш – стабільнасьць! Стабільнасьць і для суседзяў у Эўрапейскім Зьвязе, і для Эўропы цалкам. Наагул пытаньне эўрапейскіх каштоўнасьцяў, якое трэба вырашаць, – гэта не ўнутрыбеларускае пытаньне. Безумоўна, беларуская праблема павінна вырашацца тут. Яе вырашэньне адбудзецца зьнізу, знутры, а ня звонку і зьверху.

Але гэта пытаньне адначасова і эўрапейскае. Чаму падчас розных сустрэчаў мы вельмі настойліва гаворым, што беларускае пытаньне павінна стаць часткай агульнаэўрапейскага парадку дня? Бо гэта пытаньне стабільнасьці, бясьпекі для Эўропы. Сёньня тут адбываецца барацьба эўрапейскіх каштоўнасьцяў і нэааўтарытарнай ідэалёгіі, якую мы называем «лукашызмам». Лукашызм – экспартны тавар, які вельмі добра «ідзе» на постсавецкай прасторы. Чаго каштуе толькі апытаньне, зробленае сярод радыёслухачоў «Эха Масквы», калі, выбіраючы паміж Пуціным і Лукашэнкам, 80% сказалі, што яны галасавалі б за Лукашэнку.

Гэта паказвае значнасьць праблемы для Эўропы. Таму што Лукашэнка сёньня ня толькі беларускі «правіцель», але і лідэр сілаў рэваншу на постсавецкай прасторы. Праблема рэваншу застаецца вельмі актуальная. І месца Беларусі тут – вельмі важкае. Вельмі! Бяз гэтага ня могуць адчуваць сябе спакойна ня толькі Польшча і Літва, але і ўся Эўропа.

Гэтая стабільнасьць бясьпекі – ня толькі палітычная, але і эканамічная, таму што многія камунікацыі ідуць у Эўропу празь Беларусь. І для Эўропы актуальная праблема стабільнасьці не на тры-чатыры гады, а на больш далёкую часавую пэрспэктыву.

Акрамя таго, канечне, на нейкім этапе Беларусь магла б выконваць ролю своеасаблівага «моста» паміж Эўропай і Расеяй. Канцэпцыя «моста» для Беларусі можа быць эфэктыўнай з пункту гледжаньня эканомікі, з пункту гледжаньня дабрабыту людзей – нам гэта трэба выкарыстоўваць. І безумоўна, гэта можа быць моцны эканамічны праект зь вялікімі прэфэрэнцыямі як для самой краіны, так і для грамадзянаў Беларусі.

### Васіль Лявонаў

Нам нікуды нічога прыўносіць ня трэба, мы ў цэнтры Эўропы і мы павінны ў сябе дома наладзіць дастойнае жыцьцё сваім грамадзянам, спыніць барацьбу паміж беларусамі і нашымі суседзямі.

Нам варта вучыцца і навучыцца паважаць адно аднаго, не змагацца, а дамаўляцца. І яшчэ, ня варта разьлічваць на халяву з Захаду ці з Усходу, яе ня будзе. Або будзе, але толькі ў выглядзе «бясплатнага сыру». Наша самабытная культура, наш беларускі лад жыцьця, характар, звычаі нашых продкаў: працавітасьць, цярпімасьць да думкі іншых – усё гэта ды іншае і ёсьць (ня будзе, а ёсьць!) нашым унёскам у эўрапейскую цывілізацыю.

### Алег Манаеў

Наконт гэтага ёсьць два меркаваньні. Па-першае, і гэта самае важнае, калі разглядаць Эўропу як сыстэму каштоўнасьцяў, як пэўную культуру, адну з самых

разьвітых у сучасным сьвеце, дык для Беларусі як нацыі, грамадзтва і дзяржавы гэта было б вяртаньнем у агульнаэўрапейскую сям'ю. Уявіце сабе, што мы з вамі члены вялікай сям'і, у нас ёсьць брат ці сястра, якія некуды адыходзілі, і іх доўга не было. І вось яны вярнуліся. Гэта дасьць нейкі плюс сям'і? Вядома, дасьць! Усе будуць задаволеныя, што мы зьядналіся, сям'я зробіцца мацнейшай, зьявяцца новыя працоўныя рукі, падтрымка... З гэтага пункту гледжаньня вяртаньне Беларусі ў Эўропу ўзмоцніць ня толькі нас, але і саму Эўропу. Бо іменна таму і адбываецца пашырэньне Эўропы ў апошняе дзесяцігодзьдзе.

Другое меркаваньне больш прагматычнае, яно зьвязанае хутчэй з геаграфічным разуменьнем Эўропы, чым з культурным. Вяртаньне Беларусі ў Эўропу дало б магчымасьць «вялікай Эўропе» ўзаемадзейнічаць (у эканамічным, палітычным, ваенным і іншых аспэктах) з Эўразіяй больш эфэктыўна, адкрыла б новыя пэрспэктывы. Прыкладаў вельмі шмат. Напрыклад, экспарт энэрганосьбітаў з Эўразіі, ня толькі з Расеі, але і з Туркмэніі, Азэрбайджану. І калі сёньня Беларусь уваходзіць у эўрапейскую прастору ня столькі культурна і палітычна, колькі геаграфічна – гэта стварае пэўныя праблемы для ўсяго рэгіёну. Бо ўжо былі такія калізіі, напрыклад, газавы канфлікт у лютым 2004 году. У гэтым сэнсе вяртаньне Беларусі ў Эўропу спрыяла б вырашэньню многіх з гэтых праблемаў, ня толькі транзытных. Умоўна кажучы, мяжа «вялікай Эўропы» праходзіла б не па Бугу, а недалёка ад Смаленску. І гэта, паўтараю, у прагматычным сэнсе Эўропу, несумненна, узмацніла б.

### Аляксандар Мілінкевіч

Тыя традыцыі, што ў нас захаваліся, нават тая архаічнасьць беларуская – гэта вялікая каштоўнасьць. Наш народ не папсаваны тым багацьцем, якое ляжыць пад зямлёй і якое часта не дае нацыям разьвівацца. Мы, народ, які ўсё здабываў цяжкай працай, гісторыю меў і мае трагічную, магчыма, адну з самых трагічных на кантынэнце. У гэтым сэнсе нашая адметнасьць – гэта наш беларускі характар: добразычлівасьць, працавітасьць, тая ж шматпакутная талерантнасьць, ня ў сэнсе абыякавасьці, а ў сэнсе ўспрыняцьця іншых культураў.

## Анатоль Міхайлаў

Баюся, пакуль толькі нэгатыўны досьвед нашай уласнай няздольнасьці наладжваньня камунікацыі і дыялёгу з эўрапейскай культурай. Што ж, даводзіцца суцяшаць сябе тым, што і з гэтага нэгатыўнага досьведу можна атрымаць пазытыўныя ўрокі. Вельмі хацелася б, каб іх атрымалі мы самі, а ня толькі іншыя.

## Алесь Міхалевіч

Я думаю, што Беларусь будзе важная для Эўропы (як, зрэшты, і для ўсяго цывілізаванага сьвету) сваім падыходам да пытаньняў, напрыклад, экалёгіі, пытаньняў захаваньня навакольнага асяродзьдзя – увогуле пытаньняў захаваньня чалавецтва. У Беларусі, якая найбольш пацярпела ад чарнобыльскай аварыі, адназначным будзе ўспрыняцьце ядравых электрастанцыяў і, зрэшты, усялякіх тэхнічных аб'ектаў, якія могуць зруйнаваць чалавецтва пры сваім выбуху, як чагосьці адмоўнага. І гэта тое, што Беларусь можа прыўнесьці, у тым ліку, і ў аб'яднаную Эўропу: сваё разуменьне таго, што людзі недасканалыя, чалавецтва недасканалае, і ня трэба жартаваць і гуляцца з рэчамі, якія могуць гэтае чалавецтва зьнішчыць. На мой погляд, гэта асноўнае з таго, што Беларусь можа прынесьці ўнікальнага, тое, чаго ў цяперашняй Эўропе пакуль што няма.

## Тацяна Працька

Кожная краіна мае таленавітых людзей. І калі б мы жылі ў рэчышчы тых каштоўнасьцяў, якія вызначаныя эўрапейскай супольнасьцю, канечне, мы маглі б даць многа. Паглядзіце, напрыклад, на нашых апазыцыйных палітыкаў – як іх прымаюць на Захадзе! Гэта ж не з таго, што, як кажа беларускае тэлебачаньне, яны гавораць пра Беларусь дрэннае. На самай справе, гэта людзі выдатныя! Яны размаўляюць з эўрапейцамі на адной мове і больш шырока разумеюць тыя праблемы, якія стаяць цяпер перад Эўрапейскім Зьвязам і наагул перад эўрапейскай супольнасьцю. Эўрапейскія палітыкі бачаць, што Беларусь патрэбная Эўропе.

Таксама і нашых мастакоў выдатна прымаюць на Захадзе. Марачкіна лепш ведаюць у Германіі, чым тут, на радзіме.

Таму калі гаворка ідзе пра тое, ці патрэбны мы Эўропе, я сказала б так: Эўропе патрэбна кожная краіна, бо ў кожнай краіны ёсьць сваё месца, свая непаўторнасьць і свая адметнасьць. Мы даем Эўропе не даляр і ня дзесяць даляраў. Мы даем Эўропе тое, што ёсьць толькі ў нас і ў нікога іншага. Таму Беларусь Эўропе патрэбная.

Эўропа падобная да мазаікі: у кожнай краіны ёсьць сваё месца, свой колер, і гэта складае непаўторную карціну эўрапейскай цывілізацыі. І калі нейкая краіна выпадае, тады зьяўляецца чорная пляма. Гэта не ўпрыгожвае карціну. Беларусь – пакуль што «каляровы» кавалачак у эўрапейскай супольнасьці. Але ўсё можа быць... Эўропа ня мае адзінай ідэалёгіі. А мы кіруемся і ў нашым афіцыйным мастацтве, у літаратуры і нават шоў-бізнэсе нейкай ідэалёгіяй. І калі мы хочам навязаць нашу ідэалёгію эўрапейскім краінам, то яны не прымаюць ні нашу ідэалёгію, ні нашых палін смолавых, ні каго іншага з тых, хто парушае эўрапейскія стандарты і прынцыпы.

### Андрэй Саньнікаў

Па-першае, велізарны людзкі патэнцыял. Нягледзячы на ўсе намаганьні Лукашэнкі, у нас узровень адукацыі, і працаздольнасьць, і таленавітасьць...

Беларусы цяпер вымушаныя зьяжджаць за мяжу і заставацца там. Лукашэнка прадэманстраваў, што беларускі народ – даволі паслухмяны, занадта паслухмяны. Гэта значыць, што ў Эўропу ўвойдзе не праблемная краіна, а краіна, якая, па-першае, можа шмат даць, і па другое – краіна, якая будзе выконваць законы. Гэта ўся гісторыя нашая: быў Савецкі Саюз – падпарадкоўваліся савецкім законам, цяпер лукашэнкаўскія законы – ім, а даўней – законам магнатаў, князёў і г. д. Мы даволі паслухмяныя. І значыць, можам з упэўненасьцю казаць, што эўрапейскія законы на тэрыторыі Беларусі будуць выконвацца.

Беларусь шмат чаго можа даць Эўропе і ўжо дала. Можна згадаць імёны, якія гучаць у Эўропе. І ня толькі Шагала. Шмат людзей у розных галінах вядомыя як выхадцы зь Беларусі, яны шмат далі эўрапейскай цывілізацыі. Гэта і адзіны

ў Бэльгіі нобэлеўскі ляўрэат Ільля Прыгожын, які родам зь Беларусі, Барыс Кіт, якога Васіль Быкаў называў «найпершым Беларусам зь беларусаў у сьвеце». І шмат такіх людзей.

У Эўропе вядомае нашае мастацтва. Сёньня шмат людзей жывуць і працуюць з посьпехам у Эўропе. І ня толькі Барыс Заборaў, але і малодшая генэрацыя: Цішын, напрыклад, альбо адзін з найбольш вядомых сёньня ў сьвеце мастакоў Лявон Тарасэвіч. Я ведаю, што шмат навукоўцаў (і даволі буйных!) знаходзяцца там, лідэры ў сваіх галінах у Эўропе. Было б цікава паглядзець такую працу, калі б хто зрабіў (як Мальдзіс займаўся гэтым) – дзе мы і што мы ў Эўропе.

Дарэчы, ужо частка аўтахтонных беларусаў – у Эўропе: празь Літву, Латвію, Польшчу, дзе яны жывуць.

### Уладзімер Улаховіч

Сябе. Уласную цывілізацыю, ідэнтычнасьць, культуру ў шырокім сэнсе слова.

### Валеры Фралоў

Што мы маглі б даць Эўропе? Ну, у нас карысных выкапняў няма... Мы маглі б даць адчуваньне павелічэньня эўрапейскай сям’і, якая кіруецца аднымі каштоўнасьцямі. Думаю, што наша сур’ёзнае багацьце – гэта вельмі магутны чалавечы патэнцыял. У нейкай ступені і для іх, і для нас цікавыя ўзаемныя рынкі збыту.

Калі б мы вялі трохі іншую палітыку – досыць прадказальную, – у іх зьявілася б больш спакою.

### Станіслаў Шушкевіч

Калі ад нечага адарваць кавалак, дык гэта ўжо будзе зусім ня тое. Беларусь належыць Эўропе і ўвесь час нешта дае. Мне пашчасьціла бываць на розных кантынэнтах. Беларусь – тая краіна, дзе можна адчуваць сябе эўрапейцам,

і беларусы – тыя людзі, якія ў Эўропе могуць адчуваць сябе эўрапейцамі. Няма ніякіх тут адрозьненьняў!

Што можа даць? У культурным сэнсе – дала, таму што яна стварыла сваю літаратуру, якая адпавядае ўзроўню эўрапейскай літаратуры. Так, як і ўкраінская – толькі, можа, мы пазьней гэта зрабілі гадоў на пяцьдзясят. Нашы Багдановіч і Купала зьявіліся на пяцьдзясят гадоў пазьней, чым Шаўчэнка. Мастацтва беларускае, дойлідзтва... Мала ў нас засталося гэтых помнікаў, але яны засталіся – тыпова эўрапейскія палацы, касьцёлы, цэрквы (у меншай ступені), панскія дамы. І сялянскі побыт, сялянскія хаты! Я, напрыклад, калі быў у Фінляндыі, якую, мне здаецца, усе адносяць да Эўропы, то бачыў там нават дзесяць гадоў таму такія самыя прымітыўныя дамкі, як у Беларусі. Проста яны яшчэ не пасьпелі стаць абсалютна эўрапейскага ўзроўню ў сучаснасьці, а ў нас у Беларусі такіх дамкоў вельмі многа.

## Усевалад Янчэўскі

Я эўраскептык, прычым страшны.

Зрэшты, скептычнае стаўленьне да праекту Эўрасаюзу і шмат да якіх эўрапейскіх каштоўнасьцяў не азначае, што мы павінны да Эўропы паварочвацца задам. Гэта проста недарэчна.

Да таго ж шмат якія «эўрапейскія каштоўнасьці» – гэта каштоўная рэч для ўсяго чалавецтва. Цярпімасьць, негвалтоўнасьць, павага да чужой думкі, дыялёг, і іншае, і іншае... Гэта ўсё вельмі каштоўна! Калі гэтыя каштоўнасьці сыдуць пад націскам больш маладых агрэсіўных цывілізацыяў, чалавецтва можа адкаціцца назад.

Чым Эўропе магла б быць цікавая Беларусь?

Эўропе, як вялікаму арганізму, увогуле ўсё павінна быць у сьвеце цікава, таму што Эўропа – гэта адзін з сусьветных цэнтраў.

Беларусь – побач зь сёньняшнім Эўрасаюзам. Мы, Расея, Украіна заўсёды зьяўляліся фарпостам на мяжы з Азіяй. Мы і дагэтуль ім зьяўляемся – ува ўсіх сэнсах, пачынаючы ад зусім практычных рэчаў – ад нелегальнай міграцыі, наркотыкаў, злачыннасьці, экстрэмізму...

Так склалася: нас ніхто не ўпаўнаважваў, але мы заўсёды бралі на сябе гэты абавязак і сумленна яго несьлі.

Якімі паліткарэктнымі мы ні хацелі б быць, усё-такі напружаньне паміж цывілізацыямі існуе. Напружаньне, якое пагражае перарасьці ў канфлікт. Мы былі і дагэтуль застаемся нейкім валам, які спыняе гэта ўсё перад Эўропай.

У сілу нашай аўтарытарнай сыстэмы, якую шмат хто крытыкуе, мы закрываем, не ідэальна, але – закрываем! Эўропа гэта недаацэньвае. І недаацэньвае з адной простай прычыны: таму што гэта дадзена проста так!

Давайце прыгадаем Чарнобыль... Ільвіную долю расходаў мы цягнулі і цягнем на сабе. Неяк так выйшла (і гэта крыўдна бачыць і чуць у замежных СМІ), што ў сусьветнай думцы пацярпела ад Чарнобылю перш за ўсё... Украіна! Так, Украіна пацярпела, але ж мы пацярпелі больш за ўсіх! Мы былі пакінуты сам-насам з гэтай бядой і самі зь ёй спраўляемся.

Што ж выходзіць? Беларусь добрасумленна змагаецца зь нелегальнай міграцыяй, Беларусь добрасумленна змагаецца з крымінальным транзытам, з гандлем наркотыкамі, злачыннасьцю, экстрэмізмам. Беларусь на сваёй тэрыторыі забясьпечыла на самай справе спакойнае мірнае жыцьцё і сама не зьяўляецца крыніцай нейкіх канфліктаў. Але гэтага ня цэніцца! І за гэта дзякуй не гавораць. Я ўжо не кажу, што ўвогуле ў сьвеце за гэта многім плацяць – нам жа ня плацяць ні капейкі.

Таму мы ў Эўропу прыносім нямала добрага. Магла б і Эўропа што-небудзь добрае прынесьці нам...

## 4. Ці павінна Беларусь ажыцьцявіць які-небудзь стратэгічны выбар? Калі так, то які: Саюзная дзяржава Беларусі і Расеі, Эўразьвяз, СНД? Ці гэтыя выбары ўзаемавыключальныя? Што варта зрабіць, каб ажыцьцявіць іх?

**Вольга Абрамава**

У вайскова-палітычным саюзе з Расеяй мы будзем, давайце разважаць цьвяроза. Магчымы і шэраг іншых саюзаў з тых, у якіх Беларусь удзельнічае альбо можа ўдзельнічаць (напрыклад, у Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва). Калі гэта выгадна – значыць, там трэба быць. Калі гэта мэтазгодна – значыць, там трэба быць. Што да альтэрнатываў, то я, уласна кажучы, ня бачу, чаму нельга быць у саюзе з Расейскай Фэдэрацыяй, не ўваходзячы ў яе, а маючы асаблівыя стасункі з Расейскай Фэдэрацыяй, і ў той жа час – наладзіць такія самыя асаблівыя стасункі з Захадам. Больш за тое, зусім ідэальны варыянт – калі і Расея пачала б рухацца ў кірунку інтэграцыі ў эўрапейскія структуры на аснове, вядома ж, узаемнага жаданьня і ўзаемнай выгады.

Сёньня для Беларусі пытаньня ўваходжаньня ў эўраструктуры наагул не стаіць. У далёкай будучыні яно можа паўстаць. Але тут якраз традыцыйны прагматызм беларусаў спрацуе на карысьць: нас, як і Ўкраіну, ня хочуць пакуль бачыць у Эўропе. Вельмі многія эўрапейскія палітыкі (прычым тыя, што маюць палітычную вагу, «цяжкавагавікі») неаднаразова выступалі за апошняе дзесяцігодзьдзе на разнастайных міжнародных канфэрэнцыях, форумах высокага ўзроўню з такімі азначэньнямі: «Трэба выразна сказаць Расеі, Украіне, Беларусі, што яны ніколі ня будуць у Эўрасаюзе. Не таму, што мы ня хочам іх там бачыць, а таму што надта вялікія абавязаньні Захаду перад папярэднім эшалёнам,

перад цэнтральнаэўрапейскімі краінамі, надта вялікія нашыя матэрыяльныя, фінансавыя абавязаньні. Мы проста не пацягнем новых членаў». Гэта, можа, і добра. Ведаеце, іншым разам лепш пастаяць убаку і паглядзець, у што гэта ператворыцца. Мне б ні ў якім разе не хацелася апынуцца ў становішчы просьбіта, датычыць гэта патэнцыяльнага ўваходжаньня ў Расею (з чыста прагматычнага пункту гледжаньня, хоць я не прымаю гэтага палітычна) альбо ў Эўрасаюз. З просьбітам адпаведна і абыходзяцца – як з «бананавай рэспублікай», якая ня мае права голасу. На што яна можа прэтэндаваць, калі яна так прасілася і білася ва ўсе дзьверы, як матылёк у шкло запаленай лямпы? Гэта ня той варыянт. Вельмі нават нядрэнна, што ў Беларусі будзе час (я думаю, дзесяць-пятнаццаць гадоў) добра асэнсаваць, які лёс суседзяў, што ўвайшлі ў гэтую прастору, плюсы і мінусы працэсу. Такія рэчы дапамагаюць надалей (калі прымаецца рашэньне пра ўваходжаньне ў тую ці іншую структуру) істотна скараціць шлях і рухацца згодна з найбольш эфэктыўным варыянтам. Ня мэтадам спробаў і памылак, а адкідваючы ўсё тое, што нам не падыходзіць, што для нас непрымальна, і загадзя агаворваючы тыя ўмовы, якія вылучаюцца з нашага боку, а ня толькі з боку, што прымае.

Паколькі мы – краіна, якая знаходзіцца... не скажу – на разломе цывілізацыяў, але ва ўсякім разе – на стыку цывілізацыйных тыпаў, у Беларусі місія больш складаная, і нам складаней артыкуляваць нашыя нацыянальныя і дзяржаўныя інтарэсы. Наш інтарэс – гэта адмова ад канчатковага цывілізацыйнага выбару. І гэта – таксама выбар. Прынамсі, ня трэба зь ім сьпяшацца. Няхай сусьветная палітыка зробіцца больш пэўная. XX стагодзьдзе прынесла занадта вялікія ўзрушэньні, уключаючы і распад Савецкага Саюзу. Няхай вызначацца канстанты больш выразна, чым яны вызначаны цяпер. І тады Беларусь знойдзе – гнутка, разумна, рацыянальна – сваё месца ня толькі ў эўрапейскай, але і ў сусьветнай палітыцы.

## Сьвятлана Алексіевіч

Самае рэальнае – гэта саюз з Расеяй. Але гэта ўсё-такі павінны быць дзьве асобныя дзяржавы, а не адна. Для гэтага павінна праводзіцца пісьменная палітыка, пісьменнае выхаваньне – пачынаючы зь дзіцячых садкоў. Трэба рыхтаваць эліту, а ня цешыць сябе ілюзіямі. На савецкіх кухнях таксама ўвесь час гаварылі, што галоўнае – скінуць камуністаў. Скінулі, і што? Выявілася, што ніхто не гатовы да таго, што трэба рабіць далей. А краіна была ўсё ж нашмат большая за Беларусь...

На роўных у Эўропу для нас увайсьці немагчыма. Ніхто ў Эўропе не чакае з распасьцёртымі абдымкамі зруйнаваную краіну. Там ідзе вельмі жорсткая барацьба за рынак – нават сярод тых краінаў, якія даўно ўвайшлі ў гэтую прастору. А ў нас няма ніякага іншага тавару, апроч нашай мары – мары пра тое, што мы хочам увайсьці ў Эўропу...

## Яўген Бабосаў

Беларусь свой стратэгічны выбар зрабіла. Ён заключаецца ў тым, што яна павінна праводзіць шматвэктарную эканамічную, палітычную, культурную палітыку. Ня толькі саюз з Расеяй, але і з Эўрасаюзам. Але гэта павінна быць зроблена на пачатках узаемаразуменьня, узаемапрыманьня. Ня толькі мы прымаем, але і нас павінны прымаць як мы ёсьць. У гэтым сэнсе, вядома, ад Расеі адрывацца ня варта. З Эўрасаюзам – шукаць выхады туды трэба. Што да СНД, гэта рыхлая, неэфэктыўная і, рэальна кажучы, ні на што не прыдатная арганізацыя. І калі зь яе выйдуць Украіна і Грузія (а хутчэй за ўсё, яны выйдуць), тады невядома, з кім жа нам з СНД аб'ядноўвацца. З Кіргізіяй? Яна таксама хутчэй за ўсё выйдзе. З Казахстанам? Так, але там палова расейцаў і беларусаў жыве – я там быў і ведаю: паўночная частка Казахстану (я езьдзіў на цаліну з Рыгорам Барадуліным) – там беларусы, украінцы, расейцы, а казахаў было вельмі мала. Цяпер яны там трошкі размножыліся...

Дык я думаю, Саюзная дзяржава Беларусі і Расеі патрэбная. Але гэта ня значыць, што трэба адрывацца ад Эўропы. Шматвэктарнасьць: на ўсход, і на

захад, і на поўдзень, і на поўнач. З Украінай – сябраваць! Таму што можна не сябраваць зь Юшчанкам (дапусьцім, нехта яго ня любіць) ці зь Януковічам, але Беларусь, Расея і Ўкраіна выйшлі з аднаго кораня. І некалі Багдановіч гаварыў, што ў нас адзін народ, але ў трох іпастасях: беларускі, расейскі і ўкраінскі. І культура ў нас не адна славянская, а тры. З аднаго кораня, але – тры! І падзецца ад гэтага няма куды, адарвацца нельга. Я добра ведаў нябожчыка акадэміка Ліхачова. Ён казаў: «Кіеў – калыска зямель руськіх». Ня «русских», а «руськіх», ад «Русь» – Белая, Чорная, Малая і Вялікая. Слушна казаў, што Кіеў – гэта ніякая не Ўкраіна (Украіна ўзьнікла потым), Кіеў – гэта праруская зямля. Адтуль хрысьціянства пайшло ў праваслаўнай вэрсіі. Ад гэтага ж адмаўляцца нельга! Таму я думаю, што трэба шукаць саюзу ня толькі на ўсход – з Расеяй, але і з Украінай абавязкова. Можна любіць ці не любіць урад, але ж народы застаюцца.

А чаму не сябраваць зь Літвой? Жылі ж у адной дзяржаве. На ўсе чатыры бакі павінна быць стратэгія накіраваная, на ўваходжаньне ў сьвет. А чаму нам, дапусьцім, не разьвіваць стасункаў з тым жа Ўсходам, з тым жа Ізраілем? Там жа зь пяці прэзыдэнтаў, якія былі ў Ізраілі, трое – зь Беларусі родам, свае людзі. Ну, габрэі. Ну і што? Калі зь імі пагутарыць, дык і беларускую мову нават ведаюць, думаю.

Значыць, гэтыя стратэгічныя выбары ўзаемавыключальнымі быць ня могуць. Яны павінны быць узаемадапаўняльнымі – на поўнач, усход, поўдзень і захад. Беларусь павінна быць адкрытай дзяржавай і адкрытым грамадзтвам. Гэта не адно і тое ж. Адкрытае грамадзтва павінна ўбіраць у сябе зьлева і справа, з усходу і з захаду, з поўдня і поўначы – і аддаваць туды ж! Толькі тады будзе ўзаемаўзбагачэньне культураў, цывілізацыяў. І толькі тады краіну будуць паважаць усюды.

Для таго каб увасобіць у жыцьцё гэты стратэгічны выбар, трэба заставацца вернымі самім сабе, заставацца беларусамі ў гэтым сьвеце і ўсяляк прымнажаць духоўныя традыцыі, якія робяць Беларусь Беларусьсю. Таму што, урэшце, чым адрозьніваецца адзін народ ад другога? Чым адрозьніваецца Францыя ад Англіі? Ды культурай жа адрозьніваецца! Мода – тая самая, ядуць – тое самае, п’юць каньяк – той самы, глядзяць парнуху – тую самую, кінафільмы галівудзкія, амэрыканскія – тыя самыя. А нечым жа адрозьніваюцца!

У гэтым сэнсе ў французаў трэба вучыцца. Старэйшае пакаленьне добра памятае, і малодшае, мабыць, ведае Мірэй Мацье, знакамітую сьпявачку. Калі пачалася амэрыканская экспансія – насаджэньне амэрыканізму, пачынаючы з «Макдоналдсу», амэрыканізацыя (вэстэрнізацыя роўная амэрыканізацыі), яна выступіла з канцэртам. Яна дзесяць гадоў не сьпявала і выступіла з канцэртам на дзьве з паловай гадзіны «Made in France» («Зроблена ў Францыі»). У гэтым канцэрце яна сьпявала і адначасова расказвала: параўнайце тое, што мы паглынаем, амэрыканскую культуру, амэрыканскія фільмы – і французскія. Зразумела? Параўнайце амэрыканскую опэру – і французскую. Параўнайце амэрыканскі раман – і французскі. Параўнайце амэрыканскі тэатар – і французскі. Дык што мы кажам? Хто ў каго павінен вучыцца?! Яна адыграла калясальную ролю! Яе любяць у Францыі і дагэтуль. Была такая грамадзкая думка, што ўсе шыльды ў Францыі – нам трэба вучыцца! – усе шыльды, апрача «Макдоналдсу», – на французскай мове. Толькі «Макдоналдс» – таму што сусьветна вядомы. Астатняе ўсё павыкідалі, пакінулі толькі на французскай. Калі вы паедзеце ў Францыю і возьмеце з сабой візытку, дзе на адным баку будзе на расейскай мове напісана «Иванов», а на другім – на ангельскай мове, а французскай ня будзе, вас проста палічаць няветлівым чалавекам. Калі ты едзеш у Францыю, ты напішы на сваёй нацыянальнай, і цябе зразумеюць. Не зразумеюць, дык перакладчыка возьмуць! А калі ты напісаў на сваёй і на ангельскай, а паехаў да французаў – якога чорта ты туды едзеш?

І яшчэ адна рэч. Французскае тэлебачаньне (там некалькі каналаў) прыняло рашэньне, што кінапракат, які ідзе праз французскае тэлебачаньне, павінен мець 20% амэрыканскіх фільмаў, а астатнія – эўрапейскія. Італьянскае кіно (не амэрыканскае! Клясыкі дзе?), французскае кіно, былое савецкае кіно – дагэтуль, дарэчы, яно цэніцца. Калі паказалі «Рамэо і Джульету» нашай, савецкай вытворчасьці за мяжой, там усе плакалі: чаму мы такога не зрабілі?..

Так што для таго, каб увасобіць гэтыя стратэгіі ў жыцьцё, трэба, па-першае, заставацца самім сабой. Па-другое, ведаць, што ты эўрапеец і да цябе – такія ж патрабаваньні, як да французаў, швэдаў. І нітрохі мы швэдам не саступаем, ні ў чым. Калі мы саступаем у нечым, дык вялікім нацыям – Францыі (перш за ўсё ў культуры) і Англіі (у цывілізацыі), і ўсё! Немцам мы ні ў чым не саступаем.

## Анжаліка Борыс

Мне не падабаецца слова «павінна». Беларусь мае права зрабіць любы стратэгічны выбар, аднак ён мусіць адпавядаць волі беларускага народу. А вось для таго, каб народ мог выказаць сваю волю, *павінны* ўзьнікнуць умовы. У першую чаргу неабходная свабода доступу да інфармацыі, канкурэнцыя меркаваньняў і ўменьне весьці грамадзкую дыскусію, у якой бы большасьць навучылася прыслухоўвацца і паважаць думку меншасьці.

## Ірына Бугрова

Самаідэнтыфікацыя ў большасьці краінаў супала зь лібэральным пэрыядам.

Пасьля 11 верасьня 2001 году, з пачаткам III тысячагодзьдзя, пачаўся новы пэрыяд адраджэньня нацыянальнай ідэнтычнасьці. Сьвет вяртаецца да блёкавай сыстэмы: калі ты ходзіш у маю «пясочніцу», то ты ня сьмееш, не павінен хадзіць у «пясочніцу» майго суседа. Усё гэтае вяртаньне да блёкавай сыстэмы ні да якога пазытыўнага выніку не прывядзе. Сучасны глябальны сьвет паводле сваёй прыроды адкрыты, а блёкавая сыстэма вядзе да вяртаньня ў эпоху архаічных войнаў («вінных», «мінэральных»), што мы назіраем ужо цяпер. Аўтарытэту «вялікай васьмёркі» і Рады Бясьпекі ААН ненадоўга хопіць для таго, каб «разрульваць» такія сытуацыі.

Калі б Беларусь займалася нармальнай замежнай палітыкай, дык аптымальным для яе быў бы нэўтральны статус. Да ўступленьня ў Эўрасаюз нам яшчэ вельмі далёка. Нам яшчэ належыць прайсьці вельмі няпросты пэрыяд адаптацыі.

## Генадзь Бураўкін

Такі выбар павінен быць. Але гэта ня значыць, што ён ёсьць. Для мяне бясспрэчна, што Беларусь павінна быць самастойнай. І таму ніякай адзінай саюзнай дзяржавы я ня бачу. І таму прыходу ў Эўразьвяз нейкім бедным сваяком

я таксама ня бачу. Я лічу, што Беларусь павінна быць самастойнай дзяржавай, самадастатковым народам, які павінен разьвівацца ў інтарэсах сваіх людзей, і маючы тую тэрыторыю, якую даў Бог, і маючы тую гісторыю, якую нам даў Бог і суседзі і мы самі ўзялі, мы мусім прывучыць і сябе, і іншых да таго, што мы павінны адчуваць сябе абсалютна роўнымі ў сьвеце і абсалютна самастойнымі. Паколькі абсалютнай самастойнасьці ў сёньняшнім складаным сьвеце быць ня можа, то, бясспрэчна, у нас павінны быць стасункі з суседзямі, перш за ўсё, і з усім сьветам таксама – мы ж ня нейкая незямная цывілізацыя, мы тут, на гэтай зямлі, дзе столькі дзяржаваў, столькі народаў. І мы зь імі павінны быць. І бясспрэчна, у нас будуць найцясьнейшыя сувязі і стасункі – і дзяржаўныя, і культурныя, і нават чыста чалавечыя – з Расеяй, Украінай, Польшчай, Літвой, яны найбліжэйшыя да нас суседзі, зь якімі ў нас вельмі многа супольнага ў гісторыі. Калі ласка, заключайце ўзаемавыгадныя двухбаковыя пагадненьні, заключайце нават двухбаковыя саюзы, толькі – зноў жа хачу падкрэсьліць! – не ваенныя, бо «беларусы – мірныя людзі», як сьпяваецца нават у нашым сёньняшнім дзяржаўным гімне. Мы мірныя людзі, і таму ня трэба нам уваходзіць ні ў якія вайсковыя саюзы. Гэта была выдатная задумка, якая, на жаль, ня спраўдзілася, калі думалі пра лёс сувэрэннай Беларусі, і адным з абавязковых запісаў зрабілі: «Беларусь павінна быць бязьядравай, нэўтральнай дзяржавай». Я думаю, што тут сапраўды пазначана дарога, якой мы мусім ісьці. А саюзы – калі ласка! І з Расеяй, і з Польшчай, і зь Літвой, і з Амэрыкай, і з Францыяй, і з Германіяй. Але – пры адной умове: гэтыя ўсе саюзы павінны быць на карысьць самастойнай беларускай дзяржавы, на карысьць беларусаў і з абавязковым улікам інтарэсаў беларусаў. З улікам інтарэсаў і расеян, і немцаў, і палякаў, але на першым месцы – беларусаў.

Я думаю, у нас хопіць вартых людзей. Гэта толькі недастаткова адукаваныя і несур’ёзныя людзі гавораць, што ў нас не хапае разумных, таленавітых людзей. Людзей у нас хапае. У нас не хапае ўмоваў, якія павінна ствараць дзяржава для таго, каб гэтыя таленавітыя разумныя людзі паказвалі вышыню свайго розуму, сваёй адукаванасьці, сваёй прафэсійнай падрыхтоўкі і каб ім былі адкрытыя магчымасьці займаць у дзяржаве такое становішча, як дазволяць таленты, дадзеныя ім Богам, або бацькамі, або зямлёй нашай роднай

беларускай. Калі гэта будзе, то я не сумняваюся, што ўсё будзе добра і мы знойдзем той балянс дачыненьняў з Усходам і Захадам, з далёкай Афрыкай і з блізкімі эўрапейскімі краінамі. Думаю, калі мы разумна ўладкуем нашу дзяржаву, вялікіх праблемаў ня будзе. У нас ёсьць выгаднае становішча, мы на шляхах узаемасувязяў, дачыненьняў, узаемасупрацоўніцтва вельмі многіх разьвітых, сур'ёзных дзяржаваў.

У нас цудоўная прырода. Нездарма нашыя балоты называюць лёгкімі Эўропы. Бачыце – і тут Эўропа. Самім Богам мы завязаны на Эўропу. Бязь лёгкіх чалавек жыць ня можа, яму трэба дыхаць. А лёгкія Эўропы завязаныя на Беларусь...

Можа быць, я крыху ідылічную карцінку малюю, але ж хацелася б гэтага. Думаю, што праблем ня будзе: калі Беларусь будзе адчуваць сябе самастойнай, самадастатковай, годнай, тады нашы палітыкі знойдуць рэальныя фармальныя спосабы неяк так аформіць, каб мы нікога ня крыўдзілі і нас ніхто ня крыўдзіў.

Беларусы ўмеюць працаваць. У нас дастаткова сур'ёзны ўзровень навуковага патэнцыялу. У нас ёсьць цікавая, непаўторная культура. У нас ёсьць рукі. І як кажа адзін з нашых палітыкаў, мазгі ёсьць. Не ва ўсіх, але ёсьць.

Так што я ня бачу праблемы «куды». Трэба думаць не пра тое, куды нам хінуцца – на Захад ці на Ўсход, а пра тое, як нам самім сябе забясьпечыць нармальным жыцьцём і нармальнымі дачыненьнямі зь іншымі, і хінуцца да таго, хто (даруйце за гэтае прагматычнае слова) найбольш выгадны для Беларусі, для беларускай дзяржавы, для беларускага народу.

### Алесь Бяляцкі

Улічваючы, што я эўрафіл, я лічу, што адзіны шлях, які можа вывесьці Беларусь на добрую каляіну і ня быць занадта доўгім (усё астатняе будзе проста запавольваць гэты шлях), – гэта ўступленьне ў Эўразьвяз. На сёньняшні дзень мы знаходзімся паміж двух магутных утварэньняў: з аднаго боку, Эўразьвяз, з другога – Расея. І нават калі чыста лягічна суаднесьці са стандартамі, якія ў нас існуюць на сёньняшні дзень, выжыць нам адным будзе немагчыма: мы ўсё адно будзем знаходзіцца пад уплывам, нас будзе ліхаманіць, нас будзе трэсьці, нас

будзе «кілбасіць» увесь час, пакуль мы ня вызначымся. Гэта дастаткова важна для нас: вызначыцца, як мага хутчэй правесьці рэформы, зьмены (гэта тычыцца адукацыі, эканомікі, падыходаў да культуры, да правоў чалавека, усяго сацыяльнага блёку). Уступленьне Беларусі ў Эўразьвяз для мяне – проста праблема нумар адзін. Самае галоўнае, што нам трэба было б зрабіць, – «ускочыць» як мага хутчэй туды. Так, як гэта зрабілі прыбалтыйскія краіны, гэтым самым забясьпечыўшы сябе кучы пагрозаў.

Як і ў НАТО! Я перакананы: пакуль Беларусі ня будзе ў НАТО, уступленьне ў Эўразьвяз далёка ня вырашыць усе нашыя праблемы, бо на ўсходзе мы маем сёньня такое суседзтва... Гэта будуць пэўныя гарантыі. Для мяне, як праваабаронцы, стандарты Эўразьвязу на сёньняшні дзень ёсьць найвышэйшымі стандартамі правоў чалавека, якія існуюць. Стандарты ў разьвіцьці нацыянальных культураў, у разьвіцьці лякальных супольнасьцяў там дастаткова высокія, хаця, можа быць, яны і не дасканалыя, але дасканалага нічога няма. Усё гэта дазваляе нам атрымаць добры падмурак для адбудовы, для рэканструкцыі, паўставаньня нашай нацыі пасьля 90-гадовага заняпаду.

Я лічу названыя выбары ўзаемавыключальнымі, гэта несумяшчальныя рэчы. Нам трэба вызначацца! Ня можа быць Беларусь адначасова адной нагой там, а другой – там. Бо разьдзяруць, як ліпку.

Іншая справа, што сварыцца, канечне, нельга і ня трэба. Займаць пазыцыю тупалобых русафобаў ці яшчэ якіх «фобаў» абсалютна ня варта. Як бы там ні было, я не разглядаю Расею як «згубленую краіну». Гэта краіна, якая мае нармальны патэнцыял для разьвіцьця, проста яшчэ не прыйшоў яе час. Ён, можа, прыйдзе (тут я з Кавалёвым згодны) праз сорак гадоў, праз шэсьцьдзесят... З другога боку, трэба будаваць свае зносіны, безумоўна арыентуючыся на Эўразьвяз. Не будуючы ніякіх ілюзіяў на бліжэйшыя дваццаць-сорак гадоў, што мы можам з Расеяй штосьці такое вартае ўвагі стварыць.

### Аляксандар Вайтовіч

Несумненна, што Беларусь у сваёй зьнешняй палітыцы павінна кіравацца сваімі нацыянальнымі інтарэсамі. Патрэбы эканамічнага разьвіцьця, геагра-

фічнае разьмяшчэньне патрабуюць ад нас добрых дачыненьняў як з усходнімі, так і з заходнімі суседзямі. Цяперашні стан гэтых стасункаў прыводзіць мяне да высновы, што неабходна захаваць стратэгічнае партнэрства з Расеяй і сумесна рухацца да адзінай эканамічнай і гуманітарнай прасторы з Эўрасаюзам.

І яшчэ хацеў бы тут спыніцца на дзьвюх акалічнасьцях.

Першая. Думаю, што тэрмін «саюзная дзяржава» юрыдычна неабгрунтаваны, бо ён азначае адну, а ня дзьве сувэрэнныя дзяржавы.

Другая. Амаль у кожнай сваёй прамове вышэйшы чыноўнік краіны робіць недапушчальныя выпады ў адрас розных краінаў: і суседніх, і больш далёкіх. Гэта наносіць вялізную шкоду нашай краіне. І паколькі я вырас у вёсцы, дык у мяне такія паводзіны вызываюць асацыяцыі з занадта сварлівым дзядзькам, якога ніхто ў вёсцы ня любіць.

### Андрэй Вардамацкі

Думаю, цяпер няправільна ставіць пытаньне ў тэрмінах «або – або». Цяпер было б адэкватна ставіць пытаньне ў тэрмінах «і – і». Адэкватна з пункту гледжаньня нацыянальнага характару, мэнтальнасьці, эканамічнай сытуацыі, нашага геапалітычнага становішча. Такі наш геапалітычны, мэнтальны і эканамічны лёс! І гэта нармальна. Тут няма нечага абразьлівага ў сэнсе «прадажнай дзеўкі» і г. д.

Нават калі гаварыць пра чыста эканамічны ўзровень! Бо ў нас жа, з пункту гледжаньня фінансавых аб'ёмаў, цяпер ужо няма арыентацыі ні толькі ў бок Расеі, ні толькі ў бок Эўропы. І там, і там мы бачым вялікія фінансавыя лічбы. І на ўсходнім, і на заходнім вэктары мы бачым рух у бок пашырэньня нашай арыентацыі, нашай мэнтальнасьці. І там, і там мы бачым свае гістарычныя карані.

### Вінцук Вячорка

У пытаньні – фармалізм. Ня будзем тут разважаць пра ступень рэальнасьці/фікцыйнасьці «саюзнае дзяржавы» ці СНД. Можна фармальна заставацца ў СНД (як Украіна), але паступова набліжацца да сапраўднае мэты. Насамрэч выбар

ёсьць цывілізацыйны, а ў якіх інстытуцыянальных формах і ў якой пасьлядоўнасьці ён адбудзецца – перш НАТО, а потым Эўразьвяз, – гэта ўжо тактыка.

Іншы выбар – перш Расея, а потым (як бачым) Кітай, Шанхайская арганізацыя супрацы альбо штосьць падобнае – пярэчыць эўрапейскай сутнасьці Беларусі й асуджаны на правал.

### Павал Данейка

Я б сфармуляваў гэтае пытаньне па-іншаму, з каштоўнаснага пункту гледжаньня: беларусы – гэта Эўропа ці Расея? Тое, як фармулюеце гэта вы, гэта розныя палітычныя канфігурацыі, саюзы. Але калі каштоўнасьці – гэта назаўсёды, дык саюзы – на час. Любыя саюзы. Таму першаснае пытаньне – кім сябе бачыць і адчувае Беларусь? Я думаю, што яна сябе адчувае часткай Эўропы. Мы можам праводзіць розныя сацыялягічныя апытаньні, спрабуючы атрымаць лабавыя адказы на лабавыя пытаньні. Я думаю, усе яны будуць маной. Апрача яўнай, усьвядомленай намі веды, ёсьць няяўныя ўяўленьні аб рэчаіснасьці, якія актуалізуюцца ў моманты выбару. Паколькі ў беларусаў не было яшчэ выбару, яны яшчэ не стаялі перад гэтай праблемай, то гэтае ўяўленьне ўсё яшчэ не актуалізаванае. Але маё адчуваньне такое, што выбар у Беларусі зроблены адназначна большасьцю насельніцтва, абсалютнай большасьцю. І татальна.

### Андрэй Дынько

Выбар паміж прыналежнасьцю да Эўраазіяцкай эканамічнай супольнасьці і Эўразьвязу ўзаемавыключальны. Ня можна быць і там, і там: трэба выбіраць. Але ёсьць іншы выбар: фінляндызацыя Беларусі. Статус нэўтральнай дзяржавы, якая мае аднолькава добрыя дачыненьні як з Расеяй, так і з Эўразьвязам. Але я думаю, што для варыянту фінляндызацыі шанцы былі ў 1990-х гадах. Пасьля таго, што мы пэражылі за Лукашэнкам, фактычна, пад расейскім пратэктаратам, і калі глядзець на тэндэнцыі вакол Беларусі і ў самой Беларусі, то я схільны думаць, што ў бліжэйшыя дзесяць-пятнаццаць гадоў Беларусь зробіць выбар на карысьць уступленьня ў эўрапейскія і эўраатлянтычныя структуры.

## Сьвятлана Калінкіна

Мне здаецца, што СНД наагул дажывае апошнія дні. Таму ў нейкай пэрспэктыве разглядаць гэтае аб'яднаньне ня мае сэнсу. Хаця ў тым ці іншым выглядзе могуць існаваць нейкія такія міждзяржаўныя... не саюзы, а кансультацыйныя нейкія органы краінаў былога Савецкага Саюзу. Але я думаю, што гэта ня будзе СНД і нават ня будзе нешта фармальна строгае. Гэта хутчэй будуць утварэньні па інтарэсах ці па геаграфічным суседзтве.

Актуальнае цяпер пытаньне – гэта саюзная дзяржава і наагул уступленьне ў склад Расеі. Актуальнае таму, што разглядаюцца і палітолягамі, і паліттэхнолягамі (і нашымі, і расейскімі) розныя варыянты працягу палітычнай кар'еры лідэраў: і Лукашэнкі, і Пуціна. І зразумела, што адзін з варыянтаў (на погляд некаторых, нават найбольш просты варыянт) – гэта аб'яднаньне дзяржаваў. Гэта для Беларусі вельмі і вельмі небясьпечна. Яшчэ і таму небясьпечна, што ў Расеі цяпер нейкі такі рэнэсанс імпэрскіх настрояў, і вельмі шмат зьявілася палітыкаў і палітолягаў, якія менавіта так настроены: каб аднавіць вялікасьць Расеі, трэба прырастаць новымі землямі! Зразумела, што ў гэтым сэнсе Беларусь для іх – вельмі цікавы «партнэр». Гэта вялікая небясьпека! І мне здаецца, што цяпер тут, у Беларусі, уважліва слухаючы нашага лідэра, які кажа, што ён ні ў якім разе не аддасьць сувэрэнітэту Беларусі, мы неяк супакоіліся. Але ў той жа час мы добра ведаем Лукашэнку: яму сёньня сказаць адно, а заўтра зрабіць другое – гэта ніякіх цяжкасьцяў не складае. Таму мне здаецца, што менавіта гэтаму цяпер трэба найбольшую ўвагу надаваць.

Што тычыцца Эўразьвязу. Зразумела, што калі мы будзем разглядаць ідэальныя схемы, то месца Беларусі – у Эўропе і Эўразьвязе. Але я думаю, што гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі і Расея ўступіць у Эўразьвяз. Такія варыянты разглядаюцца... Ведаеце, шэсьцьдзесят гадоў таму не было НАТО. А дваццаць гадоў таму ніхто ня мог падумаць, што ня будзе Варшаўскага дагавору. Усё мяняецца, і я думаю, што, напэўна, гэта будзе. І калі ў Расеі ня будзе нейкага адыходу да левых пазыцыяў, калі левыя ня прыйдуць да ўлады, то я думаю, што гістарычна ў гэтым кірунку будзе ісьці разьвіцьцё. Саюз Германіі, Расеі й Францыі геапалітычна матываваны, і заўсёды, калі арыентавацца на гісторыю,

былі спробы стварэньня менавіта такіх саюзаў. Зразумела, з розным вынікам... Таму я не выключаю, што менавіта так будуць разьвівацца падзеі. Тады, мне здаецца, Беларусь і будзе ў Эўразьвязе.

## Сяргей Калякін

Ня трэба ніколі нічога неабдумана разбураць – напрыклад, сёньня Беларусі заяўляць пра нейкія крокі, пра выхад з СНД, спыненьне членства ў Саюзе Беларусі і Расеі. Таму што неабдуманыя крокі заўсёды могуць прывесьці да вельмі дрэнных вынікаў для Беларусі і яе народу. Усё трэба рабіць вельмі абачліва. Трэба ўступаць у любыя саюзы і заключаць любыя пагадненьні – пяць разоў падумаўшы. Але калі яны дзейнічаюць шмат гадоў і вырашаюць пэўныя праблемы – дык трэба яшчэ больш падумаць, перш чым адтуль выходзіць. Гэта вельмі складанае пытаньне.

Што да ўступленьня ў Эўрасаюз. Па-першае, тут ня ўсё залежыць ад нас. У цяперашні момант пытаньне пра ўступленьне Беларусі ў Эўрасаюз не стаіць у парадку дня Эўрасаюзу. Сёньня ўвогуле ў парадку дня Эўрасаюзу не стаіць і найбліжэйшыя пару дзясяткаў гадоў (а хутчэй за ўсё – пад трыццаць) такое пытаньне стаяць ня будзе. Ім бы завяршыць абвешчаны этап пашырэньня Эўрасаюзу і адолець цэнтрабежныя тэндэнцыі, якія сёньня ўзьнікаюць у самой аб'яднанай Эўропе ў сілу досыць істотнага пашырэньня за кошт далучэньня краінаў зь вельмі рознымі эканамічнымі, палітычнымі і іншымі сыстэмамі. Таму ставіць у парадак дня пытаньне пра ўступленьне Беларусі ў Эўрасаюз – гэта, на мой погляд, вялікае забяганьне наперад і неадпаведнасьць існым рэаліям.

У нас ёсьць іншая вельмі важная задача, што тычыцца нашага ўзаемадзеяньня з Эўропай, якая пашырылася. Мы адзіная краіна, што апынулася па-за рамкамі праграмы «Новыя суседзі», абвешчанай Эўрасаюзам. Нам трэба сёньня вырашаць праблему: як уключыцца ў гэтую праграму, якая дазваляе адладзіць дачыненьні з пашыранай Эўропай. Бо сытуацыя зьмянілася! Калі раней мы маглі весьці ўзаемадзеяньне з Польшчай, Літвой, Латвіяй, іншымі дзяржавамі, якія сёньня ўвайшлі ў склад аб'яднанай Эўропы, сам-насам, дык сёньня мы ўжо вымушаны гэта ўзгадняць зь «Вялікай Эўропай». А там ужо інтарэсы іншыя. Сёньня

Польшча павінна ад сваіх інтарэсаў часам адмаўляцца ў рамках агульнай Эўропы. І гэта шкодзіць інтарэсам Беларусі, але Польшча выбрала гэты шлях. Сёньня нам трэба, уступаючы ў дачыненьні з аб'яднанай Эўропай у рамках праграмы «Новыя суседзі», спрабаваць атрымаць для сябе лепшыя мажлівасьці ўзаемаадносінаў. Можа, нават нейкія выключныя мажлівасьці! І сёньня часткова Эўропа можа на гэта пайсьці. Я маю на ўвазе, захаваць асаблівыя стасункі – эканамічныя, палітычныя, прыгранічныя – з тымі краінамі, зь якімі мы раней мелі двухбаковыя дачыненьні без агульнай Эўропы.

Безумоўна, мы павінны быць зацікаўленыя ў тым, каб Эўропа была адкрыта для нас, – гэта сёньня адзін з самых вялікіх рынкаў: 450 мільёнаў насельніцтва – гэта адзін гіганцкі рынак, куды мы павінны імкнуцца. З нашымі таварамі, з нашымі паслугамі, з нашымі прадуктамі... Гэта вельмі няпроста. Але самаізалюючыся, не выбудоўваючы добрасуседзкіх, дружалюбных стасункаў з аб'яднанай Эўропай, мы страцім гэты рынак. Барацьба за гэты рынак сёньня ідзе, і яскравы прыклад таму – экспансія Кітаю на той самы рынак Эўропы і ЗША. Мы павінны быць у гэтым зацікаўленыя!

Але мы не павінны забываць, што Эўропа – гэта толькі адна частка нашых суседзяў. Ёсьць і іншыя часткі – тая ж Украіна і тым больш Расея. Таму калі сёньня ў нас ёсьць асаблівыя дачыненьні з Расеяй, якія выгадныя Беларусі, мы павінны іх захоўваць. Ня трэба іх разбураць! Яшчэ раз кажу: разбурыўшы іх, мы не атрымаем нічога ўзамен. Бо Расея – гэта таксама ня толькі энэрганосьбіты, ня толькі сыравіна. Гэта таксама рынак, і досыць сур'ёзны рынак збыту для нашай прадукцыі. Па асноўнай намэнклятуры прадукцыі ён сёньня для нас зьяўляецца галоўным, хоць у гандлёвым балянсе колькасна Эўропа, можа, ужо пераўзыходзіць Расею ў экспарце. Але калі адтуль адняць рээкспарт расейскіх энэрганосьбітаў (нафты і газу), то выйдзе зусім наадварот. Таму нам ня трэба сыходзіць з расейскага рынку, таму што туды прыйдзе, напрыклад, той жа Эўрасаюз: ён будзе вельмі зацікаўлены ў тым, каб заняць наша месца.

Беларусь не павінна весьці палітыку «або Эўропа, або Расея», пра якую мы гаворым, не! Мы павінны разьвівацца ў кірунку «і Эўропа, і Расея», прычым улічваць, што ў нас з Расеяй ужо гістарычна склаліся стасункі, а з Эўропай іх трэба будаваць. Таму я, не ламаючы адносінаў з Расеяй, а сям-там пераводзячы іх са

спэкулятыўных у рэальныя, у той жа час будаваў бы стасункі з Эўропай. І трэба пераконваць Эўропу, што сябраваць зь ёй «супраць Расеі» гэтак жа шкодна для Беларусі і Эўропы, як дружба Беларусі і Расеі «супраць Эўропы».

На мой погляд, Беларусь – краіна, якая ня можа мець геапалітычных амбіцыяў. Мы паводле ўсіх парамэтраў не Кітай, ня Індыя, тым больш – ня Злучаныя Штаты Амэрыкі, не Расея. Таму мы павінны выкарыстоўваць сваё геапалітычнае становішча і будаваць дружалюбныя стасункі з усімі краінамі, шукаючы ад іх выгады. І, можа, спрабаваць стацца злучальным мостам паміж канкурэнтнымі сусьветнымі сыстэмамі.

## Кася Камоцкая

Наконт Эўразьвязу і СНД – гэта, канечне, узаемавыключальныя выбары, але ў Эўразьвяз нас ніхто і ня кліча. Я, вядома, магу заявіць, што нам тэрмінова туды трэба, але...

Я арыентаваная праэўрапейска. У Маскве я не была, напэўна, дваццаць гадоў, а з «усялякіх Польшчаў і Літвоў» не вылажу. Ясна, што для мяне гэта бліжэйшае.

Але расейскі фактар ня тое, што ня выключаны, – ён ёсьць! Суседзяў не выбіраюць.

Аднак можа быць і нэўтралітэт. Я лічу, што нэўтралітэт, заяўлены ў Дэклярацыі аб незалежнасьці, – гэта вельмі-вельмі важна. Неўваходжаньне ўва ўсе саюзы мне таксама падаецца вельмі важным. І можа быць, гэта і ёсьць магчымасьцю гэтай маленькай дзяржаве ўтрымацца, ня быць праглынутай. Таму што ўсё ж Беларусь – невялікая краіна, яе вельмі лёгка «размыць».

## Сяргей Касьцян

Незалежных дзяржаваў у сьвеце няма. Калі сёньня ўзбунтуецца Японія, то ўся касьмічная навука і касьмічная дзейнасьць Злучаных Штатаў за адзін тыдзень разваліцца. І калі ўзбунтуюцца іншыя краіны і адмовяцца эканамічна супрацоўнічаць зь Японіяй, уся яе эканоміка абваліцца ў адзін момант. Таму

гаварыць пра нейкую зусім незалежнасьць, я думаю, няправільна. А вось які выбар рабіць Беларусі – на гэтае пытаньне адказ ужо дадзены. Яна зрабіла свой выбар: быць у саюзе з Расеяй, быць у саюзе з Украінай. І гэта трэба як расейскаму народу, так і ўкраінскаму, так і беларускаму. І ўрэшце, гэта трэба ўсім тым народам, якія жылі ў складзе Савецкага Саюзу. Ня помню, на якім форуме (ці то ў Атэнах, ці то яшчэ недзе) выступаў прадстаўнік Германіі, ён так сказаў: «Калі выжывуць і аб'яднаюцца тры славянскія народы – расейцы, беларусы і ўкраінцы, то Германія як нацыя захаваецца, і ў XXII ст. будзе жыць як самастойная гістарычная нацыя. Калі гэтыя народы не аб'яднаюцца, ужо ў XXII ст. ніхто ня будзе ведаць, што было некалі германская нацыянальная дзяржава». Я думаю, што гэтым усё і сказана.

### Вячаслаў Кебіч

Я ўжо адзін раз сказаў і цяпер паўтараю: гэта павінен быць паступовы пераход. Справа ў тым, што прапушчаны час. Я б так сказаў. Будучы старшынём Савету Міністраў, я аб'езьдзіў амаль усе краіны Эўропы. І тады я быў яшчэ з партыйным білетам, я быў членам КПСС, але ніколі ніхто ні ў Францыі, ні ў Італіі, ні ў Гішпаніі, ні ў іншых эўрапейскіх краінах мне не задаваў пытаньня: «Вы член партыі ці ня член партыі?» Па-першае, ім ня трэба было задаваць пытаньня: яны выдатна разумелі, што старшынём Савету Міністраў па тым часе некамуніст ня мог стаць. Я браў крэдыты ў гэтых краінах, я вёў перагаворы на роўных. І тады ня ставілася такога пытаньня – аб процістаяньні. І пытаньня ня ставілася тады пра ўваходжаньне. А цяпер мы ведаем, што вось гэтыя ўсе стасункі набываюць з часам усё больш і больш палітычны характар.

Наконт альтэрнатывы дачыненьняў: у дачыненьні да Расеі альтэрнатывы няма! Проста няма, таму што мы не гатовыя быць зусім не залежнай ад Расеі дзяржавай. Усімі сваімі энэргарэсурсамі мы завязаны толькі на Расею. І, як вы разумееце, на Расею з пункту гледжаньня энэргарэсурсаў завязана ня толькі Беларусь, а ўсе краіны Эўропы, амаль усе. Нарвэскага газу і нарвэскай нафты далёка не дастаткова Заходняй Эўропе. Можа, таму і ёсьць дачыненьні эўрапейскіх краінаў з Расеяй, каб не пазбавіцца тых энэргарэсурсаў, якія сёньня ёсьць у Расеі.

Але цесных сувязяў у Расеі сёньня няма. Быў Шродэр – была дружба, быў Бэрлюсконі – была дружба. Ня будзе Шродэра, ня будзе Бэрлюсконі – усё гэта трэба аднаўляць па-новаму, таму што сёньня расейска-эўрасаюзаўскія стасункі грунтуюцца на асабовых якасьцях лідэраў. Мяняюцца лідэры – мяняюцца і дачыненьні.

### Анатоль Лябедзька

У людзей павінна быць права асэнсаванага выбару. Калі ня будзе каштоўнасьцяў, калі мы ня вырашым гэтага пытаньня, то ня зможам і казаць, чаго хочуць людзі. Ніводнае сацыялягічнае апытаньне сёньня ня дасьць нам люстэркавага зрэзу. Людзі павінны рабіць асэнсаваны выбар, а для гэтага ў іх павінна быць інфармацыя. Што такое СНД рэальна? У лічбах, у фактах, у праекцыі таго, што ёсьць, і таго, што будзе?.. Таксама што такое Эўрапейскі Зьвяз? Што, нашы людзі маюць гэтую інфармацыю? Не! Калі мы ня вырашым гэтай праблемы, то пытаньне застанецца толькі для палітолягаў, для дыскусіі на ўзроўні людзей, якія маюць гэтыя лічбы. А для астатніх людзей трэба вырашыць першае пытаньне: вярнуць дэмакратыю ў Беларусь. Вось тады мы зможам сказаць, куды на самай справе хочуць ісьці беларусы. Паводле сацыялягічных апытаньняў атрымліваецца, што ў нас адсоткаў трыццаць – трыццаць пяць хочуць быць аднačасова і ў Эўрапейскім Зьвязе, і мець нейкія асаблівыя стасункі з Расеяй. Гэта таксама гаворыць пра тое, што ў людзей няма інфармацыі, ім не хапае гэтай інфармацыі.

Што датычыць СНД – сам час адказвае. Сёньня Ўкраіна і Грузія ставяць пытаньне пра выхад з СНД. Думаю, калі б гэта быў моцны эканамічны праект, то яны б не рабілі такіх захадаў. Калі б гэта адпавядала нацыянальным інтарэсам, так бы пытаньне ня ставілася. СНД на сёньняшні дзень ператварылася ў структуру па працаўладкаваньні кшталту Барадзіна і іншых – з цудоўным заробкам, і больш нічога. Фактычна, яна не вытрымлівае дзень канкурэнцыі з Эўрапейскім Зьвязам.

Думаю, што гэтае пытаньне для Беларусі можа вырашацца, у першую чаргу, праз двухбаковыя стасункі. А выбар – Эўропу ў Беларусь. Ці што, экспарт кітайскай цывілізацыі або азіяцкай? Выбар ужо зроблены! Я лічу недарэчным,

што ў нас у Менску ставяць сур'ёзна пытаньне, каб тут ледзь ня ў кожнай школе вывучалі кітайскую мову. Гэта мне падаецца алягічным. Ангельскую мову – так, бо мы частка Эўропы і геаграфічна, і палітычна, і гістарычна. А кітайская... Гэта што, наш мэханізм вырашэньня дэмаграфічнага пытаньня? Праз дваццаць гадоў нашы грамадзяне, беларусы, будуць выміраць, а мы будзем завозіць жыхароў Азіі ды рабіць чайнатаўны ў кожным раённым цэнтры? Прынамсі, так бачыцца тое, што робіць беларуская ўлада.

Кітайскі вэктар у эканоміцы на будучыню? Для гэтага трэба мець прафэсійную групу спэцыялістаў, і гэта ня трэба вырашаць на ўзроўні ўсёй сыстэмы адукацыі – гэта розныя падыходы. Канечне, трэба, каб былі людзі, якія вялі б перамовы па эканамічных праектах з Кітаем, бо Кітай – гэта вялікі рынак. Але гэта дастаткова вузкая спэцыялізацыя, дастаткова аднаго аддзяленьня на факультэце ў Лінгвістычным унівэрсытэце!

### Васіль Лявонаў

Але, такі выбар нам належыць ажыцьцявіць і дамовіцца аб тым, якой павінна быць наша краіна. Прапановы па гэтым пытаньні беларуска-расейскі фонд «За новую Беларусь» зрабіў партыям і грамадзкім арганізацыям. Спадзяюся, што пасьля завяршэньня «пасьлявыбарных разборак» мы да гэтага вернемся.

### Алег Манаеў

Я рэаліст і стараюся рэалістычна глядзець на рэчы. Калі б я ня бачыў таго сацыяльнага раскладу ў грамадзтве, пра які сказаў спачатку, калі б ня бачыў, што ў нас ёсьць сур'ёзная база для эўрапейскага шляху, гэта значыць «эўрабеларусаў» было б ня 30%, а 3%, – я б так не разважаў. Зусім магчыма, што і мая рэальная біяграфія была б іншай: альбо я даўно паехаў бы на Захад, альбо тут займаўся б нечым іншым... Так што эўрапейскія пэрспэктывы для Беларусі даюць мне зусім пэўныя надзеі і базу для дзейнасьці.

Такое сур'ёзнае пытаньне, як геапалітычны выбар краіны (у любой сытуацыі, гаворым мы, напрыклад, пра Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён, Лацінскую Амэрыку,

Афрыку ці Эўропу), – гэта перш за ўсё выбар людзей, грамадзянаў, выбар грамадзтва, выбар элітаў, выбар кіраўніцтва. І ў нашай краіне гэты выбар мусіць быць зроблены.

Я ведаю нямала людзей, якія лічаць, што такі выбар Беларусі не патрэбен, – давайце, маўляў, выкарыстоўваць перавагі аднаго і другога боку. Нават прэзыдэнт неяк гаварыў, што «ласкавае цялятка дзьвюх матак сьсе». Я лічу такі пункт гледжаньня памылковым. Памылковым ня ў нейкім абстрактна-палітычным ці культуралягічным сэнсе, а ў зусім канкрэтным. Дынаміка разьвіцьця сьвету ўзмацняецца з кожным дзесяцігодзьдзем. Сьвет імкліва і глыбока глябалізуецца, вынікі гэтага відаць усюды: у эканоміцы, культуры, інфармацыйнай, ваеннай сфэры і г. д. І калі краіна, нацыя, народ, эліты, кіраўніцтва ня робяць такога выбару – на рацыянальнай аснове, каб атрымаць пэўныя культурныя, палітычныя, эканамічныя і іншыя выгады, – яны адстаюць, не ўключаюцца ў гэтыя працэсы. Жыцьцё ідзе наперад, і тыя народы, грамадзтвы і дзяржавы, якія такога выбару ня робяць, трацяць ня толькі пэрспэктывы ў будучыні, але і прапускаюць зусім канкрэтныя выгады сёньня. Прычым хуткасьць глябалізацыі ўзмацняецца, і чым далей наш выбар будзе адсоўвацца, няважна пад якой маркай, тым больш мы будзем траціць (у дужках заўважу, што гавару пра выбар наагул, як геапалітычнае самавызначэньне краіны – ня важна, эўрапейскі ці эўразійскі). Гэта будзе бясконцая страта. Мы можам рэтраспэктыўна паглядзець на гісторыю тых дзяржаваў і народаў, якія не зрабілі такога выбару своечасова, – яны ці зусім зьнікалі, ці рабіліся часткай іншага народу, іншай дзяржавы, іншай культуры. Урэшце, доля гэтая не абміне і Беларусь, калі наш выбар будзе бясконца адсоўвацца.

Які выбар трэба зрабіць? Гэта пытаньне не навуковае, а палітычнае. І тут ужо лёгіка разважаньня павінна быць іншая. Зноў падкрэсьлю, што я не палітоляг і не палітык. Але магу ўявіць, як бы я разважаў пра гэта, калі б быў палітыкам. Я б разважаў, зыходзячы з той рэальнасьці, якая «дадзеная нам у адчуваньнях», – перш за ўсё з інтарэсаў беларускага народу (прычым рэальных інтарэсаў, а не таго, як іх уяўляюць сабе ўлады ці апазыцыя), з інтарэсаў Эўропы і, несумненна, з інтарэсаў Расеі. Гэта значыць, я б дзейнічаў акуратна, паступова. У сёньняшняй геапалітычнай сытуацыі рэзка ставіць пытаньне пра тое, што Беларусь павінна, як тая хатка, «павярнуцца да Расеі задам, а да Эўрасаюзу перадам», наўрад ці

ўдасца. Давайце ўявім сабе, што заўтра ў Беларусі да ўлады прыходзіць іншы лідэр – Іваноў, Пятроў, Сідараў, Мілінкевіч, гэта ня важна. Як ён зможа ажыцьцявіць такі выбар? Ён жа ня зможа, як за старым часам, калі найважнейшыя рашэньні прымалі эліты, паехаць у Брусэль, «ударыць па руках» з Барозу і Салянам, падпісаць зь імі дагавор ды яшчэ і ўтаіць ад народу яго сутнасьць. Думаю, што сёньня такое ня пройдзе – лідэру неабходна заручыцца падтрымкай народу. Сёньня ў большасьці краінаў, і Беларусь наўрад ці будзе выключэньнем, гэта ажыцьцяўляецца праз агульнанацыянальны рэфэрэндум. Значыць, трэба пытацца ў людзей, улічваць іх думкі і настроі.

Дык вось, вярнуся да сваёй думкі: калі сёньня паставіць перад беларусамі пытаньне рубам: «Калі б вам давялося выбіраць паміж аб'яднаньнем з Расеяй і ўступленьнем у Эўрапейскі Саюз, што б вы выбралі?» – суадносіны будуць 56% да 30%, г. зн. амаль 2 супраць 1 на карысьць аб'яднаньня з Расеяй (у дужках заўважу, што гэта зусім не гаворыць пра жаданьне большасьці нашых суграмадзянаў аб'яднацца з Расеяй; на прамое пытаньне наконт аб'яднаньня з Расеяй «за» прагаласавалі б 44%, а 30% – «супраць»; а на пытаньне пра галасаваньне на магчымым рэфэрэндуме аб Канстытуцыйным акце Саюзнай дзяржавы «за» прагаласавалі б толькі 35%; але пры «чорна-белым» пытаньні, якое мае на ўвазе толькі дзьве магчымасьці, большасьць беларусаў прагаласуюць усё ж за РФ, а не за ЭС). Таму калі новы, эўрапейска настроены лідэр сёньня паставіць на рэфэрэндум такое пытаньне, дык ён акажацца міжвольным заложнікам яго вынікаў. Што ён будзе рабіць потым – скажа народу «Не, вы памыляецеся, трэба рабіць па-мойму»?.. Яму давядзецца ісьці супраць волі народу або праводзіць палітыку, супярэчную ўласным перакананьням, таму, дзеля чаго ён змагаўся за ўладу. Думаю, любы адказны палітычны лідэр пастараецца гэтага пазьбегнуць.

Таму я і кажу, што трэба дзейнічаць вельмі акуратна, г. зн. праводзіць адпаведную інфармацыйную, прапагандысцкую, адукацыйную, арганізацыйную работу, рыхтаваць грамадзтва да гэтага. Людзі ёсьць людзі: можна падумаць, сярэдні француз, паляк ці беларус з ранку да вечара ходзіць і толькі думае, куды рухацца краіне: на Захад ці на Ўсход... Большасьць думае пра свае штодзённыя справы: пра сям'ю, працу, адпачынак і да т. п. Нагадаю: увесну 2004 году перад «вялікім расшырэньнем Эўропы» прайшла сэрыя рэфэрэндумаў шмат у якіх

краінах, урады рыхтавалі да гэтага публіку некалькі гадоў, арганізуючы магутныя кампаніі – культурныя, адукацыйныя, інфармацыйныя. Тое самае трэба было б зрабіць і ў нас: паступова падрыхтаваць грамадзтва і толькі потым праводзіць рэфэрэндум.

Ці зьяўляюцца гэтыя варыянты ўзаемавыключальнымі? Сёньня гэта выглядае так, таму што, нягледзячы на ўсялякія заявы і геапалітычныя канцэпцыі, ёсьць рэальная палітычная практыка расейскага кіраўніцтва. Відавочна, што яно ня надта зацікаўлена ў тым, каб Беларусь і нават дзяржавы, што вызваліліся ад непасрэднага расейскага ўплыву (як Украіна ці Малдова), ішлі ў Эўропу. Пры такім становішчы – з аднаго боку саюз Расеі і Беларусі, а з другога Эўрасаюз – сапраўды існуе сур'ёзная супярэчнасьць паміж магчымымі геапалітычнымі выбарамі. Але калі ажыцьцявіць сыстэму дзеяньняў, пра якія я сказаў (а для гэтага патрэбна зьмена ўлады), то, мне здаецца, можна было б знайсьці шляхі вырашэньня гэтай праблемы. Нагадаю, што падчас прэзыдэнцкай кампаніі адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў А. Мілінкевіч у сваіх заявах неаднаразова падкрэсьліваў прыярытэтнасьць партнэрскіх стасункаў з Расеяй, а яго першы візыт пасьля выбраньня на Кангрэсе дэмакратычных сілаў быў не ў Эўрасаюз, а ў Маскву.

### Аляксандар Мілінкевіч

Інтэграцыя – гэта сёньня сусьветная тэндэнцыя. І з Расеяй інтэграцыя таксама павінна быць, але эканамічная, бо яна нам выгадная, але ніяк не палітычная. Незалежнасьць і сувэрэнітэт для нас – несумненная каштоўнасьць. Мая пазыцыя наступная: Беларусь павінна інтэгравацца ў эўрапейскія структуры. Так, працэс доўгі. І заканчваць яго ня нашаму пакаленьню палітыкаў. А сёньня задача – максымальна выкарыстаць магчымасьці памежнага становішча Беларусі, прыярытэтнага партнэрства як суседа.

### Анатоль Міхайлаў

Без ажыцьцяўленьня такога роду стратэгічнага выбару будучыня любой краіны ня мае пэрспэктывы. Аднак гэты выбар ня можа быць проста пра-

дэкляраваны. Ён мусіць *сасьпець* і *прарасьці*, і перш за ўсё ў сьвядомасьці інтэлектуальнай эліты. Але хіба наша ўласная сьвядомасьць вольная ад мітаў і забабонаў ідэалягізаванай мінуўшчыны, якімі мы занадта часта апэруем, не ўсьведамляючы гэтага?

Што варта зрабіць? Перш за ўсё, быць крытычнымі ў дачыненьні да саміх сябе. Знайсьці ў сабе здольнасьць быць адкрытымі ў дачыненьні да іншых у кантэксьце дыялёгу. Імкнуцца пазьбягаць спакусы абвінавачваць іншых у становішчы, якое склалася. Распачаць рэалізацыю канкрэтных крокаў, што маглі б рэальна спрыяць самавызначэньню краіны. Досьвед стварэньня Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту зьяўляўся, напрыклад, спробай канкрэтнага ўкладу ў гэты няпросты і працяглы працэс. Далёка не заўсёды, на жаль, даводзілася і даводзіцца сутыкацца з належным разуменьнем таго, што мы рабілі, нават там, дзе яго можна было б чакаць.

### Алесь Міхалевіч

Я думаю, што СНД будзе жыць вечна. Бо яна нікому не перашкаджае. Гэта ня ёсьць нейкім сур'ёзным утварэньнем. Гэта ўтварэньне абсалютна сымбалічнае: патрэбна было нейкае выйсьце з Савецкага Саюзу – негвалтоўнае, прыгожае, з фармальным захаваньне нейкіх сувязяў. Гэтым і зьявілася СНД.

Для Беларусі будзе паўставаць пытаньне «дзе быць?»... Я б, можа, і ня ставіў пытаньня так: ці Эўразьвяз – ці саюз з Расеяй? Але пытаньне «туды альбо туды» – яно, дакладна, ёсьць. Ці Беларусь будзе інтэграваная ўва ўсім: і ў эканамічным пляне, і ў пляне бясьпекі, у пляне кожнай сфэры дзяржаўнага быцьця, – у заходнюю супольнасьць, якую можна ўмоўна назваць эўраатлянтычнай супольнасьцю (яна ўключае ня толькі Эўропу, але і Злучаныя Штаты, і Аўстралію, Новую Зэляндыю – тыя краіны, якія зьяўляюцца «выспамі Эўропы», выспамі эўрапейскай цывілізацыі па-за геаграфічнай Эўропай)? Ці мы будзем належаць да супольнасьці з Расеяй як адзінай, тэрытарыяльна цэльнай краінай? Бо я перакананы, што на пераходзе Беларусі ў эўраатлянтычную супольнасьць працэс не завершыцца, і цэлы шэраг народаў унутры Расеі, а таксама цэлых рэгіёнаў захочуць вызначыцца на карысьць эўраатлянтычнай цывілізацыі. Такія вельмі моцныя

тэндэнцыі ўжо цяпер ёсьць у Калінінградзкай вобласьці Расейскай Фэдэрацыі: у этнічным складзе яна, можа, не зьяўляецца асобнай ад іншай Расеі (так, там моцны складнік, вялікі працэнт беларусаў і ўкраінцаў, але ўсё роўна расейцы там пераважаюць), але значная частка жыхароў гэтай вобласьці гавораць, што яны хочуць быць Эўразьвязам, хочуць быць па той бок мяжы цывілізацыяў.

Нэўтральнасьць і «мост паміж Усходам і Захадам» – гэта, на мой погляд, вельмі несур’ёзныя спэкуляцыі, якія ня маюць пад сабой нічога грунтоўнага. Калі нехта хоча быць «мостам» – гэта значыць, ён хоча, каб па ім рэгулярна хадзілі, езьдзілі, тапталі. І гэта ня самая лепшая роля.

Беларусь мусіць вызначыцца: ці яна ў адным месцы, ці яна ў другім. На мой погляд, будучыня Беларусі – гэта частка эўраатлянтычнай супольнасьці.

Я б не называў сябе эўрааптымістам: я не люблю вызначэньняў «эўрааптыміст», «эўраскептык»... Да таго моманту, пакуль мы ўсур’ёз падыдзем да ўступленьня ў Эўрапейскі Зьвяз, зьявіцца пытаньне, ці будзе існаваць Эўрапейскі Зьвяз у яго цяперашняй форме. Эўразьвяз пасьля пашырэньня на новыя краіны зьяўляецца зусім іншым Эўразьвязам, чым той, пра ўступленьне ў які марылі нават Польшча, Літва, Латвія ці Чэхія... Тое, што павінна быць пэўная плятформа для вызначэньня супольных інтарэсаў унутры Эўропы, – гэта бясспрэчна. Таму што трэба максымальна спрашчаць пераплыў рабочай сілы, пераезд людзей – праз стварэньне спрыяльных варункаў з тымі ж візамі, напрыклад. Але якой будзе Эўропа праз дзесяць гадоў? На мой погляд, мы менавіта праз дзесяць гадоў рэальна, сур’ёзна падыдзем да моманту ўступленьня: я маю на ўвазе, што пройдуць папярэднія перамовы, мы пададзім заяўку на ўступленьне і г. д. Якой будзе на той час Эўропа – гэта вялікае пытаньне!

Але ў гэтым кірунку трэба ісьці. Я не кажу, што гэты кірунак – выратаваньне само па сабе. Альбо што бюджэт Эўрапейскага Зьвязу – гэта выратаваньне для Беларусі. Не! Але мы мусім быць максымальна зынтэграваныя ў эўраатлянтычныя структуры.

### Тацяна Процька

Гэтае пытаньне адносіцца да палітыкі дзяржавы: як павінна паводзіць сябе дзяржава, які кірунак лепш выбраць?.. Справа ў тым, што палітычная каньюнктура сучаснага грамадзтва даволі складаная: ёсьць праблемы ў Эўразьвязе, ёсьць праблемы ў СНД. Ёсьць праблемы так званага «нераўнамернага разьвіцьця краінаў». І бягучая палітычная каньюнктура можа быць дастаткова гнуткая. У дзяржаве заўсёды ёсьць добрыя эканамісты, якія пралічаць эканамічную выгаду, грунтуючыся на якой палітыкі прымуць палітычныя рашэньні.

Сёньня гэткую гнуткасьць выкарыстала, між іншым, кіраўніцтва Беларусі. Карыстаючыся тым, што ў Расеі была дастаткова моцная настальгія (і сярод палітычнай эліты, і сярод электарату) па савецкіх каштоўнасьцях, Беларусь прапанавала ім гэтыя каштоўнасьці, але сама ўзамен узяла каштоўнасьці іншыя: газ, нафту. І прапанавала свае паслугі як пасрэдніка ў гандлі з Заходняй Эўропай. І гэтая дастаткова гнуткая палітыка дала свой плён: мы цяпер жывем дастаткова няблага ў параўнаньні зь іншымі краінамі. Бо той эканамічны ўзьлёт, пра які любіць казаць нашае кіраўніцтва, грунтуецца не на разьвіцьці беларускай прамысловасьці, новых тэхналёгіях, а на тым, што мы займаліся такім сабе «дзяржаўным бізнэсам».

У гнуткасьці кіраўніцтва нашай краіны ёсьць пэўны палітычны цынізм: будзе выгада – яно будзе за эўрапейскія каштоўнасьці, будзе прыбытак зь нечага іншага – яно будзе ісьці ў Расею і дбаць пра інтэграцыйныя працэсы.

Як павінна быць скіравана грамадзянская супольнасьць – пытаньне больш складанае. Беларусь – менавіта на разломе розных падыходаў да жыцьця, розных сыстэмаў каштоўнасьцяў, розных рэлігійных канфэсіяў. І шмат іншых рэчаў, дзе мы маем граніцы, падзел на тое і на гэтае. Таму сказаць, што ў нас павінна быць нешта адно – гэта значыць далучыць нас да нечага і паставіць праблему перад той часткай, якая бачыць сябе па іншы бок мяжы, у іншай сыстэме. І я ня думаю, што гэта вельмі неабходна і прынесла б карысьць Эўропе ці нават таму «славянству». Можа, мы так і застанемся мостам паміж аднымі і другімі, бо мы дастаткова добра разумеем хібы і аднаго, і другога боку і разумеем лепшае, што ёсьць у адных, і ў другіх. І мы можам дапамагчы гэтым цывілізацыям кантакта-

ваць адна з адной на карысьць усяго чалавецтва – павялічваючы тое, што ёсьць добрае, і зьмяншаючы тое, што блага.

### Андрэй Саньнікаў

Я ўпэўнены, што Беларусь павінна быць толькі ў аб'яднанай Эўропе, у Эўразьвязе. Толькі фармальна замацаваўшы сваю эўрапейскасьць, мы можам дасягнуць беларускага адраджэньня. Для мяне абсалютна бясспрэчна, што толькі там мы можам стаць беларускай дзяржавай.

На сёньняшні дзень гэта ўзаемавыключальныя варыянты. СНД сканала, і гэта відавочна нават з таго, што адбываецца паміж дзяржавамі так званага СНД, з таго, што яны спрабуюць ствараць іншыя арганізацыі, якія я нават не магу ўсе пералічыць – ЭўрАзЭС, мытныя саюзы, ШАС... Цяпер можна заўважыць два цэнтры. Першы – Расея, ад якой ідзе ўсё тое, што я пералічыў. Другі цэнтар (таксама ня вельмі ўдалы) – ГУАМ, Супольнасьць дэмакратычнага выбару. Гэта пакуль што ня вельмі ўдалыя, але ўсё ж спробы – я ня думаю, што нешта супраць Расеі ці каб ізаляваць Расею – на эўрапейскіх каштоўнасьцях зрабіць нешта, пакуль былыя рэспублікі СССР ня вызначыліся канчаткова з сваім выбарам.

Для мяне выбар адназначны – Эўразьвяз. Наконт каштоўнасьці ўсяго астатняга для Беларусі – я не магу пагадзіцца. Для Лукашэнкі – так, гэта гульня. А беларусы папросту не атрымліваюць інфармацыі.

Нават не пра інфармацыю гаворка. Нават у краінах (краіны Балтыі), дзе адразу пасьля атрыманьня незалежнасьці вырашылі ісьці ў Эўразьвяз, нават там кампаніі праводзіліся, каб патлумачыць людзям. Калі нават ня варта было пераконваць людзей, такія кампаніі ўсё ж такі былі патрэбныя для таго, каб людзі сьвядома зрабілі свой выбар. Калі ў нас будзе свабода, тады можна казаць, чаго хочуць беларусы: ці быць з Расеяй, ці быць у нейкім СНД, ці быць у Эўропе. Перш за ўсё павінен быць выбар адукаваны, а ня той, які базуецца на дэзынфармацыі і прапагандзе.

Для мяне зразумела, што ніякі саюз з Расеяй (падкрэсьліваю – ніякі!) ня будзе накіраваны на падтрымку дэмакратычнай і незалежнай беларускай дзяржавы. Таму калі гаворка ідзе менавіта пра беларускую дзяржаву, гэта можа быць толькі

ў Эўропе і ў НАТО. Таму што павінны быць пэўныя гарантыі бясьпекі, гарантыі незалежнасьці і магчымасьці сьвядома зрабіць свой выбар, якія сёньня можа нам даць толькі НАТО. Ня трэба слухаць прапагандысцкую лухту пра НАТО, а трэба ўсьвядоміць, што сяброўства ў гэтай арганізацыі бароніць незалежнасьць дзяржавы і дазваляе ўдзельнічаць у міжнародных працэсах і ўплываць на іх. А тое, што Расея адмоўна ставіцца да магчымага нашага сяброўства ў НАТО, то для мяне гэта паказчык непрызнаньня незалежнасьці і дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі. Расея спакойна пагадзілася на ўваход у НАТО краінаў Балтыі менавіта таму, што вымушана была прызнаць іх незалежнасьць.

### Уладзімер Улаховіч

Стратэгічная задача (выклік, выбар, галоўная супярэчнасьць сучаснага гістарычнага моманту) для Беларусі заключаецца, калі гаварыць спрошчана, у выжываньні, паступовым будаўніцтве ўласнай дзяржаўнасьці.

### Валеры Фралоў

Мы знаходзімся на цывілізацыйным разломе, і нам трэба стратэгічна, прынцыпова выбіраць: ці мы з Захадам, у якога свае каштоўнасьці, да якіх нам яшчэ расьці, – ці з Расеяй. Калі ўзяць апошнія трыста гадоў, то, мабыць, мы бліжэйшыя да Расеі. Таму, на мой погляд, наш славянскі мэнталітэт, нашая рэлігія, нашая агульная гісторыя, нават недзе блізкасьць моваў, калясальная эканамічная зьнітаванасьць... Трэба нешта выбіраць! Я, у цэлым, прыхільнік таго, каб мы былі ў досыць цесным саюзе з Расеяй. Безумоўна, каб і Расея трохі іншая была. І мы ніякім чынам сябе ня проціпастаўлялі б Эўропе, знаходзілі б пункты судакрананьня. Так, ні яны ня дрэнныя, ні мы – мы проста розныя. І ня трэба малпаваць і быць празьмерна падобнымі: мы такія, якія ўжо ёсьць.

Паводзіны Расеі, працэсы, якія там адбываюцца, неадназначныя. Ёсьць імкненьне Расеі адчуваць сябе ўплывовай краінай. Нас хочуць за вушы прыцягнуць, а трэба, каб тыя краіны, што ўваходзілі ў Савецкі Саюз, па-добраму цягнуліся да Расеі, рэальна бачылі б, што ў ёй адбываюцца сур'ёзныя зьмены, і бачылі сэнс

і вынік ад узаемадзеяньня з Расеяй. Газавыя войны і іншае (а іншае, мабыць, усё-такі галоўнае, і вельмі шмат іншага хочуць вызначаць ЗША) прыводзяць, наадварот, да таго, што і Грузія, і Малдова, і Ўкраіна вырашаюць: лепш у сваёй хаціне, хай і невялікай, жыць. Вось у чым праблема! Можна крытыкаваць кіраўніцтва Расеі за гэта, але я думаю, што пасьля дзесяці бесшабашных гадоў, пасьля Ельцына, пры тых пэўных традыцыях, якія там склаліся, павярнуць Расею да дэмакратыі ў эўрапейскім разуменьні, напэўна, досыць складана нават пры імкненьні расейскага кіраўніцтва. Паварочваць можна чалавека, які досыць спакойна сябе адчувае. Думаю, у Расеі яшчэ вельмі шмат праблемаў і дастаткова складаная сытуацыя.

Стратэгічна, я думаю, – так, Расея наш саюзьнік. Час, у які мы жывем, не спрыяе ўсьведамленьню і адчуваньню гэтага: рэспублікі СНД, як малыя дзеці, разьбегліся, і, пакуль (асабліва кіраўніцтва гэтых рэспублік) не нашкодзяць, не нахуліганяць, ап'янелыя ад свабоды, цьвярозай ацэнкі сытуацыі мы не дачакаемся.

## Станіслаў Шушкевіч

Выбар стаяў, стаіць і стаяць будзе. Мне здаецца, узаемавыключальныя варыянты – гэта калі вельмі катэгарычная форма. Паміж катэгарычнай формай «быць расейскай калёніяй, якая непасрэдна гранічыць з Расеяй» і «быць эўрапейскай краінай». Вось такі катэгарычны выбар! Але гэта катэгарычны выбар з пункту гледжаньня, я б сказаў, расейскіх «ястрабаў», якія хочуць навязаць пэўны тып дачыненьняў – фактычна, патэрналісцкі, камандны. Гэта абсалютна непрымальна.

Што б мы ні рабілі сёньня, апошняе стагодзьдзе ўтварыла Захад і Ўсход, Расею і Эўразьвяз. І калі мы будзем далучацца да аднаго ці да другога, нам будзе дрэнна. Мне здаецца, што было нядрэнна сфармулявана яшчэ ў 1990–1991 гадах: Беларусь – як краіна, якая мае вопыт дзяржаўнасьці, як краіна, якая мае сваю інтэлігенцыю, – здольная стаць нармальнай нэўтральнай дзяржавай і ў палітычным, і ў ваенным сэнсе. Але каб стаць такой, з гэтым павінна пагадзіцца Расея, і павінна пагадзіцца Эўропа. Што да Эўропы – тут праблемаў няма. Што да Расеі – тут праблема ёсьць. І калі б Эўропа і Злучаныя Штаты сталі гарантамі беларускай нэўтральнасьці... Падкрэсьліваю: палітычнай і ваеннай, таму што пра абса-

лютную нэўтральнасьць гаварыць няма чаго. Пра нэўтральнасьць Швайцарыі, абумоўленую яе геаграфічным становішчам, таксама няма чаго гаварыць. Але можна гаварыць пра разьвіцьцё нэўтральнасьці ў фінляндзкім сэнсе, калі была гарантыя з боку Савецкага Саюзу і Злучаных Штатаў у сэнсе нэўтральнасьці. Былі гарантыі Фінляндыі і Аўстрыі. Мне здаецца, што гэта самы лягічны стан. Рэзкі перапад: ці ў НАТО, ці ў новы Варшаўскі дагавор – аднолькава дрэнна для Беларусі. Я не зьяўляюся прыхільнікам уступленьня ў Эўразьвяз, у НАТО. Я прыхільнік НАТО ў тым сэнсе, у якім НАТО прад'яўляе прэтэнзіі да саміх дзяржаваў. Але супраць таго, каб Беларусь была ваенным чальцом НАТО – гэта непрымальна! Яшчэ раз падкрэсьліваю: мы на перападзе – палітычным і ваенным, і найлепшая сытуацыя – сяброўскія адносіны з Эўропай і Расеяй.

Калі Беларусь была абвешчаная бязьядравай дзяржавай, былі гарантыі з боку ЗША і Расеі. Але яны былі пераважна як дэкляратыўная частка ў двухбаковых пагадненьнях. Не было такой дамовы аб статусе, як была дамова пра Аўстрыю, пра Фінляндыю. Да гэтага мы імкнуліся, але не дарасьлі. Я б сказаў, што расейскія намаганьні гэта перабілі. І пасьля гэта фактычна пацьвердзілася дактрына, якую прапанаваў расейскай уладзе Караганаўскі Савет па зьнешняй і абароннай палітыцы. Фактычна, расейская зьнешнепалітычная дактрына, прынятая ў 1999 г., улагодзіла фармулёўкі гэтай караганаўскай прапановы. Я гаварыў на сустрэчы з Караганавым: «Як так можна? Вы цяпер так добра ставіцеся да Беларусі, а што прапанавалі?» Што яны прапанавалі? «У Беларусі і ў іншых былых рэспубліках Савецкага Саюзу разьвіваюцца працэсы нацыянальнай самасьвядомасьці, самаідэнтыфікацыі. І чым раней мы гэтыя працэсы спынім, тым таньней нам будзе каштаваць перамога». Вось такія імпэрскія парывы!

На шчасьце, Караганаў пасьля адступіў ад гэтага. Фактычна, ён як бы прынёс прабачэньне, казаў: мы там многага ня ведалі, ня бачылі... Караганаў – дасьведчаны чалавек, ён мог адступіць. А што да астатніх, то яны неадступна ідуць гэтым шляхам: Беларусь – гэта частка Расеі, а беларуская мова – гэта «российское наречие». Гэта чыста каляніяльная імпэрская палітыка, якая ня мае пад сабой сур'ёзнага грунту. Толькі нахрапістасьць...

## Усевалад Янчэўскі

Наконт СНД ня буду гаварыць, таму што пра СНД і сказаць жа няма чаго. І створана яна была дзіўна, і існуе неяк... Зь яе нагоды застаецца адно разводзіць рукамі. Можа, для нейкіх нестратэгічных рэчаў яна і неабходная, але гэта другарадныя рэчы.

Усё гэта дзіўна, і СНД мы пакідаем убаку.

Беларусь апынулася паміж двух цікавых суб'ектаў, якія абодва знаходзяцца ў глыбокім крызісе, – паміж Расеяй і Эўропай.

У Расеі – цьмяны лёс. На поўным сур'ёзе вядуцца размовы пра тое, што ёсьць велізарная рызыка развалу Расейскай Фэдэрацыі як такой. Ёсьць велізарная праблема азіяцкай часткі Расеі – ненаселенай, самадастатковай паводле сваіх рэсурсаў і ўсё больш зарыентаванай на Кітай. Ёсьць велізарная праблема Расеі, зьвязаная з нафтай. Сёньняшнія нафтадаляры губяць Расею – можа, нават мацней, чым губіў развал 1990-х. Супакоеная і закалыханая чарговым нафтавым дажджом, Расея прапускае шанц выправіць памылкі 1990-х; стратэгічна нічога ня робіцца для таго, каб зрабіць тэхналягічны рывок і вывесьці краіну ў XXI стагодзьдзе. Нафтагазавы наркотык жахлівы! І ёсьць небясьпека, ёсьць найвялікшая рызыка, што ён можа Расею даканаць.

На беларускую мадэль, дарэчы сказаць, не дарма глядзяць вельмі многія ў Расеі. Як бы там ні было, але беларуская мадэль – гэта мадэль мабілізацыі грамадзтва. Мы існуем за кошт таго, што мы выpабляем, а не за кошт матухны-прыроды. Мы выжываем самі. Само жыцьцё прымушае нас праводзіць больш пісьменную, больш паваротлівую палітыку – у нас няма ні чарназёмаў, ні «саматлораў».

«Праект Лукашэнкі» – гэта мабілізацыйны праект. І ў гэтым самы галоўны яго плюс: гэта праект разьвіцьця.

Краіна пасьлядоўна прайшла этап адыходу ад прорвы, стабілізацыі і паступовага разьвіцьця. Так, яшчэ няма шпаркага разьвіцьця. Але шпаркае разьвіцьцё – наступны этап. Я спадзяюся, што ён ажыцьцявіцца, таму што «болевыя пункты» прэзыдэнт намацвае вельмі дакладна: гаворыць пра дэбюракратызацыю дзяржавы і эканомікі. Гэта тыя істотныя мінусы, якія ў нас сапраўды ёсьць.

На гэта, праўда, можна запярэчыць, што нельга бюракратычнымі мэтадамі вызваліцца ад бюракратыі. З другога боку, а якімі мэтадамі дэбюракратызаваць? Дзяржава заўсёды застаецца дзяржавай, яна заўсёды дзейнічала бюракратычнымі мэтадамі. Нават рынкавыя рэформы першапачаткова праводзяцца таксама БЮРАКРАТЫЧНЫМІ мэтадамі.

Да таго ж ёсьць прыклады эканомік азіяцкіх аўтарытарных рэжымаў (Сынгапур, Маляйзія і іншыя). Посьпехі там навідавоку. Але заўважце! Палітычны рэжым – аўтарытарны (і больш жорсткі, чым у нас), а эканоміка – зусім не лібэральная. Зусім! У эканоміках «азіяцкіх тыграў» былі вельмі істотныя элемэнты лібэралізму, але былі і вельмі істотныя элемэнты кантролю – і ўсё гэта хітра спалучалася.

Мне думаецца, прэзыдэнт Лукашэнка ідзе менавіта гэтым шляхам (натуральна, з папраўкай на нашу спэцыфіку).

Думаю, што калі б Расея многія рэчы рабіла так, як робіць Беларусь, дык гэта быў бы для Расеі шанец. Можа нават, гэта адзіны шлях, якім Расея магла б ісьці.

Але Расея працягвае кіравацца ранейшым курсам, беручы найгоршае і з сумнага досьведу СССР, і зь ня менш сумнага досьведу 1990-х. З савецкай спадчыны сучасная Расея пакінула сабе наркатычную нафтагазавую голку (якая не дазваляе ёй зрабіць тэхналягічны рывок) і звышманапалізацыю эканомікі. А ад 1990-х захавалася кланава-алігархічная сыстэма (яна да таго ж яшчэ і ўмацавалася) плюс дзікае сацыяльнае расслаеньне грамадзтва.

А Беларусь, аддаючы належнае СССР (і ня ладзячы танцаў на касьцях зрынутага камунізму), рушыла далей. Прэзыдэнт Лукашэнка рэальна адводзіць краіну ад самай страшнай заганы савецкай сыстэмы – ад татальнай сыравіннай залежнасьці. Беларусь робіць стаўку на высокія тэхналёгіі, навуку і інфармацыю. Мы ідзем шляхам Сынгапуру і Маляйзіі, а не Нігерыі і Эквадору.

Так, у нас няма прыватызацыі. І цудоўна! Няхай вырасьце тое пакаленьне тутэйшых бізнэсмэнаў, якое гатова заплаціць, а ня ўзяць задарма. Няхай прыйдуць (ня сёньня – дык заўтра, ня заўтра – дык пасьлязаўтра) заходнія бізнэсмэны, якія гатовы заплаціць, а не – зноў-такі! – узяць задарма. Няхай расейцы сюды прыяжджаюць і зьяжджаюць роўна столькі, колькі ім трэба, але калі яны хочуць нешта рабіць – няхай яны плацяць рэальную цану.

Чаму ніхто ў апазыцыі ня ставіць велізарныя плюсы прэзыдэнту за тое, што ён проста не аддае нейкім нягоднікам задарма тое, што ім не належыць? Мяне ўвесь час сьмяшаць апазыцыянэры, якія папікаюць: «Запатрабавалі за «Белтрансгаз» несусьветную цану». А якую цану павінен быў запатрабаваць прэзыдэнт дзяржавы? Вялікую! Радуйцеся, што ён не аддаў танна. Мы павінны прэзыдэнта дзяржавы абвінавачваць і крытыкаваць тады, калі ён танна некаму нешта прадае. Калі ён спрабуе прадаць дорага – гэта вельмі добра!

Нават Ючшанка разам зь Цімашэнкай паказалі, што «Крыварожсталь» можна было прадаць у 5 разоў даражэй. Я не зьяўляюся прыхільнікам «аранжавых», але гэта цудоўная была акцыя: яна экспэрымэнтальна даказала, што на абшарах Украіны, Расеі і, у значнай ступені, Усходняй Эўропы адбылося грандыёзнае ашуканства ўсіх чыста. Тое, што можна было аддаць за рэальную цану, за рэальныя грошы (няхай нават заходнім бізнэсмэнам!), тое, што можна было прадаць сумленна і на адкрытых аўкцыёнах, аддалі сваім. І таму чубайсаўская ідэя, што ўласьнік паклапоціцца лепш, не спрацавала. Таму што ўсё пытаньне ў тым, *які* ўласьнік.

Так, уласьнік, які сам гэта стварыў, паклапоціцца лепш. Так, уласьнік, які нешта купіў і заплаціў за гэта рэальную цану, паклапоціцца лепш. Але ўласьнік, які атрымаў задарма, – гэта працяг савецкай камуністычнай сыстэмы ў новых формах.

Расея пайшла натуральным шляхам эвалюцыі савецкай сыстэмы: намэнклятура вырашыла аб'явіць сябе ўладай ужо і матэрыяльна, г. зн. прыватызаваць адкрыта тое, чым раней яна кіравала «ад імя народу».

Бяда сёньняшняй Расеі нават ня ў тым, што справядлівасьці няма ў грамадзтве. Бяда ў тым, што новыя ўласьнікі ня дзейнічаюць эфэктыўна, а марнатравяць і паразытуюць на тым, чаго яны не зарабілі.

Амэрыканская ўласнасьць так не вырастала. Адбываўся натуральны адбор: той, хто мог стварыць фірму, самім фактам стварэньня фірмы паказваў, што ў яго мазгі працуюць так, што ён можа рабіць гэтую справу. А калі вы проста аддаяце завод любому чалавеку з вуліцы (ці бандыту, ці былому чыноўніку) – што ён зробіць з гэтай уласнасьцю? Вельмі мала добрага, таму што ён не прыстасаваны да гэтага.

І ў Расеі, і ўва Ўкраіне прыйшло вельмі шмат такіх вось непадрыхтаваных і напаўпадрыхтаваных людзей. Яны выдатна ўмелі захопліваць нешта, але ня ўмелі аб ім паклапаціцца. Людзі, якія зараблялі б гэта ўсё самі, былі б на парадак больш эфэктыўныя. Ці заходнія ўласьнікі, якія б заплацілі рэальную цану, яны таксама былі б на парадак больш эфэктыўныя.

Таму нам няма чаму вучыцца ў Расеі.

Мы ў вельмі складаным становішчы – паміж старой Эўропай і цяжка хворай Расеяй. А таму наша тактыка можа быць толькі адной – сытуацыйнасьць: штодня глядзець, што выгадна нашай дзяржаве. Так дзейнічае Лукашэнка. Пазыцыя абсалютна разумнага прагматызму!

На злом галавы ісьці туды ці сюды нам нельга! Юшчанка абсалютна ня мае рацыі, калі гаворыць: «Украіна пойдзе ў Эўропу». Для таго каб Украіне ісьці ў Эўропу, ёй трэба зрабіць шлях даўжынёй гадоў у дзесяць-пятнаццаць мінімум, можа больш. Усе кажуць, што гэта складана, доўга і г. д. Але ня гэта галоўная праблема.

Я пастаўлю пытаньне па-іншаму: а якой будзе Эўропа да гэтага часу?

Гэта памылка шмат якіх палітыкаў. Людзі разважаюць статычна, але мы жывем не ў каменным веку і не ў сярэднявякоўі. Сьвет мяняецца вельмі хутка: на працягу ня тое што пакаленьняў, а за пяць-дзесяць гадоў ён можа зьмяніцца кардынальна. Зьмяніцца можа ўвогуле ўсё цалкам.

Мы ж усе хочам стабільнасьці і прадказальнасьці. І хочам будаваць пляны на гады наперад. Гэта галоўная супярэчнасьць сучаснага чалавека. Гэта жахлівая супярэчнасьць паміж прыродай чалавека (які часта імкнецца да спакою) і шалёна імклівым тэмпам спароджанай ім цывілізацыі, сутнасьць і дух якой – гэта дынаміка, зьмены. Тут усё робіцца дзеля зьменаў, тут усё мяняецца. І чалавек не пасьпявае. Можа, некалі гэтая калясальная супярэчнасьць разродзіцца нейкім велізарным катаклізмам для ўсёй нашай цывілізацыі.

Мы ўсё ня можам прызвычаіцца да гэтага тэмпу, нам усё хочацца збудаваць нейкія доўгатэрміновыя прагнозы. Але паступова мы ўступаем у пэрыяд, калі доўгатэрміновыя прагнозы ўвогуле будуць немагчымыя.

Як можна намеціць цэль у абсалютным тумане? Больш правільна – рухацца «ў межах бачнасьці». І толькі ў межах бачнасьці. І не загадваць на гады наперад.

Савецкі Саюз гэта, дарэчы, і загубіла: вельмі любілі загадваць на далёкія пэрспэктывы і не прадбачылі ўласнай пагібелі.

# 5. Ці існуе беларуская ідэнтычнасьць? Калі так, то што яе вызначае? Што такое беларускасьць? Што азначае быць беларусам?

**Вольга Абрамава**

Калі ня скочвацца на «ўра-патрыятычныя» лёзунгі, дык быць беларусам – значыць адчуваць сваю прыналежнасьць да гэтага абшару. Быць беларусам – гэта, бываючы ў іншых краінах (нават у самых цудоўных), на трэці дзень хацець дамоў. Быць беларусам – гэта ўвесь час насіць Беларусь у душы, адчуваць, што гэта – тваё, разам з усімі хібамі, разам з усімі праблемамі. Табе добра тут так, як ня можа быць нідзе больш. І табе дрэнна тут бывае так, як нідзе больш, – таму што гэта тваё і ты перажываеш за ўсё, яно табе баліць.

Ну а прыроды, прыгажэйшай за беларускую, проста няма! Гэта тое, што гоіць душу, калі дрэнна. Займацца ў Беларусі палітыкай – гэта вельмі стрэсагенна. Часам адчуваньне такое, нібы ты плывеш у балоце. І гояць душу ня толькі зносіны з блізкімі людзьмі, сябрамі, але і зносіны з нашымі лясамі, нашымі азёрамі, нашымі воднымі абшарамі, незалежна ад таго, пагодна ці не на двары.

Нас не дарма часам называюць «ляндшафтнай» нацыяй (гаворачы пра нацыю, я ня маю на ўвазе, да якой этнічнай групы належыць той ці іншы чалавек). Сам характар нашых краявідаў уплывае на пэўную сузіральнасьць сьветаадчуваньня, можа быць – меншую гатоўнасьць да дзеяньня. Больш памяркоўнасьці ва ўсім, адсутнасьць схільнасьці да радыкалізму, да жорсткіх рашэньняў, і цэлы шэраг іншых рэчаў, калі разглядаць у цэлым, як дамінанту.

Пару гадоў таму я апублікавала ў Маскве свой аналіз беларускага нацыянальнага характару, дзе між іншым паказала, на што можна разьлічваць у палітычным пляне на гэтым полі, а на што – не. Бяз ломкі нацыянальнага характару (а такія працэсы разьлічаныя на стагодзьдзі) рэзкае зьмяненьне ўнутрыпалітычнай сытуацыі проста немагчымае. Таму што гэта ня ўпісваецца, не адносіцца да таго, што могуць прыняць большасьць людзей, якія жывуць на гэтай прасторы. Я пастаралася даць нейкую палітычную філязофію таго, што тут магчыма і што – немагчыма.

Чаму амэрыканцы палічылі мажлівым пасьля Другой сусьветнай вайны выдаткаваць час, намаганьні, значныя сродкі для таго, каб распрацаваць мадэлі адаптацыі да дэмакратыі для насельніцтва Германіі і Японіі? Так, каб гэта было доўгатэрміновым – ня штучна прынесеным, непрымальным, а каб гэта паступова ўвайшло ў плоць і кроў грамадзтва? І чаму з такой, можа, неўсьвядомленай высакамернасьцю ставяцца ў гэтым пляне да Беларусі? Беларусь – унікальная краіна. Калі перагледзець усю палітычную гісторыю рэгіёну, дык некаторае падабенства мы можам знайсьці толькі са славакамі.

А ўвогуле, беларусы – унікальны народ, і яны дадуць ня сто, а тысячу ачкоў наперад амаль кожнай эўрапейскай нацыі што да выжывальнасьці. Беларусы выжываюць у любых умовах і здольныя адаптавацца практычна да чаго хочаш. Адсюль гэтая высакамернасьць у дачыненьні да параўнальна невялікай эўрапейскай краіны, нежаданьне лічыцца з тым, што мы тут маем і ад чаго трэба ісьці... І калі ўзаемадзейнічаць і прапаноўваць сыстэму каштоўнасьцяў, дык трэба яе арганічна ўпісаць, уплавіць у нацыянальны характар, адаптаваць іх узаемна адно да аднаго. Бо адной формы дэмакратыі не бывае: у кожнай краіны свой шлях і свой напрамак разьвіцьця дэмакратыі. Гэта тое, з чаго трэба было пачынаць. І пра гэта чамусьці ніхто не хацеў думаць, і ніхто не лічыў патрэбным гэтым займацца. Можа, хоць цяпер пачнем?

## Сьвятлана Алексіевіч

Зьяўленьне Мілінкевіча на мінулых выбарах прывяло мяне да думкі, што пачынаецца фармаваньне беларускай ідэнтычнасьці. Гэта быў ужо вобраз бела-

руска-польскага інтэлігента. Папярэднія вобразы старшыні калгасу ці савецкага намэнклятурнага кіраўніка адыходзяць у мінулае.

Аднак хацелася б адзначыць, што гэты вобраз складваецца ў процістаяньні Саюзу: людзі вызначаюцца на фоне «каляровых рэвалюцый».

Вобраз гэты пакуль яшчэ не зрабіўся фактам масавай сьвядомасьці, ён застаецца набыткам культурных слаёў. Яго прымаюць і ствараюць студэнты, інтэлігенцыя, а просты народ усё яшчэ не прыняў.

Прычына таго, што так зацягнуўся працэс фармаваньня гэтага нацыянальнага вобразу, у тым, што гэтую работу вядуць толькі энтузіясты. Улада не вядзе гэтай работы! Але гэта задача не для купкі людзей, якімі б высакароднымі мэтамі яны ні кіраваліся. На фармаваньне гэтага вобразу павінны працаваць і ўлада, і СМІ... Калі б у нас была хоць бы такая сытуацыя, якую мы мелі за часам Шушкевіча і Кебіча, гэтая задача даўно б рашалася.

Для гэтага патрэбная праграма, менавіта сыстэма поглядаў, кола ідэяў. Цяпер гэта ўсё не прыцягваецца ў народную сьвядомасьць. Гэтым павінна была б займацца ўлада. А замест гэтага яна культывуе нейкую грубую патрыярхальнасьць.

Усё выглядае вельмі хістка. Мы запозьненая нацыя.

### Яўген Бабосаў

Беларускай ідэнтычнасьцю якраз і ёсьць беларуская нацыянальная мова. У нас лепш, чым у расейскай, сказана: «матчына мова». Калі мы гаворым «мацярынская мова» – гэта мацяршчына ў Расеі, а ў нас – «матчына мова»! Трэба ведаць і любіць матчыну мову і «мой родны кут, як ты мне мілы». Вось гэта і ёсьць беларускасьцю. Я называю яе «беларускасьць», у Янкі Купалы гэта – «беларушчына». Беларуская ідэнтычнасьць – гэта разуменьне сябе беларушчынай. Гэта ад Купалы ідзе. «А хто там ідзе, а хто там ідзе?» – вось адкуль гэта пачынаецца. Сто гадоў таму якраз. Вось гэтае «Кім нам звацца? – Беларусамі» – вось акурат беларуская ідэнтычнасьць. Усьведамленьне сябе беларусамі, якія жывуць у Эўропе, якія маюць свае нацыянальныя карані, свае нацыянальныя традыцыі, свае звычаі, свае абрады і ўсё што хочаце – у гэтым ёсьць ідэнтычнасьць. Ёсьць у нас і Дзяды

– ёсьць у нас і Радаўніца. Гэта важна! У нас і адно, і другое ёсьць! У нас каталіцкі Вялікдзень і праваслаўны Вялікдзень аднолькава важныя.

Заставацца самім сабой – гэта, думаю, і ёсьць беларускай ідэнтычнасьцю. Гэта матчына мова, наша Айчына, наша дзяржава, наша самастойнасьць, наша самабытнасьць – вось гэта і ёсьць ідэнтычнасьцю. Гэта азначае належаць да гэтых вось каранёў і напластоўваць на карані, не высякаючы нічога – ні ў культуры, ні ў адукацыі, ні ва ўсіх астатніх сфэрах, якія менш нацыянальныя. Скажам, тэхніка аднолькавая – трактар скрозь аднолькавы.

Я выступаў на адной канфэрэнцыі, ужыў слова «беларускасьць». І рэктар мэдынстытуту мне гаворыць: «Як гэта можа быць – беларуская косьць?» Ён нават ня ведае, што такое беларускасьць... Чаму ёсьць польскасьць, ёсьць расейскасьць – ёсьць такое паняцьце! – чаму ня можа быць беларускасьці? А ўвогуле гэта «беларушчына», як сказаў некалі Янка Купала.

### Анжаліка Борыс

Пэўна існуе. Але беларусы яшчэ павінны яе ўсьвядоміць. Кажучы «беларусы», я маю на ўвазе таксама палякаў, якія жывуць у Беларусі, зьяўляюцца ў Беларусі карэнным насельніцтвам і павінны ўдзельнічаць у фармаваньні гэтай ідэнтычнасьці.

### Ірына Бугрова

Безумоўна, яна яшчэ праходзіць нейкія працэсы станаўленьня. Я не магу сказаць, што сёньня ўжо беларусаў можна лічыць сфармаванай нацыяй, не. Таму што вельмі многа значыць ідэнтычнасьць на ўзроўні дзяржавы, дзяржаўная ідэнтычнасьць. І ня толькі як ідэнтычнасьць, акрэсьленая граніцамі, хоць і тут у нас ёсьць праблемы: з аднаго боку мы размываемся, ідзе вельмі моцны ціск, моцны ціск Расеі. Прычым ён вельмі палітычна каньюнктурны, адсюль і такія праблемы. На ўзроўні дзяржаўнай ідэнтычнасьці, на ўзроўні выбудоўваньня канвэнцыянальнай сьвядомасьці – маёй згоды з сыстэмай каштоўнасьцяў

і прававой сыстэмай, якую дзяржава ўсталёўвае на гэтай тэрыторыі. І нават тут бачым падзеленую краіну.

Таму сёньня вельмі цяжка вызначыць ідэнтычнасьць для беларусаў, улічваючы, што і палітычная ідэнтычнасьць адыгрывае вельмі вялікую ролю ў станаўленьні ідэнтычнасьці. А раз ёсьць падзеленае грамадзтва, падзеленая краіна (часта – практычна на процілеглыя каштоўнасьці) – значыць, часта мы гаворым: на жаль, сёньня з ідэнтычнасьцю да канца не выходзіць. Але ў цэлым дзяржаўная палітыка – з пэўнымі ідэалягічнымі акцэнтамі, з сымбалямі, узьдзеяньнем сродкаў масавай інфармацыі – стварае нейкую дзіўную зьяву: ідэнтычнасьць без ідэнтычнасьці. Яна апісаная ў літаратуры: чалавек звонку прывязваецца да нейкіх сымбаляў, а ўнутрана не адчувае сябе ні адказным за гэтыя сымбалі, ні іх «прадуктам». І трэба сказаць, што псыхолягі, якія дасьледавалі праблему індывідуальнай ідэнтычнасьці, гавораць, што людзі, якія пакутавалі на ідэнтычнасьць без ідэнтычнасьці, часта перажывалі псыхалягічны шок пасьля таго, як такая ідэнтычнасьць распадалася – мяняліся сымбалі ці яшчэ нешта перакройвалася. Я думаю, што з народамі таксама могуць такія непрыемныя рэчы адбывацца. У гэтым пляне, я лічу, укладваецца сёньня нейкі варыянт ідэнтыфікацыі беларусаў. Самых галоўных ідэнтыфікацыйных фактараў сёньня два. Першы – вонкавая дыстанцыя ад іншых дзяржаваў і народаў: вельмі шмат ідзе параўнальнага матэрыялу, часта вельмі нэгатыўнага. Тады беларусы пачынаюць думаць: а хто мы? Вось гэтыя культурныя дыстанцыі фармуюцца ў большай ці меншай блізкасьці з кімсьці. Калі вы заўважылі: як толькі расейская палітыка мяняецца ў бок ціску на Беларусь, адразу ж мяняецца і беларуская грамадзкая думка ў бок большай дыстанцыі ад Расеі. Гэта гаворыць, у прынцыпе, пра тое, што беларусы не гатовыя да такіх цесных саюзных дачыненьняў. І, трэба сказаць, наперакор афіцыйнай прапагандзе не адчуваюць такой ужо калясальнай братэрскай любові. Гэта містыфікацыя! Наадварот, з дасьледаваньняў псыхолягаў, якія пісалі да Бярдзяева, вядома, што культурна блізкія народы (лінгвістычна блізкія) часта маюць патрэбу адштурхоўвацца, знаходзіць розьнасьць, знаходзіць дыстанцыю – каб адчуваць сябе камфортней. Яны ня кідаюцца ў абдымкі, а наадварот – шукаюць адрозьненьні. Тады ідэнтыфікацыйны працэс цікавейшы.

Другі фактар – эканамічны. Ня этнакультурны, не культуралягічны, а менавіта эканамічны! Праз эканамічны фактар узьнікае нацыянальна, этнічна цікавы элемэнт – тып вядзеньня гаспадаркі беларусаў. Гэта пытаньне формы эканомікі, гэта пытаньне разьвіцьця нейкіх лякальных супольнасьцяў на нейкім узроўні і г. д. Праз эканоміку зьяўляецца і адраджаецца тое, што зьвязана з этнасам і культурай. Вельмі цікавыя працэсы цяпер адбываюцца, хоць яны, на жаль, мала кім дасьледуюцца. І ўвогуле, вельмі мала сацыялягічных працаў, прысьвечаных гэтым праблемам, – раней было нашмат больш.

На мой погляд, пакуль яшчэ ідзе працэс ідэнтыфікацыі. Ён нашмат больш яўны, чым быў раней, але пакуль я не магу сказаць, што ёсьць беларуская ідэнтычнасьць і яна вось акурат такая і такая.

Я не кажу, што такой ідэнтычнасьці няма ўвогуле, – ідзе працэс. Нешта эканамічнае назапашваецца колькасна, далей ідзе адчуваньне сябе нейкім этнасам, нейкім народам: «Чаму мы такія? Мы ня горшыя!»

Калі я працавала ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце, да нас вельмі часта прыяжджалі французы і немцы. І мы ствaралі ідэнтыфікацыйныя вобразы: як адзін народ уяўляе сабе другі народ: у якіх выразах, у якіх сымбалях ці ключавых словах апісвае. Трэба было апісваць другі народ, а потым – ідэнтыфікаваць сябе. Самая нэгатыўная ідэнтычнасьць была ў беларусаў. Яны сябе апісвалі як закрытыя. Часам вырываліся такія супярэчлівыя рэчы, як незалежнасьць і ў той жа час канфармізм, схільнасьць да таго, каб схаваць галаву, як страўс, і г. д. Гучалі такія ключавыя словы ў апісаньні, як «балота», «партызаны» і яшчэ нешта такое. Мабыць, ня скажаш, што гэта добра. Ствараецца вобраз: недзе ў балотах сядзяць партызаны і г. д. Самі ж людзі трактавалі сябе так! Гэта значыць вельмі часта людзі ня бачылі сябе як народ, які стварае нешта гістарычнае, які зьяўляецца нейкім творцам, які прызнаюць. Вельмі важна, каб цябе прызнавалі! Мне здаецца, што цяпер у гэтай прасторы зьяўляецца жаданьне, каб нас прызнавалі. Прычым прызнавалі ня толькі як дзяржаву, але і як народ, які можа сказаць сваё слова, які можа ўнесьці свой факт культуры і які можа паказаць сябе як незалежны, што дэманструе нейкія іншыя каштоўнасьці ў галіне сацыяльнай палітыкі.

Мы цяпер бачым ня толькі, як дзяржава рэпрэзэнтуе Беларусь, ня толькі вобраз, створаны праз афіцыйную прапаганду і праз афіцыйныя прадстаўніцтвы.

Мы бачым цяпер і некаторыя спробы пэўных групаў у пэўным асяродзьдзі стварарыць іншы вобраз Беларусі. Я гавару ня толькі пра Плошчу – я сьвядома гавару пра іншыя рэчы. Напрыклад, пра такія моманты, калі мы бачым у навуцы пэўныя цікавыя рэчы, зусім нечаканыя. Людзі кажуць: так, мы беларусы, у нас ёсьць вельмі цікавая кампутарная культура, мы займаемся турызмам... Разумееце, цяпер турызм заахвочвае тое, што людзі даўно хацелі рабіць самі. Гэта такая лякальная гордасьць: вось гэта – у нас у Беларусі, гэта нашы азёры! Я зьдзівілася, калі пазнаёмілася зь людзьмі, што займаюцца краязнаўствам і спробамі стварыць сапраўдны, зямны патрыятызм – спрадвечны, а не «квасны», як у Расеі кажуць. Я магу сказаць, што ёсьць такое адчуваньне, жаданьне гордасьці, бачаньня сваёй зямлі як вартай таго, каб быць убачанай, пачутай, прызнанай у Эўропе. Для мяне гэта вельмі важна! Таму нельга сказаць, што ў грамадзтве магчыма толькі палітычная ідэнтыфікацыя. Я яшчэ раз хачу сказаць: палітыка – квінтэсэнцыя таго, што адбываецца да палітыкі. Калі б не было многіх гадоў станаўленьня ў складанай, супярэчлівай гаме гэтага пачуцьця ідэнтычнасьці («я адказваю за гэтую дзяржаву»), дык, можа, нічога б не адбылося і ў палітыцы. А ўсё-такі мы ўбачылі: выбары былі вельмі незвычайныя. Мы ўбачылі вельмі цікавыя тэндэнцыі, і калі іх не заўважаць у Беларусі, то можна прапусьціць галоўнае.

У нас часта гавораць: «Ой, Эўропа! Яна хоча зрабіць Беларусі дрэнна». Гэта самае несусьветнае і неймавернае глупства! Калі бываеш у іншых краінах і шмат гутарыш зь людзьмі, дык безумоўна адчуваеш, што яны хочуць бачыць проста людзей, якія могуць гаварыць пра сябе і гаварыць на поўны голас. І калі ласка, палітыка палітыкай, але на гэтым зацыклівацца немагчыма.

### Генадзь Бураўкін

Мне здаецца, што гэта ёсьць. Іншая справа, што гэта вельмі тонкія рэчы і іх вызначыць ня так проста. Што такое беларус?.. А што такое француз? З чаго ён складаецца? З адчуваньня сваёй непаўторнасьці, годнасьці, з адчуваньня сваёй гісторыі. Так і беларус! На жаль, я лічу, што да гэтага часу ў масе яшчэ гэтага ў нас няма. І нашыя многія сёньняшнія беды ідуць якраз ад таго, што беларусы яшчэ не адчулі сабе цану як нацыі, як народу, не адчулі неабходнасьці некаторых

рэчаў: неабходнасьці сваёй нацыянальнай дзяржавы, неабходнасьці свайго нацыянальнага палітычнага жыцьця, куды ўключаецца павага да гісторыі, месца роднай мовы як дзяржаўнай, дэмакратычныя інстытуты і г. д. На жаль, гэтага беларусы пакуль што не адчулі. Тое, што Эўропа шмат у чым (а можа, і ў пераважнай большасьці) ужо прайшла. Мы гэты этап яшчэ не прайшлі. Бяда ў тым, што сёньняшняя наша ўлада замест таго, каб дапамагчы нам хоць са спазьненьнем, але годна, без экстрэмізму, без радыкалізму прайсьці гэты этап усьведамленьня, самаідэнтыфікацыі, не спрыяе гэтаму, а наадварот. Яны быццам бы выступаюць супраць палітычнай глябалізацыі, але паглядзіце, што яны робяць! Яны, наадварот, старанна падтрымліваюць тое, што робіцца на ўсім сьвеце – ураўноўваньне адрознасьцяў, касмапалітычнасьць. Іншая справа, што яны падтрымліваюць не сусьветны працэс, эўрапейскі, а нейкі рэгіянальны. Перш за ўсё тут маецца на ўвазе арыентацыя на Расею, беспрыкладная ўнікальная русіфікацыя, хлусьня, калі гаварыць пра гісторыю, замест таго, каб годна аддаваць належнае.

У гісторыі ўсякае бывала. Трэба сёньня, будучы разумнымі адукаванымі людзьмі, цьвяроза ўсё ацэньваць. Так, Аляксандар Сувораў быў вялікі расейскі военачальнік, але для Беларусі гэта быў адзін са страшных крывавых катаў. І хай там Расея цэніць талент яго палкаводчы, але мы ў Беларусі не павінны. Што, мы можам даравацьабсалютна бязьвінную кроў нашых продкаў, якую ракой праліў на нашай зямлі гэты военачальнік? А мы яго, даруйце, цэнім, музэй тут трымаем, калгасы ягоным імем называем, вуліцы ў гарадах. Мы мусім, аддаючы належнае яму як расейскаму палкаводцу, яго палкаводчаму таленту, Суворава такім паказаць у гісторыі расейскай, а ў беларускай гісторыі мы яго мусім паказаць як ката, як аднаго з самых крывавых катаў, якія прайшлі па нашай зямлі. Гэтым самым мы ніколькі не пашкодзім нашым стасункам з расейцамі. Калі яны разумныя людзі, яны нас зразумеюць. А калі неразумныя, дык ці варта нам перад імі схіляцца і перапісваць або падпраўляць сваю гісторыю?

Калі так спакойна адбудзецца беларуская самаідэнтыфікацыя, то беларусы зразумеюць, кім яны ёсьць. Сёньня беларусы яшчэ не разумеюць, што такое беларусы. Таму што мы ўспамінаем: «Я – мужык-беларус, пан сахі і касы». Так, на нейкім этапе гэта было. А цяпер ужо беларусы – паны і нечага больш сур'ёзнага: гісторыя ідзе. І вельмі няправільна, калі мы так прывыклі за савецкім

часам усё прыпісваць «вождям», як пісаў Маякоўскі, правадырам. Калі адбыўся нейкі эканамічны рост ці нешта добрае, мы ўсё гэта зьвязваем абавязкова з правадыром. Тым самым сябе прыніжаючы: гэта ж усё зроблена людзьмі! І на заводах калі людзі добра працавалі ці на палях працавалі – гэта перш за ўсё іх заслуга. Іншая справа, што кіраўнік, у сілу свайго становішча, можа або спрыяць гэтаму, або перашкаджаць ці замаруджваць гэта. Але не ягонае гэта дасягненьне. Перш за ўсё гэта заслуга тых, хто працуе, а потым ужо ягоная. Але ў нас гэтага разуменьня яшчэ няма. Людзі гатовы аддаць сваю працу ў заслугу некаму іншаму. Калі мы навучым людзей годнасьці: тое, што я зрабіў, што павінна быць ацэнена... Як пісаў Твардоўскі пра Васіля Цёркіна, «обеспечь, раз я достоин»! Пакуль што гэтага няма.

Для мяне дарагое ў беларускім характары тое, што беларус вельмі шчыра (можа быць, ня так хутка, як іншыя) адгукаецца на чужую бяду: ён, па-народнаму кажучы, дастаткова жаласьлівы. Калі гэта ідзе на роўных стасунках зь іншымі народамі – гэта выдатна. Калі ж гэтую беларускую жаласьлівасьць, дабрыню некаторыя выкарыстоўваюць зусім па-іншаму, то ад гэтага многія нашы беды, бо мы церпім тое, чаго іншыя народы б не пацярпелі. Мы церпім зьдзек з нашай роднай беларускай мовы, калі з высокіх трыбунаў яе перакрыўляюць. Уяўляеце, каб такое было ў Грузіі? Я не за тое, каб рабіць так, як робяць некаторыя грузіны – адразу ў морду, як кажуць. Але ставіць на месца тых людзей, якія так робяць, трэба.

Беларусам у іх нацыянальным характары чамусьці не хапае рашучасьці, не хапае сілы, волі, годнасьці перш за ўсё. Беларускі характар, у прынцыпе, – характар вельмі добры, славянскі. Я падкрэсьліваю – славянскі. Мы ў славянскім сьвеце, мы ад славянства ўзялі вельмі многа. Больш за тое, гэта ўжо даўнія сьцьверджаньні і адносна мовы, і адносна іншых парамэтраў нацыянальных, што беларусы, можа, захавалі найбольш добрага, чыстага і даўняга са славянскіх традыцый у сябе: у сваёй мове, у сваім характары, у сваіх звычках, у сваім побыце. І гэта добра!

Беларусам ёсьць чым ганарыцца і з чым разьбірацца ў саміх сябе. Перш за ўсё, паўтараю, беларусы павінны гэта з сабой зрабіць, а пасьля тое, што ў сабе яны выкрышталізавалі, прызналі, «зацьвердзілі», выносіць на сьвет, на веча

народаў. Так, «свой пачэсны пасад між народамі»! Мы яшчэ да гэтага часу не зразумелі, што ў нас такі пасад ёсьць, ён пачэсны, і ня трэба некаму дазваляць на наш пасад сядаць. Гэта наш пасад! Мы павінны на яго сесьці. Тое, што сказаў Янка Купала, на жаль, многія беларусы, хоць і афіцыйна называюць Купалу прарокам, яшчэ не ўсьвядомілі. Кожны беларус павінен усьвядоміць «свой пачэсны пасад між народамі». І нікому ня трэба гэты пасад аддаваць. Ня вернеш, канечне, у беларускую літаратуру Дастаеўскага, які стаў клясыкам расейскай літаратуры, ня вернеш Міцкевіча, які стаў клясыкам польскай паэзіі. Але пасад свой усё роўна нікому аддаваць ня трэба.

## Алесь Бяляцкі

У прынцыпе, беларуская ідэнтычнасьць існуе. Гэта ёсьць і на ўзроўні падсьвядомым, і на ўзроўні бытавым, на ўзроўні традыцыйным. Упершыню я гэта дастаткова моцна адчуў, калі быў у войску: я ішоў туды ўжо як сьведамы беларус. Цікава было, як зьбівалася наша беларуская кампанія і наколькі мы ўсё ж адрозьніваліся ад іншых нацыянальных групаў – ад расейцаў, ад украінцаў. Я ўжо не кажу пра больш далёкія групы.

Беларуская ідэнтычнасьць ёсьць, і яна асабліва выразна бачна, калі людзі гуртуюцца ў мультынацыянальных супольнасьцях, – тады вельмі выразна праяўляецца. Тут, у Беларусі, яна, можа быць, ня надта бачна для нас, але дастаткова моцна бачна для замежнікаў, якія прыяжджаюць сюды. Яны таксама вызначаюць, што Беларусь – не Расея, што Беларусь – не Ўкраіна. Тое ж тычыцца і людзей, звычаяў, традыцыяў і г. д.

Што вызначае гэтую адрознасьць? Мабыць, традыцыі. Нацыянальныя традыцыі, традыцыі грамадзтва, якія ёсьць на сёньняшні дзень. Яны, канечне, моцна зуніфікаваныя (таму што працэс уніфікацыі дастаткова моцны), але ў той жа час яны застаюцца вызначальнымі. Тое, што выхоўвалася пакаленьнямі, стагодзьдзямі... Чаму, напрыклад, калі ты бачыш чорнага ката, ты плюеш церазь левае плячо? Ты ж ня думаеш пра гэта. Ці чаму, напрыклад, калі ты вітаесься з чалавекам праз парог, ты стараесься перайсьці яго і павітацца зь ім на адным баку, ці ён інстынктыўна пераходзіць? Ты таксама пра гэта ня думаеш, таму што

так проста ёсьць. Такіх рэчаў, якіх мы проста не заўважаем, калі робім, ёсьць сотні, тысячы. Збоку яно заўважаецца – для іншых. А мы пра гэта ня думаем.

### Аляксандар Вайтовіч

Несумненна, існуе беларуская ідэнтычнасьць. Яе вызначаюць мова, культура, мэнталітэт, традыцыі беларусаў. Адсюль выцякае адна зь вельмі важных задачаў: берагчы і захоўваць мову. А беларускасьць (быць беларусам) – гэта і ёсьць разуменьне, захаваньне і разьвіцьцё нашай ідэнтычнасьці і праца на карысьць нашай бацькаўшчыны і яе грамадзянаў.

### Андрэй Вардамацкі

Ідзе працэс фармаваньня беларускай ідэнтычнасьці. Калі гаварыць пра беларускую ідэнтычнасьць цяпер, дык галоўным зьяўляецца не яе сфармаванасьць, яе існаваньне, факт яе наяўнасьці, а працэс яе стварэньня, хуткі працэс яе стварэньня і фармаваньня.

Я ня буду гаварыць пра яе фармаваньне на каштоўнасным узроўні, я магу сказаць на ўзроўні вынікаў агульнанацыянальных сацыялягічных дасьледаваньняў, якія мы праводзім. Яны заключаюцца ў тым, што ўвайсьці ў склад якой-небудзь іншай краіны хацелі б 4–5% насельніцтва Беларусі. Такая колькасьць людзей хацела б увайсьці ў склад, напрыклад, Расейскай Фэдэрацыі на правах суб’екту. Калі такое ёсьць – значыць, можна гаварыць пра наяўнасьць ідэнтычнасьці.

Апісаньне яе – вельмі складаная рэч. Вельмі лёгка дыфэрэнцыяваць нацыянальныя характары скандынава і італьянца: там адрозьненьні відавочныя. Але вельмі цяжка апісаць адрозьненьні беларуса ад расейца: гэта вельмі блізкія нацыянальныя характары. Аднак мы разумеем, што розьніца існуе, і можна называць нейкія характарыстыкі. Розьніца існуе ў мяккіх формах – ня так, як паміж маруднаватымі скандынавамі і экспансіўнымі італьянцамі. Але розьніца паміж расейцамі і беларусамі на ўзроўні нацыянальнага характару існуе.

## Вінцук Вячорка

Натуральна, існуе. Нармальная, паўнацэнная нацыянальная ідэнтычнасьць з усімі складнікамі. У тым ліку – асабліва падкрэсьлю – з моўным. Нягледзячы ні на што, абсалютная бальшыня з нас называе роднаю моваю беларускую, а гэта значыць, улучае яе ў сьпіс сваіх каштоўнасных апірышчаў.

Застаецца праблемаю, аднак, атаясамліваньне беларуса зь дзяржаваю. Гістарычна так склалася, што апошнія пару стагодзьдзяў дзяржава была ня нашая, і выпрацавалася трывалае адчужэньне ад яе як варожае, незразумелае сілы. Наноў атаясаміцца зь дзяржаваю, стаць *nation* у тэрміналягічным сэнсе, які ўжываецца ў заходнеэўрапейскіх мовах (нацыя-дзяржава), мы зможам толькі ў Беларусі з празрыстым мэханізмам дэмакратычнага зьдзяйсьненьня ўлады.

## Павал Данейка

Што такое ідэнтычнасьць? У маім разуменьні беларусы былі, ёсьць і будуць. Нейкая мэнтальнасьць беларуская існуе, але пытаньне ў тым, наколькі яна самарэфлексуецца, наколькі яна артыкулюецца для іншых. Гэтае пытаньне патрабуе правядзеньня такой работы: у фармулёўцы сэнсаў беларускасьці і ў трансьляцыі гэтых сэнсаў іншым. Немагчыма, каб пра цябе нешта ведалі, калі ты пра сябе нічога не расказваеш. Мы павінны нешта расказаць сьвету пра сябе. Але перад тым як расказаць, мы павінны зразумець сябе. І гэта ня робіць народ! Функцыя народу – выжываць, жыць, быць такім, які ён ёсьць. Эліты інтэрпрэтуюць гэта. Эліты насычаюць высокімі мэтамі штодзённае жыцьцё. Народ з задачай выжываньня спраўляецца выдатна, а вось эліты не спраўляюцца з сэнсам выжываньня.

Таму я думаю, мы яшчэ ідзем гэтым шляхам – шляхам фармаваньня групаў, гатовых выконваць гэтую даволі складаную работу. Такая дзейнасьць патрабуе ад элітаў дастатковай адказнасьці за будучыню краіны і за тое, што ты гаворыш. Гэтае фармаваньне адбываецца. І яно не залежыць ад жаданьня тых ці іншых палітычных групаў, дзеяньняў уладаў. Гэтыя дзеяньні і жаданьні могуць толькі нейкім чынам рэгуляваць тэмп, але не спыняць сам працэс – ён ідзе абсалютна

незалежна, як запушчаны мэханізм. Была пастаўлена праблема: трэба быць кімсьці! Проста відавочны факт: трэба быць кімсьці!

### Андрэй Дынько

Беларуская ідэнтычнасьць складаецца з розных элемэнтаў. Гэта пачуцьце прыналежнасьці да беларускай супольнасьці, пачуцьце грамадзянства беларускай дзяржавы. Сюды ўключаюцца і такія культурныя элемэнты, як беларуская мова, беларуская культура. Гэта тыя супольныя культурныя коды, якімі валодаюць беларускія грамадзяне. Але таксама ёсьць ідэнтыфікацыя шырокіх групаў людзей з гэтым незвычайным палітычным рэжымам, зь якім яны сябе атаесамляюць.

### Сьвятлана Калінкіна

Мне здаецца, што ўсё ж такі беларускай ідэнтычнасьці не існуе. Усё ж такі «Беларусь» як самаадчуваньне ня ў нейкіх адзінкавых людзей, а ў грамадзтва ў цэлым – гэтага, мне здаецца, не адбылося яшчэ.

Шмат, напэўна, гэтаму тлумачэньняў, але мне здаецца, галоўнае ў тым, што наагул за тыя пятнаццаць гадоў, што існуе незалежная беларуская дзяржава, не было адназначнага кірунку разьвіцьця гэтай дзяржавы. Мы то сьцягі мяняем, то гімны мяняем, то мову адраджаем, то яна ўжо непатрэбная. То мы ўваходзім у склад Расеі, то не ўваходзім. І такая мітусьня, мне здаецца, і не дазволіла сфармавацца беларускай ідэнтычнасьці. Беларусы як самадастатковая нацыя самі сябе не адчуваюць. Яны сябе адчуваюць «пры кімсьці»: пры Расеі альбо пры Эўропе. Пры кімсьці!

### Сяргей Калякін

Думаю, што ёсьць беларуская ідэнтычнасьць і яна ўсё больш расьце. Праўда, часам спрабуюць падмяняць паняцьці. Для самаідэнтыфікацыі трэба зразумець, што мы беларусы, мы жывем на гэтай тэрыторыі, у нас ёсьць такая і такая куль-

тура, у нас ёсьць такая вось гісторыя. Гэта значыць мы павінны самаідэнтыфікавацца як беларусы, што жывуць у канкрэтнай дзяржаве і маюць канкрэтныя інтарэсы. І падмена іх паняцьцямі, што мы эўрапейцы, ці расейцы, ці ліцьвіны, ці яшчэ ня ведаю хто, – гэта ўсё замінае самаідэнтыфікацыі. Мы беларусы! І гэтая самаідэнтыфікацыя сёньня ідзе. Яна мае вельмі невялікую гісторыю ў сілу пэўных варункаў: мы ня мелі дзяржаўнасьці некалькі апошніх стагодзьдзяў. Нашу дзяржаўнасьць можна пачынаць лічыць (прычым – абмежаваную) у рамках БССР у Савецкім Саюзе. А абсалютна незалежнай дзяржавай у апошні гістарычны пэрыяд мы сталі толькі з 1991 году. Усяго толькі пятнаццаць гадоў! Але за гэтыя пятнаццаць гадоў адбылася ўжо самаідэнтыфікацыя.

Сёньня ўсё менш беларусаў хочуць быць часткай чагосьці. Хоць адначасова значная частка хоча быць часткай чагосьці, прычым адразу часткай і аднаго, і другога: мы хочам быць адразу і ў Эўрасаюзе, і ў Расеі. Гэта гаворыць пра пэўнае раздваеньне нашай самасьвядомасьці. У гэтым ёсьць нейкі алягізм, але з другога боку, ёсьць і простая лёгіка: адбываецца ўсьведамленьне таго, што нам патрэбна і Эўропа, і Расея. Таму мы хочам быць і тут, і там. Да 70% даходзіць колькасьць беларусаў, якія жадаюць у Эўрасаюз і Расею, прычым 40% аднachasова хочуць і туды, і туды. Таму што яны адчуваюць свой інтэрас і тут, і там. Трэба быць і з аднымі, і з другімі, але – заставацца беларусамі. Трэба заставацца беларускай дзяржавай, шукаць выгады для гэтай дзяржавы, для народу, які жыве на гэтай тэрыторыі і які, уласна, і складае гэтую дзяржаву.

### Кася Камоцкая

Мне падаецца, што «быць беларусам» – гэткая ідэнтычнасьць толькі цяпер ствараецца. Можа быць, звонку выглядае іначай. Але знутры – яна толькі ствараецца. Момант самасьвядомасьці, самаідэнтыфікацыі, мне падаецца, у народу праходзіць цяпер.

Можа быць, збоку іншыя народы сказалі б, што значыць для іх беларус, але для сябе беларус... Мне здаецца, што працэс яшчэ ідзе.

Недастворaная нацыя? Безумоўна! У нас ніколі не было нацыянальнай дзяржавы. Лукашэнкаўскую дзяржаву назваць нацыянальнай немагчыма. Яна

можа быць сацыяльнай, можа быць якой заўгодна, але – не нацыянальнай. Яна фактычна праводзіць антынацыянальную палітыку. Усё робіць, каб толькі не стварылася нацыя. А нацыя абавязкова мусіць прайсьці праз пэрыяд нацыянальнай дзяржавы, а толькі потым пераходзіць да наступнага пэрыяду. Скокі ў гісторыі, можа быць, і магчымыя, але мне падаецца, для нашых варункаў неабходна, каб была створаная нацыянальная дзяржава. Нацыянальна арыентаваная, з адной нацыянальнай мовай, з лабіраваньнем нацыянальнай культуры. Тады людзі будуць разумець, што такое «быць беларусам».

### Сяргей Касьцян

Ідэнтычнасьць беларускай мэнтальнасьці заключаецца цалкам у яе эканамічным укладзе, гістарычным, традыцыях, звычаях, адукаванасьці, культуры і таксама ў яе прыродных умовах. Гэта ўсё разам і акрэсьлівае ідэнтычнасьць беларускай нацыі. І каб гэта зразумець лепей, мне здаецца, трэба нагадаць тое, што празь беларускую зямлю праходзілі дзясяткі войнаў – і з захаду на ўсход, і з усходу на захад. І, як бачыце, беларусы захавалі і сваю мову, і сваю культуру, і свае звычаі, і традыцыі, і назвы вёсак і гарадоў. Ва Ўкраіне, у Расеі колькі было перайменавана гарадоў у гонар тых або іншых рэвалюцыйных дзеячаў! У нас гэтага не было. Адзін толькі Дзяржынск – дык ён нарадзіўся тут! А ўсё астатняе – мы нічога не мянялі. Нават назваў вуліцаў не мянялі. І калі Савецкага Саюзу ня стала, ва ўсіх рэспубліках зноў пачалі мяняць найменьні гарадоў, вуліцаў, вёсак, а мы гэтага ня сталі рабіць. Вось у гэтым і ёсьць асаблівасьць беларускага народу, асаблівасьць яго мэнтальнасьці.

### Вячаслаў Кебіч

А хто мне скажа… Я дык свой радавод трохі ведаю: мне ўдалося вызначыць свой радавод з 1755 году. Але вось я вас магу спытаць: вы ведаеце, чыя кроў цячэ ў вас? Наўрад ці! Я б сказаў, што «чыстых» беларусаў, на мой погляд, увогуле няма. Мы знаходзіліся на надта цяжкіх скрыжаваньнях гістарычных момантаў, таму цяжка вызначыць – хто мы, па вялікім рахунку. Можа, сёньня слова «беларус»

больш мае дачыненьне да дзяржаўнасьці, чым расы. Такое ёсьць і ў Францыі, і ў Амэрыцы, і ў Бразыліі: там няма паняцьця нацыі... Таму я і сказаў, што «беларус» – больш з пункту гледжаньня дзяржаўнасьці, чым паводле расавых нейкіх прымет. Мы сваіх генных каранёў ня можам сёньня вызначыць. На жаль ці на шчасьце (ня ведаю, што больш правільна), мала якія краіны называюць усіх жыхароў амэрыканцамі, ці французамі, ці бразыльцамі. Большасьць усё-такі па-іншаму... Паспрабуйце вы немцам сказаць, што яны ня немцы! Ці паспрабуйце кітайцу або японцу сказаць, што яны не японцы... Там слова «японец» мае на ўвазе перш за ўсё расу, а не дзяржаўнасьць як такую. Таму што ёсьць расы «чыстыя» – я маю на ўвазе не чысьціню нацыі, а тое, што не было кровазьмяшэньня.

Таму я б сказаў, што ня трэба нам так ставіць пытаньня.

### Жанна Літвіна

Беларуская ідэнтычнасьць яшчэ не сфармуляваная. Ня столькі, можа, несфармаваная, колькі несфармуляваная. Нашая нацыянальная эліта павінна яе сфармуляваць. Прагаварыць, прапісаць, зрабіць зразумелай. Яна нейкая няпэўная, людзі не разумеюць каштоўнасьці гэтай ідэнтыфікацыі. Гады два таму трапілася мне такое параўнаньне, што Беларусь – гэта шахматная фігура, якая звалілася з шахматнай дошкі. Дзесьці проста пад стол выпала Беларусь. Як так магло адбыцца? Чаму так адбылося? На гэтае пытаньне мусіць адказваць нацыянальная эліта.

### Анатоль Лябедзька

Не, такой ідэнтычнасьці яшчэ ня склалася. На нейкім інтуітыўным узроўні нашы людзі (незалежна ад таго, на якой мове яны размаўляюць) у побыце ўсё адно кажуць: мы не такія, як іншыя. Але менш за ўсё тут робіцца захадаў з боку ўлады. Інструмэнты ўлады тут могуць быць вельмі эфэктыўныя. Калі паглядзець на сродкі камунікацыі: тэлебачаньне, радыё, друк, Інтэрнэт, – мы ня бачым з боку дзяржавы мэтанакіраванай палітыкі, каб беларусы ведалі, хто яны такія.

Бо выглядае так, што нашая гісторыя пачынаецца з 1994 году, зь першых прэзыдэнцкіх выбараў. А да гэтага – такое адчуваньне! – і гісторыі не было. Ну, нешта было, з вэтэранамі зьвязанае, – абрывак такі. І на гэтым мы страцілі памяць, і больш не было ні гісторыі, анічога.

Канечне, гэта моцна перашкаджае, бо на побытавым узроўні ёсьць жаданьне ведаць, хто мы такія. Нават калі стаіш на мяжы ў чарзе, а паехаў без чаргі нехта з расейцаў – нейкія эпітэты ідуць ад якіхсьці расейскамоўных беларусаў. Яны разумеюць: мы не такія, мы іншыя.

Думаю, гэта вельмі выразна ў сацыялёгіі зафіксавана – наколькі актуальна пытаньне сувэрэнітэту, незалежнасьці для людзей. Пятнаццаць гадоў гэта была тэма нумар адзін. У Расеі праходзілі выбары (у Думу, прэзыдэнцкія), і гэта была адна з трох-чатырох тэмаў, якія былі прыярытэтныя. Сёньня пра гэта ніхто не гаворыць. І па ўсіх сацыялягічных апытаньнях толькі 4–5% людзей на адэкватна сфармуляванае пытаньне (а яно гучыць у рэдакцыі Жырыноўскага як «Беларусь – восьмая фэдэральная акруга» – я лічу, гэта правільна і карэктна сфармуляванае пытаньне, а не пра нейкія стасункі з Расеяй) адказваюць станоўча. Гэта азначае, што за гэтыя пятнаццаць гадоў, нягледзячы на тое, што ўлада не рабіла ніякіх захадаў, каб беларусы зразумелі, што яны чымсьці адрозьніваюцца ад усіх астатніх, гэта зафіксавалася ў сацыялёгіі. І сам Лукашэнка, і ўлада пачынаюць ужо прыстасоўвацца да гэтага факту. У гэтым пляне паказальная апошняя выбарчая кампанія: Лукашэнка, фактычна, узяў усе лёзунгі сваіх апанэнтаў – «За Беларусь!» і інш.

Гэта ўсё гаворыць за тое, што мы ўсё ж ёсьць эўрапейскай нацыяй, што ў нас ёсьць свае нацыянальныя інтарэсы. Лукашэнка пра гэта не гаворыць, але праз вырашэньне нейкіх сваіх кароткатэрміновых інтарэсаў ён змушаны гэта прызнаць. Ён вымушаны прызнаць, што ніякае аб’яднаньне з Расеяй сёньня немагчымае ня толькі таму, што яму не прапаноўваюць, не даюць прававой пэрспэктывы, але яшчэ і таму, што больш за 90% людзей шчыра жадаюць жыць у сваёй краіне. І гэта каштуе дарагога! Я думаю, што якраз гэта ў значнай ступені і ёсьць заваёвай тых людзей, якія зьяўляюцца носьбітамі эўрапейскіх каштоўнасьцяў. А адна з эўрапейскіх каштоўнасьцяў – ідэнтыфікацыя, веданьне сваёй гісторыі, сваёй культуры.

## Васіль Лявонаў

Але, беларуская ідэнтычнасьць існуе. Перш за ўсё, мы «не такія, як яны». Беларусы ў імкненьні добра жыць гатовыя адпаведна і добра ды, калі трэба, цяжка працаваць, мы схільныя да інтэлектуальнай, высокакваліфікаванай працы, цярплівыя, але не бясконца. Катэгарычна адмаўляю пашыранае апошнім часам сьцьверджаньне аб тым, што нашая цярпімасьць перарадзілася ў баязьлівасьць. Не, мы проста разважлівыя ў сваіх учынках. Але герояў наша зямля нараджаць не перастала.

Быць беларусам – значыць любіць перш за ўсё беларусаў, Беларусь, спрыяць працьвітаньню сваёй зямлі, ганарыцца тым, што ты часьцінка народу, паважаць іншыя народы, не фанабэрыцца, не ўпадаць у ізаляцыянізм. Не проціпастаўляць сябе ні Ўсходу, ні Захаду.

## Алег Манаеў

На мой погляд, у пачатку XXI стагодзьдзя беларуская ідэнтычнасьць, заснаваная на прынцыпе этнічнасьці (уключаючы яго базавыя элемэнты, такія як агульнасьць тэрыторыі, крыві, гісторыі і культуры), ня тое каб неадэкватная, але ня мае яснай пэрспэктывы. У сілу самых розных прычынаў гэтая ідэнтычнасьць так канчаткова і ня склалася.

У той жа час нельга сказаць, што беларускай ідэнтычнасьці няма. Я лічу, што яна ўжо ёсьць, але іншага характару. Напрыклад, я, чалавек, які нарадзіўся ў Расеі і расеец па крыві, ідэнтыфікую сябе як беларус. Хоць з этнічнага пункту гледжаньня, які я беларус? На маю думку, беларуская ідэнтычнасьць сёньня мае ня столькі этнічны, колькі сацыяльна-палітычны, грамадзянскі характар. Аснова такой ідэнтычнасьці – незалежная дзяржава і правы яе грамадзянаў. Гэта значыць, што беларусамі з поўным правам могуць сябе лічыць людзі, якія жывуць у Беларусі. Яны лічаць сябе грамадзянамі не Расеі, ня Польшчы, не Гвадэлупы – а менавіта Беларусі. Яны карыстаюцца пэўнымі выгадамі (ня толькі ва ўтылітарным сэнсе, але выгадамі прававымі, палітычнымі, эканамічнымі, культурнымі), зьяўляюцца грамадзянамі ўласнай краіны, ганарацца гэтым і гатовыя адстойваць

гэты свой статус. Гэта і значыць – быць беларусам. А вырас ты ў беларускай вёсцы або ў асфальтавых джунглях сучаснага гораду, на якой мове ты гаворыш у штодзённых зносінах, аддаеш перавагу дранікам ці марской капусьце – гэта пытаньне другараднае. Не нязначнае, а менавіта другараднае.

Фармаваньне нацыянальных ідэнтычнасьцяў на аснове этнічнасьці і, адпаведна, нацыянальных дзяржаваў у той жа Эўропе сто пяцьдзясят – дзьвесьце гадоў назад адбывалася ў зусім іншых гістарычных умовах. Той цягнік ужо сышоў, і ў яго ўжо ня сесьці. Ніколі! Таму, калі мы зацікаўленыя, каб Беларусь зрабілася паўнацэннай сучаснай краінай, неабходна ня проста ўмацоўваць яе дзяржаўнасьць, але, перш за ўсё, умацоўваць яе грамадзянскую ідэнтычнасьць.

### Аляксандар Мілінкевіч

Я ганаруся тым, што я беларус. Хаця сёньня гэта стварае шмат праблемаў. Хваравітая сытуацыя – столькі намяшана ў галовах людзей, столькі праблемаў у мэнталітэце. Народ сапраўды выдатны. Радзіма, якую любіш самааддана, нічога не патрабуючы ў адказ. Гэта штосьці лірычнае, містычнае, зялёна-блакітнае, пяшчотнае. Гэты край – як прыгожая і прывабная жанчына, з пачуцьцём годнасьці і верай у сябе, што пакуль хаваецца пад маскай «тутэйшасьці». Радавод свой ведаю да сёмага калена. У ім – рэпрэсаваныя паўстанцы 1863 году – прапрадзед і прадзед, – дзед, які быў адным з актывістаў беларускага руху 1920-х гадоў на Гарадзеншчыне. Беларусь – гэта, найперш, падзеі і людзі. Надзвычай важна адчуваць сваё месца ў ланцужку гісторыі.

### Анатоль Міхайлаў

Надзвычай наіўна спадзявацца на тое, што існуе якая-небудзь унівэрсальная і адназначна акрэсьленая фармулёўка ідэнтычнасьці. Само асэнсаваньне ідэнтычнасьці – гэта хутчэй працэс, які ніколі не спыняецца, а не фіксаваны і навязаны вынік чыіхсьці ўяўленьняў ці пажаданьняў. Праблема, аднак, у тым, што гэтыя намаганьні ў самаідэнтыфікацыі, у сваю чаргу, прадвызначаныя нашай уласнай сьвядомасьцю. І гэты стан пакідае жадаць лепшага.

## Алесь Міхалевіч

Зразумела, беларуская ідэнтычнасьць ёсьць, таму што беларусы лічаць сябе іншымі, чым расейцы, палякі, летувісы, украінцы. То бок ёсьць самаідэнтыфікацыя сябе як чагосьці асобнага. Трэба сказаць праўду, што ў значнай ступені гэтая ідэнтычнасьць пашырылася на працягу апошніх дзесяці-пятнаццаці гадоў. Я назіраю, напрыклад, за мяжой: усё радзей і радзей звычайныя (нават троху «савецкія») беларусы, чуючы расейскую мову, кідаюцца да таго, каго пабачылі, як быццам ён іх брат, родны чалавек і г. д. Ужо ёсьць адчуваньне таго, што беларусы – штосьці іншае, штосьці асобнае. І калі чалавек сустракае за мяжой менавіта беларуса, то ёсьць вялікае шчасьце і радасьць: вось пабачыў кагосьці роднаснага!.. Гэта супрацьпастаўленьне сябе іншым: мы як «мы» адрозьніваемся ад таго, кім ёсьць «яны».

Ёсьць моманты і адмоўнага адрозьненьня (мы не яны), і станоўчага, бо нас усё ж штосьці і аб'ядноўвае. Што менавіта аб'ядноўвае? Кажуць: Чарнобыль і Лукашэнка. Нават гэта ўжо нямала! Для Захаду беларусаў цяпер больш аб'ядноўвае Мілінкевіч: гэта бачаць значна лепш тыя беларусы, якія жывуць за мяжой.

Нас аб'ядноўвае спажывецкае грамадзтва: «Купляй беларускае!». То бок стаўленьне да выпрабленага тут як да чагосьці лепшага. Стаўленьне да сябе менавіта як да чагосьці са знакам якасьці. Тое, што Лукашэнка агучыў: «Беларусы – гэта тыя самыя расейцы, толькі са знакам якасьці». Я перакананы, што большасьць беларусаў з гэтым нязгодныя, але тое, што на нас ёсьць нейкі знак якасьці, што мы лепшыя, – гэта адназначна так.

Зразумела, тут ёсьць вельмі вялікі ўплыў дзяржавы. Дзяржава вельмі шмат зрабіла: немагчыма пераацаніць наяўнасьць беларускага рубля, немагчыма пераацаніць наяўнасьць беларускіх пашпартоў, немагчыма пераацаніць нават тое, што ў беларускіх пашпартах няма нацыянальнасьці. Колькасьць тых людзей, якія вызнаюць сябе як «рускія», з кожным годам меншае. І думаю, што гадоў празь пяць тых, хто будзе вызнаваць сябе як «рускія», унутры Беларусі будзе пару працэнтаў, хаця яшчэ нядаўна іх было амаль пятнаццаць.

Ёсьць тое, што сапраўды аб'ядноўвае. Аб'ядноўваюць нашыя спартоўцы, якія час ад часу атрымліваюць перамогі на розных спаборніцтвах. Памятаем вельмі

вядомы турнір па тэнісе, дзе беларусы перайгралі расейцаў. Гэта было ўсімі ўспрынята як капітальная перамога і сьцьверджаньне таго, што мы лепшыя, што мы незалежныя. І, урэшце, той жа Лукашэнка даў гэтым тэнісістам ордэны адразу – гэта таксама паказвае, што нават для Лукашэнкі гэтая ідэнтычнасьць ёсьць, што ён таксама супрацьпастаўляе беларусаў іншым.

### Тацяна Працька

Беларусы – людзі заўважныя ў сусьветнай супольнасьці. І сярод іншых людзей яны адметныя. Гэта людзі талерантныя, як мы цяпер гаворым. Яны ставяцца да іншых людзей не з жаданьнем перарабіць гэтых людзей на свой капыл, а прымаюць іх і стараюцца падладзіцца пад іх. Усім людзям гэта вельмі падабаецца, яны ня бачаць адразу ворага ў беларусу, а бачаць чалавека, які пашырыць магчымасьці, дасьць магчымасьць усім быць добрымі.

Я магу прывесьці такі прыклад. Мая дачка цяпер жыве ў Амэрыцы. І ў той мясцовасьці жывуць людзі розных нацыянальнасьцяў: і італьянцы ёсьць, і віетнамцы, і амэрыканцы, і кітайцы, і ірляндцы... Стракатая што да нацыянальнасьцяў частка Амэрыкі. Але гэтыя людзі прыходзяць і групуюцца вакол маёй дачкі. Яны нейкія вячэры ладзяць, прыходзяць нейкія праблемы абмяркоўваць... І нейкая такая супольнасьць гэтага кавалку тэрыторыі зьявілася з таго, што зьявіліся беларусы. Беларусы – добрыя, гасьцінныя, яны нічога ні ад каго не патрабуюць і любяць добра працаваць. Напрыклад, мой муж прыяжджае і ладзіць усім вэранды і дзіцячыя дамкі. Апошнюю вэранду зрабілі вельмі вялікую – для ўсяго гэтага кавалку тэрыторыі: там можна танцпляцоўку нават рабіць. На ўсім сьвеце добра ставяцца да людзей, якія любяць працу, якасна працуюць і самі для сябе зарабляюць. Менавіта такія беларусы за мяжой.

Іншая справа, калі мы ў сваёй краіне. І тут мы зусім іншыя! Ёсьць супярэчнасьць паміж беларусам за мяжой, у сьвеце, у поглядзе іншых людзей і беларусам сярод сваіх. Проста дзівісься той зайздрасьці, якая ёсьць у нас, у сваёй супольнасьці. Яна чамусьці зьнікае, калі чалавек трапляе ў іншыя ўмовы.

Ці адносіны да сваёй гісторыі і мовы! За мяжой беларус ганарыцца сваёй гісторыяй і мовай – як усе іншыя народы.

Яшчэ адна адметнасьць беларуса – ніколі не паказваць свае язвы, не цягнуць свае непрыемнасьці на людзі. Заўсёды ўсё добра! Між іншым, гэта дапамагае нам быць эўрапейскімі людзьмі: яны таксама не выстаўляць свае язвы на публічнае абмеркаваньне.

Мы заэксплюатавалі гэтую нашую нацыянальную адметнасьць, асабліва дзяржаўнае TV: у нас усё добра! Калі нейкі іншаземец да нас прыедзе, хіба мы гаворым, як у нас дрэнна? Не, у нас усё добра! У дом запросяць: самі нічога ніколі не зьядуць, а калі госьць прыходзіць – і ікра на стале, і ўсякія прысмакі...

Так мы і ў палітыцы сябе паводзім. З аднаго боку, даволі складаная эканамічная сытуацыя. А з другога боку, усяму сьвету мы паказваем, што ў нас ікра лыжкамі...

Мы маглі б, напэўна, быць самым любімым народам у Эўропе і ў сьвеце. А паколькі ў нас нейкая такая ўнутраная раздраенасьць, мы вось гэтую зайздрасьць адзін да аднаго і маем у сваім доме. У сваім доме ў нас непарадак, а зьнешне мы дастаткова прывабныя людзі.

### Андрэй Саньнікаў

Складанае пытаньне, я магу тут спасылацца толькі на асабісты досьвед. Я ніколі не лічыў сябе ні рускім, ні кім іншым. Для мяне было натуральна, што я беларус, і я ганарыўся гэтым. Дапамагло нават тое, што ў Савецкім Саюзе мы мелі пашпарт грамадзяніна Беларусі. Мне дзіўна цяпер, калі некаторыя мае знаёмыя пішуць у анкетах: «Краіна былога грамадзянства – СССР». Я так ніколі не пішу: заўсёды – Беларусь. Гэтаму ёсьць нават фармальная юрыдычная аргумэнтацыя: я меў пашпарт грамадзяніна Беларусі, БССР.

Наконт ідэнтычнасьці. У ідэале ідэнтычнасьць павінна абапірацца на культуру, гісторыю, мову. Я б сказаў, можа, – мову, культуру, гісторыю. Але ж гэтага мы ня маем. Зьнішчэньне беларускасьці мы бачылі, а як яе выратоўвалі – пакуль што ня бачылі. Былі тры-чатыры гады адноснай лібэралізацыі, і цяпер беларускасьць спрабуюць у андэграўнд заганяць, адмаўляць яе. Але ідэнтычнасьць ёсьць. Нават у людзей, якія, можа, выступаюць за больш шчыльныя стасункі з Расеяй. Яны

ўсё ж такі адчуваюць сябе беларусамі. І калі пытаньне паставіць наўпрост: «Вы становіцеся губэрняй», – думаю, большасьць была б супраць.

Я думаю, што нам усе ж такі трэба будзе прайсьці, тым ці іншым чынам, праз этап будаваньня нацыі-дзяржавы. Гэта адбывалася з усімі эўрапейскімі краінамі, пачынаючы з XVI стагодзьдзя. Сёньня таксама ёсьць прыклады такога будаўніцтва – Славаччына. Мы праз гэта як беларусы і як Беларусь не праходзілі.

Ідэнтычнасьць ёсьць, яна павялічылася. Як ні парадаксальна (а можа, гэта натуральна), жорсткі рэжым зрабіў беларускасьць сапраўды спосабам супраціву, змаганьня супраць дыктатуры. І неяк расставіў больш-менш па сваіх месцах культурныя зьявы. Вось той лубок, які мы бачым па тэлебачаньні, эстрада, папса – нельга сказаць, што гэта беларускія выканаўцы. Не, фармальна іх можна назваць беларускімі, але ж гэта не беларуская зьява: мы гэта ж бачым і ў Маскве, і ў іншых былых савецкіх рэспубліках. І тое, што даволі моцныя мастацкія зьявы ў нас ёсьць у андэграўндзе ў музыцы, у выдавецтве (тыя ж «ARCHE» і «pARTisan»), – яны падтрымліваюць беларускасьць. Гэта натуральна, што андэграўндная культура сёньня амаль што цалкам беларускамоўная. Нават такія на нашых вачах адбываліся мэтамарфозы, калі расейскамоўная група пачынала сьпяваць па-беларуску. І гэта вельмі добра, гэта натуральная эвалюцыя. Тут вельмі цікавы выбар. Калі ты хочаш стаць папсой, якая амаль ня мае ніякага твару, то працуй на расейскай мове. Калі ты хочаш займацца творчасьцю, каб у цябе быў свой слухач, – натуральна, беларускамоўнасьць.

Напрыклад, на «Славянскім базары» – тая ж беларускасьць, якая была падчас Савецкага Саюзу. Гэта лубок. Горшага я ўвогуле нічога ня бачыў.

### Уладзімер Улаховіч

Сучасная беларуская ідэнтычнасьць толькі ў малой ступені параўнальная з клясычнай ідэнтычнасьцю эўрапейскіх нацыяў, што выкавалі сваю ідэнтычнасьць у сутыкненьні сувэрэнітэтаў, якое працягвалася не адно стагодзьдзе. У нашым выпадку гэта, па-першае, катэгорыя, якая фармуецца, часамі ня вельмі яўна і ня вельмі традыцыйна, паралельна з працэсам нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. І тут ня варта перабольшваць значэньне традыцыйных парамэтраў

філязофска-культуралягічнага характару. Напрыклад, ня маючы ніякага дачыненьня да сьветапоглядных праблемаў, пасьпяховы матч нацыянальнай зборнай па футболе ці хакеі нашмат эфэктыўней фармуе нацыянальныя пачуцьці, прыналежнасьць, гордасьць, чым сотня адукацыйных лекцыяў ці канфэрэнцыяў. Па-другое, гэта катэгорыя, максымальна блізкая да штодзённай сьвядомасьці, спрошчаная, якая адлюстроўвае галоўную праблему – выжываньня нацыі ў жорсткіх гістарычных умовах. Няяўнасьць, рухомасьць і нават пэўная няўлоўнасьць сучаснай беларускай ідэнтычнасьці – толькі адваротны бок драматычнага гістарычнага досьведу.

### Валеры Фралоў

Мне здаецца, гэта самая балючая тэма. Многія з нас называюць сябе беларусамі, але яшчэ не ўсьвядомілі сябе ні нацыяй, ні, можа быць, народам. І не заўсёды разумеем, што такое беларускасьць, хоць гаворым пра нацыянальныя рысы. Можа, гэта я не да канца разумею...

Пад беларускасьцю ў нас часьцей за ўсё разумеюць талерантнасьць, цярпімасьць. Напэўна, усё-такі гістарычна ў Беларусі досыць складаны лёс: то швэды туды-сюды хадзілі, то немцы, то палякі, то расейцы. Беларус неяк «хаваўся ў бульбу» і імкнуўся пераджыць гэтыя часы. Дапусьцім, Вялікая Айчынная вайна: мы гаворым «партызанская краіна» і г. д. Але ў нас ледзьве ня столькі ж было і паліцаяў! І вось гэтае імкненьне выжыць у любых умовах (як кажуць, «сеў на цьвік і прыцярпеўся») настолькі ўвайшло ў нашу сьвядомасьць, наша самаадчуваньне... Калі мы гэта скончым – Бог яго ведае!

Мы нядаўна сустракаліся з таварышам Ігарам Баслыком. Ён кажа: «Дзякуючы сябрам паглядзеў, хто і што на мяне пісаў. Пра некаторых думаў, што яны сябры, а яны на мяне такія гадасьці напісалі!..» Ёсьць у нас такі мастак Алесь Пушкін. На яго мужык зь ягонай жа вёскі, які ні да якіх зораў не імкнецца і ў начальнікі ня рвецца, такую гадасьць напісаў!.. Гэта характэрны паказчык адной з рысаў беларускасьці. Гэта імкненьне захавацца, напляваўшы на ўсё. Можа, гэта і слушна, але калі ты чалавек – істота сацыяльная, то павінен і божымі

прынцыпамі кіравацца, а ня толькі пра сваю шкуру думаць. На жаль, вельмі шмат у беларускасьці вось такога...

Я ведаю вельмі многіх людзей у войску, ФСБ, КДБ, шмат хто ў мінулым быў сябрам, зь некаторымі разам служылі. Я гляджу, наколькі яны могуць прыстасоўвацца, – гэта проста жах! Некаторыя, убачыўшы мяне, перабягаюць на іншы бок вуліцы – толькі каб не сустрэцца. Я ня думаю, што яны пры гэтым думаюць пра Беларусь, пра дзяржаўны лад, – у іх проста спрацоўвае інстынкт: «Адскочу! Абы ціха было. Абы не было вайны, абы ціха. У бульбе перасяджу».

Не хапае таго, што было характэрна, дапусьцім, для Паўкі Карчагіна, для Прамэтэя... Не хачу, каб усе былі Прамэтэямі і Паўкамі Карчагінымі, але нейкі ўзровень гэтых якасьцяў павінен прысутнічаць у кожным беларусу. На мой погляд, ён не прысутнічае.

Можа, я занадта высокія патрабаваньні прад'яўляю. Чалавек створаны не для таго, каб усё жыцьцё змагацца за нешта. Ён павінен жыць, кахаць, гадаваць дзяцей, езьдзіць на рыбалку, гуляць у шахматы, у яго павінен быць дастойны ўзровень жыцьця. Але мне здаецца, чалавек тым адрозьніваецца ад малпы, што ён божае стварэньне, што ў ім духоўнасьць нейкая... Я думаю, хоць і хрысьцяцца ў царкве, і наведваюць яе, ад запаветаў божых («Не забі!», «Не ўкрадзі!», «Не пажадай жонкі блізкага свайго!» і г. д.) яшчэ далекавата.

## Станіслаў Шушкевіч

Для мяне беларуская ідэнтычнасьць існуе. Таму што бацька, дзед з боку бацькі (дзеда з боку маці я ня памятаю: ён памёр рана) – яны ўсе былі беларусамі. І былі сьвядомымі беларусамі. І бабка мне ў Менску казала: «Глядзі, гэтую бэльку прыбіў дзед. Яна ніколі ня зломіцца».

Беларус для мяне... Я ведаў вясковы тып беларуса альбо такі, на ўскрайку гораду, дзе фактычна жылі, як у вёсцы. Гэта сур'ёзны руплівы гаспадар. Не сказаць, каб скупы, але ён не дазваляе сабе нешта кідаць на вецер альбо забаўляцца надта. Таму што выжываць трэба было заўжды ў вельмі цяжкіх умовах. Але гэта чалавек, які так плянаваў сваю гаспадарку, што які б вораг ні прыйшоў, што б ні здарылася, але – выжывем да вясны, да новага ўраджаю!

Мне здаецца, што ў беларусаў гэтая вельмі добрая рыса (адна з найважнейшых беларускіх рысаў) пасьля паслужыла таму, што мы фактычна сталі малапатрабавальныя, значна менш патрабавальныя, чым належыць быць эўрапейцам. Калі мяняліся ўмовы, калі мяняўся ўзровень тэхнікі, узровень забясьпечанасьці, энэргазабесьпячэньня, зьяўляліся новыя матэрыялы – хімікаты, будаўнічыя матэрыялы, мы заставаліся ў палітыцы «чаркі і скваркі». Вось гэты лукашэнкаўскі «брэд», які шкодны да таго ж, бо ён скарачае жыцьцё людзей. Навязваць аграгарадкі – гэта таксама шкодна. Беларус заўсёды быў добрым гаспадаром, калі быў самастойны.

Тое самае магу сказаць пра інтэлігенцыю: для мяне галоўным аўтарытэтам заўсёды быў беларускі настаўнік. Мне здавалася, што большага інтэлігента няма.

На жаль, гэтыя зьмены – антыбеларускія, і яны адбыліся ў грамадзтве. Але іх даволі лёгка адхіліць, і я ведаю многіх сапраўдных беларусаў, інтэлігентаў, якія застаюцца беларусамі і падобным зьменам не паддаліся. Узвышана наша інтэлігентнасьць расейскай літаратурай, музыкай, мастацтвам. Але яна ж – наша інтэлігентнасьць – засьмечана расейскай лаянкай, хлусьнёй, безгаспадарчасьцю і крадзяжом. Заўважце, многа дзе гэта пераадолена. Напрыклад, кемлівы гаспадар перайшоў у кваліфікаванага рабочага. У нас працэнт высокакваліфікаваных рабочых у чатыры разы большы, чым у Расеі: там – 6%, у нас – па-над 20%. Дзякуючы гэтаму беларусы выжываюць. Таму што калі на Захадзе адчыніце капот аўтамабіля (як гэта рабіў я), дык там усе дзівяцца: як гэта можа рабіць звычайны кіроўца-аматар? А ў Беларусі я ня ведаю таго чалавека, які сядзіць за рулём і не падыме капота аўтамабіля, і ня выправіць усякіх дробных непаладак у расейскіх аўтамабілях.

Вось гэтая руплівасьць, кемлівасьць, працавітасьць – беларускія прыкметы.

Навуку ў Расеі рабілі заезджыя прафэсіяналы. Фактычна яна была створаная на заходні ўзор. Узор акадэміі таксама быў узяты з Захаду. І сюды, у Беларусь, прыяжджалі. І ў гэтым няма нічога дрэннага. І тое, што пэўныя творы беларускай культуры стварылі татары, якія тут аселі, мяне ня крыўдзіць, а наадварот, цешыць. І тое, што беларускі клясычны балет разьвіўся

дзякуючы расейскай школе, мяне таксама цешыць. Ён ёсьць у наяўнасьці, гэты эўрапейскі ўзровень.

### Усевалад Янчэўскі

Беларусы – гэта вельмі савецкія людзі. Найважнейшая частка нашай гісторыі – гэта гісторыя найноўшая.

Вядома, гісторыю як такую нашая нацыя мае доўгую, але яе разьвіцьцё ня раз рэзка перапынялася.

Нацыя – гэта ў тым ліку і яе эліта, яе мозг. Ці можа быць галава бязь цела? Некалі беларуская нацыя пачала фармавацца ў Вялікім Княстве Літоўскім, але як толькі ледзь-ледзь пачынаў узрастаць элітарны слой, яго падсякалі. Эліта рабілася то польскай, то расейскай.

І мы зноў пачыналі з чыстага аркуша.

Паступова беларуская нацыя пачала выкрышталізоўвацца – ужо ў савецкую пару. Вядома, у першую чаргу гэта насіла сялянскі, вясковы характар. Нацыянальная інтэлігенцыя была вясковая паводле паходжаньня. У гэтым няма нічога дрэннага – так гістарычна склалася, усе нацыі праходзілі прыкладна такое разьвіцьцё.

Нават сёньня практычна ва ўсіх – карані на вёсцы. А гэта – адпаведны архетып мысьленьня, адпаведныя звычкі, адпаведны мэнталітэт і г. д.

У значнай ступені нацыю пачаў фармаваць Лукашэнка. Лукашэнка – гэта чалавек, які вылучыў рэспубліку, народ, ён іх адмежаваў. Мы можам сёньня сказаць: «Беларусь – не Расея», і «Беларусь – не Ўкраіна», і «Беларусь – не Эўропа».

За Лукашэнкам, у гэтыя гады (мы самі назіраем гэты цікавы працэс), Беларусь пачала фармавацца як САМАСТОЙНАЯ і СВОЕАСАБЛІВАЯ краіна.

Дарэчы, так званы дэмакратычны выбар пачатку 1990-х быў навязаны Беларусі. Рэспубліка была часткай вялікага абшару і міжволі прыняла ў сябе «перабудовачныя» працэсы. Але як толькі Беларусь пакінулі сам-насам з сабой – яна тут жа адкінула «лібэральную дэмакратыю» (у 1994, у 1995, у 1996 гадах), адкінула пасьлядоўна, праявіўшы сваю адметнасьць. Калі хочаце, цяперашні палітычны лад – гэта непасрэдны вынік незалежнасьці Беларусі.

Калі ж гаварыць пра нацыянальны характар... Нельга казаць, што нешта падабаецца ці не падабаецца ў рысах народу... Гэта данасьць. Мабыць, нейкага дынамізму беларускаму характару, мне здаецца, бракуе. Дынамізму, агрэсіі, энэргічнасьці...

Вельмі моцна нам шкодзіць боязь новага. У ёй ёсьць плюс: мы не дапускаем шмат якіх памылак, якія робяць іншыя. Але мне здаецца, гэта трошкі «зашкальвае»: боязь экспэрымэнту ў нас завялікая. Гэта дрэнна, мы дысануем са сьветам. Сучасны сьвет – гэта экспэрымэнт, і наагул прагрэс – гэта экспэрымэнт, рызыка. А беларусы ня вельмі рызыкоўны народ. Збольшага гэта добра і натуральна, але ў нейкай частцы гэта дрэнна. Магчыма, гэта будзе зжывацца, паколькі мы ўключаемся ў самыя розныя глябальныя працэсы.

Мне, напрыклад, хацелася б, каб мы «разварушваліся» хутчэй, каб мы больш экспэрымэнтавалі, каб мы былі наватарамі, каб менш баяліся новага. Каб, шануючы мінулае, мы ня скоўвалі сябе традыцыйнымі прывычкамі як кайданамі.

# 6. Ці існуе для вас такі панятак, як славянская супольнасьць / супольнасьць былых савецкіх народаў?

**Вольга Абрамава**

У асноўным, калі гавораць пра славянства, зь меркаваньняў прыстойнасьці гавораць пра культуру, а маюць на ўвазе – фактар крыві. Фактар крыві – ня тое, што варта было б класьці ў аснову разгляду, таму што з аднаго боку – расейцы, беларусы, нават сэрбы, а з другога боку – чэхі, палякі – і ўсё гэта славяне. Рухаемся сёньня мы зусім рознымі шляхамі, самабытнымі, аўтаномнымі шмат у якіх адносінах. Таму славянства я не прымаю, я лічу, што гэта палітычны канструкт. Можа, нават не палітычны, а ідэалягічны. Калі б сталі разглядаць канфэсійны фактар усярэдзіне гэтай тэорыі славянства, дык гэта магло б легчы ў аснову пошуку роднасьці нейкіх глыбінных каштоўнасьцяў. Калі ў краіне ёсьць шматвекавая даміноўная канфэсія, то яна ня можа не накладаць па сыстэме каштоўнасьцяў адбітак на стан масавай сьвядомасьці. Гэта значыць, дапусьцім, вэртыкаль улады выцякае ня толькі з папярэдніх традыцыяў палітычнага ўладкаваньня, але і з таго, як да гэтага ставілася рэлігія, што дамінуе ў краіне. Гэта ўплывае.

А вось судружнасьць народаў былога СССР ёсьць, за выключэньнем краінаў Балтыі – яны заўсёды былі нечым аднародным, паколькі іншая культура, іншая гісторыя, іншы спосаб уваходжаньня ў краіну. А ў цэлым мэнтальнасьць, вядома, шмат у якіх адносінах падобная. Прынамсі, мы разумеем адно аднаго. Чаму вельмі добра і лёгка было б весьці беларускім бізнэсмэнам справы з ізраільскімі партнэрамі? Таму што там вельмі шмат выхадцаў з былога Савецкага Саюзу. У іх

ня толькі няма з намі моўнага бар'еру, але і няма разыходжаньняў у разуменьні аднаго і таго ж. Ня будзе так, што, калі я гавару «стрыжана», мяне разумеюць як «голена». Мяне разумеюць акурат так, як я хачу гэта сказаць. І дакладна так я ўспрымаю суразмоўніка.

### Сьвятлана Алексіевіч

Што да народаў былога СССР – гэта выдуманая супольнасьць. Мне даводзіцца езьдзіць у розныя постсавецкія краіны – Грузію, Туркмэнію, і я бачу: савецкі чалавек яшчэ жыве, але ўсё-такі народы адыходзяць ад гэтай сьвядомасьці да сваіх каранёў.

А вось славянскае адзінства – каранёвае, за ім будучыня. Мне ня блізкія ідэі панславізму. Але тое, што за славянскай еднасьцю будучыня, для мяне нават не пытаньне. Увесь сьвет яднаецца паводле нейкіх прынцыпаў. Прыедзьце на Скандынаўскі паўвостраў: Швэцыя, Фінляндыя, Нарвэгія – розныя краіны, яны адчуваюць сябе як розныя, але ёсьць нешта агульнае для іх. Тое самае вы адчуеце, калі праедзеце па Японіі і Кітаі.

Цяпер мы ваюем зь мінулым, успамінаем нейкія крыўды. Але, па-мойму, гэты час ужо сыходзіць. Сучасны беларускі інтэлектуал, мне здаецца, нават не павінен ужо гаварыць пра нейкую варожасьць да Расеі.

### Яўген Бабосаў

Гістарычная супольнасьць «савецкі народ» не адбылася. Ёсьць славянская супольнасьць. «Славянскі базар» у Віцебску, нядаўні Кангрэс славянскіх народаў у нас – гэта тое, што ёсьць. Ёсьць славянская супольнасьць, толькі трэба зрабіць так, каб усходнія славяне не адрываліся далёка ад заходніх – ад тых жа палякаў, чэхаў, славенцаў.

Я думаю, што трэба шырэй глядзець: славяне ёсьць і ў Баўгарыі, і ў Чэхіі, і ў Славакіі, і ў Славеніі. Трэба пашыраць! Дарэчы, падчас вайны было такое аб'яднаньне. Пасьля вайны яно неяк паблякла, а ўвогуле ж нядрэнна было б адрадзіць. Гэтае паняцьце існуе.

## Анжаліка Борыс

Мне больш падабаецца эўрапейская супольнасьць.

## Генадзь Бураўкін

Ёсьць такі панятак і адчуваньне славянскай еднасьці. Як, даруйце, можна быць па-вясковаму ў вельмі добрых стасунках з суседзямі, але калі нармальная сям'я, то найбліжэйшыя – твае сваякі. Ёсьць славянская еднасьць. Іншая справа, што ня трэба запалітызоўваць гэтыя нітачкі, якія зьвязваюць славянаў, гэтыя нашыя стасункі. Запалітызоўваць іх, тым больш спэкуляваць на іх – я катэгарычна супраць.

Будзем гаварыць прама: нам жа лягчэй зразумець славака і славенца, чым фіна, немца. Праз доўгія гады мы некалі далей адзін ад аднаго адыходзілі, бліжэй падыходзілі, але еднасьць нейкая была. Я катэгарычна супраць таго, каб славянскае поле выбарачна памячаць. Таму што славяне – гэта ня толькі рускія, беларусы і ўкраінцы. Гэта і палякі, і чэхі, і славакі, і славенцы, і сэрбы, і харваты. Для мяне славянскі сьвет – увесь гэты арэал. І калі выбіраюць з гэтага арэалу нейкую частку і толькі ёй прысвойваюць права гаварыць ад імя славянаў – гэта няправільна. Калі ня ўлічваюцца інтарэсы ўсіх, гэта ўжо несправядліва. І наадварот, калі гаворка ідзе быццам бы пра еднасьць славянаў, а мы ледзь не як ворагаў успрымаем нашых суседзяў-славянаў – ну, чаго ж гэта варта? Але еднасьць такая бясспрэчна ёсьць, і хай яна будзе. Бо я за разнастайнасьць сьвету і супраць казарменнасьці. У сьвеце павінна быць разнастайнасьць: ёсьць славянскі сьвет, ёсьць франкамоўны сьвет, ёсьць ангельскамоўны, ёсьць афрыканскія рэгіёны. Таму хай гэта ўсё застаецца. Іншая справа, каб гэтая розьнасьць не была варожая. Каб гэта была не варажнеча, а мірнае спаборніцтва. Давайце будзем змагацца за тое, каб мы далі як мага больш добрага сьвету. І калі ў гэтым найбольш добрага дадуць славяне – ну што ж, пааплядуем славянам. Калі больш дадуць афрыканцы – пааплядуем Афрыцы. Больш дадуць кітайцы – парадуемся за кітайцаў.

Так што я лічу, што славянская еднасьць ёсьць. А вось наконт народаў СССР сытуацыя больш складаная. У Савецкі Саюз уваходзілі вельмі розныя суб'екты – пачынаючы ад краінаў і тэрыторыяў рэспублік, дзе ледзь яшчэ адышлі ад фэўдалізму, і да краінаў, якія ў цывілізацыйным сэнсе былі ўжо або блізка, або ў самой Эўропе (маю на ўвазе балтыйскія). І таму ўсё гэта было спалучана даволі штучна. А калі ня штучна, то пад вялікім націскам. Таму Савецкі Саюз і распаўся, а зусім не таму, што там нейкія пляны... Так, пляны былі, бясспрэчна, было процістаяньне, процідзеяньне дзьвюх вялікіх дзяржаваў, якія прэтэндавалі на тое, каб кіраваць сьветам. Гэта было, гэта рэальнасьць. Але ня іх шпіёнскія пляны развалілі Савецкі Саюз, ён сам разваліўся, як у нечым негрунтоўная, недастаткова прадуманая сям'я. Семдзесят гадоў для многіх, пяцьдзясят гадоў практычна для ўсіх краінаў, якія былі ў Савецкім Саюзе, – гэта даволі значны гістарычны пэрыяд часу. Тое, што за гэты час наладзіліся сувязі эканамічныя, я ўжо не кажу пра палітычныя і культурныя (асабліва культурныя) – гэта факт. І мне, напрыклад, вельмі шкада, што сёньня я не магу так пастаянна і пільна сачыць за разьвіцьцём літаратуры ў Грузіі, Армэніі, Сярэдняй Азіі, як я гэта мог рабіць у час Савецкага Саюзу. Канечне, я сёньня менш ведаю пра літаратуру Літвы, Латвіі, Эстоніі й нават Расеі і Ўкраіны, чым тады. Так што я хацеў бы, каб гэтыя сувязі не разрываліся. Яны могуць мяняцца якасна, нават колькасна. Але тое, што яны часам проста абарваліся, проста абсечаныя – гэтага мне шкада. Таму нейкая супольнасьць культурная, ува ўсякім выпадку – жаданьне яе ня страціць, яшчэ застаецца. Ува ўсялякім разе, мае сустрэчы апошняга часу зь людзьмі з Малдовы, з Прыбалтыкі, з Грузіі, з Азэрбайджану (я ўжо не кажу пра Ўкраіну і Расею) пацьвярджаюць: нам не хапае веданьня адно аднаго. А ў культуры, літаратуры веданьне адно аднаго – гэта ў нейкім сэнсе вучоба адно ў аднаго, гэта выхад на ўзровень, які павінен быць, бо мы ж арыентуемся на лепшыя ўзоры. Таму я за тое, каб сувязі (перш за ўсё культурныя, пра эканоміку мне цяжэй гаварыць, бо я не эканаміст, але напэўна і там тое ж), там дзе яны эфэктыўныя, дзе працуюць на прагрэс і дэмакратыю, каб яны заставаліся. І ня трэба ад іх адмахвацца. Калі тое-сёе можна ажывіць і разьвіць, я за гэта.

## Алесь Бяляцкі

Славянская супольнасьць безумоўна існуе. У якім пляне? Зноў жа, у мэнтальным. Тое, што тычыцца нацыянальнай ідэнтычнасьці, яно ў вялікай ступені (можа быць, на 80%) у славянаў аднолькавае. Можа быць, я сказаў не зусім «беларускае», але ў гэтым я ўжо шмат пераконваўся. 80% усіх «ужымак», усіх учынкаў, схем паводзінаў, паводзінаў групаў народаў у розных сытуацыях: і ў войску, і калі яны на гулянках, і калі яны працуюць, і калі яны адпачываюць, – яны ідэнтычныя. І гэтым вельмі адрозьніваюцца, напрыклад, ад немцаў ці ад французаў, ад іншых неславянскіх групаў. Гэта сапраўды так. Мяне вельмі забаўляе і весяліць, калі прыяжджаеш, напрыклад, у Харватыю за паўтары-дзьве тысячы кілямэтраў ад Менску і трапляеш у кампанію хлопцаў, якія п'юць віно, ці працуюць, ці яшчэ нешта робяць, ты адчуваеш, наколькі гэта ўсё падобна да таго, што адбываецца тут, у нас, у Беларусі.

Мы, славянскія народы, на сёньняшні дзень не настолькі яшчэ разьбегліся, каб казаць, што мы абсалютна нешта іншае. Можна, канечне, казаць, але толькі на ўзроўні ідэнтычнасьці, вызначэньня звычак, паводзінаў, манеры мысьленьня, манеры працы, культуры паводзінаў і г. д. Мы яшчэ настолькі блізкія, што гэта патрабуе дадатковага вывучэньня. У мяне асабіста гэта выклікае захапленьне, таму што я адчуваю сябе, фактычна, як дома – ад Адрыятыкі да Японскага мора.

У гэтым сэнсе расейцы не выключэньне. Наколькі ў пляне палітычным, у пляне стратэгічным нам трэба на сёньняшні дзень ад іх як мага далей адысьці, настолькі ў пляне чалавечым, у пляне пабудовы нейкіх чалавечых кантактаў, культурнага ўзаемапранікненьня, можа быць – эканомікі й г. д. мы можам знайсьці агульную мову. Можа быць, зноў-ткі, думка дзіўная як для мяне – чалавека, які столькі гадоў працаваў ужо ў беларускай культуры: мы нават самі не ўяўляем сабе, наколькі мы блізкія да тых самых расейцаў ці ўкраінцаў. Праўда, кажуць, што чалавек і да шымпанзэ таксама блізкі: на 95% гены супадаюць, толькі 5% генаў аддзяляюць чалавека ад шымпанзэ. (*Сьмяецца.*) Дык я думаю, што славянскія народы, можа, толькі сотая доля гэтага працэнту, а то і тысячная аддзяляе.

Гэта вельмі моцна заўважаецца, калі параўнаць немца і ўвогуле германскія народы. Гэтая пэдантычнасьць, дакладнасьць – тое, што вельмі разьвіта

ў швэдаў, нарвэжцаў, немцаў, фактычна – ува ўсіх германскіх народаў. І наколькі славяне ня любяць гэтага! Але самае цікавае, што гэтыя германскія ўплывы (а можа быць, падасновы, якія былі перад стварэньнем больш моцных этнасаў) вельмі моцна адчуваюцца ў нас і ў палякаў. З усіх славянаў мы і палякі больш спарадкаваныя. Я думаю, што тут была ўсё ж нейкая германская падаснова. Ці не ўваход пэўных плямёнаў – калі гэта тычыцца Беларусі. Што тычыцца Польшчы, хутчэй за ўсё падаснова перад тым, як там славяне наклаліся, была ўсё ж такі германская. Мы найбольш блізкія да немцаў з усіх славянаў. А калі параўнаць харватаў ці расейцаў – от гэта дзьве рукі аднаго цела! Яны настолькі блізкія гэтым сваім «разгвазьдзяйствам»!.. У нас проста часам сківіцы адпадаюць, калі мы маем кантакты зь імі. Тым ня менш, гэтага «дабра» хапае і ў нас. Але ня толькі гэта. Можна назваць нейкія агульныя рысы, якія вызначаюць усіх славянаў, але гэтым трэба займацца дастаткова сур'ёзна.

Наконт супольнасьці народаў былога СССР. Я дастаткова камфортна пачуваюся ў Кіргізіі, Азэрбайджане, дзе дастаткова часта бываў у апошнія гады (літаральна кожны год). У нас сапраўды ёсьць агульныя рэчы, якія дазваляюць трымаць нармальны псыхалягічны кантакт. Мы можам сьмяяцца зь іх, ганіць, але гэта было і ад гэтага нікуды не падзенесься. На сёньняшні дзень я значна больш камфортна сябе адчуваю дзе-небудзь у Кіргізіі, чым на Захадзе, у любой з заходніх краінаў. Бо яны выхаваныя, «адштампаваныя» па такіх самых мерках, як у свой час нашае пакаленьне савецкіх дзяцей. «Лякала» гэтае клалася, нягледзячы на народы, па ўсім Савецкім Саюзе. І гэтая супольнасьць будзе яшчэ пэўны час. Прынамсі гэта тычыцца тых людзей, якія выхаваліся ў Савецкім Саюзе. Ужо нашыя дзеці, можа, ня будуць разумець адно аднаго. Хутчэй за ўсё, так! Прынамсі нашыя дзеці і дзеці азэрбайджанскія будуць разумець адно аднага, як швэд, немец і яшчэ хто-небудзь. Што тычыцца нашага пакаленьня, то я сябе там вельмі добра адчуваю ў пляне разуменьня мяне, у шматлікіх іншых рэчах.

## Аляксандар Вайтовіч

Існаваньне славянскіх народаў, народаў з аднымі каранямі паводле паходжаньня, якія карыстаюцца славянскімі мовамі, – гэта гістарычны факт. Для іх зьяўляюцца характэрнымі многія аднолькавыя элемэнты культуры, аднолькавыя традыцыі.

Наконт супольнасьці былых савецкіх народаў. Прайшло ня так шмат часу з моманту, калі яны былі ў адной дзяржаве, і такая супольнасьць у шматлікіх аспэктах яшчэ існуе і праяўляецца.

## Андрэй Вардамацкі

Можна гаварыць пра два ўзроўні існаваньня славянскага адзінства. Строга кажучы, гаварыць пра адзінства на ўзроўні народных мэнталітэтаў ужо не даводзіцца. Адзінства – гэта вельмі вялікая ступень злучэньня, вялікая ступень падабенства і вельмі вялікая ступень узаемадзеяньня. Цяпер гэтай вялікай ступені фактычна няма. Таму можна казаць пра падобнасьць нацыянальных характараў, культураў, мэнтальнасьцяў славянскіх народаў. Гэта я гаварыў пра першы ўзровень – масавай, нацыянальнай псыхалёгіі.

Што да палітычнай сытуацыі, палітычнага ўзроўню, дык тут ёсьць два вэктары: з аднаго боку, падкрэсьленае разьмежаваньне, якое мае свой функцыянальны, прагматычны грунт, і, з другога боку, паблік-рылэйшэнавае падкрэсьліваньне гэтага адзінства, якое на самай справе мае іншыя, зусім прагматычныя падставы.

Тое самае – наконт постсавецкай прасторы. Так, вядома, падабенства ёсьць. І тут гаворка ідзе ня толькі пра людзей сталага веку, але і пра людзей сярэдняга ўзросту, пачынаючы з трыццаці гадоў. Падабенства ёсьць: усе мы родам з Савецкага Саюзу. Але з другога боку, ёсьць відавочныя цэнтрабежныя сілы, якія маюць шэраг сваіх падставаў.

### Вінцук Вячорка

Гэта розныя рэчы; не зусім разумею, чаму яны напісаныя праз «**/**».

Для мяне як для гуманітара моўная блізкасьць славянаў – рэч натуральная, па-свойму каштоўная, бо дае плённую глебу для культурных параўнаньняў і ўзаемаўзбагачэньня. Ясна, маю на ўвазе ўсіх славянаў, а ня толькі тых «рускіх», на якіх прэтэндуе імпэрская дактрына. Мэнтальнае палітычнае славянскае супольнасьці няма.

З гледзішча «нацыятворчага», аднак, больш істотная тыпалягічная блізкасьць тых народаў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы, што перажывалі нацыянальна-дзяржаўнае адраджэньне ў XVIII–XX стст. (апошнім яго акордам стала аднаўленьне незалежнасьці Чарнагорыі), незалежна ад моўна-этнічна-канфэсійных падзелаў. (Зрэшты, большыня славянскіх народаў, акрамя расейцаў, у гэтую супольнасьць уваходзіць.) Большая частка гэтае супольнасьці, што ў XX ст. уваходзіла ў падкантрольную СССР таталітарную прастору, відавочная ня толькі дасьледнікам, але й палітызаваным пластам грамадзтва. Адсюль узаемныя сымпатыі й салідарнасьць, прыхільная ўвага да барацьбы сабе падобных за незалежнасьць і свабоду; адсюль і пэўны рэальны грунт пад паймом «новая Эўропа», хаця ніякая мы Эўропа ня новая, а заўсёдная.

Што да былых савецкіх, дык зноў жа тут асобная група – цэнтральна-(усходне?-)эўрапейскія народы й Паўднёвы Каўказ. Гэта частка апісанае вышэй супольнасьці. Як толькі абрынулася савецкая імпэрыя, вельмі хутка, як на гістарычныя тэмпы, пачалі аднаўляцца даўнія цывілізацыйныя падзелы. Наступнае пакаленьне ўжо ня будзе пачувацца часткаю *mundus sovieticus*.

### Павал Данейка

За гэтым стаяць нейкія рэальнасьці. Зразумела, што мы можам сесьці выпіць гарэлкі з палякамі, выпіць гарэлкі з расейцамі – і, у цэлым, ня можам гэтак жа выпіць гарэлкі з французамі. У гэтым ёсьць нейкае славянскае адчуваньне. Але славяне таксама розныя, у нас ёсьць нейкія разьдзяляльныя межы, таму

што розныя каштоўнасныя выбары былі зроблены ў розных краінах, розных рэгіёнах.

Наконт адзінства савецкіх народаў мне гаварыць складана. Калі мы гаворым пра адзінства двух народаў, мы павінны апэраваць нейкімі традыцыйнымі падыходамі, супольнай гісторыяй. А гісторыя – гэта Грунвальд, Ворша, г. зн. падзеі, якія аб'ядноўвалі ці разьядноўвалі гэтыя народы. Так, Радзівілы, даведаўшыся пра Чарнобыль, сказалі: «А ў Сапегаў заўжды бардак быў».

Адчуваньне гісторыі плюс эстэтыка блізкая – так, славяне маюць шмат супольнага. А вось савецкія народы... Пры чым, напрыклад, да нас туркмэнская мэнтальнасьць, хоць яны і ўмеюць размаўляць па-расейску? Там іншыя людзі, іншая мэнтальнасьць, іншыя правілы, іншая структура стасункаў. Усё-такі ў маім разуменьні блізкасьць азначае ня толькі мову, але і супольныя каштоўнасныя структуры. У славянаў ёсьць такія перасякальныя каштоўнасьці – у адных славянаў у большай ступені, у іншых – у меншай. Але яны ёсьць! Пачынаючы ад нейкай агульнасьці мовы, моўных архетыпаў.

### Андрэй Дынько

Сьлядоў славянскай еднасьці я не заўважаю. Відавочна, ёсьць суседзкая салідарнасьць балканскіх народаў паміж сабой. Пачуцьце салідарнасьці, выкліканае еднасьцю гістарычных лёсаў і цяперашнімі супольнымі эканамічнымі інтарэсамі, маюць краіны Вышаградзкай групы – новыя сябры Эўразьвязу. Пачуцьце пэўнай салідарнасьці маюць краіны-суседзі тут. Але мы вельмі часта назіраем, як беларусы праяўляюць салідарнасьць зь літоўцамі, а чэхі – з вугорцамі, альбо палякі – з балтыйскімі народамі.

Што да ідэі панславізму, якую спрабавалі акцэнтаваць пэўныя колы ў Расейскай імпэрыі, яна мела вельмі канкрэтную задачу і скіраванасьць. Як сказаў адзін чэскі мысьляр у сярэдзіне XIX стагодзьдзя, расейцы любяць усё расейскае называць славянскім, каб пасьля магчы назваць усё славянскае расейскім.

У пэўным сэнсе тое самае адбываецца на тэрыторыі былога Савецкага Саюзу. З аднаго боку, сёньня няма нічога, што б лучыла паміж сабой Эстонію і Туркмэністан. Цяжка ўявіць дзьве краіны больш супрацьлеглыя. Аднак цяжка нават

знайсьці супольныя рысы, якія б лучылі такія блізкія ў геаграфічным сэнсе краіне, як Беларусь і Малдова – гэта краіны з цалкам адрознымі вэктарамі разьвіцьця. Безумоўна, спробы выкарыстоўваюць савецкую ідэнтычнасьць, выкарыстоўваць савецкую культуру ці эканамічныя сувязі паміж гэтымі краінамі ў палітычных мэтах – яны ёсьць, і яны знаходзяць відавочную падтрымку з боку сучаснай расейскай палітычнай эліты. Была такая песьня Газманава «Сделан я в Советском Союзе, родом я из СССР», якой была зробленая вялізная прамоцыя. А Газманаў – такі прыдворны сьпявака мэра Масквы Юр'я Лужкова. Але гаварыць пра гэтую супольнасьць як нешта гамагеннае і кагерэнтнае не выпадае. І, па-мойму, не ў нацыянальных інтарэсах Беларусі, каб гэтая супольнасьць адраджалася.

### Сьвятлана Калінкіна

Цяжка сказаць. Адназначнага адказу на гэтае пытаньне ў мяне няма. У нейкіх палітычных ініцыятывах заўсёды палітыкі апэлююць да нейкіх такіх згуртаваньняў людзей. Гэта можа быць і славянская супольнасьць, як мы назіралі нядаўна, калі ў Беларусі быў Славянскі сабор. Зразумела, мы славяне. Славянства... Калі гэтаму будзе надавацца прапагандай вельмі шмат увагі, то гэта можа стаць вельмі папулярнай ідэяй у грамадзтве.

Гістарычна можна гаварыць, вядома, і пра савецкую супольнасьць: мы ўсе родам з Савецкага Саюзу. Таму якімі б рознымі ні былі культурныя вытокі, напрыклад, Туркмэніі і Беларусі, але шмат што ўсё ж дзякуючы Савецкаму Саюзу нас аб'ядноўвае.

Мне здаецца, і адно, і другое існуе. Але наколькі гэта будзе вызначальным для краінаў, для людзей – гэта залежыць ад таго, як будуць разьвівацца палітычныя падзеі і хто будзе ўзначальваць краіну. Усе постсавецкія краіны, акрамя, можа, Прыбалтыкі, апынуліся паміж цывілізацыямі – заходняй і ўсходняй. Таму вельмі важна, хто будзе на чале краіны – тыя супольнасьці і будуць найбольш разьвівацца.

Недаацэньваць такія «патрыятычныя» (назавем іх так) настроі я б ня стала. Яны вельмі моцныя. Хто іх варушыць, зь якімі мэтамі і г. д. – ад гэтага многа залежыць. І павінна прайсьці яшчэ шмат пакаленьняў, каб гэта неяк нівэлявалася.

## Сяргей Калякін

Былі такія супольнасьці, але цяпер яны ўвогуле разбураныя. Такія супольнасьці, па меры таго як яны ствараюцца і існуюць, абрастаюць супольнымі рысамі і г. д. Але як толькі яны распадаюцца, пачынаецца распад і гэтых супольных рысаў.

Нядаўна эўрапейцы, калі дасьледавалі, ці ёсьць такая супольнасьць – эўрапейцы, прыйшлі да высновы, што – не, хоць усё ўжо ідзе да стварэньня адной дзяржавы. Усё-такі існуе вельмі высокая ступень самабытнасьці ў галяндцаў, французаў, немцаў... Дакладна гэтак жа і тут: калі мы былі ў Савецкім Саюзе, можна было гаварыць пра супольнасьць «савецкі народ». І гэта праяўлялася ў пэўныя гістарычныя пэрыяды, можна прывесьці прыклады. Але разам з тым існавала і самабытнасьць: напрыклад, грузіны, беларусы, украінцы і чукчы заўсёды мелі адрозьненьні. І сёньня, у незалежнай дзяржаве, мы ўсё больш набываем рысы беларусаў, набываем самабытнасьць.

Наконт славянскай супольнасьці... Я б сказаў, супольныя карані існуюць, бясспрэчна. Але ёсьць адна простая рэч: з кожнага з бакоў ідзе невялікая падтасоўка. Усё пытаньне ў тым, наколькі мы будзем паглыбляцца ў гісторыю. Чым далей мы будзем паглыбляцца ў гісторыю, тым хутчэй мы прыйдзем да высновы, што ўсе мы маем адны і тыя ж карані. Калі мы пойдзем на сто-дзьвесьце гадоў назад, мы можам казаць, што ў нас большая агульнасьць з палякамі. Пойдзем на трыста гадоў назад – будзем гаварыць, што мы жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім, дзе дзяржаўнай была старабеларуская мова. Усё гэта ёсьць, і ня трэба з гэтым спрачацца. Але ня трэба проціпастаўляць адно другому! І ня трэба рабіць з гэтага інструмэнт палітычнай барацьбы. Гэтым могуць займацца навукоўцы. Але проціпастаўляць тое, славяне мы, ліцьвіны ці эўрапейцы, – гэта з галіны палітыкі, а не самавызначэньня нацыі. Мы беларусы! Мы зрабілі такі выбар.

Ніхто ня ведае, што будзе зь беларусамі праз пяцьсот гадоў. Ці што будзе зь немцамі праз пяцьсот гадоў. Мы ж памятаем, што былі вялікія квітнеючыя дзяржавы, якія кіравалі сьветам, – і сёньня іх няма, і народаў гэтых няма. Таму, на мой погляд, малапэрспэктыўна на сёньня і нават шкодна гэта, таму што яна можа працаваць на стварэньне блёкаў процістаяньня, а не на тое, каб аб'ядноўваць

людзей. А нам трэба кансалідаваць нацыю! Таму ня трэба шукаць адрозьненьняў – трэба шукаць агульныя рысы, каб зьядноўваць нацыю. Дарэчы, за апошнія гады цяперашняе палітычнае кіраўніцтва вельмі моцна спрабуе падзяліць і ўжо падзяліла людзей: нас падзялілі на беларускамоўных і расейскамоўных, старых і маладых, багатых і бедных вясковых жыхароў і гарадзкіх, прыхільнікаў прэзыдэнта і ягоных праціўнікаў... Гэта шкодзіць грамадзтву. Гэта ненармальна! І квітнеючая дзяржава, і квітнеючая нацыя ня маюць такога расколу: у іх ёсьць палітычная канкурэнцыя, але ў іх няма расколу. У іх гэтыя спрэчкі калі і ўзьнікаюць, дык хутчэй на навуковай арэне.

### Кася Камоцкая

Самае дзіўнае, што славянская супольнасьць існуе! Я адчуваю гэта ў іншых краінах. Славяне адрозьніваюцца ад іншых – нейкім сваім... «разгвазьдзяйствам» ці што... Вось паедзеш у Чэхію – нібыта такая культурная краіна! А потым прыяжджаеш у Германію – і бачыш, што нешта ня тое ўжо. Думаеш: нешта чэхі «разгвазьдзяі» нейкія.

І ёсьць таксама нейкая гістарычная памяць у народаў былога Савецкага Саюзу. Можа быць, у старэйшага пакаленьня ёсьць і ў Прыбалтыцы, а ў маладога ёсьць і ў іншых краінах. Я не бяру зусім мусульманскія краіны, бо ня ведаю, што там творыцца. Я, напрыклад, выступала ў Кембрыджы, і ясна, што там беларусаў вобмаль. А прыйшлі казахі, украінцы – тыя, для каго гэта цікава. Ангельцаў не было, хіба два-тры. А прыйшлі якраз студэнты з былога Савецкага Саюзу.

### Сяргей Касьцян

Народы былога СССР дзякуюць славянам за тое, што яны захавалі іхныя каштоўнасьці: захавалі іхнюю мову, і веру, і традыцыі. Ніводная з мусульманскіх рэспублік, якія ўваходзілі ў склад Савецкага Саюзу, ня стала праваслаўнай. І ні адна з прыбалтыйскіх рэспублік, якія ўваходзілі ў склад Савецкага Саюзу, дзе быў каталіцызм, таксама ня стала праваслаўнай. І гэта гаворыць аб тым, што пад

дахам славянаў могуць разьвівацца і спакойна жыць усе народы, якія паважаюць славянскую цывілізацыю, славянскую культуру, звычаі, традыцыі, гісторыю.

Ці існуе славянскае братэрства? Існуе! Іншая справа, што за апошнія гады славяне так паверылі ў інтэрнацыяналізм, што не заўважылі, калі ім забаранілі самастойна выбіраць сабе сваіх кіраўнікоў. І сёньня для большасьці славянскіх краінаў вырашаюць у Брусэлі і Вашынгтоне, каму быць кіраўніком той ці іншай славянскай дзяржавы. І калі кіраўнікі нейкіх славянскіх дзяржаваў не выказваюцца за славянскае адзінства і братэрства, гэта зусім не азначае, што гэтага братэрства не існуе. Яно існуе паміж славянскім народамі. Незалежна ад таго, хочуць таго кіраўнікі або ня хочуць. Што б ні крычалі сучасныя кіраўнікі Польшчы супраць Беларусі, а простыя грамадзяне Польшчы падтрымліваюць Беларусь і не падтрымліваюць сваё кіраўніцтва ў гэтым напрамку. Таксама ў той жа Чэхіі, або Славакіі, або Баўгарыі – любой славянскай дзяржаве. І ня толькі падтрымліваюць на словах, але робяць усё, каб супрацоўнічаць з намі эканамічна.

### Вячаслаў Кебіч

Славянскай супольнасьці я б асабліва не вылучаў. Я, вядома, мала памятаю вайну, але як Савецкая армія ваявала з Германіяй вельмі нават цікава назіраць у фільмах: калі паказваюць два рускія твары (з пункту гледжаньня гледачоў), а далей усе з раскосымі вачыма ідуць у бой, а камандзір крычыць: «Наперад, славяне!» Расея сёньня ўвогуле ня мае права называць сябе славянскай дзяржавай: там далёка ад славянства. З гістарычнага пункту гледжаньня можна адрозьніваць славянскія нацыі ад неславянскіх. Але з пункту гледжаньня сфармаванай сёньня гістарычнай супольнасьці людзей я б не дазволіў сабе ставіць гэтае пытаньне на першае месца.

А вось супольнасьць народаў былога СССР ёсьць, дагэтуль мае вялікае значэньне. Ведаеце, як бы Саакашвілі ні паводзіў сябе ў Грузіі, а ўсё-такі ў асноўнай масе грузінскі народ марыць пра дружбу паміж грузінамі і іншымі рэспублікамі. Пакуль што існуюць добрыя ўспаміны аб былой судружнасьці, і гэта мае сёньня сур'ёзнае значэньне. Пакуль палітыкі не ўваб'юць у галаву (асабліва нацыянальныя палітыкі), што мы «самыя-самыя» – самыя вялікія, і наагул роўных нам няма!..

## Анатоль Лябедзька

На палітычным узроўні, безумоўна, еднасьць былых савецкіх народаў прысутнічае. І гэта ёсьць інструмэнтам палітыкі. Але і на побытавым узроўні ёсьць такое паняцьце, як «савок». Яно, на жаль, кансэрвуецца ў значнай ступені ў Беларусі. І мадэль кіраваньня Лукашэнкі якраз скіраваная да гэтага «саўка» і да падтрыманьня яго. Мадэль кіраваньня Лукашэнкі вельмі простая: ёсьць ягоная рэзыдэнцыя – і ёсьць амаль дзесяць мільёнаў грамадзянаў, якія стаяць у велізарнай чарзе да гэтай рэзыдэнцыі. І ўсе яны стаяць з працягнутай рукой, выходзіць цар – і нешта ім дае. Гэта мэнталітэт «саўка»: нехта павінен за яго нешта рабіць, а ад яго не патрабуецца выкарыстоўваць свае ўнутраныя рэсурсы, рэзэрвы, каб ён разьвіваўся звыш таго, што дазволена дзяржавай. Гэта – частка палітыкі, якую праводзяць беларускія ўлады, яна скіраваная на вяртаньне назад, у фармат Савецкага Саюзу. Раней гэта выкарыстоўвалася больш актыўна, сёньня – менш. Але гэта ёсьць, і частка насельніцтва ёсьць носьбітамі гэтай ідэалёгіі. Мы можам весьці дыскусію, колькі гэта адсоткаў людзей.

Гэта пытаньне часу: час не працуе на «саўка» – гэта аб'ектыўна. А тое, што ёсьць «настальжы» па савецкай еднасьці ў старэйшых пакаленьняў, то, я думаю, гэта яшчэ й праблема пераходнага этапу. Гэта ўсё пытаньні вельмі балючыя. Праблемаў шмат, і ня ўсе людзі могуць усьвядоміць свой унутраны патэнцыял і яго выкарыстаць. Калі цябе трыццаць-сорак гадоў прывучаюць да адных паводзінаў, ствараючы пэўныя стэрэатыпы, то цяжка чакаць, каб людзі з узростам лёгка прызвычайваліся да новай сытуацыі, нават калі насталі б большыя мажлівасьці. У Літве я нядаўна размаўляў з Кубілюсам, адным зь лідэраў кансэрватараў. Яны правялі апытаньне: у іх таксама каля 50% людзей прама ці ўскосна гавораць пра настальгію па мінулым. Хаця Літва ў Эўрапейскім Зьвязе, і посьпех там выразны, але гэта – ёсьць! Гэта захоўваецца. Я думаю, гэтае пытаньне будзе менш актуальным зь цягам часу, калі будзе падрастаць новае пакаленьне.

Што датычыць славянства, то мне здаецца, што гэта менш актуальна на сёньняшні дзень для Беларусі. Хаця ёсьць невялікая група людзей. Палітычна не прыжылася ні адна такая структура – ні Славянскі сабор, ні іншыя. Яны па-

адміралі. Чаму? Калі ёсьць попыт, то заўсёды і людзі зьяўляюцца і мабілізуюцца, і ідэя мае нейкі падмурак, яе можна потым рэалізаваць.

Тут няма нейкай скансалідаванай пазыцыі, якая ёсьць сярод ісламскага сьвету. Славяне ёсьць і ў Эўрапейскім Зьвязе, і на частцы былой савецкай прасторы. Няма такога кансалідаванага падыходу, які мае ісламскі сьвет. Там зусім іншая сытуацыя.

## Васіль Лявонаў

Ёсьць ці быў супэрэтнас «славянства». Чаму менавіта быў? Ды таму, што мы, ведучы гаворку пра славянства ў звыклым разуменьні, не ўспамінаем палякаў, чэхаў, іншыя нацыі. Славянскі супэрэтнас распаўся паводле канфэсійнай прыметы: каталікі і праваслаўныя. Калі весьці гаворку пра ўсходнеславянскую супольнасьць – Расею, Беларусь, Украіну, – дык і тут ёсьць пытаньні, яны вельмі складаныя, і ў рамках адказу на адно з пытаньняў цяжка пра гэта весьці гаворку. Мы ня проста блізкія народы (мы – расейцы, украінцы і беларусы), мы вельмі блізкія. Але гэтая блізкасьць, роднаснасьць стварала ў мінулым і стварае ў цяперашні час нямала праблемаў. Гэта асобная вялікая тэма...

Што ж да супольнасьці былых савецкіх рэспублік, дык лепш за прэзыдэнта Расеі У. Пуціна ня скажаш: «СНД – гэта арганізацыя па цывілізаваным разводзе».

## Алег Манаеў

Вядомыя расейскія дзеячы і іх пасьлядоўнікі ў Беларусі і Ўкраіне (а такіх нямала) любяць падкрэсьліваць славянскую супольнасьць у этнічным і геапалітычным сэнсе: у нас, маўляў, была супольная гісторыя, супольная дзяржава, мы разам змагаліся з татарамі, тэўтонамі і г. д. Дакладна гэтак жа некаторыя нашы дзеячы спрабуюць сёньня ўзмацняць беларускую ідэнтычнасьць на аснове «залатога часу ВКЛ». На мой погляд, сёньня такое разуменьне славянскай супольнасьці, славянскай еднасьці, таксама як і беларускай ідэнтычнасьці, ужо неадэкватна часу – гэтага папросту больш не існуе.

Але ў іншым аспэкце – культурна-псыхалягічным, часткова рэлігійным, думаю, што славянская супольнасьць (але ня еднасьць!) як пачуцьцё блізкасьці існуе. Дакладна гэтак жа, як, напрыклад, кітайскі студэнт, калі сустрэне карэйца ці віетнамца недзе ў джунглях Афрыкі ці ў Мангэтане, мабыць, адчувае зь імі большую культурна-псыхалягічную блізкасьць, чым з навакольнымі. У гэтым сэнсе, я думаю, можна гаварыць пра культурна-псыхалягічную блізкасьць славянаў і больш цесную сувязь паміж імі, чым паміж славянамі і, напрыклад, французамі, бразыльцамі, японцамі і г. д.

Што ж да супольнасьці былых савецкіх народаў, дык гэта папросту блеф. Знакамітая формула, прапанаваная ледзьве ня ў сталінскі час, – пра фармаваньне новай гістарычнай супольнасьці пад назвай «савецкі народ» – якраз і была такім блефам. Паміж некаторымі роднаснымі нацыямі і народнасьцямі (якіх у Савецкім Саюзе было больш за сто) былі асаблівыя культурна-псыхалягічныя сувязі. Напрыклад, паміж славянскімі, балтыйскімі, каўкаскімі, сярэднеазіяцкімі народамі. Але так званае «адзінства савецкага народу» трымалася ў асноўным на гвалце і лжывай прапагандзе. Калі мы возьмем сярэднестатыстычнага эстонца і сярэднестатыстычнага туркмэна, дык сацыяльна-культурная еднасьць у іх была на мінімальным узроўні. Безумоўна, былі нейкія супольныя рысы ў трохсот мільёнаў людзей, што жылі ў Савецкім Саюзе і называліся савецкім народам. Але гэтыя рысы былі зьвязаныя не з нацыянальнымі асаблівасьцямі, а з асаблівасьцямі савецкай сацыяльна-палітычнай сыстэмы. Напрыклад, паніжаная ініцыятыўнасьць і адказнасьць у параўнаньні зь сярэднестатыстычным заходнеэўрапейцам або японцам, затое павышанае пачуцьцё страху, імкненьне да халявы і да т. п. Як толькі сыстэма развалілася – пачалі зьнікаць і гэтыя супольныя рысы. Таму сучасныя спробы аднавіць «еднасьць» туркмэнаў і эстонцаў, грузінаў і якутаў, іншых народаў былога СССР – абсалютна беспэрспэктыўныя.

### Аляксандар Мілінкевіч

Гэтымі паняткамі даўно спэкулююць разнастайныя артадаксальныя палітыкі. Кшталту, «славяне – гэта толькі тыя, хто праваслаўныя», ці «славяне – гэта

толькі тыя, што прызнаюць Маскву за цэнтар зьбіраньня зямель» і г. д. Гэта такія славяне, якія лічаць, што беларусаў як нацыі не існуе.

### Анатоль Міхайлаў

Было б наіўна адмаўляць наяўнасьць гістарычна абумоўленых асаблівасьцяў таго, што можна ўмоўна абазначыць як славянская супольнасьць. Спэцыфіка гістарычнага разьвіцьця, блізкасьць моваў, агульнасьць культурных традыцыяў... На тэрыторыі былога СССР яна аказалася да таго ж узмоцненая інтэнсіўным узаемадзеяньнем на тэрыторыі, што ня мае дзяржаўных межаў.

### Алесь Міхалевіч

Наконт славянскай супольнасьці я заўсёды прыводжу прыклад – тое, што сам пачуў ад расейцаў, якія прыехалі ў Чэхію, у Прагу. Яны сказалі такую фразу, што чэхі толькі гавораць па-славянску, а на самай справе яны немцы! Славянская супольнасьць для мяне – штосьці каштоўнаснае. Калі паглядзець, хто рэпрэзэнтуе Расею на міжнародных форумах, якія людзі кіруюць Расеяй, то ня будзе ўпэўненасьці, што хаця б палова зь іх зьяўляецца славянамі з паходжаньня. Таму Расею разглядаць як частку славянскага сьвету ўвогуле вельмі цяжка.

Плюс да ўсяго: гістарычна мая маці была вельмі моцна зьвязаная зь Літвой, Вільняй. І я ніколі не разумеў, чаму нейкія славяне з далёкіх расейскіх рэгіёнаў да нас чымсьці бліжэйшыя за, напрыклад, балтаў – летувісаў, якія жывуць тут, побач, за сто кілямэтраў ад нас.

Народы былога СССР маюць супольны досьвед. Яны маюць тую перавагу над краінамі, якія не былі ў сацыялістычным лягеры, якія не былі ў СССР, што яны разумеюць, як працуе дыктатура. Яны маюць супольную мову камунікацыі, і я, напрыклад, абсалютна не саромеюся праводзіць сумесныя канфэрэнцыі паміж Беларусьсю і Азэрбайджанам з расейскай мовай як рабочай. Калі мы добра ведаем гэтую мову, то чаму саромецца на ёй размаўляць паміж сабой? Гэта сродак камунікацыі. Але гэта – усё, што нам засталося ад Савецкага Саюзу.

І з кожным годам нават гэтыя моманты, якія аб'ядноўваюць (як веданьне расейскай мовы), будуць адыходзіць.

### Тацяна Процька

Панятак славянскай супольнасьці ёсьць. Ён узьнік даволі даўно, яшчэ да савецкай дзяржавы. Ён грунтуецца на рэлігійнасьці, на праваслаўі (менавіта рускім праваслаўі, бо праваслаўных цэркваў болей), а галоўнае – на калектывізьме, на тым ладзе жыцьця, які панаваў у дарэвалюцыйнай Расеі ў большай частцы насельніцтва – сялянства, і ягоных поглядах на жыцьцё.

Заходнія славяне – зусім іншае славянства, чым расейскае; яно належыць да эўрапейскай цывілізацыі. Урбаністычныя працэсы значна зьмянілі звонку і знутры і расейскае славянства. І цяпер, мне падаецца, славянства – гэта больш ідэалёгія, у якой вызначаецца іншая, чым у Заходняй Эўропе, сыстэма каштоўнасьцяў. Свабода, дэмакратыя, правы чалавека – асноўныя, фундамэнтальныя слупы заходнеэўрапейскай цывілізацыі. А вось у славянскай цывілізацыі – зусім іншы падыход: дзяржава, эканоміка, падпарадкаванасьць кіраўніцтву.

Заходнеэўрапейскі падыход – лібэральны: чалавек у цэнтры– і ўсё астатняе вакол яго, у тым ліку і дзяржава. Чалавек сам за сябе адказвае і ўсё вырашае сам. А ў славянскай цывілізацыі наадварот: дзяржава ў цэнтры, а чалавек – для яе. Акрамя таго, тут значную ролю адыгрывае калектывізм. Палітычныя свабоды, свабоды, зьвязаныя з дэмакратыяй, – другарадныя паняцьці.

Супольнасьць савецкіх народаў існуе, пакуль жывуць людзі, якія жылі ў СССР. Пакуль яны не памруць, гэтая супольнасьць будзе. Амаль сто гадоў, цэлыя пакаленьні расьлі пад пэўным сьветапоглядам. Але прыхільнікаў у яго ўсё менш і менш.

Аднак я б не сказала, што савецкая супольнасьць ужо сканала. Выхаванае за доўгі час у людзях пачуцьцё, што за цябе ўсё вырашае дзяржава, на жаль, вельмі папулярнае і характэрнае для Беларусі – найбольш у параўнаньні зь іншымі краінамі былога СССР. Хочацца, каб за цябе думаў чарговы Сталін, а ня ты сам адказваў за свой лёс. А эўрапейская сыстэма каштоўнасьцяў патрабуе ад чалавека адказваць за сябе, у першую чаргу, рабіць сваё шчасьце самому,

а не чакаць, што дзяржава табе нешта дасьць ці грамадзтва табе абавязанае даць нейкае шчасьце...

### Андрэй Саньнікаў

Славянская супольнасьць – гэта палітычны тэрмін, палітычная зьява. Чамусьці славянская супольнасьць у разуменьні былых савецкіх рэспублік не ўключае ў сябе ні Польшчу, ні Баўгарыю, ні Чэхію, ні Славакію... Славянская супольнасьць – гэта «Мы будуем Савецкі Саюз». Сэрбаў нейкі час «прызнавалі», пакуль быў Мілошавіч. Не прызнаюць славянамі палітычныя правадыры, якія падтрымліваюць гэтую ідэю славянскай супольнасьці, ні Польшчу, ні Чэхію, ні Славакію. Але ж калі рэспубліканская партыя ў Чэхіі ладзіла Славянскі кангрэс, рэакцыйны, скіраваны супраць дэмакратычных прынцыпаў, то адразу ж іх прызналі славянамі, дэлегацыі з Масквы, зь Менску ехалі...

Славянская супольнасьць існуе, ёсьць пэўныя культурныя традыцыі. Але тое, што сёньня палітыкі называюць славянскай супольнасьцю, – тыповы палітычны фантом, які агучваецца на карысьць палітычных лідэраў, перш за ўсё – у Расеі, Беларусі, Украіне.

А сувязі народаў, якія былі пад саветамі, я лічу, ёсьць, і будуць існаваць. На жаль, зьяўляюцца штучныя рэчы, якія перашкаджаюць стасункам. І на жаль, разбурылася тое стваральнае асяродзьдзе, якое мы бачылі, напрыклад, у пэрыяд перабудовы. Мне бракуе сур'ёзнай інтэлектуальнай падтрымкі з Расеі. Тых людзей, на прыкладзе якіх мы вучыліся годнасьці і свабодзе. Мы былі разам, разам разбуралі імпэрыю і падтрымлівалі адно аднаго.

Я ня так даўно быў на пятнаццатай гадавіне падзеяў у Рызе, іх барыкадаў. Там таксама пра гэта казалі – што, на жаль, згубіліся сувязі. Таму што калі б не было падтрымкі гэтых людзей, інтэлектуальных лідэраў, дысыдэнтаў, праваабаронцаў з Расеі, якія прыяжджалі зь Піцера, як дэпутаты Ленсавету, каб падтрымаць, то ніхто ня ведае, чым магло б скончыцца. Я думаю, што гэты час ня вернецца, але тэарэтычна можна пашкадаваць. Таму што цяпер мы такога ўвогуле ня бачым. Нешта могуць сказаць пра нашу сытуацыю і цьвяроза ўсьвядоміць, што тут адбываецца, адзінкі.

### Уладзімер Улаховіч

Інэрцыя існаваньня, нібыта ў зьніклым СССР, які распаўся, зразумела, ёсьць і шмат што тлумачыць у сучасным жыцьці.

### Валеры Фралоў

Я думаю, ёсьць адчуваньне славянскасьці: усё-такі яно культывуецца.

Ёсьць супольнасьць народаў былога СССР. Нават калі па нашай Беларусі меркаваць: колькі тут усялякіх нацыяў жыве?

Але іншая рэч, калі гэта пачынаюць культываваць, калі гэта выкарыстоўваюць палітыкі, – гэта адыходжаньне ад сутнасьці і ператварэньне ў інструмэнт для палітычных гульняў. Вось гэта страшна!

Супольнасьць ёсьць, яна нас яднае. Цяжка ў адначасьсе, за пятнаццаць гадоў, яе разбурыць. Але калі гэта ператвараецца ў інструмэнты для палітычнага пад'ёму, для зарабляньня на гэтым грошай (я ведаю, што многія зарабляюць грошы на гэтым), для прасоўваньня сябе – гэта гнюсна.

Я часта бываю ва Ўкраіне, у Расеі, у Прыбалтыцы – і адчуваю, што нешта такое засталося. Я не хачу перабольшваць тых станоўчых рысаў, якія былі пры Савецкім Саюзе, пры сацыялізьме, але ўсё-такі ў той час было вельмі шмат добрага, вельмі шмат. А мы, як заўсёды, шарахаемся: ці да белых, ці да чырвоных. То Леніна абагаўлялі: «кучаравы хлопчык», – то цяпер называюць вылюдкам. Жыцьцё не такое простае, яно ня чорна-белае, а вельмі рознакаляровае.

Безумоўна, трэба сказаць вялікі дзякуй Лукашэнку, што ў нас цяпер зараджаецца адчуваньне сваёй краіны, сваёй рэспублікі. Так, сапраўды, гэта ніяк не зьвязана з нацыянальнымі якасьцямі, гэта чыста фармальна, казённа. Але тым ня менш... Я належу да тых людзей, якія вельмі доўга пражылі ў Савецкім Саюзе. Я бачу, што расьце іншае пакаленьне. Вельмі добра, мне здаецца, з гэтай нагоды Чарнамырдзін сказаў, выступаючы ў Кіеве, калі ён ужо быў не прэм'ерам, а паслом: «Некаторыя ў Расеі думаюць, што мы старэйшы брат. Ды не старэйшы мы і ніякі ня брат – мы ўжо іншыя. Трэба разумець, што вырасла новае пакаленьне, якое глядзіць на гэтыя рэчы зусім па-іншаму». Думаю, што пройдзе нейкі час –

і мы ўсё больш і больш будзем адчуваць сябе незалежнай, сувэрэннай рэспублікай са сваім спэцыфічным мэнталітэтам, са сваімі традыцыямі. Але калі мы, жывучы на адной плянэце, на адным кантынэнце, будзем кіравацца прынцыпамі, якія дазволілі б мірна суіснаваць, разьвівацца, – вось гэта будзе здорава! Каб кожны захоўваў сваю нацыянальную адметнасьць і нешта сваё ўносіў у рознакаляровую мазаіку! І каб на гэтую мазаіку было прыемна глядзець, і каб гэта была ня нейкая мазаіка з фашысцкага знаку...

## Станіслаў Шушкевіч

Што да славянскай супольнасьці, у мяне такое ўражаньне, што акрамя простага ўзаемаразуменьня неадукаваных людзей (якія ня ведаюць моваў, бо не вучылі), тут ніякай такой супольнасьці няма. Я тут бачу не супольнасьць, а супярэчлівасьць. Адны славяне – гэта рускія, беларусы, украінцы, другія славяне – палякі, чэхі, славакі. Сэрбы як бы крыху падобныя да расеянаў.

Відавочна, што ўсё гэта вынік агульнага паходжаньня – я не гісторык, не магу тут сказаць.

Я адчуваю сябе добра ў тым месцы, дзе я магу з чалавекам абменьвацца думкамі, дзе я разумею яго мову. У гэтым сэнсе для мяне існуе славянская супольнасьць. Прыехаўшы ў савецкі час да прафэсара ў Любляну, я раптам адчуў, што ў мяне няма праблемаў, каб разабрацца. Я ніколі не вывучаў славенскую мову! У Славакіі (у Браціславе) было тое самае. Цяжэй у Чэхіі. А што да Польшчы – тут праблемаў няма: польскую мову я ведаю, тут у Беларусі я яе вывучыў, жыў у месцах, дзе гавораць па-польску. Для мяне ў гэтым сэнсе супольнасьць існуе.

Але вельмі часта гэтыя аб'яднаньні былі, я б сказаў, не зусім прыстойныя. Напрыклад, сэрбска-расейскае адзінства, якое парадзіла зьнішчэньне мусульманаў. Мне ня вельмі блізкая мусульманская культура, але я бываю ў асяродзьдзі, дзе мне вельмі лёгка кантактаваць зь людзьмі іншых рэлігіяў. Калі дайшло да генацыду і да сёньня народ хавае вінаватых у гэтым генацыдзе як нацыянальных герояў, тут нейкая зьнявечанасьць у выхаваньні, гэта адступленьне ад эўрапейскасьці.

І я б сказаў так: існуе славянская супольнасьць, але месцамі яна так перарадзілася, што час ад часу кантакты зь іншай супольнасьцю, напрыклад з тымі самымі фінамі і французамі, мне здаюцца больш эфэктыўнымі і больш карыснымі для абодвух бакоў.

Цяпер што да савецкай супольнасьці... Я савецкі чалавек, ведаеце. Я вельмі многа езьдзіў па Саюзе і некалі казаў, што нельга аднолькавым спосабам кіраваць узбэцкім бавaўнаводзтвам і чукоцкім аленяводзтвам. Але я сябе нядрэнна адчуваў і ў Душанбэ, і ў Тбілісі, а пазьней у Бішкеку – дзякуючы вось гэтай нашай супольнай гісторыі. Гэтая навязаная гісторыя, яна, відавочна, абумоўленая аднолькавымі сацыяльнымі праблемамі.

Вось я толькі што вярнуўся з Францыі. Французы вельмі даўно рэвалюцыі ладзяць. Пратэстны дух – гэта дух нацыі, ён дазволены. Іх навучаюць таму, каб яны ўмелі пратэставаць, пратэставаць цывілізавана. Часамі бываюць зрывы – нават у цяперашнім студэнцкім пратэсьце. Але гэта – дух нацыі. Дарэчы, яны ўсе сталі французамі дзякуючы аб'яднаньню, таму што да гэтага падзяляліся на шэраг народнасьцяў. Мне здаецца, што калі б у нас прынцыпы аб'яднаньня былі праўдзівыя, то гэты Саюз меў бы шанцы быць трывалым. А так як прынцыпы былі лжывыя і кіраўніцтва прапаведавала адно, а рабіла другое. Толькі тыя людзі, якія засталіся падманутымі (у пэўным сэнсе і я, бо мне вельмі доўга падабаліся савецкія прынцыпы), маюць настальгію па гэтай супольнасьці.

Для мяне як беларуса было зьнявагай: чаму гэта мой бацька як выкладчык беларускай мовы атрымліваў на 12% заработную плату меншую, чым выкладчык расейскай мовы (як замежнай)? Быў такі час. Гэтыя зьняважлівыя прынцыпы, навязаныя каляніялізмам, і толькі праз вольныя мас-мэдыі яны робяцца зразумелымі людзям...

Адно засталося, што нас аб'ядноўвае, – веданьне расейскай мовы. Больш я пакуль што ня ведаю нічога. Эўрапейцы: палякі, чэхі – ад гэтага ўжо адышлі. Дый прыбалты... А мы яшчэ застаемся *homo soveticus*.

## Усевалад Янчэўскі

Наконт народаў СССР. Нехта дасьціпны гаварыў (ці пісаў), што на тэрыторыі Савецкага Саюзу існавала адразу чатыры грамадзка-эканамічныя фармацыі, паводле Маркса: фэўдалізм у Расеі, капіталізм у Прыбалтыцы, рабаўладаньне ў Сярэдняй Азіі і першабытна абшчынны лад на Чукотцы. Нейкае ёсьць у гэтым перабольшаньне, вядома...

Зразумела, што жыхары Сярэдняй Азіі ці Закаўказьзя да нас не падобныя. Уласна, колькі часу назад Сярэдняя Азія была ўключана ў Расейскую імпэрыю? Калі хівінскага хана Скобелеў пакарыў? Паводле мерак гісторыі ня так і даўно!

Але ўсё-такі паняцьце «савецкі чалавек» было (дакладна!), яшчэ ёсьць, але ўжо праз нейкі час – яго ня будзе. Гэта як у фізыцы: калі вы рэчы мэханічна злучаеце, яны будуць прыцірацца адна да адной, хоць бы яны былі нават вельмі розныя. Малекулы будуць пранікаць. І такія ж «малекулы» пранікалі і тут. Гэта рабілася часам вельмі жорстка. Часам – гвалтоўна, часам – натуральна. У прынцыпе, нічога ўнікальнага ў гэтым няма: Расея Раманавых, Савецкі Саюз былі клясычнымі імпэрыямі. Гэта такая форма самаарганізацыі людзей – імпэрская: яна сынтэзавала вельмі розныя культуры, часта непадобныя і нават супярэчлівыя. У яе была звышыдэя, звышкаштоўнасьць, звышзадача.

Імпэрыя распалася – часткова натуральным, часткова выпадковым чынам. Напрыклад, пры нейкім гістарычным павароце падзеяў, напэўна, цалкам маглі б Беларусь, Украіна, Расея, Казахстан (як пісаў Салжаніцын) захавацца ў адзінай дзяржаве. Абсалютна ня выключана!

Прыбалтыка – гэта нешта чужое было. Хоць усё ж дзьвесьце гадоў прабыла ў Расейскай імпэрыі. Галіччына ў Расейскай імпэрыі практычна і не была: яе ўключыў толькі Сталін.

Потым СССР разваліўся. Яго часткі пачалі разыходзіцца. Многія зь іх ня маюць арганічнай патрэбы ў злучэньні, і таму яны натуральна будуць разыходзіцца і надалей. Ну, што ў Таджыкістану будзе агульнага з Эстоніяй?

У мяне вельмі дзіўнае стаўленьне да славянскага адзінства. Дапусьцім, мы гаворым пра Расею і Сэрбію. Клясычная тэма, браты і г. д. Але гістарычна гэтыя

краіны не былі зьвязаны ўвогуле ніяк! Гэта былі дзьве абсалютна розныя гісторыі, яны не судакраналіся.

Баўгары, «братухны». Мы іх вызвалялі, але дзьве вайны яны ваявалі супраць нас.

Палякі, славяне... Калі прааналізаваць, расейцы ваявалі з палякамі нешта надта ўжо часта – я ўжо ня ведаю, з кім больш, чым зь імі! Украінцы і палякі паміж сабой ня надта сябравалі.

Чэхі. Мова падобная да расейскай, але што агульнага ў гісторыі? Нічога.

У цэлым, наконт славянскага адзінства відавочных фактаў ня вельмі шмат. Мова? Так, безумоўна. А апрача мовы што?

# 7. Як вы ацэньваеце палітыку Расеі ў дачыненьні да Беларусі?

## Вольга Абрамава

Паводзіны Расеі прагматычныя, адпавядаюць яе нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам. Думаю, для вас не сакрэт, што я з самага пачатку свайго знаходжаньня ў палітыцы зьяўляюся прарасейскім палітыкам, але адначасова – і праэўрапейскім. Я стараюся трымаць гэты балянс. Я ўсьведамляю, што на гэтай прасторы ёсьць сфэра сумленнага ўзаемадзеяньня, і, як прагматычны чалавек, лічу, што яна і павінна быць захаваная – у нацыянальна-дзяржаўных інтарэсах Беларусі. У дачыненьні да Беларусі расейскае кіраўніцтва праводзіць тую палітыку, якая ня проста адпавядае нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам Расеі, але і падтрымліваецца большасьцю яе насельніцтва. Гэта аналягічна таму, як паводзіць сябе Аляксандар Лукашэнка: ён таксама ва ўнутраным і вонкавым пляне праводзіць палітыку, якая падтрымліваецца і падзяляецца большасьцю насельніцтва краіны.

## Сьвятлана Алексіевіч

Расея сёньня ў складанай сытуацыі: імпэрыя пала, але імпэрская ідэя засталася. І гэта адзіная ідэя, якая засталася ў Расеі. Такое ўжо сустракалася ў гісторыі: імпэрыі распадаліся, а імпэрская сьвядомасьць яшчэ заставалася. Расея страціла Грузію, Украіну (не як тэрыторыі, але як сфэру свайго ўплыву),

і гэта прымусіла яе жорстка сфармуляваць свае геапалітычныя інтарэсы. Мне не падабаецца імпэрская сьвядомасьць...

Што цікава: у гэты момант у Беларусі інтарэсы асабістай улады Лукашэнкі супалі з інтарэсамі нацыі. Вось такія парадоксы таксама часам сустракаюцца.

### Яўген Бабосаў

Думаю, палітыка Расеі ў дачыненьні да Беларусі дваістая. Гэта зьвязана з тым, што ў Расеі, у адрозьненьне ад Беларусі, ёсьць алігархі, якія зацікаўленыя больш у тым, каб Расею схіліць да падпарадкаваньня Захаду, чым да саюзу зь Беларусьсю. Таму гэтыя алігархі перашкаджаюць працэсу аб'яднаньня народаў. У нас жа ёсьць усе падставы... 38% (!) беларускіх жанчын – гэта навуковыя зьвесткі! – замужам за расейцамі і ўкраінцамі. 38% – больш чым трэць! І 36% мужчынаў жанатыя з расейкамі, ці ўкраінкамі, ці прадстаўніцамі яшчэ нейкіх нацыяў. Ніякімі межамі, ніякімі дагаворамі гэта не вызначаецца.

У мяне ёсьць колішні асьпірант, ён з Заўральля. У яго маці памерла, як паехаць на пахаваньне – вось праблема! Дарага каштуе. А калі ва Ўладзівастоку? Там у мяне ёсьць дактарант, прафэсар, які атрымаў званьне доктара. Ён наш, беларус. Як паехаць да яго ў госьці? Праблема не чалавечых стасункаў, а эканамічнага парадку – няма за што паехаць. Вось гэта перашкаджае... Вось мяне запрасілі ў Маскву на Расейскі кангрэс сацыёлягаў. Уступны ўзнос – 450 тыс. рублёў. Вось я і думаю: ехаць ці ня ехаць? Вось пытаньне. А студэнту? Ды ніколі ў жыцьці!

Праблема стаўленьня Расеі да Беларусі дваістая. З другога боку, Расея ў Беларусі вельмі зацікаўленая – заходнія рубяжы ўсё-такі і прыкрыцьцё з захаду. Калі што – дык Беларусь першая! Усе ж памятаюць Берасьцейскую крэпасьць, калі што.

### Анжаліка Борыс

Як імпэрскую.

### Генадзь Бураўкін

На вялікі жаль, у мяне такое ўражаньне, якое з часам не слабее, а наадварот, павялічваецца, мацнее, што ў Расеі ня толькі на дзяржаўным узроўні, а на ўзроўні грамадзтва вельмі актыўна рэанімуюцца ідэі імпэрскасьці. Многія расеяне, у тым ліку і дзеячы культуры, вельмі хочуць быць абавязкова вялікімі, абавязкова сваю волю калі не дыктаваць, дык навязваць іншым. Перш за ўсё тым, хто бліжэй да іх, хто быў некалі ў Савецкім Саюзе. Вы заўважылі, што вельмі часта апошнім часам гаворыцца пра Савецкі Саюз як пра разнавіднасьць Расейскай імпэрыі. Для расеян гэта ўжо, як кажуць, дадзенасьць. Хаця я лічу, калі ўжо быць гістарычна дакладным, поўнай роўнасьці ставіць паміж Расейскай імпэрыяй і Савецкім Саюзам нельга. Ува ўсякім выпадку, нават у Леніна было жаданьне адысьці ад таго, што было ў Расейскай імпэрыі, недарма ж ён гаварыў, што Расея – «турма народаў». Цяпер чамусьці палітыкі нават на самым высокім узроўні вельмі ахвотна ставіць знак роўнасьці паміж Расейскай імпэрыяй і Савецкім Саюзам. Савецкага Саюзу няма – яны з гэтым згодныя. Яны нават згодныя з тым, што Савецкага Саюзу і быць ня можа. Але – павінна вярнуцца Расейская імпэрыя! Не ў такіх фармулёўках, канечне. Часам гучыць: павінна вярнуцца вялікая Расея, павінна вярнуцца расейская магутнасьць і г. д. Калі адкінуць дыпляматыю і нейкія стылёвыя хітрыкі, гэта ўсё ідзе гаворка пра вяртаньне, рэанімацыю Расейскай імпэрыі. А гэта значыць, калі далей весьці гэты лягічны ланцужок, што Расея зноў хоча мець пад сваім кіраўніцтвам і Беларусь, і Украіну, і Казахстан, і Грузію. Я ня ведаю, можа, яны падумваюць і пра Прыбалтыку – гэта яны асьцярожна пакуль што гавораць. Таму тыя палітычныя асаблівасьці сёньняшняй Расеі, якія я бачу, мяне вельмі палохаюць.

Адсюль тая непрыхаваная русіфікацыя, якую Расея вельмі баіцца страціць. У Беларусі для іх праблемы з расейскай мовай, ці – як яны кажуць – з расейскамоўным насельніцтвам, няма. А паглядзіце, як яны гэтае пытаньне разглядаюць у дачыненьні да Латвіі, Эстоніі, нават да той жа Ўкраіны ці Малдовы. Абсалютна імпэрскія настроі, імпэрскі падыход.

Яшчэ мяне вельмі трывожыць тое, што ў палітычным асяродку Расеі адбываюцца працэсы, якія вельмі нагадваюць пра тое, што зьвязана з фашызмам. На

самым высокім узроўні ўсякія Жырыноўскія, Затуліны і г. д. атрымліваюць для гэтага агромністыя трыбуны, тэлевізійныя і іншыя, дзе яны клічуць да прымяненьня сілы да тых, хто паводзіць сябе ня так, як ім здаецца патрэбным. Я ўжо не кажу пра гэтыя вар'яцкія заявы, што трэба памыць боты ў Індыйскім акіяне. І ўсё гэта не асуджаецца. Калі й асуджаецца, то вельмі нясьмела, праз зубы. А ўсё гэта ідзе ледзь не пад апладысмэнты вельмі многіх людзей. І я думаю, не выпадкова тое, што апошнім часам адбылося ў Расеі ў дачыненьні да студэнтаў-замежнікаў, у якіх іншы колер скуры, у дачыненьні да сынагог. Мяне гэта вельмі і вельмі насьцярожвае. Таму тое, што мы ўцягваемся ў арбіту расейскага палітычнага жыцьця, гэтых працэсаў, для мяне гэта страшна, вельмі трывожна. І я проста баюся, што калі мы (а мы ў многім вельмі блізкія) прымем гэткае ад іх, то ня толькі для нашай душы, для нашай гісторыі гэта будзе трагічна – гэта будзе трагічна для лёсу нашай маладой нацыянальнай дзяржавы.

### Алесь Бяляцкі

Палітыку Расеі расцэньваю як недалёкую, абмежаваную, пабудаваную на першасных інстынктах, я сказаў бы. Гаварыць пра нейкую стратэгію Расеі ў дачыненьні да Беларусі не выпадае. Усё пабудавана на абсалютна тупалобым, вайсковым прагматызьме. І на сёньняшні дзень гэта ёсьць вонкавай палітыкай Расеі ў дачыненьні да ўсіх краінаў, якія раней уваходзілі ў СССР. Чаму прыбалты з такой хуткасьцю выскачылі з усіх «саюзных пагадненьняў», дачыненьняў, эканамічных стасункаў і г. д.? Яны гэта зрабілі нягледзячы на любыя эканамічныя страты, хоць гэта, можа, было нявыгадна, і цяпер яшчэ нявыгадна, і яшчэ нейкі час будзе нявыгадна. Яны адчувалі, што калі яны застаюцца ў гэтай постсавецкай багне, то ім усё роўна за гэта прыйдзецца плаціць у пяць разоў даражэй, чым яны зрабілі адразу, адрэзаўшы гэтую пупавіну як мага хутчэй і зваліўшы адсюль. На сёньняшні дзень мы бачым, што робіць Расея з Грузіяй, з Малдовай: фактычна, ідзе прыхаваная эканамічная блякада. Гэты шлях раней ці пазьней будзе чакаць і нас, калі Расея ня зьменіць свайго стаўленьня. У яе сёньня няма падставаў мяняць: яна занадта вялікая краіна, ёй гэтая Грузія ці, урэшце, Беларусь... Хіба што Ўкраіна можа нешта значыць у эканамічным пляне. Усе іншыя

краіны для яе – нішто. Можа, Беларусь і Ўкраіна як транзытныя шляхі – тут на іх больш завязана на Эўропу, на гандаль і г. д. А што тычыць гэтых няшчасных маленькіх краінаў кшталту Малдовы і Грузіі, якія геапалітычна – зусім нікуды, дык расейцы іх душаць, топчуць, зьдзекуюцца зь іх як хочуць. Таму гаварыць пра нейкае сур'ёзнае стаўленьне да Беларусі пакуль не прыходзіцца. Як сябе паводзіць п'яны жаўнер у бардэлі, такім чынам Расея сябе паводзіць з усімі гэтымі малымі краінамі, якія вакол яе ўтварыліся.

Я думаю, што ў бліжэйшы час ніякіх зьменаў не адбудзецца: тут мы не павінны мець ніякіх ілюзіяў. І гэта яшчэ адна зь вельмі моцных падставаў таго, чаму Беларусь як мага хутчэй павінна ўлятаць, уязджаць, убягаць у Эўразьвяз. Таму што тут нас нічога добрага не чакае. Умоўна кажучы, нам трэба цяпер як мага хутчэй будаваць пяцімэтровы плот на нашай усходняй мяжы, пакідаць там дзесяць-дваццаць праходаў для культурных і сямейных стасункаў, а ўсё астатняе – перакрываць. Інакш гэта можа вельмі-вельмі кепска для нас скончыцца. Так, як, урэшце, уся гісторыя саюзу з Расеяй для нас – нейкая суцэльная трагедыя, якая выліваецца кожны раз у мільённыя ахвяры. Я ўжо не кажу пра эканамічныя шкоды – толькі пра чалавечыя ахвяры.

### Аляксандар Вайтовіч

Калі вельмі коратка, то я ацэньваю палітыку Расеі цяпер як неадпаведную нацыянальным інтарэсам і Расеі, і Беларусі.

### Андрэй Вардамацкі

Расейская палітыка проста недальнабачная. Яна заключаецца ва ўзаемадзеяньні толькі з афіцыйнымі структурамі, будучыня якіх, увогуле кажучы, стратэгічна няпэўная. І іншыя сэгмэнты грамадзтва вельмі добра гэта бачаць. І пры зьмене сытуацыі іншыя сэгмэнты грамадзтва будуць мець насьцярожанае стаўленьне да Расеі.

### Вінцук Вячорка

Гаворка не на адзін абзац. Сьцісла – нічога ў іхнай палітыцы не мяняецца, дакладней, яе сутнасьць зноў праясьняецца для тых, хто ў нейкі момант паверыў у магчымасьць зьмены. «Лібэральная імпэрыя», – сказаў Чубайс. Імпэрыя ня можа быць лібэральнаю; цяпер відавочна (тым, хто раней ня бачыў), што яна такою і ня ёсьць. Дарэчы, цікава, што Беларусь там мала ведаюць, не разумеюць працэсаў у нашым грамадзтве. Тыя, хто прымаюць рашэньні, жывуць стэрэатыпамі. Кранікам як унівэрсальным рычагом. Можа, гэта і добра?

### Павал Данейка

Я перакананы, што ніякай замежнай палітыкі ў Расеі няма. Расея ня ў стане выпрацоўваць нейкую асэнсаваную замежную палітыку з адной простай прычыны: яна ня ў стане адрэфлексаваць нацыянальныя інтарэсы. Рэшткі імпэрскага замежнапалітычнага мысьленьня ў значнай ступені вызначаюць на сёньняшні дзень дзеяньні Расеі. Гэтыя дзеяньні, у маім разуменьні, супярэчаць інтарэсам Расеі. Пытаньне ў тым, як мы вызначаем гэтыя інтарэсы. Калі мы вызначаем іх праз рост дабрабыту, які будзе надзейна абаронены ад замахаў звонку і знутры, калі мы гэта разглядаем як галоўную задачу дзяржавы, дык, безумоўна, такому разьвіцьцю падзеяў у Расеі цяперашняя замежная палітыка супярэчыць. Яна заснавана на іншых дапушчэньнях, на нейкіх ідэалягічных дапушчэньнях: яны па-ранейшаму мысьляць прасторавымі характарыстыкамі, па-ранейшаму лічаць важным, каб іх баяліся. Гэта абсалютная каша з розных спадчынаў, якая да сучаснай Расеі, да народу, які там жыве, ня мае ніякага дачыненьня.

Таму і ў дачыненьні да Беларусі як такой палітыкі няма і не было. Нейкія імпэрскія структуры, што захаваліся, цешацца з такога тыпу стасункаў, дзе для іх галоўнае – «наш сатэліт», «саюзьнік», «малодшы брат»: адчуваньне, што нехта ад іх залежыць. Але гэта закранае альбо масавую сьвядомасьць, якая неадрэфлексаваная, як спадчына прапаганды, альбо зусім «адвязаных» інтэлектуалаў, якія шмат ведаюць, але мала разумеюць. Сур’ёзныя эліты ставяцца да гэтага як

да гульні, яны досыць цынічна выкарыстоўваюць наяўны набор стэрэатыпаў для дасягненьня сваіх уласных інтарэсаў – групавых і асабістых.

### Андрэй Дынько

Я ацэньваю палітыку Расеі ў дачыненьні да Беларусі як прагматычную аж да цынізму. Я таксама ацэньваю яе як недальнабачную. Расейская палітыка апошняга дзесяцігодзьдзя грунтавалася на безагаворачнай падтрымцы аўтакратычнага рэжыму Лукашэнкі пры захаваньні патаемных спадзяваньняў на тое, што ў выніку ўрэшце Беларусь удасца-такі вярнуць ува ўлоньне матухны-Расеі. З аднаго боку, гэтая палітыка вельмі пыхлівая, яна ігнаруе той факт, што рэпрэсіўны рэжым у Беларусі супярэчыць інтарэсам многіх слаёў беларускага грамадзтва, што ён ненатуральны для краіны Цэнтральнай Эўропы. Адна толькі Беларусь мае такі рэжым, нідзе побач другога такога няма. Рэжымы, якія былі ў Славаччыне ці Харватыі, вельмі хутка ўпалі. І гэта прыводзіць да вялікага расчараваньня беларускай грамадзянскай супольнасьці ў Расеі.

Я назваў бы гэтую палітыку цынічнай. Калі адкінуць усякія фігуры ўмаўчаньня, то яна прадугледжвае асыміляцыю беларускага народу як такога. Мне цяжка знайсьці які іншы прыклад у Эўропе, калі б адна краіна ставіла сабе стратэгічнай задачай выкарыстаць сытуацыю, інкарпараваць другую краіну і зьнішчыць яе нацыянальную адметнасьць. Гэта тое, што выклікала ўсе апошнія гады зразумелы непакой у асяродзьдзі беларускай нацыянальнай эліты, выклікала таксама вялікія страхі беларускага бізнэсу. І гэта накладаецца на ранейшыя псыхалягічныя траўмы ў стасунках між Беларусьсю і Расеяй.

Аднак Расея, я спадзяюся, застанецца дэмакратычнай краінай, адказным членам эўраатлянтычнай супольнасьці. Эканамічныя кантакты Беларусі з Расеяй вельмі істотныя, нягледзячы на тое, што экспарт беларускіх тавараў у Эўразьвяз у апошнія гады ўвесь час рос, а экспарт у Расею – падаў. Тым ня менш, Расея застаецца для Беларусі самым вялікім суседам, краінай, зь якой Беларусь мае найбольш працяглую мяжу. Я бачу адной з асноўных задачаў беларускіх інтэлектуалаў на сёньня – знайсьці такія варыянты суіснаваньня з Расеяй, пры якіх

бы Расея перастала быць крыніцай небясьпекі для Беларусі, а была крыніцай спрыяньня ўстойліваму разьвіцьцю.

### Сьвятлана Калінкіна

Палітыка Расеі – гэта палітыка імпэрыі. Па вялікім рахунку, Беларусь для Расеі – гэта калёнія: зь яе трэба выцягнуць як мага больш. І ўсё астатняе, па вялікім рахунку, Расею не цікавіць.

Але тут я б не абвінавачвала толькі адну Расею, таму што шмат у чым мы вінаватыя самі. Мы самі дазволілі, у нас саміх было такое кіраўніцтва. І нават – мы самі імкнуліся задушыцца ў гэтых братніх абдымках. У той жа час гэтая палітыка не разьлічаная на шмат гадоў – гэта кароткачасовая палітыка. Цяпер, мне здаецца, у Расеі нейкія такія спробы хаця б неяк па-іншаму, іншым нейкім ракурсам глянуць на тое, што адбываецца ў стасунках паміж ёй і Беларусьсю, ужо ёсьць. Але яны яшчэ не ў Расеі як дзяржавы, а ў нейкіх расейскіх аналітыкаў, палітолягаў. Такія спробы ёсьць, таму мне здаецца, што ўсё ж такі ў нейкай блізкай пэрспэктыве дачыненьні паміж Беларусьсю і Расеяй зьменяцца.

Іншая справа, што гэтага можа не адбыцца наагул, калі ў хуткім часе ажыцьцявяцца пляны ў стварэньні саюзнай дзяржавы як адзінай, цэльнай, маналітнай і г. д.

### Сяргей Калякін

Калі браць апошні пэрыяд, то ацэньваю расейскую палітыку як недальнабачную. Расея дэкляруе на дзяржаўным узроўні, што Беларусь зьяўляецца стратэгічным партнэрам, што зь Беларусьсю будуецца адзіная дзяржава, што ёсьць стратэгічныя інтарэсы. Разам з тым Расея глядзіць праз пальцы на тое, што Беларусь усё больш аддаляецца, у тым ліку – і ад Расеі. Паводле ўсіх парамэтраў! Мы будуем дзесяць гадоў саюзную дзяржаву – з 1996 году. Калі мы возьмем 1996 год і 2006 год, дык убачым: у 1996 годзе Беларусь і Расея былі значна бліжэйшыя адна да адной паводле ўсіх парамэтраў – у сыстэме эканамічнай дзейнасьці, у сыстэме палітычных стасункаў, сацыяльных адносінаў...

Апроч таго, Расея ў стасунках зь Беларусьсю кіравалася і будзе кіравацца ўласнымі інтарэсамі. І гэта нармальна! Гэтак жа паводзіць сябе любая іншая краіна: Германія ў дачыненьні да Беларусі будзе кіравацца сваімі інтарэсамі, Польшча – сваімі, Эўрасаюз – сваімі, ЗША – сваімі... Таму Расея зыходзіць са сваіх інтарэсаў. Але, на мой погляд, яна разумее іх няправільна і недальнабачна. Робячы стаўку толькі на дзейны рэжым, які падтрымліваецца няхай нават палавінай насельніцтва Беларусі, Расея проціпастаўляе сабе другую палавіну: тая бачыць, што Расея, аказваючы падтрымку сёньняшняму рэжыму, тармозіць трансфармацыю, тармозіць перамены, тармозіць дэмакратызацыю Беларусі. І яна бачыць у Расеі перашкоду: калі б не было сёньня падтрымкі Расеі, дык перамены адбыліся б, магчыма, хутчэй. І трэба разумець, што тая палавіна, якая не падтрымлівае Лукашэнку, – маладзейшая, больш адукаваная. Гэта – частка, за якой будучыня. І працяглай падтрымкай толькі аднаго боку Расея стварае прэцэдэнт: у пэрспэктыве ў яе робіцца ўсё больш і больш праціўнікаў. На мой погляд, ёй трэба тэрміновым чынам мяняць сваё стаўленьне да працэсаў, што адбываюцца ў Беларусі, і паказваць беларусам, што нашы праблемы мы павінны вырашаць самі. Але ў той жа час яна павінна паказваць, што яна не выбірае нейкага боку і штучна не тармозіць працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі. А пры разумным падыходзе Расея магла б аказваць і дапамогу ў зьменах, што адбываюцца ў Беларусі, зыходзячы з таго, што Беларусь і фармальна ў супольнасьці Расеі і Беларусі ўзяла на сябе шмат якія абавязаньні, якіх не выконвае, – у галіне правоў чалавека, палітычных свабодаў і іншага. І Расея сёньня мае больш уплыву і магчымасьцяў, фактычна, чым Эўропа, чым ЗША. Яна павінна прадэманстраваць, што яна дапамагае Беларусі ў вырашэньні існых у яе праблемаў. А тым самым яна дапамагла б у вырашэньні праблемаў, якія сёньня ў Беларусі ёсьць у стасунках з Эўропай, з ЗША і г. д. І, на мой погляд, Расея магла б уключыцца ў сёньняшні агульны сусьветны працэс спробаў вырашэньня існага глыбокага палітычнага крызісу ў Рэспубліцы Беларусь.

### Кася Камоцкая

Гэта адназначная падтрымка дыктатуры пры дапамозе газу і нафты. І інфармацыйная падтрымка, і дыпляматычная.

### Сяргей Касьцян

Я б сказаў так, што гэтая палітыка мае два кірункі. З аднаго боку, Расея рабочых і сялянаў, прагрэсіўнай інтэлігенцыі, частка палітычных дзеячаў Расеі выступаюць за хутчэйшы саюз Беларусі і Расеі. За моцны саюз Беларусі і Расеі! Але ёсьць і частка палітычных дзеячаў (у Расеі, але ня рускіх!), якія выступаюць ад імя Расеі і выступаюць супраць гэтага саюзу. Мы гэта ўлічваем. І нават апошняе рашэньне аб павышэньні цэнаў на газ для Беларусі сьведчыць аб тым, што тыя сілы ў Расеі, якія кіруюцца патрабаваньнямі з Вашынгтону, яны і заявілі аб гэтым. Чаму? Нядаўна адзін з палітычных дзеячаў, эканаміст з Заходняй Эўропы, па «EuroNews» сказаў, што трэба патрабаваць ад Расеі, каб яна перастала прадаваць Беларусі газ па ўнутраных цэнах, каб хутчэй абваліўся рэжым Лукашэнкі, бо шляхам выбараў яго адлучыць ад улады нельга. Прайшоў адзін тыдзень – і гэтыя сілы (антырускія, падкрэсьліваю, і антыбеларускія!) прынялі гэтае рашэньне. Але пабачым, што будзе далей, бо рускі народ ужо падняўся: на 3 красавіка арганізуецца ў Расеі пікет супраць «Газпрому», 2 красавіка – Сабор грамадзкіх аб'яднаньняў Расеі і Беларусі, дзе прынялі рэзалюцыю, адрасаваную Пуціну і ў «Газпром», супраць увядзеньня гэтых цэнаў. У Расеі ўжо адкрыта гавораць, што гэта спэцыяльна робіцца так, каб не дапусьціць стварэньня моцнага саюзу Беларусі і Расеі, моцнай саюзнай дзяржавы. Я думаю, што рускі народ зможа дабіцца адмены гэтых здрадных рашэньняў.

### Вячаслаў Кебіч

Што да Расеі, там ёсьць дзьве плыні. Палітычная плынь: любым спосабам ня страціць Беларусь, мець зь ёй добрыя стасункі. Таму што гэта – адзіны калідор на Захад, які застаўся ў Расеі. Ёсьць яшчэ і другі напрамак – эканамічны. Калі

ўзяць той жа «Газпром», напрыклад, ён не займаецца палітыкай – ён займаецца эканомікай. І чым даражэйшую вырвеш у кожнай дзяржавы цану, тым для таго ж Мілера лепш. Таму пераважаюць два напрамкі. Але хоць эканамісты заціскаюць Рэспубліку Беларусь, верх пакуль бярэ палітычны пачатак.

### Анатоль Лябедзька

У Расеі няма стратэгіі да Беларусі. Узважанай, зразумелай стратэгіі – няма. Масква, як і Брусэль, да прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі аказалася непадрыхтаванай. Таму для Расеі ідэальным вынікам гэтай кампаніі быў статус-кво, калі нічога не мяняецца. Яны не падрыхтаваныя, каб быць актыўным гульцом на палітычным полі Беларусі, таму яны імкнуліся захаваць гэтую сытуацыю, але з адной дабаўкай: Лукашэнка застаўся каля ўлады, але застаўся як зганьбаваны фальсыфікацыямі. Таму сам Лукашэнка змушаны шукаць легітымізацыі ня толькі ўнутры краіны (што прыярытэтна!), але і дзесьці за межамі. Дзе? Вось у Расеі. Ён прыходзіць туды слабы: усе ведаюць, што былі фальшаваньні, што ён ня выйграў выбараў. Гэтую слабасьць Расея можа выкарыстоўваць, каб вырашаць свае пытаньні: эканамічныя і палітычныя.

Я прагназую, што зараз адбудзецца зьмена ў Маскве (як і ў Брусэлі). Масква пачне рабіць інвэстыцыі ў палітычную інфраструктуру. Яна пачне ствараць палітычныя суб'екты, якія будуць арыентавацца на Расею, і пачне вырошчваць свайго беларускага януковіча. Як толькі гэта будзе зроблена, Масква пачне дзейнічаць актыўна, прагматычна і даволі жорстка. Тут ёсьць плюсы і мінусы.

Плюс у тым, што гэта новая якасьць. Новая якасьць азначае, што Лукашэнка тады мусіць адкрываць два франты: Першы і Другі Беларускія – на ўсход і на захад. Яму гэта будзе значна больш складана: рэсурсы распыляцца.

Мінус у тым, што ёсьць вялікая верагоднасьць, што Масква зможа «прадавіць» кандыдата з падтрымкай тых палітычных сілаў, якія вельмі моцна арыентаваныя на Расею.

## Васіль Лявонаў

Палітыка Расеі ў дачыненьні да Беларусі недальнабачная, памылковая.

## Алег Манаеў

Выказваючыся навуковай мовай, ацэньваю гэтую палітыку як неадэкватную, гэта значыць, неадпаведную рэальнасьці. Канкрэтна гэтая неадэкватнасьць праяўляецца ў тым, што, асабліва пасьля нядаўніх «каляровых рэвалюцыяў», Расея ўсімі сіламі спрабуе не наладзіць узаемавыгаднае супрацоўніцтва з новымі кіраўнікамі і элітамі, а вярнуць свой уплыў у гэтых краінах, падтрымліваючы адыёзных кіраўнікоў і кансэрватыўныя эліты. Тым самым палітыка Расеі аб'ектыўна ўступае ў супярэчнасьць з нацыянальнымі інтарэсамі суседзяў. Як бы ні ставіцца да гэтых новых кіраўнікоў і элітаў, відавочна, што нацыянальны інтэрас любой краіны скіраваны ў будучыню, а не ў мінуўшчыну. Пуцін публічна заявіў, што Расея прывыкла мець стасункі з тымі элітамі ў суседніх і іншых краінах, якія знаходзяцца пры ўладзе. Гэтым ён тлумачыў падтрымку Акаева, Лукашэнкі, Кучмы... Гэта і ёсьць неадэкватнай палітыкай. Што значыць «прывыкла»? Калі так рабілі твае папярэднікі і Расея ад гэтага мела больш мінусаў, чым плюсаў (а каляпс СССР таму сьведчаньнем), дык мяняй гэтую палітыку – ці мала што было раней! Але Расея, на жаль, гэтага ня робіць, у чым мы пераканаліся на прыкладзе апошніх прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Яшчэ ў канцы 2005 году былі нейкія надзеі, спрэчкі, дыскусіі, заснаваныя на папярэдніх стасунках беларускіх контрэліт з расейскімі партнэрамі. Але цяпер відавочна, што расейскае кіраўніцтва вырашыла захаваць свой уплыў у Беларусі, падтрымліваючы палітычны статус-кво. Не бяруся меркаваць, наколькі гэта адпавядае нацыянальным інтарэсам Расеі (думаю, што не), але нашым нацыянальным інтарэсам гэта дакладна не адпавядае. Колькі часу гэта будзе працягвацца, ня ведаю. Некаторыя зрухі адбываюцца (напрыклад, апошняя газавая калізія). Але ці значыць гэта, што палітыка Расеі адносна Беларусі робіцца больш адэкватнай? Калі б мы бачылі, што гэтыя крокі робяцца для таго, каб палітыка беларускага кіраўніцтва зрабілася больш дэмакратычнай, паважлівай да правоў сваіх грамадзянаў,

больш адкрытай да знадворнага сьвету і г. д., – можна было б сьцьвярджаць, што палітыка Расеі робіцца больш адэкватнай. Але мы бачым, што гэтыя крокі маюць перад сабой зусім іншыя мэты.

## Аляксандар Мілінкевіч

Лічу, што Расея, імкнучыся вырашыць свае геапалітычныя інтарэсы коштам дзесяцімільённага народу, робіць вялізную памылку. Гэта беспэрспэктыўная палітыка, стратэгія аднаго дня. Расейскае кіраўніцтва, прызнаючы вынікі сфальсыфікаваных выбараў, прызнаючы нелегітымнага прэзыдэнта, настройвае супраць сябе мноства людзей. І перш за ўсё маладых, якія ў будучыні будуць кіраваць Беларусьсю, і зь якімі Расеі выбудоўваць дачыненьні. Мы са свайго боку заўсёды кажам маскоўскім палітычным элітам, што ў стратэгічным інтарэсе Расеі – дэмакратычная Беларусь. Я б назваў нашае стаўленьне да Расеі прагматычным. Расея – суседняя дзяржава, зь якой мы маем намер будаваць адкрытыя, узаемавыгадныя, прыязныя стасункі, падмуркам якіх ёсьць, перш за ўсё, эканоміка і дабрабыт грамадзянаў, а не палітычная каньюнктура.

## Анатоль Міхайлаў

Палітыка Расеі на постсавецкай прасторы ў цяперашні час пазбаўленая пачуцьця рэалізму. Зьдзіўляе, што нават ажыцьцяўленьне таго, што магло б быць абазначана як адстойваньне нацыянальных інтарэсаў, аказваецца, як правіла, контрапрадуктыўным.

## Алесь Міхалевіч

Я яе ацэньваю як такую пазыцыю: Беларусь зьяўляецца васалам Расеі. Мы зьяўляемся краінай, якая дэ-факта ў асноўных пытаньнях кіруецца з боку Расеі.

## Тацяна Процька

У Расеі цяпер няма ніякай доўгатэрміновай прадуманай зьнешняй палітыкі ў дачыненьні ні да якіх краінаў. Усё вельмі спарадычна. У самой Расеі ідуць працэсы, і няведама, якая яна будзе. З аднаго боку, яна – з Амэрыкай. З другога боку, яна пачынае гульні з Кітаем. З трэцяга боку, умацоўвае дачыненьні з Эўразьвязам. Усё гэта адбіваецца і на адносінах зь Беларусьсю.

Але Расеі важна мець з намі сяброўскія стасункі. Па-першае, мы эўрапейская краіна, мы ўваходзім у эўрапейскія арганізацыі. Калі ты хочаш там нешта правесьці, то даражыш кожным голасам. Па-другое, мы транзытная краіна. Расея разумее нашую геапалітычную значнасьць для сваёй палітыкі.

І, канечне, адзіная мова, адзінае савецкае мінулае. Апошняе найбольш значна. У Расеі шмат людзей, у тым ліку і палітыкаў, якія мараць узнавіць савецкую сыстэму, выправіўшы яе «недахопы». А ў Беларусі гэта ўжо робіцца. З усіх краінаў былога СССР Беларусь была і застаецца найбольш савецкай. Была такая палітыка камуністаў – зрабіць буфэрную ўзорную краіну для Захаду, дзе дэманстраваліся б савецкія каштоўнасьці, новая супольнасьць «савецкі народ»... Пад іншымі словамі цяпер гэтая мадэль зноў пачынае сваё жыцьцё.

Па-трэцяе, пасьля вайны ў Беларусі асела значная частка расеянаў. Гэта таксама вымушае кіраўніцтва Расеі мець да нас цікавасьць. Ёсьць і іншыя сувязі.

Расея сёньня – казырная карта і ўва ўнутрыпалітычных беларускіх гульнях. І дэмакратычная апазыцыя, і кіраўніцтва краіны шукаюць там фінансавай падтрымкі. Расейскія грошы ў палітыцы сёньня найбольш прывабныя.

Нельга не згадаць і эканамічныя стасункі Расеі і Беларусі.

## Андрэй Саньнікаў

Я ня бачу пакуль што сур'ёзнай і станоўчай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі. Таму што існуе такая, я б сказаў, упартая падтрымка дыктатуры (мы гэта і пры Ельцыну бачылі, і цяпер пры Пуціну), усіх тых працэсаў, якія прывялі ў Беларусі да дыктатуры і таталітарызму. Нягледзячы ні на што, Расея ніякіх памылак не заўважае. Расея не стварае сяброў на будучыню. Кіраўніцтва Расеі, як заўсёды,

клапоціцца пра вобраз моцнай дзяржавы, сусьветнага гульца. Можа, і нельга чакаць, што Расея будзе паводзіць сябе іначай. Але ж тры-чатыры, нават пяць гадоў таму, калі невядома было, якую палітыку будзе праводзіць Пуцін, там гучэлі і абмяркоўваліся ідэі: калі мы хочам быць дэмакратычнай дзяржавай, то чаму мы не падтрымліваем дэмакратычныя працэсы ў суседзяў? Нельга сілай стварыць сяброў! Я думаю, усё ж такі большасьць беларусаў не з такой ужо прыхільнасьцю ставіцца да Расеі, як гэта падаецца і ў расейскіх, і ў нашых афіцыйных мэдыях. Відавочна, што калі б была іншая палітыка, можна было б размаўляць і пра тое, што ёсьць нейкі выбар між Эўразьвязам і пэўнымі адносінамі з Расеяй (не саюзам!). А цяпер я катэгарычна кажу: наша гісторыя нас навучыла, што такі драматычны выбар у нас у будучыні не стаіць.

### Уладзімер Улаховіч

Палітыку Расеі ў дачыненьні да Беларусі расцэньваю як традыцыйную.

### Валеры Фралоў

Мне яна ня вельмі зразумелая з пункту гледжаньня здаровага сэнсу. Зь нейкіх каньюнктурных меркаваньнях яна, у прынцыпе, зразумелая. Імкненьне Расеі захаваць прастору, на якой яна мела б уплыў і якая выходзіць за рамкі яе тэрыторыі, натуральнае. Недзе ўплывае эканамічная каньюнктура, «труба».

Але стратэгічна мне незразумелая гэтая палітыка. Расея пакуль падтрымлівае Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку, хоць ён ужо зрабіўся бервяном на шляху манэўру Расеі. Нейкія пытаньні на нейкіх этапах вырашаюцца, але каб мы існавалі як два брацкія народы, у саюзе на ўзор Эўрасаюзу – ну ніяк не дапамагае!

Я ня ўтойваю, я палітык прарасейскай арыентацыі. Мы тут для нацыяналістаў ворагі нейкія, яны лічаць, што мы здаем Беларусь. Ды мы яе ніяк ня хочам здаваць! Проста мы, я думаю, шырэй глядзім на жыцьцё. А расейцы ўжо нас лічаць нацыяналістамі. Прарасейская, цьвярозая, канструктыўная апазыцыя аказалася вельмі мала запатрабаваная.

У Расеі, дзе я быў перад Новым годам, зрухі ўжо ідуць. Там ёсьць Эўрапейскі форум, на які з краінаў былога Савецкага Саюзу зьбіраюцца дзьвесьце-трыста чалавек. Фонд эфэктыўнай палітыкі Глеба Паўлоўскага запрашае канструктыўных палітыкаў з, скажам так, прарасейскім ухілам. Вось я быў на чарговым гэтым форуме перад Новым годам, там тады было ня трыста, а чалавек шэсьцьдзесят – каб сумесна сустрэць Новы год. Я быў там, Казулін... Пасьля размовы з Мадэстам Колеравым (ёсьць там такі начальнік упраўленьня па справах СНД) у мяне зьявілася жаданьне плюнуць на ўсё і паехаць дамоў, у Менск. Потым мы пагутарылі з Какошыным, Глебам Паўлоўскім – яны зьмякчылі сытуацыю, але я паехаў адтуль вельмі сумны і расхваляваны.

Я ж перажываю ня толькі за Беларусь. Я перажываю і за Расею, таму што ў нас з Расеяй шмат што ўзаемазьвязана. Мы аказаліся там мала каму патрэбнымі. Тут, у Беларусі, на палітычнае поле, на якім дзейнічае наша традыцыйная апазыцыя, яна імкнецца нас не пусьціць. Заўважце, да ўсіх тых ініцыятываў, якія мы прапаноўвалі, калі былі дэпутатамі (зьмяненьні ў Выбарчы кодэкс, кантрактная сыстэма), яны ставіліся вельмі асьцярожна. Калі нашая ініцыятыва, а яны падтрымалі – значыць, мы падняліся на ўзровень, мы ў аўтарытэце, а яны тады хто? Ішла (і цяпер ідзе) ціхая міжусобная вайна паміж асноўнымі часткамі нашай апазыцыі, і нас яны не пускаюць на сваю паляну. Таму недзе і прыклейваюць ярлыкі: «Яны здадуць Беларусь! Яны матчынай мовы ня ведаюць», – ці яшчэ што-небудзь такое.

Калі мы галадалі ў мяне ў кватэры, там было шмат прадстаўнікоў АГП і быў Віктар Івашкевіч, намесьнік старшыні БНФ. Часам увечары рабіць няма чаго – вось мы сядзем зь ім на бальконе і пачынаем высьвятляць погляды партыі, спрачацца пра нешта. Я гавару Івашкевічу: «У мяне адчуваньне Беларусі нашмат большае, чым у нашых лібэралаў. Таму што я вырас тут, таму што мяне выхоўвала мая беларуская бабуля, якая была непісьменная, і мая цётка, якая скончыла чатыры клясы». Вядома, нешта ў мяне і расейскае налажылася: бацька ў мяне – расеец, а маці – беларуска. Я шмат у Расеі служыў, мне і Расея дарагая. Вядома, тут нейкая пэўная раздвоенасьць прысутнічае.

Нас хочуць падзяліць: «Ага, раз ты за Беларусь – значыць, ты супраць Расеі. Раз ты за Расею – значыць, ты будзеш беларусаў душыць». Ды глупства гэта!

Эўрасаюз аб’яднаўся, а мы ўсё дзелімся, хто з нас большы дэмакрат, хто якімі прынцыпамі кіруецца, хто каго хоча паглынуць і іншае.

### Станіслаў Шушкевіч

Як імпэрскую. Я падзяліў бы толькі... Я люблю расейскіх людзей. І ў мяне такое ўражаньне, што беларусаў амаль усе на сьвеце любяць. І расейцы – вельмі любяць. Але расейскае кіраўніцтва заўсёды было ворагам. Расейская ўлада, колькі яе ні было, была ворагам і рускай культуры, і іншай нацыянальнай культуры. Заўсёды дзеячы рускай культуры: ад Пушкіна, Талстоя, Чэхава і да Салжаніцына – выступалі супраць улады. Я ня ведаю, адкуль знаходзяцца такія кіраўнікі, у якіх сумленьне адступае на другі плян. Возьмем сёньняшні дзень. Умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Беларусі – звычайная зьява. Ансамбль Чарнамырдзін–Строеў–Селязьнёў прыехаў да нас у 1996 г. Цяпер прыехаў Грызлоў: ён бачыў дакумэнты, што апазыцыя рыхтуе тут фальсыфікацыі. Я ня ведаю такога кіраўніцтва ў іншай краіне, якое б страціла цалкам пачуцьцё сораму! Такое кіраўніцтва ёсьць толькі ў Расеі.

Яшчэ раз скажу: мой любімы пісьменьнік – рускі. Можна многа гаварыць пра рускіх кампазытараў, вынаходцаў... Але што да ўлады... Неяк не шанцуе на прыстойную ўладу Расеі. Нам не шанцуе таксама, але гэта, я думаю, хвароба, якая ідзе адтуль.

У мяне расейскія прывычкі, расейская бязладнасьць, я люблю расейцаў. Не люблю расейскае кіраўніцтва, бо яно неінтэлігентнае. Для мяне інтэлігент – той адукаваны чалавек, які верны пэўным прынцыпам. Якія прынцыпы могуць быць у Жырыноўскага, у Грызлова альбо ў Рушайлы? Ніякіх! І ў пэўным сэнсе Пуцін пацьвярджае, што ў яго ніякіх прынцыпаў. Я дэталёва вывучаў пуцінскі артыкул «На рубяжы тысячагодзьдзяў», апублікаваны ў пачатку 2000 г. З гэтага ягонага артыкулу можна было пайсьці куды хочаш, ён усіх павінен быў задаволіць: там і дзяржаўнасьць, і што толькі ні хочаце. А дзяржаўнасьць – гэта вялікадзяржаўнасьць, імпэрскасьць і г. д. Каб такая краіна існавала толькі дзякуючы нафтадалярам – проста сорам!

## Усевалад Янчэўскі

У Расеі папулярны Лукашэнка, папулярны наш шлях. У расейскіх СМІ пра Беларусь цяпер гавораць мала: за Пуціным пра Беларусь практычна перасталі гаварыць. Але «народны тэлеграф», самая надзейная крыніца інфармацыі, працягвае дзейнічаць. У некага тут жывуць сваякі, нехта прыяжджае ў камандзіроўкі... Людзі бачаць, як жывуць беларусы. І адсюль – павага да Лукашэнкі.

Між тым, у сяго-таго ў Крамлі стаўленьне да Беларусі дзіўнае – няшчырае і дурнавата-паблажлівае.

Некаторыя расейскія палітыкі хочуць рабіць выгляд, што ім досыць паварушыць пальцам – і ў Беларусі ўсё імгненна зьменіцца. Але нават калі яны пачнуць варушыць усімі пальцамі на руках і нагах, у Беларусі ад гэтага ня зьменіцца ні-чо-га! Многія ў Расеі, здаецца, ужо зразумелі, але яшчэ не жадаюць прызнаваць гэтага факту. Хоць пасьля ўкраінскага правалу 2004 году ім гэта зразумець неабходна.

Расеі пашанцавала, што прэзыдэнтам Беларусі выбраны Лукашэнка. Толькі сумленнасьці нашага прэзыдэнта Масква абавязана тым, што ў яе яшчэ ёсьць саюзьнікі на заходнім напрамку.

Беларусь ужо дала Расеі ўсё, што магла. І ня варта патрабаваць ад нас нечага большага, таму што гэта будзе супярэчыць нашым уласным інтарэсам. Мы ня зможам даць больш нічога.

Расеі ня варта адштурхоўваць свайго адзінага саюзьніка ці імкнуцца трымаць яго ў пярэднім пакоі. Расея ўжо не імпэрыя. І маскоўскім палітыкам (калі сярод іх нехта думае пра краіну) замест нейкіх наіўных гульняў у «энэргетычную звышдзяржаву» варта было б зразумець, што нафта і газ – гэта два дэманы Расеі. Яны яе загубяць гэтак жа, як некалі загубілі СССР...

# 8. Як вы ацэньваеце палітыку іншых суседніх дзяржаваў, за выняткам Расеі, у дачыненьні да Беларусі?

### Вольга Абрамава

Што да суседзяў, я сфармулюю свой погляд вельмі жорстка. Літва, Польшча, Украіна праводзяць палітыку, якая ў доўгатэрміновым пляне не адпавядае іх нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам. І калі прыбраць палітычныя і ідэалягічныя напластаваньні, і каньюнктурныя выбары, і прыярытэты палітычнай эліты, то я ня думаю, што такім быў бы выбар большасьці народу, калі б пытаньне пра стаўленьне да Беларусі было вынесена на агульнанацыянальны рэфэрэндум у кожнай з гэтых краінаў. Я думаю, вынік быў бы іншы, чым тая лінія, якую праводзіць сёньняшняя палітычная эліта названых краінаў.

### Сьвятлана Алексіевіч

Мне цяжка гаварыць пра палітыку, таму што гэтыя пытаньні мяне практычна не цікавяць. Мне больш цікавы гістарычны, культурны, мэнтальны ці нават псыхалягічны ланцужок.

У Маскве ў мяне нядаўна была прэзэнтацыя кнігі «Чарнобыльская малітва». І сярод тых, хто прыйшоў, былі трое расейцаў, якія крычалі: «Нам бы вашага Лукашэнку!» Гэта людзі, якія прайгралі ў працэсе расейскіх рэформаў. Для іх сучасная Беларусь – гэта астравок сацыялізму. Але такіх я сустракаю нячаста. Часьцей мне даводзіцца чуць: «Ну што ж вы, беларусы? Як вы дазволілі, каб з вамі

так абышліся? Дзе ж ваша інтэлігенцыя і пісьменьнікі?» – і ў гэтых дакорах гучыць такая нотка, быццам да нас зьвяртаюцца як да дзяцей, а не да дарослых.

Псыхалёгія ахвяры, псыхалёгія чаканьня дапамогі, характэрная для нашай апазыцыі, ідзе ад пачуцьця ўласнага бясьсільля. Раней мы чакалі дапамогі ад Захаду, потым – ад Расеі, цяпер – глядзім на нашых найбліжэйшых суседзяў. Але нельга чакаць дапамогі ад кагосьці. Пакуль мы самі ня вырашым сваіх задачаў – іх за нас ня вырашыць ніхто. І нашы найбліжэйшыя суседзі для нас могуць толькі паказаць прыклад, і ня больш.

### Яўген Бабосаў

Сучасны ўрад Польшчы (ня людзі! Я з палякамі вельмі сябрую) – правага кірунку (хоць Квасьнеўскі быў, мабыць, ня лепшы). Ён праводзіць недружалюбную палітыку ў дачыненьні да Беларусі. І гэта ўскладняе стасункі паміж нашымі людзьмі. Тут вінаватыя не палякі, а сучаснае кіраўніцтва Польшчы.

Што да Літвы – там прыкладна тое самае. Там кіраўніцтва моцна арыентаванае на Захад і неяк слаба арыентавана на Ўсход. Думаю, што гэта часовая зьява: ім няма куды падзецца, і жыць трэба ў міры зь Беларусьсю. І ўсялякія гэтыя штукі наконт захаваньня атамных адкідаў на мяжы зь Беларусьсю, усялякія манэўры ваенныя – нічога з гэтага ня будзе. У эканамічным сэнсе Беларусь мацнейшая і за Літву, і за Латвію, і за Эстонію (і трохі слабейшая за Польшчу). У эканамічным сэнсе яны нічога ня зробяць. З пункту гледжаньня ваеннага процістаяньня, нашы вайскоўцы (я ведаю, паколькі быў старшынём камісіі па ваеннай рэформе) падрыхтаваныя, у выпадку чаго, лепш, чым нашы суседзі. Таму і тут нічога ня выйдзе! Што да культуры – мы таксама нічым не саступаем. Таму ім нам проціпаставіць проста няма чаго, апроч нейкіх патугаў, якія ідуць не на дабро. Таму я думаю, што «Гітлеры прыходзяць і сыходзяць, а народ германскі застаецца» (хоць і ня модна спасылацца на Сталіна). Сыходзяць адамкусы і ўсялякія іншыя, а літоўскі народ застанецца і будзе сябраваць зь беларускім народам – яму няма куды падзецца. Проста няма куды падзецца! І палякі – тое самае, нікуды ня дзенуцца.

Наконт Украіны – усё вельмі складана. Справа ў тым, што вельмі актыўна Ючшанка нацэлены на ўваходжаньне ў НАТО – гэта, вядома, ускладняе сытуа-

цыю, таму што Беларусь не зьбіраецца ў НАТО ўступаць. Украінцы цяпер жывуць горш, чым мы, у сэнсе зарплаты і ўсяго астатняга. Горш! Таму я думаю, што яны нікуды ня дзенуцца. Ім падзецца няма куды – яны будуць у саюзе з Расеяй і Беларусьсю. Нікуды ня дзенуцца! Можа, празь пяць гадоў, калі сыдзе Юшчанка, прыйдзе нехта іншы... Ёсьць тэндэнцыі разьвіцьця краінаў (не дзяржаваў! Гэта розныя рэчы) да таго, што саюз усходніх славянаў павінен узмацняцца. Да гэтага ўсе перадумовы існуюць. А да таго, каб іх разьяднаць, перадумоваў мала, апроч геапалітычных памкненьняў некаторых лідэраў, якім цяпер падпарадкоўваецца Юшчанка і той жа Саакашвілі.

## Анжаліка Борыс

Палітыку суседніх дзяржаваў ацэньваю як рэакцыю на агрэсіўную палітыку самой Беларусі. І як занепакоенасьць тым, што краіна ў цэнтры Эўропы, праводзячы палітыку самаізаляцыі, зьяўляецца патэнцыяльна дэстабілізоўным фактарам для суседзяў.

## Генадзь Бураўкін

Думаю, што ўплыў ёсьць, але, на жаль, дзяржаўна не такі прыкметны, як расейскі. Тут трэба зразумець, што ў Расеі – вельмі вялікай і багатай краіны – ёсьць такія рычагі ўзьдзеяньня, як нафта, газ, вытворчыя сувязі. Я ўжо не кажу пра культурныя ўплывы, калі ў нас з самага раньняга дзяцінства нашы дзеці перш ведаюць Пушкіна, Някрасава, а пасьля толькі Купалу, Коласа, Багдановіча. Таму ўплыў, канечне, перш за ўсё ідзе з боку Расеі. Дзяржава гэты ўплыў ня толькі падтрымлівае, а ўсяляк яму спрыяе.

Уплыў жа з боку суседзяў (перш за ўсё я маю на ўвазе Ўкраіну і Польшчу, а пасьля ўжо Літву), бясспрэчна, ёсьць. Але ён не такі прыкметны, не такі дзяржаўна фармаваны. Але ён ёсьць, бо тыя ж падзеі, якія нядаўна адбываліся ўва Ўкраіне, не маглі не абмяркоўвацца ў нашым беларускім грамадзтве. Таго, што робіцца ў Польшчы, мы ня можам не заўважаць. Уплывы ёсьць, але ўся афіцыйная дзяржаўная прапаганда (перш за ўсё тэлебачаньне) скіраваная на тое, каб прынізіць

усё добрае. І ўва Ўкраіне складаная сытуацыя, і ў Польшчы няпростая, усякага там хапае. Дык вось тое, што там дрэннае, у нас вельмі шырока паказваюць, а тое, што добрае – замоўчваецца. Хаця апошнім часам мы ўжо і Расею не шкадуем таксама. Тое, што добрае ёсьць ува Ўкраіне і Польшчы і што можна было б выкарыстаць у нас у Беларусі, яно або зусім замоўчваецца, або прыніжаецца. Таму, канечне, уплыў адчуваецца, калі мы жывем па суседзтве; цяперашніх магчымасьцях знаёмства, пры тэлебачаньні, радыё, Інтэрнэце – гэта бясьсьледна не праходзіць. Але дзяржава вельмі стараецца гэта ўсё адсочваць, прасейваць і выдаваць. А ў сілу характару беларусы прывыклі давяраць уладзе. Гэта, у адрозьненьне ад некаторых суседзяў, якія прывыклі зусім не давяраць уладзе – можа, і дарма! Лепш уладзе давяраць з разборам. А нашы беларусы прывыклі давяраць уладзе. І калі тэлебачаньне дае масіраваную інфармацыю пра тое, як жахліва жывуць украінцы, як жахліва жывуць палякі, гэта запамінаецца, застаецца ў памяці. Таму ўплыў у гэтым сэнсе своеасаблівы, але ён ёсьць.

Паглядзіце, што робіцца перад выбарамі. У Беларусь паехалі расейскія палітыкі ня лепшага ўзору. Прыехаў Лужкоў. Што, яму дома няма чаго рабіць? Ён прыехаў з канкрэтнай падтрымкай аднаго кандыдата. З боку Ўкраіны ці Польшчы такога няма.

Мы папракаем іншых у двайных стандартах, але паглядзіце, хто да нас прыяжджае з Украіны – апазыцыянэры ўкраінскія: Пятро Сіманенка (кіраўнік Камуністычнай партыі Ўкраіны), агалцелая Вітрэнка. А афіцыйных прадстаўнікоў украінскай улады, якіх выбраў народ (і гэта прызнаў увесь сьвет), няма. Мы быццам бы сьвядома, дэманстратыўна ідзем на канфрантацыю. Таму, адпаведна, чый уплыў нашыя чыноўнікі будуць прызнаваць ці вітаць? Уплыў Расеі! Чыйго ўплыву баяцца? Уплыву Ўкраіны, уплыву Польшчы. Хаця гэта складанае пытаньне, бо палітыка заўсёды была вельмі неадназначнай справай. Ёсьць пастаянны і адназначны ўплыў Расеі і вельмі нязначны ўплыў іншых суседзяў.

## Алесь Бяляцкі

Можна сказаць, што цяпер адбыўся прагрэс у дачыненьні да Літвы, Латвіі й Польшчы: пасьля таго як яны ўступілі ў Эўразьвяз, яны ўрэшце ўбачылі, што ў іх на ўсходзе ёсьць нейкая краіна. Бо раней было такое адчуваньне, што ўсе іхныя палітыкі, усе палітолягі, усё грамадзтва, адгарадзіўшыся ад усходу, будавалі свае кантакты з Эўразьвязам, з Амэрыкай, спрабуючы выканаць як мага хутчэй свае галоўныя задачы – уступіць у НАТО, у Эўразьвяз, дасягнуць усіх стандартаў, якіх патрабавалі ад іх. У мяне такое адчуваньне, што пасьля таго, як гэта было зроблена, яны ўрэшце расслабіліся і азірнуліся. І вось тут яны ўбачылі, што ёсьць яшчэ нейкая краіна ля іхных межаў, якая патрабуе ўвагі, таму што ад гэтага залежыць стабільнасьць ужо ўсяго рэгіёну. І гэтага патрабуе ад іх, урэшце, уся эўрапейская супольнасьць. Так, як ад Францыі патрабуе, каб яна мела добрыя дачыненьні зь якім-небудзь Альжырам, так і ад гэтых краінаў яны патрабуюць, каб яны паглядзелі, што там робіцца «з другога боку» Эўразьвязу. Такім чынам, рэзка ўзмацнілася іх увага да нашых праблемаў. Для нас гэта вельмі добра, улічваючы, што яны прысутныя ўва ўсіх эўрапейскіх структурах на сёньняшні дзень, што іх разуменьне сытуацыі ў Беларусі (праблемаў дэмакратыі) у прынцыпе супадае з нашым разуменьнем – гэта звычайны сярэднеэўрапейскі стандарт, нічога іншага звыш таго яны не вымагаюць. Такім чынам, на сёньняшні дзень гэта палітыка вельмі спрыяльная. Зьявілася сапраўдная зацікаўленасьць, а ня толькі добрыя словы, раней гэта ўсё канчалася на добрых словах і недзе там і завісала.

Што тычыцца Ўкраіны. З аднаго боку, вельмі добра, што наш рэжым страціў саюзьніцкі рэжым, які быў перад гэтым, – рэжым Кучмы. Адназначна, гэта былі саюзьніцкія рэжымы, яны падтрымлівалі адзін аднаго ва ўсіх міжнародных структурах, ва ўсіх сваіх праектах. Гэта было відавочна, асабліва на міжнародных сэсіях і выступах – у АБСЭ, ці ў структурах СНД, ці нават у Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў, дзе Ўкраіна зьяўлялася і зьяўляецца сябрам Камітэту па правах чалавека. Вельмі цікава: пазалетась яны галасавалі супраць прыняцьця рэзалюцыі пра парушэньні правоў чалавека ў Беларусі, летась яны прагаласавалі за, таму што зьмянілася сытуацыя ва Ўкраіне. Для нас гэта ёсьць пасіўным спрыяньнем. На жаль, актыўнага няма, і для мяне гэта трохі крыўдна. На сёньняшні дзень Украіна,

якая вызвалілася з кучмаўскай багны і ўрэшце больш-менш выразна вызначыла для сябе стратэгічныя дэмакратычныя шляхі разьвіцьця, яна павінна была б, як чалавек, які вылазіць зь нейкай небясьпекі ці з агню, падаць руку таму, хто там сьледам. Ёсьць такая магчымасьць на сёньняшні дзень ува Ўкраіны: гэта ня ёсьць краіна, якая знаходзіцца ў стане вайны, ці ў эканамічным крызісе, ці яшчэ ў чорт ведае якіх праблемах. Яна дастаткова ўпэўнена трымаецца на сёньняшні дзень на нагах і рэальна мала чым дапамагае Беларусі.

Гэта тое самае, што было раней з тымі ж Польшчай, Літвой і Латвіяй, дзе цяпер усё зьмянілася. На сёньняшні дзень ад Украіны мы, канечне, хацелі б чакаць больш выразных крокаў, і больш рашучых захадаў, і рэальнай дапамогі дэмакратыі ў Беларусі. А то яны кажуць пра эканамічныя стасункі. А куды дзенецца Лукашэнка пры эканамічных стасунках? На сёньняшні дзень пазыцыя Эўрапейскага Зьвязу дастаткова выразная наконт парушэньня правоў чалавека ў Беларусі. І што, Лукашэнка зьменшыў гандаль? Наадварот – гандаль з Эўразьвязам павялічваецца, нікуды яны ня могуць падзецца ў гэтай сытуацыі. Тое самае і з Украінай. Трэба менш баяцца, менш трэсьціся за свой эканамічны інтарэс: гэты інтарэс нікуды ня дзенецца, калі будуць нейкія прынцыпы і больш-менш пасьлядоўная палітыка.

### Аляксандар Вайтовіч

Палітыку суседніх краінаў, у асноўным, лічу адэкватнай існай у Беларусі сытуацыі.

### Андрэй Вардамацкі

Іх палітыка мае больш доўгатэрміновы стратэгічны палітычны прагноз, чым расейская.

## Вінцук Вячорка

У асноўным пазытыўна. У палітыцы суседніх дзяржаваў, паколькі яны ёсьць дэмакратычнымі дзяржавамі, выяўляецца той патэнцыял салідарнасьці, якім валодаюць іхныя грамадзтвы.

У вялікай ступені дзякуючы новым сябрам ЭЗ, нашым блізкім і далейшым суседзям, зьмянілася, а лепш сказаць – зьявілася палітыка Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі. Ёсьць нават канкурэнцыя паміж імі за тое, хто вядзе беларускае пытаньне ў ЭЗ. Тут нам, дэмакратычным сілам, дарэчы, ня варта станавіцца марыянэткамі таго ці іншага суседа. Як і крыўдаваць на іх за спробы кіраваць намі ня варта: у кожнага ж свае інтарэсы, старыя страхі, праекцыі будучыні.

У суседніх з намі эўразьвязаўскіх краінах ёсьць супярэчнасьці паміж каштоўнасьцямі (на якіх будаваўся ЭЗ і якія падзяляюць нашыя суседзі як эўрапейцы) і прагматычным інтарэсам ад гандлю зь немаленькім суседам. Дадайма сюды захаваныя ўплывы былых элітаў (партыя, камсамол, спэцслужбы), якія ператварыліся ў эліты бізнэсовыя й някепска каардынуюцца на посткамуністычнай прасторы.

Украіна мае марныя, на маю думку, спадзевы стаць «пасярэдніцаю» між Лукашэнкавым рэжымам і Брусэлем. Тлумачыцца гэта тым, каб не адна Масква мела тут уплывы на рэжым. Але Ўкраіна тут ня першая, нічога з гэтага ня будзе.

## Павал Данейка

Мне цяжка гаварыць. Літва, па-мойму, зьдзяйсьняе нейкія дастаткова асэнсаваныя і доўгатэрміновыя дзеяньні па фармаваньні палітыкі ў адносінах да Беларусі. І гэта досыць відавочна.

Ва Ўкраіны пакуль што такога відавочнага фармаваньня беларускай палітыкі я ня бачу. І ў Польшчы – таксама. Там ёсьць выяўленьне агульных эўрапейскіх пазыцыяў і плюс нармальны элемэнт добрасуседзтва: калі ёсьць супольная граніца, дык трэба будаваць нейкія стасункі. Але ў маім разуменьні палітыка – гэта доўгатэрміновыя мэты, бачаньне таго, што будзе праз 10–12 гадоў. Па-мойму, апроч літоўцаў, ні ў кога такіх канцэпцыяў няма.

## Андрэй Дынько

Палітыка Ўкраіны ў дачыненьні да Беларусі толькі фармуецца, бо Ўкраіна доўгі час была ў пераходным стане: яна вагалася паміж эўрапейскай і эўразійскай супольнасьцямі і была занятая ўнутранымі праблемамі. Яе палітычныя эліты былі занятыя ўзбагачэньнем і не фармулявалі доўгатэрміновых інтарэсаў Украіны. Мне падаецца, што яна будзе канчаткова сфармуляваная толькі ў наступныя гады, калі Ўкраіна далучыцца да эўрапейскіх структураў і НАТО. Але ўжо цяпер відавочна, што шараговыя ўкраінцы і палітычныя эліты Кіева ставяцца да Беларусі зь вялікай сымпатыяй, як да краіны-сястры. Яны лічаць, што Беларусь павінна быць прывілеяваным партнэрам Украіны. У гэтым сэнсе характэрна, што ўкраінская дыпляматыя адмаўляецца ўводзіць супраць Беларусі тыя палітычныя санкцыі, якія былі ўведзеныя Эўразьвязам і падтрыманыя многімі іншымі дзяржавам, бо лічыць, што менавіта Ўкраіна павінна быць тым каналам, па якім беларускі ўрад мог бы камунікаваць з сусьветнай супольнасьцю. Над беларуска-ўкраінскім адносінамі цяжэе даўняя праблема недэмаркаванай мяжы, але краіны лучыць супольны гістарычны досьвед і, у пэўным сэнсе, наяўнасьць украінскамоўнага насельніцтва на поўдні Беларусі, якое ўяўляе сабой вельмі сьвядомых грамадзянаў Беларусі, з моцнай беларускай ідэнтычнасьцю, але якія маюць пэўны сантымэнт да Ўкраіны і крэўныя повязі зь ёй. Наяўнасьць гэтай вялікай групы людзей, соцень тысяч людзей, таксама будзе заўсёды дадаткова зьвязваць нашы краіны.

Польшча зарэкамэндавала сябе як краіна, якая разглядае ўмацаваньне незалежнасьці Беларусі, умацаваньне грамадзянскай супольнасьці тут і станаўленьне дэмакратыі як сваю нацыянальную задачу. І для гэтага яна многа робіць. Фактычна, сёньняшняя польская дыпляматыя рэалізуе тыя прынцыпы, якія былі сфармуляваныя Ежы Гедройцем і колам парыскай «Kultury» ў дачыненьні да УЛБ – Украіны, Літвы, Беларусі, прычым Польшча прэтэндуе на добрае разуменьне беларускай сытуацыі. У Польшчы, у адрозьненьне, скажам, ад Украіны ці Расеі, ёсьць моцныя асяродкі беларускіх дасьледаваньняў. Адносіны Беларусі і Польшчы ўскладненыя на сёньня, але на будучыню, я думаю, яны будуць палягчацца і інтэнсыфікавацца. Спрыяць ім будзе і наяўнасьць у Беларусі вялікай колькасьці

этнічных палякаў – добра арганізаванай і, у пэўным сэнсе, самай актыўнай нацыянальнай меншасьці ў Беларусі. А зь іншага боку, наяўнасьць досыць істотнай і актыўнай групы беларусаў у Польшчы.

У асяродку беларускіх палітычных элітаў, дарэчы, дагэтуль застаецца актуальнай і па-свойму папулярнай ідэя адбудовы свайго роду Рэчы Паспалітай на тэрыторыі паміж Балтыйскім і Чорным марамі.

Беларуская грамадзянская супольнасьць была ўражаная актыўнасьцю Літвы на беларускім кірунку. Літоўская дыпляматыя нават прэтэндуе на лідэрства ў кантактах Эўропы на беларускім кірунку. Літоўскае пасольства – адно з самых вялікіх дыпляматычных прадстаўніцтваў у Менску. Мы назіралі, як паслу Літвы ў Беларусі Вайтэкунасу было прапанавана заняць пасаду міністра замежных справаў – гэта паказвае на значнасьць гэтай пасады. Таксама трэба адзначыць, што Вільня нават больш, чым Варшава, стала базай для беларускай апазыцыі. Гэта, напэўна, ня будзе ніколі забыта беларускай грамадзянскай супольнасьцю. Яшчэ дзесяць-пятнаццаць гадоў таму нам даводзілася сутыкацца ў кантактах зь літоўскай інтэлігенцыяй з такой позай гонару: маўляў, Беларусь страціць незалежнасьць – ну і добра, бо яна ня будзе прэтэндаваць на нашу спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Такая была эгаістычная пазыцыя. Але ёй кіраваліся нават многія акадэмікі і высокапастаўленыя асобы. Цяпер мы назіраем, як аднаўляюцца традыцыі салідарнасьці без прэтэнзіі на нейкую выключнасьць у правах на гэтую спадчыну.

Латвія трошкі менш актыўная ў палітычным пляне, затое эканамічныя кантакты Беларусі з Латвіяй досыць істотныя: яны адбываюцца на розных узроўнях.

### Сьвятлана Калінкіна

Палітыка ў гэтых краінаў вельмі няроўная. Польшча да нядаўняга часу ўвогуле займала найбольш канфармісцкую пазыцыю: маўляў, добрасуседзтва, трэба беларускае кіраўніцтва неяк перавыхоўваць, тлумачыць, запрашаць, размаўляць. І толькі з канца мінулага году ў іх больш жорсткая, больш адназначная палітыка.

Гэта краіны, скажам так, з маладымі дэмакратыямі. Я і ня думала б наагул, што яны будуць вызначаць палітыку Эўропы ў дачыненьні да Беларусі.

### Сяргей Калякін

Гэта самыя зацікаўленыя намі ў Эўропе краіны. Таму што ў іх ёсьць вельмі сур'ёзныя і канкрэтныя праблемы і інтарэсы, якія яны хацелі б рашаць у Беларусі. Не хачу пакрыўдзіць, але ў Гішпаніі ці Партугаліі значна менш інтарэсаў у Беларусі. Тым самым сёньня нашыя ўзаемаадносіны зь Літвой, Латвіяй, Польшчай больш дынамічныя ў тым, што тычыць іх дзеяньняў у Эўрапейскім Саюзе: яны матор беларускага пытаньня ў Эўрасаюзе, таму што для іх гэта жыцьцёва важна. І для дэмакратычных сілаў Беларусі вельмі важная гэтая іх актыўная пазыцыя.

Аднак пры гэтым я б не перабольшваў іх магчымасьцяў: свае праблемы беларусам давядзецца вырашаць самім. Але такія памочнікі, якія ўзмацняюць міжнародны ціск і ўплыў на тое, што адбываецца ў Беларусі, – гэта добра. Я б пазытыўна ацаніў іх ролю.

### Кася Камоцкая

Як і ў Расеі, я б ацаніла: падтрымка дыктатуры. Яны купляюць у нас нафту і радасна павіскваюць!

У Польшчы настрой, канечне, ёсьць: польскі народ увогуле вельмі любіць салідарызавацца. І там гэта шчыра адчуваецца. І польскі народ вельмі схільны да свабоды. Не да незалежнасьці нават, а менавіта да свабоды.

Літва, мне падаецца, нічога, апроч заклікаў, ня робіць. Яна засмучаная, бо хацела б, скажам так, лідэрстваваць у падтрымцы Беларусі. А нічога рэальна яна ня робіць. У іх дзьве траціны – мяжа зь Беларусьсю, таму ім выгадна гандляваць з намі.

Украіна... Я думаю, яна б старалася, але ў іх столькі сваіх праблемаў, што ім не да Беларусі. Асабліва цяпер.

Таму рэальна, па настроі, я бачу, што падтрымлівае толькі Польшча. Ім гэта баліць. А астатнія...

Калі б яны перасталі купляць беларускую нафту – гэта быў бы «наш адказ Чэмбэрлену». А так – трындзець можна што заўгодна. Нашым чыноўнікам ня

трэба езьдзіць у Эўропу, яны і на Дняпры пасядзяць, як гэты сказаў... Канечне, санкцыі ўдараць найперш па народзе! А што ж вы думалі?! Хай народ і выбера правільнага прэзыдэнта! Нічога ня зробіцца, пакуль народ не зазнае пакутаў. Што ж яны хочуць? Тым больш – якія санкцыі? Санкцыі толькі адны: вось гэта не купляць, бо яно дае самыя вялікія грошы. Хоча – хай сядзіць са сваім газам і нафтай!

### Сяргей Касьцян

Народы Прыбалтыкі разумеюць, што далей існаваць, як цяпер, яны ня змогуць. Прыбалтыка атрымала вялікі росквіт у складзе Савецкага Саюзу. А цяпер гэтыя так званыя «незалежныя краіны» сталі калёніямі Злучаных Штатаў Амэрыкі. Палітыкі, якія ўзначальваюць гэтыя рэспублікі, не зьяўляюцца палітыкамі нацыянальнымі. Адамкус – гэта фашыст, які прыехаў з ЗША. І ён зноў туды ўцячэ, бо народ Літвы яму не даруе развалу. Яны яго проста павесяць! Тое ж самая гэтая Віке-Фрэйбэрга, якая таксама прыехала з Амэрыкі і якая таксама туды ўцячэ. Яны развалілі рэспублікі, развалілі эканоміку. Моладзь вымушаная зьяжджаць, бо ня можа дома атрымаць адукацыі для душы і для працы. Троху іншая сытуацыя ў Эстоніі, дзе Руйтэль. Ну, але Эстонія – сямсот тысячаў чалавек. Яна заўжды вымушаная быць калёніяй, пагэтаму там праводзяць палітыку трошку больш спакойна.

Яны ж сваёй самастойнай палітыкі не праводзяць – ні палякі, ні літоўцы, ні латышы. Яны праводзяць тую палітыку, якую ім дыктуюць з Вашынгтону або з Брусэлю.

А Ўкраіна яшчэ ўвогуле нічога не праводзіць. Няхай яна яшчэ разьбярэцца, што і куды яна будзе праводзіць і хто там будзе. Тое, што Юшчанка вылеціць як корак з-пад шампанскага – гэта вядома ўжо. Ён ненадоўга, і я аб гэтым сказаў на тэлебачаньні, калі ў іх атрымаўся разлад зь Юляй Цімашэнкай. Няма ў яго фундамэнту, ён сілавым мэтадам прыйшоў да ўлады, а ня быў законна абраным прэзыдэнтам. Таму і ня можа ён існаваць доўга на пасадзе прэзыдэнта.

### Вячаслаў Кебіч

Вельмі складана ацаніць абстаноўку ва Ўкраіне. Там абстаноўка настолькі няясная, што нават самыя вялікія палітолягі і тое ўжо баяцца даваць прагнозы пра будучыню Ўкраіны. Як толькі будзе сфармаваны ўрад, ва Ўкраіне будзе гранічна ясна, у якім напрамку яна будзе разьвівацца.

### Анатоль Лябедзька

Што датычыць краінаў – сяброў Эўрапейскага Зьвязу, то гэта, безумоўна, паравоз, які цягне ўвесь састаў беларускага пытаньня. Мы назіралі дзясяткі разоў, калі Літва і Польшча выяўляліся як найбольш актыўныя гульцы. Я з павагай стаўлюся да такой палітыкі. Літва мае шэраг неўрэгуляваных пытаньняў зь Беларусьсю – і мяжа, і рэадмісія, і г. д. Тым ня менш, яны паказваюць узор стратэгічнай палітыкі, скіраванай, можа, не на сёньняшні дзень, а на пэрспэктыву. Безумоўна, гэта пазытыў!

Думаю, і Варшава мае вялікую палітычную зацікаўленасьць, і мы назіраем там кансэнсус практычна ўсіх палітычных сілаў у беларускім пытаньні, за выключэньнем невялікіх групаў, якія ўсё ж ёсьць у парлямэнце.

Украіна... Украіна надзвычай важная для Беларусі, як і мы для яе актуальныя. Найперш гэта нядаўнія падзеі ўва Ўкраіне. Гэта падзеі ў Югаславіі, Грузіі былі для нашых людзей неяк далекавата, таму іх гэта ня тычылася. А тут праз плот глянуў – бачыш, што гэта сусед. І таму посьпех Украіны – гэта ўмацаваньне пазыцыяў прыхільнікаў эўрапейскага выбару, прыхільнікаў пераменаў у Беларусі. Паразы, праблемы – гэта ўсё адбіваецца бумэрангам на нас.

Што такое Ўкраіна? Яна стварыла альтэрнатыву на постсавецкай прасторы. Да гэтага часу лічылася, што на ўсходзе трэба закрываць эўрапейскую мяжу. Ну, не Бэрлінскі мур там будаваць, але ўсё ж – пытаньне пашырэньня на ўсход закрытае, займацца трэба ўнутры, тымі, каго ўключылі ў Эўрапейскі Зьвяз. А на ўсходзе – беспэрспэктыўна, там нічога не адбудзецца. Украіна разбурыла гэты стэрэатып, які пачаўся складвацца. Сілы Грузіі ці Малдовы невялікія: яны ня могуць стварыць альтэрнатыўнага выбару на постсавецкай прасторы.

А Ўкраіна – можа! І кааліцыя дэмакратычнага выбару, якая складваецца, – гэта новая цікавая сытуацыя на постсавецкай прасторы. І гэта адкрывае шанец перад усімі намі на тое, што трэба сюды ўвага, што тут ёсьць мажлівасьць рэалізаваць сьвядомы дэмакратычны выбар, які робяць шэраг краінаў.

### Васіль Лявонаў

Палітыка, дружалюбная да беларускага народу, але не да кіроўнага рэжыму.

### Алег Манаеў

Калі гаварыць коратка і проста, дык палітыка іншых суседніх дзяржаваў, у адрозьненьне ад палітыкі Расеі, больш адэкватная. Асабліва гэта датычыць балтыйскіх краінаў – Літвы і Латвіі. Гэтая адэкватнасьць праяўляецца ў тым, што, з аднаго боку, кіраўнікі і эліты гэтых краінаў не разарвалі, не замарозілі цалкам стасункаў з кіраўніцтвам Беларусі – пра гэта гаворыць рост тавараабароту, трансгранічнае супрацоўніцтва і г. д. З другога боку, ідзе актыўнае ўзаемадзеяньне зь беларускімі контрэлітамі – дэмакратычнымі сіламі, грамадзянскай супольнасьцю, нацыянальнымі і рэлігійнымі суполкамі і да т. п. Вось гэта я і называю адэкватнай палітыкай.

### Аляксандар Мілінкевіч

Адзначыў бы аднадушша Польшчы, Літвы, Латвіі, асабліва дзьвюх першых, у ацэнцы і ўспрыняцьці сытуацыі ў Беларусі. Лічу надзвычай важнай салідарнасьць гэтых краінаў з дэмакратычнымі сіламі Беларусі, асабліва калі казаць пра адстойваньне інтарэсаў беларускай дэмакратыі ў эўрапейскіх структурах, падтрымку рэпрэсаваных студэнтаў, сустрэчах на самым высокім узроўні, спрыяньне ўзьнікненьню незалежных мас-мэдыяў, праўдзівае асьвятленьне падзеяў у Беларусі.

Цяжэй з Украінай. Яна спрабуе сёньня гуляць ролю моста паміж Эўропай і Менскам. Аднак так не атрымаецца, мы ўжо гэта праходзілі, гэта безвыніковая стратэгія. Але нам вельмі важна падтрымка той Украіны, якая лічыць сябе дэмакратычнай і прайшла праз падобныя нашым выпрабаваньні.

### Тацяна Працька

Амаль усе нашыя суседзі ўжо ў Эўразьвязе, яны афіцыйна прынялі новую сыстэму каштоўнасьцяў. А Беларусь – і ня там, і ня там. Таму да нас ставяцца насьцярожана. Тым болей, што кіраўніцтва Беларусі адкрыта ў сваім палітычным жыцьці грэбуе сыстэмай эўрапейскіх каштоўнасьцяў. Гэта, у пэўным сэнсе, адштурхоўвае Беларусь-дзяржаву ад шчыльнага супрацоўніцтва з краінамі-суседзямі. Эканамічныя стасункі, аднак, разьвіваюцца пасьпяхова.

На сёньняшні дзень у Беларусі вельмі цікавая палітычная роля: наша краіна ўзмацняе ўва ўсіх краінах былога СССР настальгічныя матывы. Калі мы ўспамінаем сябе ў маладосьці, усё здаецца добрым. Мы забываем, што балячкі былі на вуснах і нешта дрэннае было. Усё дрэннае ў мінулым адыходзіць. Вось і цяпер: людзі ўспамінаюць савецкае мінулае як нейкі прыгожы крышталь. А тут якраз і беларускае кіраўніцтва з прасавецкай ідэалёгіяй.

Мы быццам бы сваю сыстэму каштоўнасьцяў прапануем. І падкрэсьліваем, што гэта добра. А Ўкраіна на нас глядзіць, і іншыя краіны глядзяць: моцная ўлада, нібыта, дае плён для людзей, усе задаволеныя і шчасьлівыя, сацыяльнага пратэсту няма.

Таму нашае значэньне ў адносінах зь іншымі краінамі двухсэнсоўнае. З аднаго боку, мы ўяўляем сабой мінулае. З другога боку, на сёньняшні дзень за намі назіраюць: ці ня ёсьць мы прыкладам?

### Андрэй Саньнікаў

Палітыку суседніх дзяржаваў ацэньваю ня вельмі станоўча. Мы бачылі, што і ў Літве, і ў Польшчы афіцыйныя асобы выказваліся наконт таго, што папярэдняе кіраўніцтва рабіла прыярытэтам палітыкі супрацоўніцтва з Лукашэнкам.

Я дакладна ведаю, што Польшча, Літва, Латвія выкарыстоўвалі тое, што ў нас адбываецца, для больш пасьпяховага прысьпешваньня свайго сяброўства ў Эўразьвязе. Было відавочна, што Лукашэнка стварыў выдатны фон. Але незразумела, чаму гэта працягвалася і пасьля далучэньня. Чаму сёньня, напрыклад, у сытуацыі, калі ў нас масавыя арышты, міністар замежных справаў Літвы Валёніс кажа, што нельга ўводзіць санкцыі супраць Беларусі? А як інакш? Калі згадаць не такую ўжо далёкую гісторыю: калі б ня ўводзілі санкцыі супраць польскіх уладаў падчас «Салідарнасьці», то я ня ведаю, што б адбывалася цяпер у Польшчы. Калі салідарнасьцёўцаў саджалі ў турмы, сьвет рэагаваў вельмі жорстка. І таргаваліся вельмі жорстка: калі вы выканаеце тое, тады можна казаць пра гэта. Тое ж самае было, калі ў ГДР узмацняліся рэпрэсіі. Вілі Брант праводзіў палітыку добрасуседзтва, але ж ён таксама выкарыстоўваў фактар таго, што падтрымлівае з Хонэкерам пэўныя сувязі, каб дапамагчы людзям, якія цярпелі ад таго рэжыму. Гэтага зь Беларусьсю цяпер не адбываецца.

Пэўны час да пашырэньня Эўразьвязу была пэўная манаполія Польшчы як экспэрта ў беларускіх справах. Я не лічу, што гэта добра. Не хацеў бы нікога абражаць у Польшчы, але манаполія – заўсёды дрэнна. Пасьля пашырэньня Эўразьвязу намі пачалі цікавіцца іншыя краіны, якія не мяжуюць з намі, – і гэта станоўчы вынік. Але пакуль што гэта не ператварылася ў сур’ёзны стратэгічны падыход да Беларусі. Мы больш дасягнулі праз кампанію салідарнасьці зь Беларусьсю. Кіраўніцтва Польшчы, Літвы, Латвіі, Чэхіі, Славакіі ня можа не заўважыць людзей, якія кожны месяц 16-га патрабуюць свабоды для Беларусі, свабоды для палітвязьняў. Я спадзяюся, што праз грамадзянскую супольнасьць, праз масмэдыі, якія на нашым баку, мы здолеем паўплываць на палітыку і Эўразьвязу як арганізацыі, і асобных краінаў.

Украіна сёньня перажывае складаны пэрыяд. Безумоўна, мы ўсе былі ў захапленьні ад рэвалюцыі, сёньня мы ўсе бачым гэтыя складанасьці. Часткова яны аб’ектыўныя, ёсьць і суб’ектыўныя. Пакуль што ўва Ўкраіны таксама няма палітыкі ў дачыненьні да Беларусі, яна сябе яшчэ няўпэўнена адчувае. Але былі нейкія крокі, якія дэманстравалі, што ўкраінская роля можа быць больш важкай. Факт, што Ўкраіна падтрымала рэзалюцыю Камісіі ААН па правах чалавека ў 2005 годзе, нэгатыўную для беларускага рэжыму. Украінская дзяржава зрабіла

гэта ўпершыню! Потым пачаліся незразумелыя выказваньні, што «мы павінны будаваць адносіны і з гэтым рэжымам, шмат залежыць ад гандлёва-эканамічных стасункаў...». Хацелася б бачыць больш прынцыповае стаўленьне Ўкраіны да сытуацыі ў Беларусі, таму што гэта, відавочна, будзе вельмі моцная падтрымка. Я б не сказаў, што яе можна будзе параўнаць з уплывам Расеі на Беларусь, але ў дадатак да Эўразьвязу яна можа стварыць пэўны балянс.

### Уладзімер Улаховіч

Палітыку суседніх дзяржаваў ацэньваю таксама як традыцыйную, хоць і ў новых, больш адэкватных, больш прымальных формах.

### Валеры Фралоў

Думаю, што і ў прыбалтаў, і ў палякаў, і ва ўкраінцаў сваіх праблемаў вышэй даху. Вельмі многа! Напэўна, у першую чаргу іх цікавяць свае праблемы. Мне здаецца, праблемы Беларусі іх цікавяць у той ступені, у якой мы на іх можам адмоўна ўплываць. Здорава мы на іх паўплываць ня можам, таму мы іх асабліва і не цікавім. Можа, у нейкай ступені цікавіць Беларусь літоўцаў і палякаў – ня просты народ, а менавіта палітыкаў, якія там існуюць. Іх цікавіць Беларусь, таму што свае інтарэсы Заходняя Эўропа і Злучаныя Штаты спрабуюць рэалізаваць праз гэтыя краіны. То бок гэта цікавіць пэўных палітыкаў.

Можа, Беларусь цікавіць яшчэ з пункту гледжаньня, каб мець тут прадказальную ўладу, якая кіравалася б такімі ж прынцыпамі, як і яны, каб яны не чакалі нейкага падвоху. Вось Адамкус сказаў, што Беларусь хоча напасьці на Літву, – гэта нейкі амэрыканскі падыход (ён жа ўсё-такі амэрыканец, шчыра кажучы)... Каб у іх нават думкі не ўзьнікала, што мы ім можам нейкую гадасьць учыніць! Каб тут была разумная транзытная краіна, са сваімі традыцыямі, зь нейкімі сваімі асаблівасьцямі.

Іх цікавіць, каб мы былі разумнымі і кіраваліся тымі самымі жыцьцёвымі нормамі і прынцыпамі, якімі карыстаюцца яны. На жаль, у нас цяпер трохі іншыя прынцыпы.

Эканамічныя стасункі яны разьвіваюць, таму што ім гэта выгадна. Мабыць, гэта правільны прынцып: калі табе выгадна зь некім супрацоўнічаць, то складзіце намаганьні, каб атрымаць узаемную выгаду, – і на здароўе!

Літва больш блізкая да Беларусі. Я там служыў, быў і ў Латвіі. Нешта нас усё-такі з таго даўняга часу трошкі зьвязвае. Пасьля выхаду з СССР Латвія і Эстонія больш жорстка вырашалі праблемы, зьвязаныя з расейцамі, а ў Літве нашмат мякчэй усё было. Ну, у Літве і прасьцей, таму што ў іх усё-такі 80% літоўцаў жыве. Вядома, у латышоў і эстонцаў, дзе расейцаў і расейскамоўных было даволі шмат, былі праблемы захаваньня сваёй нацыі.

## Станіслаў Шушкевіч

Вы мне задаяцё такое пытаньне, на якое мне хочацца адказаць так, як Талстой адказаў на пытаньне пра кароткі зьмест *Вайны і міру*: я карацей не магу.

З Украінай праблем няма: у нас беды аднолькавыя, толькі ўкраінцы сьпяваюць лепш за нас і беляць свае мазанкі лепей за беларусаў. Мы гаспадарым, можа, лепей за іх на зямлі. Але яны цешацца нашым посьпехам, і мы – іхнім. Тут няма праблемаў, бо мы аднолькава пакрыўджаныя многа разоў былі.

Цяпер што да палякаў. Я часамі працую ў Польшчы і вельмі ўдзячны гэтай краіне і таму, што ў ёй адбылося. Але калі я ў 1974 г. працаваў у Ягелёнскім унівэрсытэце і пачынаў гаварыць пра Беларусь, мне – «крэсы всходне»: гэта значыць, іх усходнія рэгіёны, якія ў іх забралі. Вось так яны разумелі Беларусь. І многа часу спатрэбілася, каб яны ўсьвядомілі, што гэта ня так. Сёньня большасьць усьведамляе – дарэчы, дзякуючы апошнім 15–16 гадам нашага існаваньня. І мне здаецца, так як Польшча сама стала на шлях дэмакратыі, у іх і стаўленьне да нас стала нармальным, дэмакратычным. Яны хацелі б мець тут дэмакратычную дзяржаву. Тая недасьведчанасьць, якая была ня ў простых людзей – заўважце! – а ў прафэсуры Ягелёнскага ўнівэрсытэту ў Кракаве, сярод якой я працаваў, была ад неўсьведамленьня таго, што ў нас агульная гісторыя, што мы мелі агульную фэдэратыўную дзяржаву. Што Вялікае Княства Літоўскае спачатку было беларускай дзяржавай, а пасьля супольнай дзяржавай двух народаў. Савецкі час і расейскае панаваньне ў Польшчы прытупілі гэтае разуменьне. Я сёньня гляджу

на Польшчу як на краіну, якая лепей за ўсіх разумее, што адбываецца ў Беларусі, і больш за ўсіх хоча нам дапамагчы, у межах сваіх магчымасьцяў – дапамагае.

Мы павінны ўладкоўваць сваё жыцьцё самі і браць найлепшыя ўзоры: ёсьць што браць і ў Расеі, у Літве, Польшчы, Латвіі і Ўкраіне. Але 95% павінна быць уласнага.

## Усевалад Янчэўскі

Палітыку суседніх дзяржаваў расцэньваю як сьмешную. Польшча, Літва, Латвія крычаць: бі Лукашэнку, даеш дэмакратыю! Але палітычныя санкцыі і фінансавая дапамога апазыцыі рэальнай шкоды Беларусі не нанясуць.

Шкоду (значную, але не сьмяротную) маглі б нанесьці толькі эканамічныя санкцыі. Але самае сьмешнае, што калі б такое пытаньне раптам паўстала, то і Польшча, і Літва, і Латвія грудзьмі леглі б, каб не дапусьціць такіх санкцыяў. У выніку іх увядзеньня гэтыя краіны панесьлі б страты значна большыя, чым Беларусь. У эканамічных сувязях зь Беларусьсю яны зацікаўленыя нават больш, чым Расея. І ў гэтых адносінах яны будуць першымі абаронцамі цяперашняй беларускай улады.

Тое самае можна сказаць і пра Эўропу. Калі вам не падабаецца рэжым, то перад тым, як спрабаваць зьмяніць яго, ацаніце свае рэсурсы. Калі вы ня можаце гэтага зрабіць, дык навошта спрабаваць? Калі ў вас ёсьць лішнія грошы, дык навошта аддаваць іх нашай апазыцыі? Аддалі б нашым чарнобыльцам. Ці ўвогуле – пакінулі б сабе, зэканомілі б. Навошта ставіць сябе ў недарэчнае становішча?

Хацеў бы сказаць пра «каляровыя рэвалюцыі». На Майдан у Кіеве выйшаў электарат, які ў нас галасаваў бы за Лукашэнку. На Майдан выйшлі людзі, каб выказаць нездаволенасьць карупцыяй, нізкім узроўнем жыцьця – усім тым, чаго ў Беларусі няма. Мне дзіўна чуць, калі гавораць, што ўсё гэта зрабілі амэрыканцы, на амэрыканскія грошы. На самай справе амэрыканцы проста «асядлалі момант». Людзі, якія перабольшваюць ролю Амэрыкі ў «каляровых рэвалюцыях», проста ліюць ваду на млын амэрыканскага агітпропу: яны пераконваюць усіх навокал ва ўсёмагутнасьці Амэрыкі. Такім чынам, яны самі працуюць на міт аб

амэрыканскай усёмагутнасьці. На Майдане былі ня купленыя людзі – там былі людзі, якія шчыра абурыліся сваім становішчам, кланамі, што правілі краінай. Але іх ашукалі!

Чаго патрабаваў Майдан? Сыходу карумпаванай, кланавай улады. Чаго патрабавалі грузіны на плошчы? Гарачай вады, цяпла, сьвятла ў дамах. Да адчаю іх давяла галеча.

Таму прыход да ўлады «аранжавых» і Саакашвілі – гэта ня змова ЦРУ, а вынік палітыкі Кучмы і Шэварднадзэ (дарэчы, зусім праамэрыканскіх дзеячаў). Гэта вынік «рыначных», псэўдалібэральных (называйце іх як хочаце) рэформаў. І кучмаўская Ўкраіна, і Грузія за Шэварднадзэ праводзілі ў сябе палітыку ПРАМА ПРОЦІЛЕГЛУЮ той, якую вёў у нас Лукашэнка. У выніку яны атрымалі майданы, а ў нас усё ціха і пасьпяхова.

І менавіта таму мітусьня амэрыканцаў у Кіеве і Тбілісі дала эфэкт, а ў Менску выйшаў пшык.

# 9. Як вы ацэньваеце палітыку Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі?

### Вольга Абрамава

А ў Эўрасаюзе ўвогуле не разумеюць, што адбываецца ў Беларусі. Проста не разумеюць! Палітыка Эўрасаюзу ў дачыненьні да Беларусі фармуецца не ў Эўрасаюзе – яна фармуецца тут, той часткай палітычнай апазыцыі, якая даўно ўжо заняла пэўную палітычную нішу і ператварыла палітыку ў бізнэс. У цэлым, гэтая частка апазыцыі не зацікаўленая (наперакор гучным словам, шумавым эфэктам, палітычным заявам), каб сытуацыя ў Беларусі мянялася ў напрамку дэмакратызацыі, у напрамку складваньня тут паўнавартага рынку, у напрамку зьняцьця ізаляцыі зь Беларусі з мэтай наладжваньня паўнацэнных кантактаў з заходнім сьветам. Яна ў гэтым не зацікаўленая, таму што ёй выгодна і камфортна існаваць. Але гэта датычыць толькі вярхоў, і нават ня ўсіх лідэраў апазыцыі, таму што я магла б прыводзіць і іншыя прыклады.

Беларусь – краіна маленькая. Дакладна гэтак жа ў любым рамястве – ці журналісцкім, ці аналітычным – усе мы выдатна ведаем, хто майстар, а хто чаляднік. Дакладна гэтак жа мы ўсе выдатна ведаем, хто чым дыхае ў Беларусі. Можна гаварыць любыя самыя прыгожыя словы пра любоў да краіны, любоў да дэмакратычных каштоўнасьцяў, але ня быць пры гэтым унутрана ні патрыётам, ні дэмакратам. І паводзіць сябе ў адпаведнасьці са сваім шкурным інтэрасам.

Таму я паўтараю. У Эўрасаюзе гэта эўравысакамернасьць, нежаданьне (як і з боку ЗША, да якіх я гэтак жа, як і да Эўрасаюзу, стаўлюся паважліва) абцяжарыць сябе тым, каб прапанаваць ва ўзаемадзеяньні дзеяздольную мадэль. Я ня раз казала публічна эўрапейскім партнэрам: «Хлопцы, а што ж вы, калі прад'яўляеце прэтэнзіі да Беларусі, паводзіце сябе вельмі дзіўна? Бо восьліку, каб ён бег наперад, трэба прапанаваць морквy. А вы намагаецеся ўвесь час біць нас палкай па сьпіне. А давайце паспрабуем па-іншаму. Прапануйце нам канкрэтныя, прагматычныя, важкія рэчы (я маю на ўвазе перш за ўсё з матэрыяльнага пункту гледжаньня). Беларусы – вельмі прагматычны народ: яны падумаюць-падумаюць, і калі тое, што вы прапануеце, сапраўды ня будзе дробнай падачкай... Я разумею, што на сёньня гэта нерэальна: спытайце ў эканамістаў, колькі спатрэбіцца для пераводу нашай эканомікі на рыначныя рэйкі. Але прапануйце хоць бы траншамі, часткамі! Вы можаце нас такім чынам завабіць у агульнаэўрапейскую прастору».

У мяне ёсьць вялікае падазрэньне, што нават беларускае кіраўніцтва ў выпадку, калі там чаго істотнага прапануюць (паколькі яны належаць да таго ж культурнага поля, што і ўсе мы паводле базавых каштоўнасьцяў, паводле глыбінных: прагматызм, уменьне ўзважваць жыцьцёвыя выгады), не адмовіцца ад гэтага варыянту. Зрабіце такім чынам! А біцьцё ніякага выніку не прыносіць. Яно толькі прыносіць закасьцяненьне, упартасьць ва ўяўленьнях аб уласнай рацыі, фармаваньне акопнай псыхалёгіі («мы абкружаны варожым сьветам»), кансалідацыю большасьці нацыі вакол гэтага ўяўленьня. Дзейнічаць паводле гэтага заганнага варыянту далей непэрспэктыўна. Пра санкцыі ў дачыненьні да Беларусі я заўсёды гаварыла, што яны контрападуктыўныя, а ў палітычным пляне наагул нясуць нэгатыўны эфэкт.

### Яўген Бабосаў

Калі мы гаворым пра дваістасьць расейскага стаўленьня да Беларусі, дык Эўрасаюз больш аднабаковы – у сэнсе непрызнаньня Беларусі. Але гэта, зноўтакі, не эканоміка, а палітыка! Нэгатыўнае стаўленьне да сучаснага кіраўніцтва Беларусі пераносіцца, на жаль, на народ Беларусі. Гэта робіць ня ўвесь Эўрасаюз,

а толькі некаторыя лідэры Эўрасаюзу – тыя, якія ўваходзяць у АБСЭ і г. д. Што да самога Эўрасаюзу, Эўрапарлямэнту, то запрашаюць туды апазыцыю – ну і Бог зь імі, няхай запрашаюць! Гэта іх справа.

Я думаю, што пэрспэктыва за тым, каго народ выбера. Каго народ выбера – гэта яго справа, каго выбіраць: ці аднаго, ці другога, ці пятнаццатага – няважна. Галоўнае (яшчэ раз паўтараю) заставацца самім сабой. І толькі калі мы будзем самі сабой, мы застанемся ў Эўропе. Як толькі мы пачнем некаму падпарадкоўвацца, перад некім поўзаць, нас проста затопчуць.

## Анжаліка Борыс

Палітыку Эўразьвязу ацэньваю як недастаткова пасьлядоўную, хоць апошнім часам, шмат у чым дзякуючы ўплыву Польшчы і іншых новых членаў ЭЗ, усьведамленьне праблемы Беларусі робіцца глыбейшым і шчырэйшым.

## Генадзь Бураўкін

Я і сёньня ня ўпэўнены, што палітыка Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі ёсьць. Можа, і ёсьць, але яна, на мой погляд, несур'ёзная. У мяне адчуваньне, што Эўразьвяз не разумее своеасаблівасьці таго, што адбываецца ў Беларусі. Эўразьвяз бярэ свае стандарты і стараецца ці іх прапагандаваць у Беларусі, ці іх прыкладаць да беларускай рэальнасьці. І таму мне сьмешна, калі я слухаю некаторых даволі высокіх эўразьвязаўскіх чыноўнікаў, якія пачынаюць нам прапагандаваць ідэі дэмакратызму, свабодных выбараў... Ідэі правільныя, але гэтыя чыноўнікі ня могуць зразумець, што ў Беларусі іх рэалізаваць, ажыцьцявіць немагчыма. Таму ў мяне такое адчуваньне, што кіраўніцтва Эўразьвязу (ува ўсякім разе, вышэйшы эшалён) да гэтага часу рэальнай сытуацыі ў Беларусі ня ведае і не разумее. Адсюль – быццам бы жаданьне дапамагчы дэмакратычным працэсам, якія ў нас ідуць, і ў той жа час абсалютнае няўменьне (ад няўліку рэальнасьці) зрабіць нейкія канкрэтныя крокі. То спазьняюцца, то наадварот, то не ідуць да канца, то ўвогуле робяць выгляд, што нічога не адбываецца. Таму, паўтараю, у мяне няма ўпэўненасьці, што ёсьць лінія, ёсьць палітыка ў дачыненьні да

Беларусі і што ў Эўразьвязе разумеюць вельмі няпростую сытуацыю (перш за ўсё – палітычную), якая склалася ў Беларусі.

Забаранілі ўезд чыноўнікам? Дык у іх ёсьць такое права, і яны ім пакарысталіся. Гэтым яны падкрэсьлілі сваё стаўленьне. Але я ня думаю, што гэта тыя рашэньні, якія могуць нешта сур'ёзна памяняць у Беларусі. Гэта больш маральныя рэчы, чым арганізацыйныя, палітычныя.

### Алесь Бяляцкі

Я шмат казаў пра суседнія з намі краіны – тут шмат што супадае, бо палітыка суседніх дзяржаваў шмат у чым адпавядае агульнай палітыцы і стратэгіі Эўразьвязу. Хаця, можа быць, варта паўтарыцца: нарэшце Эўразьвяз убачыў у Беларусі краіну-суседку, краіну, зь якой варта мець справы і спрабаваць вырашыць нешта.

Палітыка Эўразьвязу паляпшаецца. Не скажу, што яна стала лепшай на 100%, але тое, што моцныя зьмены да лепшага адбыліся за апошнія два гады, – гэта відавочна. І наша задача, каб Эўразьвяз разглядаў Беларусь як краіну, у якой ёсьць праблемы. Хай сабе і не як краіну Эўразьвязу (таму што гэта малаверагодна на сёньняшні дзень), але краіну, у якой ёсьць праблемы. А пасьля вырашэньня гэтых праблемаў – як краіну, якая можа далучыцца да Эўразьвязу. Гэта як людзі, якія жывуць у адной вёсцы, і ў адной хаце – непарадак, і суседзі могуць сабрацца і падумаць, чым памагчы, нейкую талаку зрабіць: выкінуць падгнілыя ніжнія вянцы, падкласьці новыя, усе разам – падперці гэтую хату... Каб яны глядзелі на Беларусь як на рэальны кавалак эўрапейскай прасторы, эўрапейскай супольнасьці, эўрапейскага поля. Нас вельмі шмат зьвязвае з эўрапейскай супольнасьцю, з тымі народамі, якія жывуць у Эўропе, – проста неверагодна шмат. Мы мала што сабе ўяўляем пра гэта. Адзін прыклад – жаночыя ўпрыгожаньні тысячагадовай даўніны. Вазьміце Нарвэгію і параўнайце зь беларускімі комплексамі – магчыма, ня ўсімі, але прынамсі на поўначы Беларусі, на Віцебшчыне. 80% ідэнтычнасьці! Гэта значыць, што ішоў інтэнсіўны гандаль, і настолькі актыўна людзі езьдзілі туды-сюды і вазілі жонак, і настолькі вялікі быў натуральны абмен паміж старажытнымі тагачаснымі дзяржавамі...

Нікому і ў галаву не магло прыйсьці, што на сёньняшні дзень гэта ўсё будзе парвана, адлучана і г. д. Я б не хацеў, каб так было.

### Аляксандар Вайтовіч

Лічу палітыку Эўразьвязу ў дачыненьні да Беларусі, у асноўным, адэкватнай сытуацыі.

### Андрэй Вардамацкі

Яна крайне непаваротлівая. Рашэньні прымаюцца вельмі марудна. Напрыклад, стварэньне незалежнага інфармацыйнага поля абвяшчаецца, але гэта зусім неэфэктыўна. Гэта справядліва ня толькі на ўзроўні мэдыйных рэйтынгаў тых сродкаў масавай інфармацыі, якія ствараюцца ў Эўропе (рэйтынгі мізэрныя!), але і на ўзроўні той ідэалёгіі, якая прапануецца. Насельніцтву прапануюць не аналіз падзеяў, якія адбываюцца тут, у Беларусі, а апісаньне таго, якім добрым і сьветлым, «белым і пухнатым» зьяўляецца Эўрасаюз. Беларуская інфармацыйная патрэбнасьць заключаецца ў жаданьні даведацца, што ж на самай справе адбываецца ўнутры Рэспублікі Беларусь, а не ў апісаньні таго, які «белы і пухнаты» Эўрасаюз. Ёсьць неадпаведнасьць паміж інфармацыйнай патрэбнасьцю беларускай аўдыторыі і прапанаванымі тэмамі, якія ідуць з боку Эўрасаюзу. «Птушка» адносна Беларусі ставіцца, але эфэктыўнасьць гэтай «птушкі» мізэрная. Фармат паперы, напісанай з нагоды мэдыя-вяшчаньня на Беларусь, большы за фізычнае пакрыцьцё гэтых станцыяў на тэрыторыі Беларусі.

### Вінцук Вячорка

Я ўжо казаў, што да нядаўна такой палітыкі наагул не было, а былі несыстэмныя, схематычныя, рэактыўныя паводзіны. Зрэшты, Беларусь як геапалітычны чыньнік аб’ектыўна займае невялікі працэнт увагі ЭЗ як цэласьці. Ёсьць Блізкі Ўсход, пост-югаслаўскія Балканы, для Францыі істотны Магрыб, ёсьць 50-мільённая Ўкраіна. Урэшце, ёсьць Расея.

Эўрапейскаму Зьвязу, якому скансалідаваныя рашэньні даюцца вельмі нялёгка, трэба было займець у сваім складзе групу краінаў, для якіх беларуская праблематыка істотная. Як толькі гэта (пашырэньне коштам нашых суседзяў) адбылося, пачалі зьяўляцца спробы сыстэматызаваць падыход да Беларусі. Г. зв. *two-fold approach* (двухскладнікавы падыход), у прынцыпе, калі яго ажыцьцяўляць пасьлядоўна, можа даваць пазытыўны вынік.

Першы складнік – карная ізаляцыя рэжыму, ягоных кіраўнікоў і найбольш зацятых слу́жак. Тут, пасьля шматлікіх вострых рэзалюцыяў Эўрапарлямэнту, на якія лукашэнкаўская ўлада зважала няшмат, пачаліся сапраўды эфэктыўныя крокі ў выглядзе пэрсанальных візавых абмежаваньняў: спачатку паводле г. зв. сьпісу Пургурыдэса быў забаронены ўезд у ЭЗ тым, хто можа мець дачыненьне да зьнікненьняў, а нядаўна ЭЗ ухваліў сьпіс з трох дзясяткаў імёнаў тых, хто кіраваў фальсыфікацыяй выбараў і рэпрэсіямі, для візавых абмежаваньняў (больш эфэктыўна) і замарожваньня рахункаў (менш дзейсна, бо яны іх у ЭЗ, хутчэй за ўсё, не трымаюць). Рэакцыя ўладаў паказвае, што сьпіс трэба пашыраць і папулярызаваць у Беларусі.

Што да эканамічных санкцыяў, то ЭЗ іх не ўхваляе, на маю думку, слушна.

Другі складнік – максымальная адкрытасьць задзіночанай Эўропы для беларускага грамадзтва й дапамога дэмакратычнай грамадзянскай супольнасьці. Палітыка – гэта ня толькі дэклярацыі, але канкрэтныя, падмацаваныя матэрыяльнымі рэсурсамі крокі. Тут ёсьць што рабіць і выпраўляць ужо зробленае. Доўга нам давялося пераконваць Эўракамісію, што праграма TACIS (тэхнічная дапамога краінам СНД) Эўразьвязу ў частцы дапамогі грамадзянскай супольнасьці ня толькі не карысная, а нават шкодная, бо паводле правілаў гэтае праграмы кожны выдатак мусіць узгадняцца з урадам краіны. Уявім, як лукашэнкаўскі ўрад ухваляе, скажам, праграму падтрымкі адной з праваабарончых арганізацыяў, якія ён адну за адной зачыняе.

Але палітыка ў дачыненьні да нас эўрапейскіх суседзяў і не-суседзяў найбольш залежыць ад нас. Толькі мы пачалі рэальна яднацца, вылучылі годнага веры лідэра, вырваліся за электаральнае ґета – тут жа пачаўся зусім іншы ровень падтрымкі: як вэрбальнай, так і практычнай. Калі будзем моцныя мы тут, у Беларусі, будзем эўрапейцамі дэ-факта – нікуды не падзенуцца: падтрымаюць і пры-

знаюць. Калі мы захаваем палітычную суб’ектнасьць аб’яднаных дэмакратычных сілаў, гэта будзе найлепшым доказам для Расеі нашае здольнасьці будаваць і абараняць беларускую незалежную дзяржаўнасьць.

## Павал Данейка

Думаю, ніякай палітыкі рэальна няма. Эўрасаюз у поўнай разгубленасьці, таму што Беларусь папросту вывальваецца з усяго таго, з чым ён мае справу на ўсіх сваіх межах. Яны проста абсалютна не разумеюць, што з гэтым рабіць. І не разумеюць ролі Беларусі ў рэгіёне. Не разумеюць той ідэалягічнай нагрузкі, якую нясе беларуская сытуацыя, і як разьвіцьцё сытуацыі ў Беларусі будзе ўплываць на зьмяненьне ў разьмеркаваньні сілаў і г. д. Для іх гэтая краіна проста не існуе! Яны лічаць, што разьвіцьцё падзеяў тут ніяк не ўплывае на разьвіцьцё рэгіёну.

Вядома, усе вучылі геаграфію, могуць паказаць Беларусь на карце. Але, памойму, нямецкае ўспрыманьне Беларусі, напрыклад, адсутнічае цалкам: яны лічаць, што гэта Расея. Я не абвінавачваю іх – гэта проста такое каштоўнаснае ўспрыманьне.

## Андрэй Дынько

У сакавіку гэтага году, падчас пратэстаў, якія суправаджалі выбары, я патрапіў на нейкі час у турму. Тая турма была пабудаваная за грошы праграмы TACIS. Гэта вельмі камфартабэльная турма – сардэчны дзякуй праграме TACIS і Эўразьвязу за яе пабудову! І я нават папрасіў бы, каб яны яшчэ некалькі такіх турмаў збудавалі ў Беларусі. Бадай, гэта была найлепшая інвэстыцыя праграмы TACIS, якую можна было прыдумаць.

Рэч у тым, што палітыка Эўразьвязу была вельмі супярэчлівай. Эўрапейцы вельмі доўгі час проста ня ведалі Беларусі, не разумелі яе: Беларусь не ўкладалася ў стэрэатыпы. Зь ёй спрабавалі кантактаваць у тых жа схемах, паводле якіх кантактавалі зь іншымі краінамі. Аказалася, што патрабаваліся нейкія зусім іншыя схемы.

Я магу гаварыць пра сваю сфэру – СМІ. Колькі я працую рэдактарам газэты «Наша Ніва», я чую з боку ЭЗ запэўніваньні, што будзе ісьці далейшая падтрымка незалежных СМІ ў Беларусі. І за гэты час не адчуў ніякай рэальнай падтрымкі. А праекты, якія ажыцьцяўляюцца, звычайна скіраваныя на падтрымку сродкаў масавай інфармацыі Эўразьвязу, а не беларускіх. Эўразьвяз мае права на гэта – я гэта прымаю. Але зь іншага боку, у беларускай сытуацыі, па-мойму, вельмі важна такое: калі доктар ня можа вылечыць, ён павінен кіравацца прынцыпам «Не не нашкодзь».

У доўгатэрміновым пляне самае галоўнае для Беларусі, каб эканамічныя, культурныя, палітычныя і проста чалавечыя сувязі з усімі краінамі Эўразьвязу пашыраліся. Думаю, што ўсялякія санкцыі, якія білі б па такіх сувязях, вельмі пашкодзілі б. Беларусі патрэбная не ізаляцыя, а наадварот. Пра ізаляцыю можна гаварыць толькі ў дачыненьні да вузкага кола людзей, якія цынічна і нахабна парушаюць эўрапейскія правілы, людзей, датычных да злачынстваў.

Але любое пашырэньне эканамічных кантактаў вядзе да адкрыцьця Беларусі. Калі ня сёньня – дык заўтра! Любое пашырэньне палітычных кантактаў зь беларускай грамадзянскай супольнасьцю вядзе да адкрыцьця Беларусі. Любое пашырэньне культурных кантактаў падтрымлівае свабоднае беларускае слова і зьмяняе атмасфэру тут. Найлепшае, што магло б быць, – гэта адкрыцьцё межаў. Я разумею, што пакуль што марыць пра гэта ідэалістычна. Але любыя палягчэньні візавага рэжыму адкрываюць Эўропу для беларусаў. Тое, што зрабіла цяпер Латвія, увядзеньне бясплатных візаў, – гэта цудоўна! Гэты крок акупіцца ёй стакроць у будучыні.

## Сьвятлана Калінкіна

Заўсёды адназначную палітыку ў дачыненьні да Беларусі займалі Злучаныя Штаты. А Эўропа – не!

Эўропа і для Беларусі, і асабіста для Лукашэнкі (паколькі ён кіруе краінай) – асноўны партнэр на самай справе. І калі раней мы казалі пра тое, што краіна ў асноўным гандлюе з Расеяй, то цяпер – не, усе ж такі менавіта з Эўропай. Эўропа на першым месцы. Тут вельмі складана! Я разумею і эўрапейскія краіны, заходнія

краіны. Вельмі шмат праблемаў у сучасным сьвеце. І ў гэтым сэнсе Беларусь, дзе няма канцэнтрацыйных лягераў, дзе каталікі не ваююць з праваслаўнымі, – гэта не такая ўжо «гарачая кропка», каб прымаць нейкія радыкальныя меры.

Але тут іншая небясьпека. На мой погляд, цяпер Эўропа пачынае ўжо разумець, што Беларусь ператвараецца ў такі рассаднік рэваншысцкіх сілаў на ўсёй тэрыторыі Эўропы: і югаслаўскіх, і ўкраінскіх, і расейскіх, і прыбалтыйскіх... Таму вельмі небясьпечна мець такую краіну, якая дапамагае гэтым сілам.

Дагэтуль палітыка Эўразьвязу была непасьлядоўная. Яе нельга было назваць палітыкай Эўразьвязу ў цэлым. Аднаго пункту гледжаньня, адной стратэгіі маглі прытрымлівацца, напрыклад, Францыя і Вялікабрытанія, а зусім іншай – Германія, Італія, Аўстрыя, напрыклад. Гэта тое, што мы назіралі літаральна да нядаўняга часу.

На цяперашні час гэта зьмянілася. Цяпер палітыка адназначная, больш вызначаная, больш катэгарычная. Але я так разумею, што ўсё ж такі Эўропа пакуль спадзяецца, што беларускае пытаньне вырашыцца нейкім чынам з дапамогай Расеі. І таму такія вось паўмеры прымаюцца ў дачыненьні да Беларусі. Добра, калі гэта так, калі з расейскім удзелам сапраўды ўдасца зьмяніць сытуацыю і ўдасца нашай краіне выйсьці на цывілізаваны шлях разьвіцьця. Але магчыма, што Беларусь прынясе ў Расею шмат свайго, а не наадварот.

### Сяргей Калякін

Гледзячы пра што мы гаворым. Вядома, Эўропа моцна зацікаўленая ў тым, каб вырашыць нарэшце праблему завяршэньня ўласнай цэльнасьці. Так, яна зацікаўленая ў тым, каб уключыць Беларусь у агульнаэўрапейскую сям’ю. Але ёсьць праблема! Праблема ў тым, што сёньня сытуацыя ў Беларусі вельмі моцна адрозьніваецца ад тых стандартаў, якія прынятыя ў аб’яднанай Эўропе. Таму Эўропа зацікаўленая ў тым, каб адбыліся пэўныя трансфармацыі. Яна спрабуе на гэта ўзьдзейнічаць палітычнымі мэтадамі – дарэчы, мэтадамі абсалютна законнымі: усё, што датычыць галіны правоў чалавека, не зьяўляецца сувэрэннай справай той ці іншай дзяржавы. З гэтай нагоды падпісаны адпаведныя міжнародныя канвэнцыі. І калі ў рамках гэтага ў АБСЭ ці ў Радзе Эўропы разглядаецца

пытаньне пра парушэньне правоў чалавека ў Беларусі – гэта нармальна: гэта інструмэнты, прызнаныя і ўжываныя ў сьвеце.

На жаль, у Эўропы пакуль бракуе мэханізмаў для таго, каб эфэктыўна ўплываць на сытуацыю ў Беларусі. Я б сказаў, што сёньня ўплыў Эўрапейскага Саюзу на тое, што адбываецца ў Беларусі, ня вельмі высокі. Пры высокай увазе зь іхняга боку! Проста ў іх адсутнічаюць эфэктыўныя інструмэнты.

Сапраўды, там ёсьць бюракратычная структура, але... Там 25 краінаў, і любое рашэньне Эўрасаюзу павінна быць ухвалена ўсімі 25 краінамі. Ёсьць Польшча, Літва, Латвія, Германія, Чэхія і іншыя, якія дынамічна прасоўваюць пытаньні па Беларусі. Але ёсьць краіны, для якіх гэта не зьяўляецца прыярытэтам. У Галяндыі, Партугаліі, Гішпаніі, напрыклад, ёсьць іншыя прыярытэты і іншыя праблемы, якія для іх жыцьцёва важныя. Для іх Беларусь зьяўляецца пытаньнем другасным. Таму яны ня бачаць неабходнасьці паскараць нейкія працэсы, ствараць нейкія інструмэнты ў дачыненьні да Беларусі. У Эўропе многія сёньня насілу знойдуць Беларусь на карце. Гэта нам здаецца, што мы цэнтар сьвету і аб'ект увагі, што нас усе хочуць заваяваць, заняволіць і г. д. Я вам скажу, што шмат у якіх краінах сьвету і палітыкі, якія кіруюць дзяржавамі, не заўсёды дакладна скажуць, дзе знаходзіцца Беларусь. Гэта значыць праблема і ў тым, што сёньня – як бы нам гэта ні было крыўдна! – Беларусь не зьяўляецца прыярытэтам нумар адзін у эўрапейскай палітыцы. Напрыклад, праблемы тэрарызму, ісламізацыі і ісламскага фундамэнталізму, Іраку і Ірану для Эўропы прыярытэтныя і больш важныя сёньня, чым праблемы Беларусі. Калі б для Эўропы гэта была праблема нумар адзін і прыярытэт нумар адзін, дык вырашэньне пайшло б хутчэй. Але мы не зьяўляемся праблемай нумар адзін і ў цэлым для Эўропы, і для многіх уплывовых краінаў. Для некаторых увогуле стасункі зь Беларусьсю зьяўляюцца тым інструмэнтам, праз які ажыцьцяўляецца ўзаемадзеяньне з Расеяй.

Нам часам так здаецца (і гэта нармальна!), што мы цэнтар сьвету і цэнтар увагі. Гэта гаворыць аб тым, што мы ўсьведамляем сябе як нацыя, як дзяржава. Але трэба рэальна глядзець на рэчы: сёньня мы не эпіцэнтар усіх сусьветных падзеяў і ня ключ да іх вырашэньня. Таму задача сёньня – у тым ліку мая і маіх калегаў па дэмакратычнай кааліцыі – у тым, каб праблемы Беларусі падняць на

больш высокі ўзровень. І мы гэта зрабілі, хоць магло б застацца ўсё па-ранейшаму: ну, ёсьць такая краіна ў Эўропе – па-за Эўропай, і няхай яны там жывуць, раз ня хочуць жыць па-іншаму; ёсьць важнейшыя праблемы, якія трэба рашыць, а потым можна заняцца праблемамі Беларусі. Такое стаўленьне таксама ёсьць! І вельмі добра, што нашы найбліжэйшыя суседзі не даюць зьнікнуць Беларусі ўвогуле з парадку дня.

### Кася Камоцкая

Структуры Эўразьвязу ня тое што слабыя, але нейкія млявыя: яны ўсё засядаюць і засядаюць, адна заява не адрозьніваецца ад другой. Таму мне падаецца, што беларуская сытуацыя патрабуе іншага стаўленьня да сябе ад Эўразьвязу: больш жорсткага, больш канструктыўнага, больш прынцыповага. Яны якраз, можа, і ня думаюць, што мы ёсьць Эўропай, думаюць, мы – «недзе там»...

### Сяргей Касьцян

Эўрасаюз таксама не аднолькавы. Эўрасаюз кіруецца ўказаньнямі з Вашынгтону. Там няма самастойнай палітыкі. Але там ёсьць самастойныя палітыкі, якія разумеюць, што зь Беларусьсю трэба супрацоўнічаць. Прыклад гэтага: на гэтым тыдні прыехала цэлая група бізнэсмэнаў з Германіі, падпісваюцца дагаворы са славакамі і славенцамі. Эканамічнае супрацоўніцтва ідзе, а гэта – галоўнае.

### Вячаслаў Кебіч

З палітычнага пункту гледжаньня Эўрасаюз (а сюды ж адносяцца Літва, Латвія, Эстонія і Польшча) хоча любым спосабам прыбраць Беларусь у сваё ўлоньне, ва ўлоньне сваёй «царквы». Таму тут гранічна ясна: тут ёсьць толькі палітычная накіраванасьць.

Калі Прыбалтыка яшчэ можа весьці сваю лінію, незалежна ад Брусэлю, дык палякі ўжо наўрад ці здолеюць. Гэта па-першае. Па-другое, трэба ўспомніць гістарычную мінуўшчыну. Ніколі не было ніякай дружбы паміж беларускім

і польскім народамі. Польшча па-ранейшаму разглядае Беларусь як былую сваю вотчыну. І гэтая панская фанабэрыя так і мае месца сёньня ў Польшчы.

### Анатоль Лябедзька

Трэба сказаць, што стратэгіі тут няма, калі не лічыць такой адсутнасьць усякай стратэгіі. Апошняя выбарчая кампанія дае нам надзею на тое, што тут адбудуцца перамены, і Віленская канфэрэнцыя-2006 таксама пра многае сьведчыць. Калі раней падчас такога форуму нам даводзілася праводзіць папярэднюю працу і дамаўляцца, каб хто-небудзь зь вядомых палітыкаў у свой выступ унёс некалькі радкоў пра Беларусь, то цяпер выступалі ўсе – і практычна ўсе гаварылі пра Беларусь. Ніхто не праводзіў ніякай папярэдняй працы. Гэта гаворыць, што ёсьць цікавасьць да Беларусі на палітычным узроўні. Многія ўбачылі, што ёсьць такая краіна на мапе. Я думаю, што гэта зрабілі, у першую чаргу, тыя трыццаць тысяч чалавек, якія выйшлі на наш беларускі Майдан, на Плошчу, якую мы цяпер называем імем Каліноўскага. Вось гэтыя людзі зрабілі пералом у стаўленьні Брусэля да Беларусі, да яе сытуацыі, да яе пэрспэктываў. Усе бачылі, які шалёны націск быў на людзей, якія былі запалохваньні – у лепшых традыцыях савецкага часу. І гэтая мужнасьць гаворыць, што ёсьць носьбіты эўрапейскіх каштоўнасьцяў – людзі, якія разглядаюць свабоду як каштоўнасьць. Гэта іх заслуга ў першую чаргу! Потым можна сказаць, што гэта праца і палітыкаў – доўгая, на працягу апошніх пятнаццаці гадоў.

Але цяпер трэба цікавасьць, якая ёсьць на палітычным узроўні, пераўтварыць у рэальную стратэгію і потым – у рэальны плян дзеяньняў. Калі гэта будзе зроблена, тады мы можам казаць, што Эўропа прысутнічае ў Беларусі – не выпадкова, ня час ад часу, а сыстэмна.

Калі мы гаворым пра міжнароднае супрацоўніцтва, то вакууму тут быць ня можа. І калі рэжым праводзіць палітыку самаізаляцыі, то гэта не азначае, што ніша павінна быць пустой: яна павінна запаўняцца суб'ектамі грамадзянскай супольнасьці. Што тычыцца супрацоўніцтва, то я думаю, што нам трэба быць больш прагматычнымі і не баяцца, што мы можам кагосьці ў Эўропе пакрыўдзіць. У нас ёсьць свае інтарэсы! І калі мы хочам вырашаць беларускую праблему хутка

і найперш сваімі намаганьнямі, то мы павінны выразна фармуляваць нашы пазыцыі. Я, напрыклад, за тое, каб сказаць не міжнароднай дапамозе, якая ёсьць неэфэктыўнай. І ня трэба баяцца гэтага!

Колькі ўжо часу абмяркоўваюцца розныя праекты, зьвязаныя з разрывам інфармацыйная блякады ў Беларусі. Колькі я сябе памятаю – усё ідзе гэтае абмеркаваньне. Але абмяркоўваюць гэтае пытаньне, прымаюць рашэньні людзі звонку, без удзелу экспэртаў зь Беларусі. Як можна вырашаць пытаньне інфармацыйнага праекту без удзелу журналістаў і спэцыялістаў у галіне інфармацыйных камунікацыяў зь Беларусі? Гэта значыць, што рашэньне, якое прымаецца, – проста для галачкі. У падтрыманых Эўропай інфармацыйных праектаў вельмі нізкі ўзровень эфэктыўнасьці – і гэта трэба пераламіць. І тут трэба сьмела заяўляць пра пазыцыі. А так у нас атрымліваецца, што адна частка грамадзянскай супольнасьці хоча больш падабацца, чым іншая. Гэта няправільная пазыцыя. Тут, у дачыненьні да міжнароднай супольнасьці, павінна быць кансалідаваная пазыцыя.

Мы мусім сказаць, напрыклад, што дапамога павінна быць скіраваная не на нейкую партыю, NGO ці лідэра: яе павінен адчуваць сярэднестатыстычны грамадзянін Рэспублікі Беларусі. Гэтым мы вырашаем адразу дзьве праблемы. Мы вырашаем праблему прапаганды, якая гаворыць, што ўся дапамога скіраваная на тое, каб зрабіць людзям дрэнна. Падчас выбарчай кампаніі я праехаў 17 рэгіёнаў, было ад ста да пяцісот чалавек на кожнай сустрэчы. І ўсюды я задаваў адно і тое ж пытаньне: «Скажыце, калі ласка, у вас ёсьць тры тэлевізійныя кнопкі. На першай, другой і трэцяй – абсалютна адна і тая ж інфармацыя, як сіямскія блізьняты. Калі, напрыклад, Эўрапейскі Зьвяз выдасьць рэсурсы, грошы на стварэньне чацьвертай кнопкі, спадарожнікавае тэлебачаньне, і вы, націскаючы на кнопку, будзеце атрымліваць іншы погляд на тыя ж падзеі, іншы аналіз сытуацыі. Падыміце рукі, хто супраць гэтага, супраць такой дапамогі?» Дзьве, тры, чатыры рукі! Гэта значыць, што там цалкам людзі ўспрымаюць гэта пазытыўна, бо яны бачаць, што гэтая дапамога выходзіць на іх. Яна разьлічаная канкрэтна на іх.

Вось такога кшталту праекты патрэбныя, такога кшталту дапамога – каб яе адчувалі ў першую чаргу людзі. Тады гэта будзе эфэктыўная контрапрапаганда

таму, што робіць афіцыйнае тэлебачаньне і радыё. Самае галоўнае – пытаньне эфэктыўнасьці!

### Васіль Лявонаў

Рыторыка добрая, і разам з тым зашмат цынізму ў палітыцы шэрагу эўрапейскіх краінаў на працягу ўсёй гісторыі Беларусі. Такая рэальнасьць, і нам ня трэба спадзявацца на тое, што Эўропа будзе нешта за нас рабіць, будзе нешта даваць. Даваць танны газ ня будзе і Расея.

### Алег Манаеў

Калі параўноўваць палітыку Эўрасаюзу з палітыкай ЗША ў дачыненьні да Беларусі, то, на мой погляд, палітыка ЗША непараўнальна больш адэкватная. Але за апошнія гады палітыка Эўрасаюзу стала нашмат больш адэкватнай, чым раней, хоць яна яшчэ далёкая ад таго ўзроўню, які многія эўрабеларусы, і я асабіста, хацелі б бачыць. Шмат якія структуры Эўрасаюзу ўсё яшчэ праяўляюць асьцярожнасьць у дачыненьні як да цяперашняга палітычнага рэжыму ў Беларусі, так і да грамадзянскай супольнасьці. Я маю на ўвазе цэлую сыстэму канкрэтных дзеяньняў. Возьмем, напрыклад, фармальна-палітычны ўзровень, г. зн. пазыцыю Рады ЭС, Эўрапарлямэнту і Эўракамісіі – за апошнія гады яны прынялі мноства добрых і справядлівых рэзалюцыяў, заяваў, якія асуджаюць разнастайныя парушэньні дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. Але на іншым, практычным узроўні – якія канкрэтна праекты распрацоўваюцца, якія канкрэтныя дзеяньні падтрымліваюцца (я маю на ўвазе ня толькі фінансавы, але і палітычны, тэхналягічны, інфармацыйны складнік) – гэтая падтрымка на парадак ніжэйшая. За кожнай рэзалюцыяй, кожнай палітычнай заявай павінны ісьці практычныя рашэньні, канкрэтныя праекты і дзеяньні.

Канкрэтны прыклад – стаўленьне да Расеі. Дагэтуль адным з найважнейшых пунктаў стратэгіі Эўрасаюзу ў дачыненьні да Беларусі, на думку дэмакратычных сілаў, зьяўляецца ўключэньне «беларускага пытаньня» ў парадак дня ўзаемадзеяньня ЭС з Расеяй. Пад «уключэньнем беларускага пытаньня» маюцца на

ўвазе не агульныя размовы і намёкі, а зусім канкрэтныя прапановы да Расеі ў яе стасунках з кіраўніцтвам Беларусі. У ЭС з гэтым, у прынцыпе, пагаджаюцца, але калі даходзіць да практычных крокаў, то яны ня робяцца. За апошні год сытуацыя пачала мяняцца да лепшага. Наколькі? Паглядзім, як скажацца «ўключэньне беларускага пытаньня» – няхай нават і ня ў першым шэрагу – у павестку дня саміту «вялікай васьмёркі» ў Санкт-Пецярбургу.

Летась Эўрасаюз пачаў некалькі інфармацыйных праектаў для Беларусі. Гэта «Беларускія хронікі» на «Deutsche Welle», гэта адмысловая штотыднёвая праграма на ізраільска-амэрыканскім тэлеканале RTVi, гэта новая ўвага да Беларусі, якую праяўляе расейская служба «EuroNews». У нас ёсьць вынікі апытаньня, праведзенага ў канцы красавіка 2006 году: «Якія тэлеканалы вы гледзіце?». Расейская служба «EuroNews» – ад 20% да 25%, адмысловая перадача RTVi – ад 10% да 15%. Вядома, нехта можа сказаць: «Ну і што, думаеце, яны паглядзелі гэтыя перадачы і зрабіліся прыхільнікамі дэмакратыі?» Але вось наступнае пытаньне: «Калі вы глядзелі канал «EuroNews», то ці бачылі сюжэт пра адзінага кандыдата дэмакратычных сілаў Мілінкевіча?» Адказ: некалькі разоў – 39%, хоць бы адзін раз – 31%. Гэта значыць 70% з тых, хто ўвогуле глядзіць гэты тэлеканал, бачылі сюжэт пра Мілінкевіча. Прычым, мяркуючы з адказаў на іншае пытаньне, большая частка гледачоў пачалі пасьля гэтага думаць пра Мілінкевіча лепш. Значыць, гэтыя праекты пачынаюць працаваць. Перадачы радыёстанцыяў, што вяшчаюць на Беларусь з Эўропы, слухаюць каля 15% выбаршчыкаў, г. зн. пад мільён чалавек. Слухачы гэтых перадачаў абмяркоўваюць іх са сваімі сябрамі, калегамі, суседзямі і паступова пранікаюцца адпаведнымі ведамі, каштоўнасьцямі, поглядамі. Калі гэты ўплыў яшчэ ставіцца пад сумненьне некаторымі прадстаўнікамі дэмакратычных сілаў у Беларусі і скептыкамі ў самой Эўропе, дык беларускія ўлады рэагуюць зусім адэкватна і робяць жорсткія захады, каб яго заблякаваць. Так што працэс ідзе. І Эўрасаюз бярэ ў ім усё больш актыўны і дзейсны ўдзел. Гэты ўдзел таксама ўсяляе надзею.

### Аляксандар Мілінкевіч

Варта сказаць пра тое, што ўпершыню за многія гады Эўразьвяз выпрацаваў скансалідаваную пазыцыю адносна дыктатарскага рэжыму ў Беларусі. Важна, што апошнім часам асноўныя эўрапейскія інстытуцыі пасьлядоўна не прызнаюць вынікаў ладжаных уладай з грубымі парушэньнямі агульнапрынятых дэмакратычных стандартаў «рэфэрэндумаў» і «выбараў». Але пакуль што трэба прызнаць, што аб'яднаная Эўропа ня выпрацавала сыстэмнага падыходу да «беларускай праблемы». Яшчэ да прэзыдэнцкай кампаніі з боку асобных нацыянальных урадаў меў месца пэўны флірт з рэжымам у Менску – у шчырым ці прагматычным спадзеве, што рэжым зьменіць паводзіны. Але быў час пераканацца, і падзеі выбарчай кампаніі пацьвердзілі, што гэты рэжым нерэфармавальны ў сутнасьці. Ані пуга, ані пернік на яго ня дзейнічаюць. Мы са свайго боку заўсёды трымаліся пазыцыі: Эўропа павінна вярнуцца да так званага двухбаковага падыходу стасоўна Беларусі, але з акцэнтам на яго другую частку – супрацоўніцтва з дэмакратычнай Беларусьсю.

### Анатоль Міхайлаў

Для таго каб зрабіць гэтую палітыку больш эфэктыўнай, яе зьмест усё яшчэ належыць вызначыць. Дагэтуль яна застаецца залішне абстрактнай.

### Таццяна Працька

Падаецца, што нейкай палітычнай стратэгіі ў дачыненьні да Беларусі ў Эўразьвязу няма. Менавіта цяпер у сьвеце вельмі складаная сытуацыя – зь вялікімі нафтавымі грашыма ў адных і высокім коштам на нафту для другіх.

Дастаткова цяжка Эўразьвязу цяпер з-за высокіх цэнаў на нафту і газ. Таму ў дачыненьні да Беларусі сёньня адно стаўленьне, калі Эўропа стабілізуецца – будзе іншае стаўленьне, зусім іншае. Цяпер Эўропа можа, у прынцыпе, заплюшчыць вочы на тое, што ў такой блізкай, суседзкай да Эўразьвязу краіне

парушаюцца правы чалавека, законы, дэмакратыя. І яны з усіх сілаў гэтыя вочы заплюшчваюць, бо мы – транзытная краіна. А калі ўсё стабілізуецца...

Такі крызіс, як цяпер, ужо быў у 1970-я гады: Захад выйшаў зь яго з новымі тэхналёгіямі, а Савецкі Саюз, які толькі выкарыстаў грошы і не зрабіў ніякіх тэхналягічных зьменаў, – разваліўся. Наступствы сёньняшняй сытуацыі будуць такімі ж, хаця кіраўніцтва Расеі з гэтым змагаецца. Будзе вялікі палітычны крызіс і ў Беларусі, калі гэтыя вялікія грошы ня выкарыстаюцца на мадэрнізацыю. Але пакуль ня бачна, што іх укладваюць у эканоміку.

Паглядзіце, якая ў нас фактычная інфляцыя: напрыклад, колькі каштуе жыльлё! Калі гэта мэтар жыльлёвай плошчы ў Менску каштаваў больш за тысячу даляраў? А цяпер гэта ўжо нармальна. Гэта з-за таго, што грошай шмат, і гэтыя грошы ідуць не на мадэрнізацыю эканомікі, а на зарплату.

Я думаю, што шмат праблемаў яшчэ наперадзе. І казаць пра стаўленьне Эўропы да Беларусі можна будзе праз некалькі гадоў. Сёньня Беларусь на скрыжаваньні, і стаўленьне да нашай краіны – таксама на скрыжаваньні. З аднаго боку – сымпатыя да беларусаў як да народу неваяўнічага, талерантнага, добразычлівага, гасьціннага, які прымае людзей такімі, якія яны ёсьць. З другога боку, калі нашая дзяржава будзе ўяўляць сабой небясьпеку, адмаўляцца ад законнасьці, дэмакратыі, правоў чалавека, то ў Эўропе змогуць заплюшчыць вочы на тое, што Беларусь згіне ў нетразях беларуска-расейскай інтэграцыі.

Таму да нас пакуль што ставяцца насьцярожана. Але Эўропа, я б сказала, чакае, што мы працягнем ім руку. Як на фрэсках Мікеляндж элё, дзе Бог ляжыць і працягвае руку, а ў чалавека рука такая вялая-вялая... Вось у нас сытуацыя менавіта, як на гэтай фрэсцы.

### Андрэй Саньнікаў

Цяпер больш увагі надаюць Беларусі, больш выказваюць занепакоенасьць. Але пакуль што, зноў-такі, гэта не пераўтварылася ў нешта канкрэтнае. Тое, што цяпер кажуць пра пашырэньне сьпісу неўязных чыноўнікаў... Калі гэта – усё, на што Эўразьвяз здольны, то для мяне гэта паказчык ня толькі слабасьці, але і нежаданьня сур’ёзна падыходзіць да нашай сытуацыі. Таму

што ёсьць іншыя мэханізмы, даступныя Эўразьвязу, ён мог бы іх выкарыстоўваць. Пачынаючы з гандлёва-эканамічных стасункаў: у пэўных краінах Эўразьвязу гандлёвы абарот зь Беларусьсю вырас у тры, чатыры, пяць разоў. Ёсьць інструмэнты! Я не кажу, у якіх формах гэтыя інструмэнты можна ўжываць: эмбарга, санкцыі, пазбаўленьне ліцэнзіі (магчымасьці працаваць) пэўным фірмам, якія кантралююцца ўладамі. Ёсьць інструмэнты юрыдычныя: адна справа – пазбавіць магчымасьці паехаць за мяжу ў краіны Эўразьвязу, іншая – распачаць міжнародную справу па зьніклых у Беларусі. Ёсьць такія прэцэдэнты, можна такое зрабіць. Не ператвараецца ў справу нават тое, што было з мэдыйным праектам... Проста шкада грошай і часу, шчыра кажучы. Думаю, там могуць быць задзейнічаныя таленавітыя людзі з нашага боку, але эфэкту ня будзе: ніхто ня ведае, ніхто ня чуе, ніхто ня бачыць. Нехта з знаёмых глядзеў перадачу па RTVi – жахлівую: нікога зь Беларусі там не было, цытавалі там адзіны няўдалы артыкул пра Беларусь, які зьявіўся ў «Guardian», быццам іншых артыкулаў увогуле не было.

У нас цяпер няма таго асяродзьдзя, якое існавала ў Польшчы ў савецкі час. Тады кароткія хвалі слухалі амаль усе. Сёньня эпоха FM, і немагчыма кароткімі хвалямі змагацца супраць FM. Таму трэба дапамагаць таму, што ёсьць тут.

### Уладзімер Улаховіч

Як мінімалісцкую, звод намераў. Канцэпцыя Новага эўрапейскага суседзтва – відавочны маніфэст жыцьця паасобку ва ўмовах нараджэньня новай разьдзяляльнай рысы. З аднаго боку, ЭС абвяшчае нарошчваньне блізкасьці пасьля ўласнага расшырэньня. З другога боку – уводзіць жорсткі візавы рэжым на ўсіх напрамках, уключаючы і рэгіёны, дзе ў гісторыі ніколі не існавала межаў у беларусаў (Літва, Латвія, граніца з Польшчай заўсёды былі з больш ці менш палегчаным рэжымам перасячэньня). Пры гэтым працэдура атрыманьня візаў увесь час робіцца ўсё больш і больш ускладненай і зьневажальнай. Зразумела, што гэта ня мае нічога супольнага з агульнаэўрапейскімі каштоўнасьцямі, на якіх ідэалягічна стаіць ЭС. Апраўданьне павелічэньнем жорсткасьці барацьбы зь незаконнай міграцыяй у дачыненьні да Беларусі таксама не працуе. Ні

ў водной эўрапейскай краіне вы ня знойдзеце колькі-небудзь прыкметнай з пункту гледжаньня сацыяльнага і крымінальнага напружаньня групы імігрантаў з сучаснай Беларусі. Але ці ня ў кожным буйным эўрапейскім горадзе вы лёгка знойдзеце ня вельмі дружныя з законам суполкі ўкраінцаў, малдаванаў, расейцаў, альбанцаў, кітайцаў, віетнамцаў і г. д. Беларусы вельмі асьцярожныя і пераборлівыя ў перамене месцаў. Дарэчы, гэта таксама дзівосная нацыянальная рыса.

Выходзіць, што ў адпаведнасьці з дэкларацыяй Брусэлю, Эўропа нам зрабілася бліжэйшай пасьля траўня 2004 году, аднак фактычна, на справе – далейшай. Добрая ілюстрацыя эўрапейскай палітыкі.

## Валеры Фралоў

Я прывяду маленькі прыклад. Неяк мне патэлефанаваў пасол Англіі: «Не маглі б вы прыехаць?» Прыехаў нейкі чыноўнік з МЗС, з Эўрасаюзу, і такі шчасьлівы расказвае, як яны прынялі нейкую там рэзалюцыю. Я разумею, гэта чыноўнік, які ў гэтым Эўрапарлямэнце круціцца, кіруецца сваімі падыходамі. Я разумею заходніх людзей: яны імкнуцца ўсё вырашыць дэмакратычнымі падыходамі. Мы хочам, каб яны нам дапамаглі, каб мы таксама зрабіліся падобныя да іх паводле жыцьцёвых прынцыпаў. Але гэта досыць складана зрабіць, таму што ў іх дзейнічаюць законы, яны імі кіруюцца. І законы неяк не дапускаюць, што можна на некага «наехаць», некаму морду набіць...

Думаю, там таксама мучаюцца: як жа з намі абысьціся? Думаю, да іх прыходзіць разуменьне таго, што «кепскім хлапчукам» колькі пальчыкам ні грazі – усё бессэнсоўна. Пакуль у кут не паставіш ці папругай не адлупцуеш – толку ня будзе. Ня бачу я дастаткова жорсткай пасьлядоўнай палітыкі, якая дапамагла б. То гавораць пра тэлебачаньне, то пра радыёвяшчаньне... Думаю, тут вельмі многае залежыць ад канкрэтных людзей, якія будуць кіравацца сваімі інтарэсамі. Далёка не на першым месцы ў іхніх галовах Беларусь. Ну, калі самі беларусы ня могуць выпрацаваць тут сваю нейкую выразную пазыцыю і прадэманстраваць, што яны гатовыя і хочуць жыць у іншай краіне... А то жывуць абы-як! Ну, дык чаго прыходзіць да таго, хто сам ня ведае, як хоча жыць?

Я не гавару пра палітыкаў накшталт Аляксандра Мілінкевіча. У невялікага пласту людзей, вядома, ёсьць такое бачаньне. Але няма пэўнай агульнай лініі, таму заходнія палітыкі ня ведаюць, каму тут дапамагаць, што тут рабіць, ці ня марныя будуць намаганьні...

Апроч таго, тут вельмі сур'ёзны ўплыў Расеі. Можа, Эўрасаюз і хацеў бы нейкім чынам больш канкрэтна паўплываць на Беларусь, але тут Расея з другога боку ўплывае. І пачынаюцца тут нейкія палітычныя гульні. Гэта падобна да перацягваньня каната: хто каго перацягне – той потым шчокі надзьме для «пантоў», для адчуваньня, што «мы магутная дзяржава». А прынцыпова – не асабліва Беларусь і цікавая. Ну, ёсьць такая краіна, жывуць там такія хлопцы, якія і самі ня ведаюць, куды ісьці (за выключэньнем пэўнай часткі). Чаго туды лезьці? Тым больш што ядравую зброю, у адрозьненьне ад Ірану, мы ўжо здалі, нічога не распрацоўваем, карысных выкапняў у нас няма. «Труба» транзытная трошкі цікавіць. І – каб прадказальнасьць была. Ну, калі тут нешта непрадказальнае будзе – стукнуць па галаве: многія краіны вакол нас ужо ўвайшлі ў НАТО. Дый Расея спаць у шапку ня будзе. Сілы на гэта ёсьць, урэшце!

Мы апынуліся на разломе паміж Расеяй і Захадам: і адно на нас уплывае, і другое. І такі элемэнт раздвоенасьці... Не хацелася б рашаць адназначна: «Вось мы ідзем у Расею, гэты Захад нам па барабане» ці «Мы ідзем на Захад, Расея нам па барабане». Мабыць, усё-такі неяк шырэй і глыбей трэба глядзець. А ўсім хочацца так – выразна і зразумела: усе ў Эўропу! А там нас і не чакаюць, у прынцыпе. Каму мы там патрэбныя?

Жыцьцё, вядома, цяжкая і жорсткая штука. Напэўна, нашай краіне, як і кожнаму чалавеку, трэба навучыцца жыць без таго, каб цябе вадзілі за руку, усё тлумачылі.

Гэта як у заапарку: клеткі пафарбаваныя, дарожкі пасыпаныя пяском, кавалак мяса табе прынясуць, ніякі зьвер цябе не кране – ён сядзіць у суседняй клетцы. Вось так мы і прывыклі жыць. Пахадзіў-пахадзіў па клетцы, брык – паляжаў. Але чалавек, як і любая істота, павінен жыць у чыстай прыродзе! А мы трохі затрымаліся ў гэтым заапарку...

## Станіслаў Шушкевіч

Эўразьвяз апынуўся ў пастцы. Справа ў тым, што спачатку гэта было аб'яднаньне краінаў, заснаваных прыкладна на адных і тых самых палітычных прынцыпах: у адных гэтыя традыцыі ўжо ўкараніліся, у другіх – амаль што ўкараніліся, але яны ішлі да гэтага, разумелі, куды ісьці. Гэтае іх агульнае заканадаўства, якое вылілася ў не прынятую сёньня Канстытуцыю (але ёсьць шэраг пазыцыяў, якія прынятыя), адпавядала інтарэсам гэтых краінаў. Калі далучыліся дзесяць новых краінаў з Цэнтральнай Эўропы, узьніклі пэўныя складанасьці. І ўдасканаленьне заканадаўства не пасьпявае за гэтым. Яны фармуюць бюджэт паводле старых прынцыпаў. І яны слаба зацьвярджаюцца, таму што гэта павінна прайсьці праз нацыянальнае заканадаўства сёньня. І зусім ужо атрымалася нягеглая сытуацыя, калі ў АБСЭ, напрыклад, уліліся такія краіны, як Беларусь (а там прынцып кансэнсусу мінус адзін). Яны фактычна перасталі адыгрываць якую-небудзь аб'яднальную ролю. Я б сказаў, што гэта пераходны пэрыяд у Эўразьвязе. Ён для таго, каб пашырыцца, не пасьпеў удасканаліць сваё заканадаўства. Калі хочаце, у мікрамаштабе мы перажывалі гэта: мы разумелі, што такое Савецкі Саюз, што такое шосты артыкул Канстытуцыі. Мы яго адмянілі і пачалі латаць гэтую нашую Канстытуцыю – яе латаць было немагчыма. Пасьля хуценька прынялі новую, зь вялікімі «прабоямі» – дэмакратычную, але ня вельмі дасканалую. Вось і ў Эўразьвязе сёньня няма заканадаўства, няма прававой падставы, каб рэальна дапамагчы такой краіне, як Беларусь. Няма! Яны могуць дапамагаць толькі праз урад, таму што гэта было аб'яднаньне сумленных дэмакратычных урадаў, якія выбіраюцца дэмакратычным чынам. Яны могуць мяняцца, могуць там быць такія выбрыкі, як у Аўстрыі, напрыклад, з правымі, альбо такія выбрыкі, як, можа, цяпер будуць у Італіі. І я думаю, што пройдзе пэўны час, пакуль гэтае заканадаўства будзе ўдасканаленае.

Маральная дапамога з боку Эўропы – цудоўная. А калі гаворка ідзе пра нейкую дапамогу рэальную, то гэта можа быць зроблена законна толькі праз індывідуальныя краіны, як, напрыклад, зрабіла Славакія. А Эўразьвяз – ня ведаю... Я ні разу ня быў у Брусэлі, таму што ня ведаю, пра што гаварыць з брусэльскай

адміністрацыяй. Я ведаю, якімі законамі яна карыстаецца, і думаю, што на падставе гэтых законаў нічога людзкага зрабіць нельга.

Мы можам скардзіцца на эўрабюракратыю (і я скарджуся часам), але яна – прававая бюракратыя: яна працуе паводле законаў. І абысьці гэты закон не дазволена гэтаму эўрабюракрату. А закону, які б дазваляў разьвязваць такія пытаньні, як паўстала зь Беларусьсю, фактычна ў іх няма. І гэта для іх найважнейшае. Заўважце: цяпер уступілі дзесяць краінаў – трэба ўладкаваць тыя пытаньні. Дэфіцыт бюджэту новыя краіны ствараюць да 2008 г. нешта парадку 12 мільярдаў эўра. І няма гэтых мільярдаў эўра, і няма адкуль іх узяць. А яны павінны знаходзіць паводле таго заканадаўства, таму што гэта – тое, што мусіць працаваць заўтра. А Беларусь – пачакае...

### Усевалад Янчэўскі

Шчыра кажучы, я ня бачу ніякай палітыкі. Эўрасаюз не разумее Беларусі і, мяркуючы па ўсім, не жадае яе разумець.

Эўропа ставіцца да нас па-спажывецку, звысоку. Часта яна лучае ў прычыну, таму што высакамернасьць нават вялікім не да твару. Мы невялікія, і з брусэльскіх ды вашынгтонскіх вяршыняў нас разгледзець складана. Іменна таму яны нас не разумеюць. Іменна таму яны ўпадаюць у такую дурасьць, што думаюць, быццам калі яны абмяжуюць уезд беларускіх чыноўнікаў, дык беларускія чыноўнікі вельмі моцна ад гэтага засмуцяцца.

Эўропа прапускае велізарныя магчымасьці супрацоўніцтва зь Беларусьсю. Нашая стабільнасьць – гэта плюс, яна дае істотны плюс эўрапейцам. Калі б яны гэта выкарыстоўвалі, пачынаючы ад невялікіх прадпрыемстваў, фірмаў і канчаючы нават краінамі, яны б мелі ад гэтага вельмі істотны эканамічны прыбытак.

Беларусь вырашае за Эўропу шэраг праблемаў: перш за ўсё стрымлівае вал наркотыкаў, нелегалаў... За гэта Эўропа пэрыядычна ляніва нам дае высьпятка. Гэта не спрыяе таму, каб мы задачы загароджваньня Эўропы ад усёй гэтай муці, што ідзе з усходу, з Азіі, вырашалі больш эфэктыўна. Гэта няправільная і непісьменная палітыка.

І нарэшце, Эўропа проста траціць час. Эўрапейцы чамусьці думаюць, што рана ці позна мы пойдзем шляхам Польшчы, Вугоршчыны, Чэхіі. Але мы ня Польшча, не Вугоршчына і ня Чэхія! Яны чамусьці наіўна думаюць, што Лукашэнка – гэта выпадковасьць. За дванаццаць гадоў яны так і не зразумелі: Лукашэнка – гэта ўсур'ёз і надоўга.

Яшчэ раз паўтару: эўрапейцы ніякай палітыкі ў дачыненьні да нас не праводзяць. У мяне такое ўражаньне складваецца, што палітыка Эўропы ў дачыненьні да Беларусі – гэта чарада нейкіх заяваў, якія гэтак году з 1996-га адным файлам у кампутары лічацца і там перастаўляюцца толькі даты і нагоды.

Амэрыканцы і эўрапейцы вельмі часта нагадваюць мне савецкіх бюракратаў, асабліва ў сваіх фармулёўках: у іх фармулёўкі такія, як у колішняга ТАСС. Яны абсалютна стандартныя, прадказальныя, і можна гадоў на пяць наперад прадказаць, што скажа Дзярждэп ЗША ці які-небудзь эўракамісар з той ці іншай нагоды. Яны сябе выстаўляюць у гэтым пляне трошкі сьмешнымі.

Самае цікавае, што Беларусь практычна нічога ня просіць у Эўропы. Эўрапейцы наракаюць, што тут перакрываюцца ўсялякія каналы дапамогі. Дарэмна наракаюць. Наш прэзыдэнт дапамагае эўрапейскім падаткаплацельшчыкам зэканоміць іх грошы, якія большай часткай раскрадаліся і раскрадаюцца. Усе эўрапейскія праграмы дапамогі абсалютна не эфэктыўныя. Але агульная практыка выдзяленьня ўсялякіх грантаў на абшары былога Савецкага Саюзу паказвае, што гэта зазвычай бязбожны крадзеж, стандартныя справаздачкі невядома куды.

Эўрапейскія палітыкі ніяк ня могуць зьмірыцца, што ў Беларусі здарылася рэдкая штука – тутэйшая палітыка пачала стварацца ў дакладнай адпаведнасьці з пажаданьнямі большасьці народу. Так здарылася, што ў Беларусі зьявіўся Лукашэнка. Так здарылася, што Лукашэнка здолеў, у сілу ўласьцівасьцяў сваёй асобы (досыць унікальнай), перавесьці чаканьні масы, большасьці ў палітычную практыку. Гэтага не атрымалася ні ва Ўкраіне, ні ў Расеі: там і да 1991 году меншасьць кіравала ў асобе ня выбраных нікім камуністычных кіраўнікоў, і пасьля 1991 году там таксама кіравала меншасьць.

У Беларусі выйшла цікава: тут пачала правіць большасьць. Тут палітыка стала разьвівацца так, як хоча большасьць. Большасьць адчувала настальгічныя

пачуцьці да СССР – гэты элемэнт увасобіўся ў палітыцы. Большасьць адчувала жаданьне жыць у дзяржаве, як цяпер любяць казаць, сацыяльнай (або, як любяць выказвацца палітолягі, патэрналісцкай), ці, груба кажучы, мець падтрымку ад дзяржавы, – і гэта знайшло адбітак у палітыцы дзяржавы. Большасьць не хацела бачыць жахлівага расслаеньня – і тут не прайшла прыватызацыя, і чыноўнікі (прынамсі вонкава) паводзяць сябе досыць сьціпла: іх да таго змушае ўлада.

І аказалася, што на цяперашнім этапе большасьць беларускага народу ў агульнаэўрапейскі кантэкст не захацела ўпісвацца. Гэта факт. Гэты факт – ня шкодны, не зламысны. Не было большага абсурду, чым назваць адну з кніг пра Лукашэнку (вельмі слабенькіх) – «Выпадковы прэзыдэнт». І наадварот, Фядута вельмі кваліфікавана напісаў у сваёй кнізе пра тое, што прэзыдэнт Лукашэнка зусім не выпадковы.

Ён невыпадковы зь дзьвюх прычынаў. Па-першае, таму што такі чалавек безумоўна павінен быў зрабіцца вельмі буйным лідэрам, маштабнай гістарычнай постацьцю ў сілу сваіх найрадчэйшых асабістых якасьцяў: харызмы, геніяльнай палітычнай інтуіцыі і ўнікальнага ўменьня адчуваць подых і поступ гісторыі (дарэчы, Лукашэнка, бадай што, наагул адзіны палітык на постсавецкай прасторы, надзелены гэтым амаль містычным дарам).

Па-другое, тое, што народ уручыў яму ўсю паўнату ўлады – гэта таксама не выпадкова, бо мэнталітэт, каштоўнасьці пераважнай большасьці нашага народу на сёньняшнім гістарычным этапе разыходзяцца з клясычнай эўрапейскай дэмакратыяй. Наш народ не запатрабаваў ні палітычных свабодаў, ні парлямэнтарызму. Іх у яго не адабралі – гэта няпраўда. Іх не падавілі – яны проста не былі запатрабаваныя. Прычым яскрава гэта было відаць у 1991–1994 гадах.

Заўважце, тыя свабоды, якія былі народам запатрабаваныя, усе ўвасобленыя. На сконе СССР былі вельмі моцна запатрабаваныя асабістыя свабоды. Свабода перамяшчэньня: усе ў Савецкім Саюзе хацелі езьдзіць па сьвеце. Калі гэтую свабоду адабраць – за яе народ выйдзе на плошчу, дзе б там ні было. Свабода ад дробязнай дзяржаўнай апекі, ад дыктату, ад партсходаў, дурацкіх палітынфармацыяў, прапясочваньня, сачэньня за асабістым жыцьцём (разьвёўся – не разьвёўся і г. д.) – усё гэта было запатрабавана вялікай масай людзей.

Уласна, і ў Савецкім Саюзе толькі меншасьць патрабавала палітычных свабодаў. Большасьць патрабавала вось гэтых базавых, асабістых свабодаў.

У Беларусі засталіся ўсе свабоды, якія былі запатрабаваныя грамадзтвам. Але палітычныя свабоды (у заходнім разуменьні) грамадзтва сьвядома і добраахвотна адхіліла. Абсалютна выразны быў выбар у бок, скажам, адзінаўладнага праўленьня. Я заўсёды пратэстую, калі нашу дзяржаву называюць дыктатурай. Гэта некарэктна, абсурдна і нават, я б сказаў, кашчунна. Нельга падаваць руку чалавеку, які так гаворыць. У сапраўдных дыктатурах былі ахвяры – сотні, тысячы, мільёны. Турмы, катаваньні, расстраляныя, забітыя.

Хіба можна гэта нават блізка параўноўваць з тым, што ў Беларусі пару дзясяткаў чалавек за парушэньні грамадзкага парадку адпраўляюць на пятнаццаць сутак? Пры дыктатурах, выбачайце, адпраўляюць на пятнаццаць гадоў, а не на пятнаццаць сутак. Ці ўвогуле высылаюць масавым парадкам на той сьвет. І выхад апазыцыйных газэтаў там не прыпыняюць – яны проста адсутнічаюць як зьява. І апазыцыйныя лідэры не зьбіраюцца на кангрэсы ды палітрады. Навошта ж гаварыць пра дыктатуру, навошта кідацца гэтым цяжкім, трагічным словам?

Так, у нас аўтарытарны рэжым – безумоўна. Сам прэзыдэнт ад гэтага не адмаўляецца. Такі рэжым выбраны большасьцю насельніцтва сьвядома. Асноўную думку Канстытуцыі 1996 году народ выдатна зразумеў. Ён зразумеў: мы аддаём уладу Лукашэнку.

Я быў дэпутатам папярэдняга скліканьня, я заўсёды казаў: «Так, наш парлямэнт не настолькі паўнамоцны, як эўрапейскі парлямэнт». Але ў гэтым няма нічога дзіўнага, таму што на гэтым этапе большасьць нашага народу выбрала сыстэму, пры якой клясычнага падзелу ўладаў няма, пры якой ёсьць зрушэньне ўлады да аднаго чалавека.

Гэтага жадае большасьць беларускага народу. І на прыкладзе сёньняшняй Украіны мы бачым – гэта слушна.

Эўропе, Эўрасаюзу неабходна зразумець: Францыя ішла да дэмакратыі некалькі стагодзьдзяў, перажыўшы не адну крывавую рэвалюцыю. Германія аплаціла сваю дэмакратыю мільёнамі сваіх і чужых жыцьцяў.

Мы ж ня хочам ісьці да дэмакратыі праз узрушэньні і не жадаем аплачваць яе крывёй. Усё дваццатае стагодзьдзе наша шматпакутная Беларусь ахвяравала ўсім дзеля сьветлай камуністычнай будучыні. Камуністычныя бонзы гаварылі: патрывайце сёньня, а заўтра ўсім будзе лягчэй. Рыначнікі-лібэралы гавораць

сёньня таксама: патрывайце беспрацоўе, безуладзьдзе, крымінал – гэта ўсё, маўляў, выдаткі «пераходнага пэрыяду».

Кардынальнае адрозьненьне паміж Лукашэнкам і яго праціўнікамі заключаецца іменна ў гэтым. Яны зноў спрабуюць прымусіць пакутаваць народ сёньня дзеля цьмянага заўтра. А Лукашэнка ведае – людзі хочуць жыць нармальна ня заўтра, не праз дзесяцігодзьдзі, а сёньня, тут і цяпер. І менавіта гэтаму падпарадкаваная яго палітыка. У гэтым яго праўда і яго сіла.

Пачынаць будаваць чарговую «сьветлую будучыню» (гэтым разам дэмакратычную) у нашага народу ўжо няма сілаў. Было б нядрэнна, каб у Эўропе знайшліся сьветлыя галовы, якія б зразумелі гэтую ў цэлым ня надта складаную ісьціну...

# Чатыры карпарацыі беларускае эліты

Андрэй Казакевіч

Вызначыць, што такое эліта і акрэсьліць ступень яе *ўплыву* на грамадзтва практычна немагчыма. Звычайна гэта адчуваецца інтуітыўна. Тым больш складана весьці размову пра погляды беларускае эліты. Праблема нават ня ў тым, што эліта вельмі фрагмэнтаваная (адсутнічае нават мінімальны палітычны кансэнсус), але і ў тым, што яе візіі часта вельмі дынамічныя і хістаюцца ў залежнасьці ад многіх унутраных і вонкавых фактараў. Дастаткова цяжка вызначыць розьніцу паміж сапраўдным меркаваньнем, сымуляцыяй, ідэалягічным тэзісам, эпатажам ці імкненьнем сказаць тое, што чакаецца. Асабліва ў кантэксьце інтэрвію. Але, магчыма, гэта і не істотна, – так ці інакш гэтая сукупнасьць адлюстроўвае пэўны стан грамадзкае сьвядомасьці.

Мэта гэтага невялікага паслоўя – схематычна адлюстраваць асноўныя рысы тае неакрэсьленае сацыяльнае групы, якую ўмоўна можна назваць элітаю і адначасова пазначыць яе лёгіку разуменьня Эўропы ды эўрапейскае праблематыкі. У кнізе прадстаўленыя асноўныя часткі беларускіх элітаў, хоць і прысутнічае пэўны аб'ектыўны дысбалянс у выніку некантактнасьці часткі палітычнай і эканамічнай эліты, якая моцна інтэграваная ў дзяржаўную сыстэму (вышэйшыя дзяржаўныя пэрсоны, буйны бізнэс, частка акадэмічнай навукі, культуры і г. д.).

Падаецца, што пры аналізе поглядаў беларускай эліты найбольш зручна правесьці яе падзел па крытэрыю субкультуры. Гэты падзел дастаткова ўмоўны, але адлюстроўвае пэўныя стылі мысьленьня і, адпаведна, стратэгіі

ў разуменьні вонкавага кантэксту Беларусі, што для нас і зьяўляецца найбольш цікавым. У гэтым кантэксьце вылучэньне функцыянальных групаў (эканамічная, палітычная, культурная эліта) пакідаецца па-за ўвагаю. Яшчэ адным важным фактарам, які вызначае лёгіку мысьленьня эліты, зьяўляецца падзел палітычнае і культурнае прасторы Беларусі па восі «ўлада – апазыцыя», якая цягне за сабою больш глыбокія падзелы на ўзроўні культуры і каштоўнасьцяў. Гэты падзел дастаткова важны ў кантэксьце таго, што могуць сказаць прадстаўнікі элітных групаў падчас інтэрвію і наколькі шчыра.

Тэрмін субкультура мы выкарыстоўваем дастаткова адвольна і зьвязваем яго з наяўнасьцю пэўных супольных рысаў палітычнае групы: структура біяграфіяў, адукацыя, сацыяльнае паходжаньне, культурны фон, пазыцыя ў палітычным полі (і, адпаведна, камунікацыйная блізкасьць ці адчужанасьць), карпаратыўныя сувязі і арганізацыйная эвалюцыя. Ня ўсе групы маюць аднолькавыя ўласьцівасьці і ўзровень кансалідацыі, межы іх дастаткова мабільныя і нетрывалыя. Тым ня менш такі падзел, на нашу думку, дазволіць збольшага сыстэматызаваць погляды беларускай эліты. Пры гэтым належыць памятаць, што погляды – фэномэн дастаткова дынамічны, і кожны прадстаўнік грамадзтва можа іх часта мяняць пры зьменах у сацыяльным асяродзьдзі ці палітычнай пазыцыі. Ці не клясычным выпадкам тут выступае С. Шарэцкі.

Некалькі словаў варта сказаць пра прадмет кнігі, аснову якой складаюць адказы на пытаньні, якія агульна можна назваць «эўрапейскай праблематыкай». У Беларусі існуе аўтарытарны рэжым, што адкладвае свой значны адбітак на характар і статус асабістае думкі. Меркаваньні пра эўрапейскі шлях у значнай ступені тэарэтычныя, бо не зьяўляюцца прадметам рэальнае палітыкі. Акрамя гэтага, яны значна больш пэрсаналізаваныя і выпадковыя, бо не падмацоўваюцца адпаведнай грамадзка-палітычнай дыскусіяй і калькуляцыяй рэальных інтарэсаў, што трэба ўлічваць пры чытаньні матэрыялаў.

*Беларуская постсавецкая эліта.* Беларуская савецкая адміністрацыйная эліта пачала складвацца пасьля Другой сусьветнай вайны. У першапачатковай форме яна афармляецца ў 1950-х, надалей працэс яе рэпрадукцыі ў межах савецкага партыйнага апарату адбываўся практычна неперарыўна да пачатку 1990-х.

Распад СССР і стварэньне незалежнае Беларусі троху паслабіў уплыў савецкае эліты, але даміноўны статус быў хутка вернуты (у 1990–1994 гадох цэнтральнай фігураю быў В. Кебіч) і захаваўся практычна да канца 1990-х, калі пачаў працаваць натуральны дэмаграфічны фактар старэньня. Такім чынам, прадстаўнікі савецкае намэнклятуры захоўвалі даміноўныя пазыцыі ў дзяржаўным апараце і пасьля прыходу да ўлады А. Лукашэнкі. Паступовы сыход гэтай групы адбываецца толькі на рубяжы XX–XXI стагодзьдзяў, сымбалічнай мяжою тут можна лічыць выцісканьне зь «вялікае палітыкі» пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году М. Мясьніковіча, які пасьля 1994 году доўгі час лічыўся нефармальным лідэрам постсавецкае эліты.

Постсавецкая эліта зьяўляецца, магчыма, адзінай беларускай групай, якая мела досьвед, прынамсі часткова, адміністрацыйнай завершанасьці, з уласнымі правіламі, карпаратыўнай повязьзю, сыстэмай адукацыі, мэханізмамі адбору і рэкрутаваньня. Лёгіка яе разьвіцьця была разбураная на пачатку 1990-х, але гэта не перашкодзіла яшчэ дзесяцігодзьдзе займаць лідэрскія пазыцыі. Большасьць прадстаўнікоў савецкае эліты мела «мясцовае» паходжаньне, многія захоўвалі пэўныя сантымэнты ў адносінах да беларускай культуры, асабліва літаратуры, але адначасова яна была моцна саветызаванаю ў параўнаньні з астатнімі рэспубліканскімі элітнымі групамі. Ідэі незалежнасьці і нацыянальнага адраджэньня не былі дастаткова папулярнымі, а кіраўніцтва БССР да апошняга заставалася ляяльным СССР.

Тым ня менш, у 1990-я прадстаўнікі постсавецкай эліты дэманстравалі дастатковую палітычную і культурную гнуткасьць. У першыя гады незалежнасьці адбылося актыўнае пераняцьце ідэі сувэрэнітэту і нават легітымацыя нацыянальнае палітыкі, і частка эліты пасьпяхова дэмакратызавалася і нават арганічна ўвабрала нацыянальны элемэнт. Лёс пасьля 1994 году быў вельмі розны, частка ў розных формах прадэманстравала апазыцыйнасьць (М. Грыб, У. Ганчарык), другая, большая, частка пасьпяхова інтэгравалася ў новы палітычны лад, пры гэтым захоўваючы, як падаецца, частковую аўтаномію (М. Мясьніковіч, В. Кебіч). Для большасьці, як падаецца, гэта было не ідэалягічным, але прагматычным выбарам, хоць адміністрацыя А. Лукашэнкі і выцягнула на палітычную сцэну

шэраг артадаксальных камуністаў (кшталту Касьцяна, Малафеева ці, у меншай ступені, Дземянцея).

Што тычыцца разуменьня Эўропы і эўрапейскага шляху, то для большай часткі постсавецкай эліты яно цалкам укладаецца ў кантэкст беларускай савецкай культуры і адпаведнага тыпу ідэнтычнасьці. Беларуская савецкая традыцыя адназначна адносіла Беларусь да Эўропы, хоць яе разуменьне было пераважна прасторавае і, натуральна, ніякім чынам не зьвязанае з цывілізацыйнай структураю, каштоўнасьцямі ці хрысьціянствам. Зрэшты, ніякай альтэрнатывы такому разуменьню Эўропы і не магло існаваць: расейская нацыяналістычная традыцыя супрацьпастаўленьня Расеі і Эўропы, як і панадпрасторавае разуменьне Эўропы, супярэчыла савецкай ідэалёгіі. (Экспансія новых «расейскіх ідэяў» і адпаведна экспарт у Беларусь расейскага нацыяналізму, якія адбываюцца на пачатку 1990-х і ў 1995–1999 гадох, аказаўшы значны ўплыў на беларускую ўладу, засталася для постсавецкай эліты вельмі чужою.) Ня менш адчужанай была і ідэя Эўропы як сыстэмы каштоўнасьцяў. Для большасьці эліты Эўропа была і ёсьць толькі прасторавым (галоўным чынам геаграфічным) паняцьцем, мала нагружаным дадатковымі ідэалягічнымі сэнсамі. (Дарэчы такое стаўленьне цалкам аналягічнае разуменьню нацыі і дзяржавы, якія выступаюць галоўным чынам як тэрытарыяльныя паняцьці.) Трэба адзначыць, што такая візія Эўропы для постсавецкай эліты складвалася ў той час, калі кантынэнт быў напалову савецкім, а Эўрапейская эканамічная супольнасьць уяўляла сабой рэгіянальнае аб'яднаньне шасьці–дзесяці краінаў Эўропы. Яна выразна кантрастуе з сучасным разуменьнем, якое ўласьцівае маладой генэрацыі, калі Эўропа і ЭС – паняцьці практычна тоесныя.

Звычайна прадстаўнікі постсавецкае эліты дэманструюць пазытыўнае стаўленьне да Эўропы як нечага блізкага, як партнэра для супрацоўніцтва – перш за ўсё эканамічнага. Нават патрабаваньні дэмакратызацыі ўспрымаюцца спакойна. Але культурны канцэпт Эўропы, яе ўнутраныя падзелы падаюцца, звычайна, незразумелымі і штучнымі ў геаграфічнай парадыгме. Пры гэтым звычайна падкрэсьліваецца неабходнасьць захаваньня асаблівых традыцыйных сувязяў з Расеяй. Гэта свайго роду прагматычная парадыгма савецкага пэрыяду, якая ніколі не была ўважлівай да культурных і неэканамічных аспэктаў палітыкі. На-

прыклад, ня вельмі часта можна сустрэць агрэсіўнае стаўленьне да дэмакратыі, але яна ў большасьці выпадкаў не разглядаецца як каштоўнасьць, але толькі як дадатковы мэханізм для «паляпшэньня ўмоваў супрацоўніцтва». Постсавецкая эліта была дастаткова гнуткаю, каб ажыцьцяўляць такія захады пры пэўных вонкавых варунках.

*Нацыянальная эліта*. Нацыянальная эліта – група, якая паўставала як супрацьвага беларускай савецкай эліце. Супрацьвага галоўным чынам культурная, толькі пры канцы 1980-х пачынаюць узьнікаць арганізаваныя палітычныя групы, не падкантрольныя камуністычнай партыі. Трэба ўлічваць, што ў савецкай Беларусі не было значнага дысыдэнцкага руху (ні нацыянальнага, ні рэлігійнага), а новае пакаленьне нацыянальнага руху арганізуецца ў першай палове 1980-х безь непасрэднай пераемнасьці з больш раньнімі пэрыядамі. Пры гэтым непасрэдным падмуркам стала нацыянальная традыцыя пачатку XX стагодзьдзя, уласна беларускі элемэнт беларускай савецкай культуры (які ў БССР перажыў значнае сацыяльнае абмежаваньне) і беларускі рух Заходняй Беларусі 1920–1930-х гадоў. Аснову «дысыдэнтаў» склала творчая інтэлігенцыя: прадстаўнікі культуры і навукі, сканцэнтраваныя ў буйных гарадох.

У супрацьвагу савецкай ідэнтычнасьці «дысыдэнты» прапаноўвалі ідэнтычнасьць нацыянальную, заснаваную на павазе да беларускай мовы і культуры, зусім іншай інтэрпрэтацыі гісторыі (з доўгай генэалёгіяй ад часу ВКЛ, а не 1917 году, як у савецкай вэрсіі), і зусім іншае разуменьне замежнапалітычнага кантэксту. Калі для савецкай эліты Эўропа была ня больш як прасторай, не напоўненай дадатковымі сэнсамі і каштоўнасьцямі, то для нацыянальнага руху яна стала сымбалем нацыянальнага адраджэньня. Эўропа стала вобразам сапраўднай (несаветызаванай) беларускай культуры і спрадвечнай (нязьвязанай з расейскай каляніяльнай спадчынай) палітычнай традыцыяй ад часу Полацкага княства і ВКЛ. Важным для нацыянальнага руху стала мэтафара вяртаньня ў Эўропу, як палітычнай, эканамічнай і, што яшчэ больш важна, культурна-цывілізацыйнай задачы. Гэта, адпаведна, спалучалася з шматбаковым падкрэсьліваньнем эўрапейскае сутнасьці і асновы беларускай культуры.

Трэба заўважыць, што ўздым эўрапейскай праблематыкі ў нацыянальнай дыскусіі адбываўся ўва ўмовах значнага ўздыму расейскага нацыяналізму пасьля распаду СССР. (Уздым меў вельмі розныя формы – ад новае інтэрпрэтацыі панрусізму і заходнерусізму да панславізму і эўразійства, але першыя варыянт відавочна дамінаваў. Адным зь нешматлікіх прадстаўнікоў на сучаснай палітычнай сцэне можна лічыць С. Касьцяна.) Розныя вэрсіі расейскага нацыяналізму сталі дастаткова папулярнымі ў асяродзьдзі часткі беларускае эліты і зусім нязначнае групы інтэлігенцыі, асабліва пасьля 1994 году, калі А. Лукашэнка практычна ўзьвёў ято да ўзроўню дзяржаўнае палітыкі (асабліва замежнай). Часам існаваньне беларускае нацыі ставілася пад пытаньне, таму Эўропа і эўрапейскасьць разглядаліся нацыянальным рухам як галоўная супрацьвага і альтэрнатыва расейскасьці. Але значэньне эўрапейскасьці для нацыянальнага (у больш шырокім кантэксьце – практычна ўсяго дэмакратычнага) руху стала значна большым за простае супрацьпастаўленьне, зрабіўшы эвалюцыю ад сымбалю мінулага да каштоўнасьці і асноўнай пэрспэктывы, пры гэтым захоўваючы сваю ідэалягічную нагрузку.

У 1990–1994 гадох нацыянальны рух (галоўнай палітычнай сілаю якога стаў БНФ) быў часткаю няўстойлівага балянсу з савецкай элітаю, якая захавала ўладу, але пайшла на саступкі ў галіне беларусізацыі і вяртаньня нацыянальных сымбаляў («кансэнсус Кебіча»). Але далейшае палітычнае разьвіцьцё не прывяло да сынтэзу нацыянальнае і савецкае культуры, прынамсі такі сынтэз быў значна запаволены ўзмацненьнем аўтарытарных тэндэнцыяў і фактычным пераходам дзяржаўнае ўлады ў 1994–2000 гадох на радыкальныя панрусісцкія нацыяналістычныя пазыцыі. Нацыянальная эліта ў такіх умовах пачынае выціскацца зь легальнага палітычнага поля (што было дасягнутае ў 1996-м) і рэпрэсавацца дзяржаваю як на сымбалічным, так і на сацыяльным узроўні. У сучаснай Беларусі нацыянальная эліта практычна ня мае магчымасьці ўдзелу ўва ўладзе і сканцэнтраваная ў палітычнай апазыцыі, шэрагу СМІ і культурнай эліце (дзе яна часта дамінуе). Гэта падкрэсьлівае яе шмат у чым дысыдэнцкі характар, з адпаведнымі стратэгіямі палітычнай барацьбы і псыхалёгіяй.

*Новая эліта*. Сярод разнароднае масы, якую мы ўмоўна называем беларускай элітай, існуе дастаткова значная група, якая зрабілі ўласную палітычную

ці бізнэс-кар'еру ўва ўмовах распаду савецкае сыстэмы і палітычных трансфармацыяў 1990-х (у больш вузкім кантэксьце – падчас кіраваньня Лукашэнкі). Для значнай часткі гэтых людзей толькі перабудова, незалежнасьць і распад СССР у 1991-м, электаральная рэвалюцыя 1994-га адкрылі магчымасьці для кар'ернага росту. Гэта група дастаткова разнародная сваім паходжаньнем і ідэнтычнасьцю, і яна фармуе тое, што ўмоўна можна назваць новаю элітаю, якая і пачынае дамінаваць ва ўладных і бізнэс-структурах.

Цэнтральнае месца тут займаюць людзі, якія атрымалі сацыяльны і палітычныя статус у выніку прамое пратэкцыі ад новае ўлады і асобных яе носьбітаў, а таксама тыя, чые пазыцыі (у прыватнасьці, эканамічныя) сталі магчымыя толькі ў выніку атрыманьня прэфэрэнцыяў ад дзяржаўнае сыстэмы. Найбольш паказальным тут зьяўляецца кола знаёмых і калегаў А. Лукашэнкі (а таксама знаёмыя гэтых знаёмых і г. д.), якія займалі сьціплыя пасады раённага ўзроўню, а пасьля 1994 году зрабіліся пэрсонамі нацыянальнага маштабу (У. Канаплёў, Г. Жураўкова), кола тых, хто падтрымаў будучага прэзыдэнта як палітычны праект (В. Шэйман, Дз. Булахаў). Гэта найбольш радыкальныя выпадкі – для большасьці новае эліты кар'ерны рост быў значна больш павольны, аднак пры гэтым моцна зьвязаны з новаю ўладаю. Акрамя гэтага, значная колькасьць адміністрацыйнае эліты сфармавалася ўва ўмовах сучаснае дзяржаўнае сыстэмы, якая падаецца ім дастаткова знаёмай і звыклай, а значыць карыснай. Пэрсанальныя перакананьні прадстаўнікоў новае эліты могуць быць рознымі (да крыптаапазыцыйнасьці), але іх статус прымушае глядзець на палітыку праз прызму інтарэсаў сыстэмы (ад якой залежыць іх будучыня), хоць шчырае перакананьне ў яе правільнасьці не было да апошняга часу вельмі распаўсюджаным. Гэта група стварае аснову рэальнае палітычнае эліты Беларусі і зьяўляецца найбольш закрытай для неафіцыйнай грамадзкасьці.

Цэльнага ўяўленьня пра яе тут няма і быць ня можа. Але нас найбольш цікавіць «жорсткі цэнтар» новае эліты, візія якой дамінуе ў публічнай прасторы. Менавіта гэтымі коламі прадукуецца афіцыйная антызаходняя рыторыка, пэўны замежнапалітычны радыкалізм і адпаведны ідэалягічны падмурак. (Галоўная ўвага, натуральна, надаецца ЗША, але Эўропа таксама выглядае нэгатыўна.) Калі ў другой палове 1990-х новая эліта прапаноўвала ў якасьці асноўнае ідэалёгіі

розныя варыянты расейскага нацыяналізму, то на пачатку XXI стагодзьдзя адбываецца пераход да спэцыфічнае канструкцыі «ідэалёгія беларускае дзяржавы» (2003). Гэта троху зьмяніла статус Эўропы і розных элемэнтаў «цывілізацыйнага» супрацьпастаўленьня ў ідэалёгіі. Улада зноў вярнулася да геаграфічнага разуменьня эўрапейскае прасторы.

У гэтай мадэлі падкрэсьліваецца геаграфічная прыналежнасьць Беларусі да Эўропы (вядомая мэтафара: «Беларусь – цэнтар Эўропы»), але культурная – хутчэй, не (прынамсі ў адносінах да Заходняе і Цэнтральнае Эўропы). Часам Беларусь нават супрацьпастаўляецца заходняму тыпу культуры (часта прыгадваецца спадчына праваслаўя). Адпаведна вельмі рэдка адзначаецца неабходнасьць інтэграцыі ў Эўропу і яе культурная каштоўнасьць для Беларусі; у адносінах да Расеі такія звароты больш частыя. Такім чынам, Эўропа – гэта з аднаго боку геаграфічнае і гістарычнае паняцьце, якое без сумневу ўключае Беларусь. Зь іншага боку, Эўропа як культурная і палітычная супольнасьць зьяўляецца дастаткова чужою для беларускага народу. Асабліва такая рыторыка ўзмацняецца ў кантэксьце палітычнага ціску на беларускія ўлады з боку эўрапейскае супольнасьці, што адназначна разглядаецца як умяшаньне ўва ўнутраныя справы і спроба навязаць уласныя стандарты дэмакратыі і каштоўнасьці, непрымальныя (ці заўчасныя) для беларускага грамадзтва. Пры гэтым заўсёды падкрэсьліваецца гатоўнасьць да раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Такім чынам, істотнае адрозьненьне ад звычайнага геаграфічнага разуменьня Эўропы заключаецца ў тым, што яна адчуваецца як рэальная палітычная супольнасьць (фактар рэальнае палітыкі), якая знаходзіцца ў супрацьстаяньні да існага беларускага ўладкаваньня.

*Маладая генэрацыя*. Група яшчэ больш складаная для вызначэньня, чым новая эліта, і значна больш фрагмэнтаваная. Дастаткова ўмоўна яна ахоплівае маладых людзей, якія прыйшлі ў палітыку ў другой палове 1990-х і пазьней. Па вялікім рахунку, «генэрацыя» не ўяўляе сабой цэльнае групы, але менавіта пакаленьне, якое было выхавана (у палітычным сэнсе) ува ўмовах незалежнае Беларусі. Ступень палітычнае актыўнасьці «генэрацыі» дастаткова розная, ува ўладных структурах яе прысутнасьць хутчэй фонавая (калі выключыць шэраг

паказальна актыўных цынікаў-«тэхнакратаў»). У той час як у апазыцыйных структурах маладое пакаленьне займае значна больш уплывовыя пазыцыі. (Заняцьце маладой генэрацыяй значнай часткі асноўных пасадаў у БНФ адбылося ў 2003 годзе, у АГП – з пэўным спазьненьнем – у 2006-м). На рэгіянальным узроўні сытуацыя аналягічная, увесь правіслы мэнэджмэнт запаўняецца маладымі функцыянэрамі, што можна лічыць адной з уласьцівасьцяў – відавочна, крызісных – разьвіцьця апазыцыйных структураў.) Матывацыя ўдзелу ў апазыцыі звычайна зьвязаная зь перакананьнямі і ідэалягічным выбарам, хоць цынічнае стаўленьне не зьяўляецца рэдкім.

Для беларускае ўлады маладая генэрацыя – гэта натуральная рэзэрва рэкрутаваньня. Новыя функцыянэры звычайна зьяўляюцца ляяльнымі дзяржаўнай сыстэме, але пры гэтым дэманструюць дастаткова высокі ўзровень апазыцыйнасьці ў прыватным жыцьці. Ацаніць, наколькі маладая генэрацыя знаходзіцца пад уплывам ідэалягічных практыкаў рэжыму, дастаткова складана. Відавочна, ідэалягічныя канструкцыі ўспрымаюцца ў большасьці выпадкаў на апэратыўным узроўні і пакуль ня маюць характару каштоўнасьцяў. Пры гэтым камунікацыя паміж дзьвюма часткамі маладое генэрацыі беларускае эліты практычна адсутнічае магчыма – нават больш радыкальна, чым паміж іншымі групамі эліты.

Фармаваньне новае групы для беларускае эліты адбывалася ўва ўмовах Рэспублікі Беларусі, і гэта накладвае свой адбітак на самасьвядомасьць, хоць яна і не выступае як нейкая самастойная і завершаная форма. Збольшага новае пакаленьне ўспрымае асноўныя формы ідэнтычнасьці існых групаў эліты з пэўнымі асаблівасьцямі. Падаецца, што ўспрыняцьце Эўропы менш ідэалягічнае і больш крытычнае, у сэнсе ўнутранае крытыкі і спадзеву на вырашэньне сытуацыі. Калі для нацыянальнае эліты Эўропа выступала сродкам вырашэньня многіх супярэчнасьцяў беларускага нацыянальнага разьвіцьця, то новая эліта мае куды менш ідэалізму на гэты конт. Для яе часткі, інтэграванай у дзяржаўную сыстэму, сытуацыя выглядае падобным чынам. Калі і фармуецца нэгатыўнае стаўленьне да Эўропы, то яно ня столькі зьвязанае з ідэалягічнымі і прапагандысцкімі канструкцыямі (ці «няведаньнем Эўропы»), але з абмежаванасьцю паўнавартых кантактаў на дзяржаўным узроўні і, адпаведна, зьмяншэньнем практычнае цікавасьці да эўрапейскае праблематыкі. Гэта зусім

ня значыць адсутнасьці кантактаў на асабістым узроўні і асабістага досьведу наведваньня замежжа, але ідэя прыналежнасьці ці далучэньня пры гэтым не ўзьнікае. Эўропа як інтэлектуальны і культурны канструкт і Эўрапейскі Саюз як яго рэальнае палітычнае і эканамічнае ўвасабленьне становяцца практычна тоеснымі паняцьцямі, а гэта значыць межы становяцца дастаткова добра акрэсьленымі.

**Андрэй Казакевіч** – нар. у 1980. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (аддзяленьне паліталёгіі) у 2002. У 2002–2005 вучыўся ў асьпірантуры, падрыхтаваў да абароны дысэртацыю *Тэарэтычныя аспэкты палітычнага аналізу судовай улады Беларусі*. Галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфэра». Кіраўнік бакаляўраўскай праграмы «Паліталёгія. Эўрапейскія дасьледаваньні» Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту з сакавіка 2006.

# Аб аўтарах

**Вольга Абрамава** – нар. 1953, палітык. У 1975 скончыла Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт (БДУ). Кандыдат філязофскіх навук (1988), тэма дысэртацыі – «Гуманізм гвалтоўнай задачы сацыялістычнай рэвалюцыі». Выкладала ў Беларускім тэхналягічным інстытуце і Менскім радыётэхнічным інстытуце. Палітыкай пачала займацца з канца 1980-х, пратэстуючы супраць наданьня беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай мовы. У Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь XIII скліканьня зьяўлялася старшынёй Камісіі па міжнародных справах. Была выбрана ў т. зв. палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканьняў.

**Сьвятлана Алексіевіч** – нар. 1948, пісьменьніца. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ. Пазьней працавала ў раённай газэце г. Бяроза Берасьцейскай вобласьці, рэспубліканскай «Сельской газете», загадчыцай аддзелу нарысу і публіцыстыкі літаратурна-мастацкага часопісу «Нёман». Аўтарка кніг *У вайны не жаночае аблічча* (1985), *Апошнія сьведкі (сто недзіцячых аповедаў)* (1985), *Цынкавыя хлопчыкі* (1989), *Зачараваныя сьмерцю* (1993), *Чарнобыльская малітва (хроніка будучыні)* (1997). Асабісты сайт: http://alexievich.info.

**Яўген Бабосаў** – нар. 1931, сацыёляг, філёзаф. У 1955 скончыў БДУ. З 1959 выкладаў філязофію ў БДУ і Менскім мэдынстытуце. У 1962–1977 намесьнік загадчыка аддзелу навукі і навучальных установаў ЦК КПБ. Дырэктар Інстытуту

філязофіі і права Акадэміі навук БССР (1977–1989); дырэктар (1990–1998), з 1998 загадчык аддзелу Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі, адначасова загадчык катэдры Белдзяржунівэрсытэту. Доктар філязофскіх навук (1972). Акадэмік НАН Беларусі (1994). Быў адным з ініцыятараў стварэньня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасьці (1993), а таксама Сацыялістычнай партыі Беларусі (1994). Узяў удзел у распрацоўцы т. зв. ідэалёгіі беларускай дзяржавы. Яго манаграфія *Асновы ідэалёгіі сучаснай дзяржавы* выйшла двума выданьнямі.

**Анжаліка Борыс** – нар. 1973, лідэр польскай меншасьці ў Беларусі. Скончыла сярэднюю школу ў вёсцы Падліпкі Гарадзенскага раёну, пэдагагічны тэхнікум у Замосьці Люблінскага ваяводзтва Польшчы і Варшаўскі ўнівэрсытэт (філіял у Беластоку) па спэцыяльнасьці «Пэдагогіка і псыхалёгія». Выкладала польскую мову ў вёсцы Адэльск Гарадзенскага раёну і ў Школе польскай у Горадні. У Саюзе палякаў Беларусі ад 1995, з 1998 займала там пасаду загадчыцы аддзелу адукацыі. На шостым зьезьдзе Саюзу палякаў Беларусі ў сакавіку 2005 абраная старшынёй. Міністэрства юстыцыі Беларусі прызнала вынікі зьезду нелегітымнымі. Па інфармацыі тыднёвіка «Салідарнасьць», у 2005 56 разоў выклікалася на допыты беларускімі спэцслужбамі.

**Ірына Бугрова** – палітоляг, вядучы дасьледчык Міжнароднага інстытуту палітычных дасьледаваньняў у Менску (да яго закрыцьця ўладамі). Выкладае паліталёгію ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце (ЭГУ). Кандыдат філязофскіх навук, дацэнт. У сфэру яе навуковых інтарэсаў уваходзіць практычная псыхалёгія, палітычная культура, канфліктолёгія, транзыталёгія, тэхналёгіі выбарчых кампаніяў.

**Генадзь Бураўкін** – нар. 1936, паэт, грамадзкі дзеяч. У 1959 скончыў аддзяленьне журналістыкі філялягічнага факультэту БДУ. Працаваў у рэдакцыях газэтаў і часопісаў. З 1978 – старшыня Дзяржаўнага камітэту БССР па тэлебачаньні і радыёвяшчаньні. З 1990 – пастаянны прадстаўнік БССР пры ААН. Працаваў у рэдакцыі прафсаюзнай газэты «Беларускі час», пакуль кантроль над ёй не пераняў беларускі рэжым. Сябар Беларускага ПЭН-цэнтру.

**Алесь Бяляцкі** – нар. 1962, праваабаронца. У 1984 скончыў Гомельскі дзяржаўны ўнівэрсытэт. Сябар Арганізацыйнага камітэту БНФ «Адраджэньне» (1988), адзін з заснавальнікаў Беларускай каталіцкай грамады (1990). У 1992–1996 – дэпутат Менскага гарадзкога савету. У 1989–1998 працаваў дырэктарам Музэю Максіма Багдановіча ў Менску. У 1996 заснаваў і ўзначаліў праваабарончы цэнтар «Вясна-96». У лютым 2006 году быў узнагароджаны «Andrei Sakharov Freedom Award 2006». У 2006 быў таксама вылучаны групай нарвэскіх парлямэнтароў на атрыманьне Нобэлеўскай прэміі міру. У тым жа годзе ў Чэхіі атрымаў з рук Вацлава Гаўла прэстыжную прэмію «Homo homini».

**Аляксандар Вайтовіч** – нар. 1938, навуковы і палітычны дзеяч. Доктар фізыка-матэматычных навук, прафэсар, акадэмік НАН Беларусі. У 1960 скончыў фізычны факультэт БДУ. З траўня 1997 – прэзыдэнт НАН Беларусі. 19 сьнежня 2000 абраны старшынём т. зв. савету рэспублікі нацыянальнага сходу Беларусі другога скліканьня. 28 ліпеня 2003 быў адкліканы з гэтай пасады ўказам прэзыдэнта і перайшоў у апазыцыю. Асабісты сайт: http://voitovich.com/.

**Андрэй Вардамацкі** – нар. 1956, сацыёляг. Кандыдат філязофскіх навук, доктар сацыялягічных навук. У 1978 скончыў БДУ. Кіраўнік прыватнай дасьледчай лябараторыі аксіямэтрычных дасьледаваньняў «Новак» (новая аксіялёгія), якая валодае ўласнай сацыялягічнай сеткай. На апошніх прэзыдэнцкіх выбарах лябараторыя не атрымала дзяржаўнай акрэдытацыі і была пазбаўленая магчымасьці праводзіць незалежныя сацыялягічныя дасьледаваньні.

**Вінцук Вячорка** – нар. 1961, пэдагог, вучоны, лідэр Партыі БНФ. У 1983 скончыў філялягічны факультэт БДУ, у 1986 – асьпірантуру пры Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук. У 1988 стаў адным з заснавальнікаў БНФ «Адраджэньне» (БНФ). З 1990 выкладаў у Менскім дзяржаўным пэдагагічным інстытуце і Беларускім гуманітарным ліцэі. Займаўся нармалізацыяй сучаснага беларускага правапісу. У 1995 заснаваў і ўзначаліў цэнтар «Супольнасьць». Быў адным з арганізатараў «Менскай вясны-1996». За арганізацыю пратэстаў супраць яго была пачатая крымінальная справа, якая цягнулася да 1998. У 1999 В. Вячорка

выбраны новым старшынём Партыі БНФ. Падчас выбарчай кампаніі 2006 быў намесьнікам кіраўніка штабу Аляксандра Мілінкевіча і адказваў за дачыненьні з даверанымі асобамі й міжнародныя сувязі.

**Павал Данейка** – нар. 1961, эканаміст, палітычны дзеяч. У 1986 скончыў БДУ па спэцыяльнасьці «макраэканоміка». Працаваў у Інстытуце эканомікі Акадэміі навук Беларусі. Пасьля 1991 узначальваў фінансава-інвэстыцыйную кампанію «Фіко», кампанію «Сыстэмнае бізнэс-кансультаваньне». Дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь XIII скліканьня. Член АГП з 1991, член Палітрады АГП. Старшыня наглядальнай рады Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту (Менск). Сфэра навуковых інтарэсаў: макра- і мікраэканамічныя ды інстытуцыянальныя аспэкты трансфармацыі, палітэканомія трансфармацыі, фондавы рынак.

**Андрэй Дынько** – нар. 1974, галоўны рэдактар тыднёвіка «Наша Ніва», перакладчык, публіцыст, аўтар шэрагу апавяданьняў. У 1996 скончыў Менскі дзяржаўны лінгвістычны ўнівэрсытэт. У 1997–2000 выкладчык Менскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўнівэрсытэту. У 2002–2004 – віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-Цэнтру. У 2003 годзе Вацлаў Гавал перадаў яму прэмію за Грамадзянскія заслугі імя Ганны Эленбоген (стаў першым замежнікам, якому была перададзена гэтая чэская прэмія).

**Сьвятлана Калінкіна** – нар. 1970, журналістка. З 1996 – першая намесьніца галоўнага рэдактара «Белорусской деловой газеты», з 2002 – галоўны рэдактар «Белорусской деловой газеты», галоўны рэдактар газэты «БДГ. Для служебного пользования». Апошнія колькі гадоў – шэф-рэдактар найбольш тыражнай апазыцыйнай газэты «Народная воля». Разам з журналістам Паўлам Шараметам напісала і выдала кнігу *Выпадковы прэзыдэнт*. Ляўрэатка прэміі Буцэрыюса «Маладая прэса Ўсходняй Эўропы».

**Сяргей Калякін** – нар. 1952, палітык. У 1977 скончыў Менскі радыётэхнічны інстытут па спэцыяльнасьці «радыёінжынэрыя», у 1992 – БДУ па спэцыяльнасьці «паліталёгія». Працаваў у прамысловасьці. Член КПСС з 1977. З 1983 па 1991 – другі

і першы сакратар Савецкага райкаму КПБ г. Менску. Сакратар (з 1993), першы сакратар ЦК ПКБ (з 1994). Дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь XIII скліканьня, член Прэзыдыюму ВС і кіраўнік фракцыі камуністаў. Падчас выбарчай кампаніі 2006 быў кіраўніком штабу Аляксандра Мілінкевіча.

**Кася Камоцкая** – нар. 1963, рок-сьпявачка. У 1991 стварыла і ўзначаліла папулярную рок-групу «Новае неба».

**Сяргей Касьцян** – нар. 1941, гісторык, палітык. Скончыў Менскі дзяржаўны пэдагагічны інстытут. Працаваў першым сакратаром Мазырскага райкаму ЛКСМБ, загадчыкам аддзелу Мазырскага райкаму КПБ, загадчыкам катэдры Мазырскага дзяржаўнага пэдагагічнага інстытуту. Доктар паліталягічных навук. Дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь XIII скліканьня. Пасьля яго роспуску ўвайшоў у склад т. зв. палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Быў у складзе дэпутацкага аб'яднаньня «За саюз Украіны, Беларусі і Расеі» («ЗУБР»), дэпутацкіх групаў «Адзінства», «Сябры Баўгарыі», «Народны дэпутат». Быў намесьнікам старшыні Камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД. Сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, старшыня Беларускага славянскага камітэту.

**Вячаслаў Кебіч** – нар. 1936, гаспадарчы і дзяржаўны дзеяч. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут і Менскую вышэйшую партыйную школу. Кандыдат эканамічных навук. Працаваў інжынэрам-тэхнолягам, намесьнікам галоўнага інжынэра Менскага заводу аўтаматычных лініяў, дырэктарам Менскага станкабудаўнічага заводу, генэральным дырэктарам Менскага вытворчага аб'яднаньня па выпуску працяжных і адразных станкоў імя С. М. Кірава, другім сакратаром Менскага гаркаму КПБ, загадчыкам аддзелу цяжкай прамысловасьці ЦК КПБ, другім сакратаром Менскага абкаму КПБ, старшынём Дзяржаўнага плянавага камітэту БССР, прэзыдэнтам Беларускага гандлёва-прамысловага саюзу. Выбіраўся членам ЦК КПСС, народным дэпутатам СССР, дэпутатам Вярхоўнага Савету БССР X, XI, XII і XIII скліканьняў. З 1985 – намесьнік старшыні, у 1990–1994 – старшыня Савету Міністраў Беларусі. Падчас першых прэзыдэнцкіх выбараў

у Беларусі (1994) набраў у першым туры 17,33%, у другім – 14,1% галасоў. Увайшоў у склад т. зв. палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага скліканьня, быў членам дэпутацкай групы «Спрыяньне эканамічнаму разьвіцьцю», членам пастаяннай камісіі па прамысловасьці, паліўна-энэргетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве.

**Жанна Ліцьвіна** – нар. 1954, журналістка, грамадзкая дзяячка. З 1976 па 1994 прайшла шлях ад асацыяванага рэдактара да галоўнага рэдактара рэдакцыі моладзевых праграмаў Беларускага радыё. Узначальвала радыёстанцыю «Беларуская маладзёжная», пасьля звальненьня зь якой у 1994 годзе стварыла незалежную радыёстанцыю «Радыё 101.2», закрытую ўладамі ў 1996 годзе. З 1994 па 1995 узначальвала беларускі карпункт радыё «Свабода». З 1995 – старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў.

**Анатоль Лябедзька** – нар. 1961, палітык. Старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі (АГП). У 1985 скончыў факультэт гісторыі і францускай мовы Менскага пэдагагічнага інстытуту, у 1996 – юрыдычны факультэт БДУ. У Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь XII скліканьня займаў пасаду намесьніка старшыні Камісіі па справах моладзі, сям’і і жанчын. У Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь XIII скліканьня зьяўляўся намесьнікам старшыні Камісіі па замежных справах і адным зь лідэраў парлямэнцкай фракцыі «Грамадзянскае дзеяньне». У 1992–1999 – прэзыдэнт Беларускай асацыяцыі маладых палітыкаў, з красавіка 2000 – старшыня АГП.

**Васіль Лявонаў** – нар. 1938, гаспадарчы і дзяржаўны дзеяч. Скончыў Беларускі інстытут мэханізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў загадчыкам сельгасаддзелу ЦК КПБ, першым сакратаром Магілёўскага абкаму КПБ. Займаючы гэтую пасаду, даў згоду на назначэньне Аляксандра Лукашэнкі дырэктарам саўгасу «Гарадзец». Падтрымаў А. Лукашэнку падчас выбараў народных дэпутатаў СССР (1988) у альтэрнатыву старшыню Дзяржпляну БССР Вячаславу Кебічу. Пасьля забароны КПБ у 1991 быў прызначаны гандлёвым прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у Германіі. 4 жніўня 1994 быў прызначаны міністрам сельскай гаспадаркі,

а 23 жніўня 1994 – пераназначаны міністрам сельскай гаспадаркі і харчаваньня Рэспублікі Беларусь. 11 лістапада 1997 быў арыштаваны ў сваім працоўным кабінэце. Арышт трансьлявалі на тэлебачаньні. 14 лістапада 1997 А. Лукашэнка, выступаючы ў АПА «Расьсвет» Кіраўскага раёну Магілёўскай вобласьці, публічна абвінаваціў В. Лявонава ў датычнасьці да забойства кіраўніка службы кантролю прэзыдэнта па Магілёўскай вобласьці Яўгена Мікалуцкага. Пасьля выхаду з турмы – старшыня папячыцельскай рады зарэгістраванага ў Расеі беларуска-расейскага фонду «За новую Беларусь».

**Алег Манаеў** – нар. 1952, сацыёляг. У 1974 скончыў БДУ. Кандыдат філязофскіх навук (1983), доктар сацыялягічных навук (1991). У 1992–1999 – прафэсар катэдры сацыялёгіі БДУ. З 1992 – дырэктар Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД), закрытага беларускімі ўладамі вясной 2005 і вымушанага перарэгістравацца ў Літоўскай Рэспубліцы. У 1990 быў адным з арганізатараў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (сёньняшняя АГП). У 1992 стаў адным з заснавальнікаў, а затым старшынём праўленьня Беларускага фонду Сораса. У сфэру яго навуковых інтарэсаў уваходзяць: праблемы мас-мэдыяў і дэмакратыі, тэарэтычныя праблемы эфэктыўнасьці СМІ, уплыў СМІ на індывідуальнасьць.

**Аляксандар Мілінкевіч** – нар. 1947, палітычны й грамадзкі дзеяч. У 1969 скончыў фізыка-матэматычны факультэт Гарадзенскага пэдынстытуту. У 1969–1972 вучыўся ў асьпірантуры Інстытуту фізыкі АН Беларусі. Кандыдат фізыка-матэматычных навук. Стажыраваўся ва ўнівэрсытэце Манпэлье (Францыя, 1980) і Каліфарнійскім унівэрсытэце (ЗША, 1998), прайшоў курс навучаньня ў Эўрапейскім цэнтры дасьледаваньня праблемаў бясьпекі ў Гарміш-Партэнкірхэне (Нямеччына, 2000). У 1980–1984 загадваў катэдрай Сэтыфскага ўнівэрсытэту (Альжыр). З 1984 да 2000 – дацэнт катэдры агульнай і тэарэтычнай фізікі Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Я. Купалы. З 1990 да 1996 – намесьнік старшыні гарвыканкаму Горадні. Кіраўнік праграмаў «Фонду спрыяньня лякальнаму разьвіцьцю». У 2001 быў кіраўніком выбарчага штабу кандыдата ў прэзыдэнты Сямёна Домаша. На Кангрэсе дэмакратычных сілаў Беларусі,

які адбыўся 1–2 кастрычніка 2005 у Менску, абраны адзіным кандыдатам ад апазыцыі на прэзыдэнцкія выбары 2006. Паводле афіцыйных зьвестак, падчас галасаваньня 19 сакавіка 2006 набраў 6% галасоў выбарнікаў.

**Анатоль Міхайлаў** – нар. 1939, філёзаф, пэдагог. У 1961 скончыў БДУ. У 1966–1974 і з 1980 – у БДУ (з 1987 – загадчык катэдры). У 1974–1980 – супрацоўнік Цэнтру сацыяльнага разьвіцьця й гуманітарных справаў (Нью-Ёрк–Вена). З 1992 – рэктар ЭГУ, закрытага беларускімі ўладамі ў 2004 і перарэгістраванага ў Літоўскай рэспубліцы. Акадэмік НАН Беларусі. Доктар філязофскіх навук (1986). У сфэру навуковых інтарэсаў уваходзіць гісторыя філязофіі, сучасная заходняя філязофія й мэтадалёгія гуманітарных ведаў.

**Аляксей (Алесь) Міхалевіч** – нар. 1975, палітык. Намесьнік старшыні Партыі БНФ (з 2003 г.) старшыня Менскай абласной суполкі БНФ. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (аддзяленьне паліталёгіі). Узначальваў Згуртаваньне беларускіх студэнтаў і Моладзевы інфармацыйны цэнтар, закрытыя беларускімі ўладамі. Генэральны дырэктар сумеснага беларуска-польскага прадпрыемства ТАА «Аркадзія». У 2003 быў абраны дэпутатам Пухавіцкага райсавету.

**Тацяна Працька** – нар. 1951, праваабаронца. Працавала ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Кандыдат філязофскіх навук (1983). З 1992 па 1994 – старшы рэдактар Белтэлерадыёкампаніі, рэдактар радыёчасопісу «Наша мінуўшчына», палітычны камэнтатар. З 1995 году – старшыня грамадзкага аб’яднаньня «Беларускі Хэльсынскі камітэт».

**Андрэй Саньнікаў** – нар. 1954, палітык. У 1977 скончыў Менскі пэдагагічны інстытут замежных моваў, у 1989 – Дыпляматычную акадэмію МЗС СССР. Надзвычайны і паўнамоцны амбасадар Рэспублікі Беларусь. У 1995–1996 быў намесьнікам міністра замежных справаў Рэспублікі Беларусь; напярэдадні рэфэрэндуму 1996 пайшоў у адстаўку. Каардынатар грамадзянскай ініцыятывы «Хартыя-97» у міжнародных справах. Ляўрэат міжнароднай прэміі імя Бруна Крайскага ў галіне правоў чалавека (2005).

**Уладзімер Улаховіч** – дырэктар Цэнтру міжнародных дасьледаваньняў БДУ. Скончыў БДУ, асьпірантуру ў Акадэміі грамадзкіх навук (Масква). У сфэру яго навуковых інтарэсаў уваходзяць адносіны ЭЗ з краінамі-суседзямі, міжнародныя арганізацыі, замежная палітыка Беларусі.

**Валеры Фралоў** – нар. 1947, палітык. Генэрал-маёр у адстаўцы. Скончыў Харкаўскае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча (1970), Ваенную акадэмію бранятанкавых войскаў (1977), Акадэмію Генэральнага штабу Ўзброеных сілаў СССР (1991), Акадэмію кіраваньня пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусь (2000). Даслужыўся да пасадаў начальніка штабу армейскага корпусу Ўзброеных сілаў Рэспублікі Беларусь (1993–1994), камандзіра 28-га армейскага корпусу (1994–2000). З 2000 да 2004 – дэпутат т. зв. палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога скліканьня, лідэр апазыцыйна настроенай дэпутацкай групы «Рэспубліка». З 2005 – член Цэнтральнага камітэту Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі («Грамада»). Адмовіўся ад удзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах 2006 на карысьць лідэра БСДП (Г) Аляксандра Казуліна, увайшоў у перадвыбарны штаб Казуліна.

**Станіслаў Шушкевіч** – нар. 1934, радыёэлектронік, палітык. У 1956 скончыў фізыка-матэматычны факультэт БДУ, у 1959 – асьпірантуру Інстытуту фізыкі АН БССР. Доктар фізыка-матэматычных навук. Кіраваў катэдрай ядравай фізыкі і электронікі БДУ, займаў пасаду прарэктара па навуковай рабоце. У 1989–1991 – народны дэпутат СССР, член Міжрэгіянальнай дэпутацкай групы, у 1990–1995 – дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь XII скліканьня, у 1990–1991 – першы намесьнік старшыні Вярхоўнага Савету Беларусі. 9 верасьня 1991 выбраны старшынём Вярхоўнага Савету Беларусі. 7–8 сьнежня 1991 падчас сустрэчы ў Белавескай пушчы (Віскулі) з прэзыдэнтамі Расеі Барысом Ельцыным і Ўкраіны Леанідам Краўчуком паставіў подпіс пад Белавескімі пагадненьнямі пра ліквідацыю СССР і стварэньне СНД. 26 студзеня 1994 зьняты з пасады старшыні Вярхоўнага Савету Беларусі. Падчас першых прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі (1994) набраў у першым туры крыху менш за 10% галасоў. З 1998 – старшыня партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада.

**Усевалад Янчэўскі** – нар. 1976, палітык, журналіст. Быў актывістам прэзыдэнцкай кампаніі (1994) А. Лукашэнкі, членам перадвыбарнага штабу С. Шушкевіча падчас выбараў у Вярхоўны Савет (1995). Уваходзіў у партыю «Славянскі сабор „Белая Русь"». У 1998 скончыў юрыдычны факультэт БДУ, у 2000 – факультэт міжнародных дачыненьняў таго ж унівэрсытэту. Некалькі гадоў у рангу першага сакратара Цэнтральнага камітэту ўзначальваў Беларускі патрыятычны саюз моладзі (БПСМ). У 2005 прызначаны галоўным рэдактарам створанага Адміністрацыяй прэзыдэнта часопісу «Планета».